Пераклад Адэлі Дубавец

ВІТАЛЬД ШАБЛОЎСКІ

ТАНЕЦ МЯДЗВЕДЗЯЎ

34 MAG. NET

34 MAG. NET

ВІТАЛЬД ШАБЛОЎСКІ

ТАНЕЦ МЯДЗВЕДЗЯЎ

РЭПАРТАЖЫ ПРА ПЕРАБУДОВУ

Пераклад Адэлі Дубавец

2016

Copyright © by Witold Szabłowski & Agora SA, 2014. All rights reserved.
© Адэля Дубавец, пераклад на беларускую мову, 2016
© 34mag.net, 2016

Афіны — тут штодня тысячы грэкаў мараць, каб у іхнай краіне ўрэшце запанаваў найлепшы ды самы шчаслівы лад — камунізм.

Бялград — цягам доўгіх гадоў пад выглядам лекара нетрадыцыйнай медыцыны тут хаваўся ваенны злачынца Радаван Караджыч.

Берат — тут будаўнік Д'ёні разбівае бункеры, пабудаваныя Энверам Ходжай.

Горы — вясталкі Сталіна сцерагуць пасмяротную маску генералісімуса ў доме, дзе ён нарадзіўся.

Гавана — тысячы кубінцаў дрыжаць, пачуўшы вестку пра пагаршэнне стану здароўя Фідэля Кастра; адныя дрыжаць ад страху, іншыя — ад узбуджэння, бо вецер пераменаў урэшце пачне веяць і на іхным востраве.

Лондан — лэдзі Перон мае тут свае два гектары, між чыгуначным вакзалам Station і аўтобусным Victoria Coach Station.

Косаўска-Мітравіца — адсюль сябры Флорэнт і Душан вырушаюць, каб раздаваць курэй сербам, якія вяртаюцца ў Косава.

Мэдыка — праз мяжу з Украінаю штодня ходзіць тысяча «мурашак», якія прыносяць у Польшчу гарэлку і цыгарэты.

Нарва — сталіца эстонскіх расейцаў, дзе нават паліцыянты не валодаюць эстонскаю мовай.

Серакова Славеньске — жыхары гэтай постсаўгаснай вёскі ў межах барацьбы з беднасцю заснавалі вёску хобітаў. Пераапранаюцца ў герояў Толкіна і ладзяць арыентацыйныя гульні для дзяцей.

Тырана — адсюль кіраваў Энвер Ходжа, тут дагэтуль выклікае жах піраміда, прыдуманая ягонаю дачкой і зяцем.

Беліца — у гэтым мястэчку знаходзіцца дванаццацігектаравы парк мядзведзяў-танцораў, дзе іх прызвычайваюць да жыцця на волі.

Др'яновец — адсюль паходзяць браты Гіёргій і Стэфан Марынавы. Першы з іх з мядзведзіцаю Вэлаю ездзіў па ўзбярэжжы Чорнага мора і ваколіцах. Другі быў адмыслоўцам архіскладанага мастацтва дужання з мядзведзем.

Гецава — тут у 2007 годзе ў цыганскай сям'і Станевых адабралі трох апошніх мядзведзяў-танцораў у Балгарыі: Мішу, Светлу ды Міму.

Ягода — мястэчка, вядомае сваімі знакамітымі, хаця й бяднейшымі за сваіх калег з поўначы краіны, мядзведнікамі. Балгары хваліліся, што кожны жыхар Ягоды мае ў хаце мядзведзя.

Лазніца — у гэтай вёсцы нарадзіўся таварыш Пэнча Кубадынскі, які падчас Другой сусветнай вайны хаваўся з цыганамі-мядзведнікамі, а пазней стаў адным з самых знакамітых балгарскіх камуністаў, блізкім сябрам ды паплечнікам Тодара Жыўкава.

Сафія — у сталіцы краіны яшчэ колькі год таму можна было ўбачыць жывых мядзведнікаў у трамваях, мікраараёнах, больш таго — нават пад кіёскамі з суперлато. Яны гралі на гуслях ды чакалі падачак.

Варна, Залатыя пяскі — найбольш папулярныя балгарскія курорты, яшчэ пару год таму, пакуль Балгарыя не ўвайшла ў Еўразвяз, поўніліся мядзведнікамі ды іхнымі звярамі.

Частка 1

Слоўнічак

Мэчка — па-балгарску мядзведзь.

Мэчкар *або* ***мэчкадар*** — мядзведнік, дрэсіроўшчык.

Намордні́к — маска, часта з чырвоным пампонам, якую надзявалі мядзведзю на пысу.

Холка — металічнае колца, якое мядзведнікі ўбівалі сваім звярам у насы.

Гадулка (гъдулка) — гуслі, на якіх граў мядзведнік.

І. ЛЮБОЎ

1

Гіёргій Мірчаў Марынаў хавае галаву ў правай далоні, а леваю страсае попел на зямлю, што ў вёсцы Др'яновец мае інтэнсіўны, часам аж да чырвані брунатны колер. Мы сядзім пад абтынкаваным шэрым домам. Марынаву крыху за семдзесят, але ён яшчэ не схіліўся да зямлі, хоць у Др'яноўцы, вёсцы на поўначы Балгарыі, населенай пераважна цыганамі, рэдкі мужчына дажывае да ягоных гадоў.

З кабетамі, зрэшты, тут не лепш. На дзвярным вушаку хаты Марынава вісіць свежы некралог са здымкам жанчыны толькі крыху за яго маладзейшай. Гэта жонка. Памерла летась.

Калі прайсці праз гэты вушак, мінуць воз, мула і кучу папяровага смецця, дойдзеш да глінянага гумна. Пасярод яго стаіць убіты ў зямлю шост. Пры ім амаль дваццаць зімаў правяла мядзведзіца Вэла.

— Я любіў яе, быццам гэта была мая дачка, — кажа Мірчаў, якога ўспаміны на імгненне перанеслі ў тыя раніцы

над Чорным морам, калі ён і Вэла, абапершыся адно аб аднаго, выстаўлялі насы ў бок мора, а потым падсілкоўваліся пшанічным хлебам і ішлі па асфальце, што рабіўся ўсё гарачэйшым, на сваю працу. І гэтыя ўспаміны растапляюць яго, як тое сонца тады растапляла той асфальт, ён забывае пра цыгарэту, ажно жар пачынае апякаць ягоныя пальцы, тады ён кідае бычок на брунатна-чырвоную зямлю і вяртаецца ў вёску Др'яновец, пад шэры абтынкаваны дом з некралогам на дзвярным вушаку.

— Бог мой сведка, я любіў яе так, быццам гэта быў чалавек, — кажа і трасе галавою. — Любіў, як самага блізкага сваяка. Хлеба яна заўжды мела дастаткова. Найлепшы алкаголь. Трускалкі. Шакалад. Батонікі. Калі б я мог, насіў бы яе на сабе. Таму, калі ты кажаш, што я яе біў, што ёй са мною было кепска, ты кажаш хлусню.

2

Вэла з'явілася ў доме Мірчавых на пачатку сумных 90-х, калі следам за падзеннем камунізму пачалі занепадаць і калгасы, якія тут называюцца ТКЗС — трудово кооперативно земеделско стопанство.

— Я быў трактарыстам у ТКЗС у Др'яноўцы, ездзіў на трактары маркі «Беларус» і вельмі любіў сваю працу. — кажа Мірчаў. — Калі б я мог, працаваў бы ўсё жыццё ў калгасе. Людзі прыемныя. Праца часам цяжкая, але на свежым паветры. Нам усяго хапала.

Але ў 1991-м ТКЗС пачало звальняць працаўнікоў. Дырэктар выклікаў Мірчава і сказаў яму, што ў капіталізме трактарыст мусіць не толькі ездзіць на трактары, але дапа-

магаць і з каровамі, і падчас сяўбы, і на жніве. Гіёргій і так шмат разоў дапамагаў людзям на розных працах, праблемы ў гэтым ён не бачыў. Дырэктар сказаў, што ён усё разумее, але нават такіх шматфункцыйных трактарыстаў ён у капіталізме дванаццаць не ўтрымае — бо раней у ТКЗС у Др'яноўцы было дванаццаць трактарыстаў, — а ўтрымаць зможа ў лепшым выпадку трох. Мірчава звольнілі.

— Я атрымаў заробак на тры месяцы наперад — і да пабачэння, — узгадвае. І дадае: — Калі выйдзеш з майго дома, пройдзеш крыху ўправа і залезеш на горку, убачыш, што засталося ад нашага калгаса. Гэта быў цудоўны калгас, трыста кароў, некалькі сотняў гектараў, дасканалая арганізацыя! Працавалі ў ім пераважна цыганы, бо для балгараў тут была занадта смярдзючая праца. Сёння ўсё сапсавалася, цыганы замест таго, каб працаваць, сядзяць беспрацоўныя. А малако ў маркеце ў Разградзе прадаецца нямецкае. Відаць, немцам выгадна мець вялікую сельскую гаспадарку, балгарам — не.

У 1991-м Мірчаў мусіў задаць сабе галоўнае пытанне, якім задаецца кожны звольнены з працы: «Што іншае я магу рабіць?»

— Адказ у маім выпадку быў просты, — кажа. — Я ўмеў трэнаваць мядзведзяў, каб яны танчылі.

Мядзведнікамі былі ягоныя бацька ды дзядуля, а брат Стэфан вадзіў мядзведзяў, як толькі скончыў школу.

— З найбліжэйшай сям'і толькі я пайшоў у калгас, — кажа Мірчаў. — Я хацеў пакаштаваць іншага жыцця, бо тое, з мядзведзямі, мне было вядомае. Шмат мядзведнікаў пайшлі, як і я, працаваць у калгас. Але я выхаваны

пры мэчках. Я ведаў усе песенькі, усе фокусы, усе гісторыі. Двух мядзведзяў майго бацькі я сам выкарміў з бутэлькі з соскаю. Калі ў мяне нарадзіўся сын, мы гадавалі іх разам. Не раз я памыляўся — і малы піў з бутэлькі мядзведзя, а мядзведзь з ягонай. Таму, калі мяне звольнілі з калгаса, я ведаў адно: калі я хачу жыць далей, я мушу як найхутчэй знайсці мядзведзя. Без мядзведзя і года не пражыву.

Як я знайшоў? Чакай, запалю яшчэ адну цыгарэту і ўсё табе распавяду.

3

Па мядзведзя я паехаў у рэзерват Кармісаж. Гэта вядомая паляўнічая тэрыторыя; здаецца, Брэжнеў прабачыў нашым камуністам мільярд леваў доўгу, каб толькі яго бралі туды на паляванні. Так мне распавядаў адзін чалавек, які ў Кармісажы працаваў сорак гадоў, але ці гэта праўда — не ведаю.

Найперш я мусіў паехаць у Сафію, у міністэрства, адказнае за лясы, бо ў мяне там працаваў школьны сябар. Дзякуючы яму я атрымаў талон на мядзведзя, каб выкарыстаць у Кармісажы, таму проста з Сафіі я падаўся ў рэзерват. Пра мяне там былі начутыя, бо мой брат Стэфан калісьці прыязджаў да іх з іншымі мядзведнікамі, а ён у тыя часы быў сапраўднаю зоркай. Ён выступаў у даражэннай рэстарацыі над Чорным морам, дзе бывалі нават чальцы кіраўніцтва камуністычнай партыі. Некалькі разоў яго паказвалі па тэлебачанні. Многія людзі ў Балгарыі яго пазнавалі.

Стэфан свайго мядзведзя ўзяў з сафійскага заапарка. Адзін п'яны вайсковец уламіўся туды на тэрыторыю мядзведзяў, а ў маткі акурат было малое, таму яна кінулася на чалавека ды забіла яго на месцы. Яе мусілі ўсыпіць, гэтак робіцца ў заапарку, калі звер заб'е чалавека. Стэфан аднекуль пра гэта даведаўся і паехаў купіць адно з мядзведзянятак.

У рэстарацыі найперш выступалі дзяўчыны, якія танчаць на вуглях, потым ён. Пачынаў ён з барацьбы з мядзведзем, а пад канец мядзведзь масаваў спіну дырэктара рэстарацыі.

Потым да брата вышнуроўвалася доўгая чарга ахвотных, каб мядзведзь іх таксама памасаваў. Брат зарабляў на гэтым цудоўныя грошы. Вядома, яму даводзілася дзяліцца з дырэктарам, але хапала ім абодвум.

Таму я паехаў у Кармісаж, ляснік папрасіў перадаць прывітанне брату, а потым прывёў тую малую. Ёй было некалькі месяцаў. Гэткія найлепшыя, бо яшчэ не прызвычаіліся да маткі занадта моцна; яшчэ можна ім памяняць гаспадара, не будуць моцна крывіцца. Старэйшы мядзведзь, калі яго забраць ад маткі, можа абвесціць галадоўку.

Глядзіць на мяне. Я прыглядаюся да яе. Думаю: «Прыйдзе да мяне ці не прыйдзе?» Я прысеў. Выцягнуў руку. Клічу:

— Ну, хадзі, малая, хадзі.

Яна нічога. Толькі глядзіць на мяне, а вочы ў яе, як два вуглі.

Ты б у тыя вочы закахаўся, кажу табе.

Я выняў з кішэні хлеб, паклаў у клетку і чакаю, ці выйдзе. Яна зноў на мяне паглядзела. Хвілінку павагалася, але ўвайшла. Я падумаў: «Значыць, ты ўжо мая. У радасці і ў нядолі». Бо я добра ведаў, што мядзведзь з чалавекам трыццаць гадоў можа жыць. А гэта ж палова жыцця!

Я заплаціў за яе 3,5 тысячы леваў, але не шкадаваў аніводнай стоценкі. Гэтак яна мне да сэрца прыпала.

Грошы ў мяне былі з калгаснага заробку і яшчэ крыху пазычаныя. Тады за прыкладна чатыры тысячы можна было набыць масквіч.

Але на масквіч мне грошай ужо не хапіла. Таму частку дарогі я разам з малою ехаў на аўтобусе і ўжо тады адчуў вялікую прыемнасць, бо ўсіх дзяцей цікавіў мой мядзведзь, усе хацелі яго гладзіць. Я падумаў, што гэта добры знак. І што мне патрапіўся сапраўды файны мядзведзь, прыязны ды сімпатычны. І ўжо тады я падумаў: «Будуць цябе зваць Валянціна. Ты прыгожая мядзведзіца, а гэта прыгожае імя, акурат для цябе».

І так яно павялося. Валянціна, а ў скароце Вэла.

Потым нам давялося змяніць аўтобус на цягнік, і Вэла ехала ў багажным адсеку. Кандуктар не патрабаваў за яе білета, толькі папрасіў дазволу яе пагладзіць. Зразумела, я дазволіў. Але ўсё роўна ўпёрся, што за білет заплачу. Такі ўжо я ёсць — як трэба плаціць, то плачу і кропка. Я заўжды набываў Вэле квіткі, як для дарослага чалавека, без аніякіх зніжак за гладжанне. Аднойчы толькі кандуктар упёрся. Сказаў, што нехта з ягонай сям'і ляжыць у лякарні і ён бачыць у гэтым мядзведзі добры знак, на

шчасце для свайго сваяка. Я бачыў, што для яго гэта істотна, таму грошай у той адзін-адзіны раз не заплаціў.

4

Найбольшая праблема ў мяне была з жонкай. Бо я паехаў у Кармісаж у таямніцы ад яе. І калі раптоўна я пагрукаў у дзверы разам з мядзведзем, яна раз'юшылася.

— У цябе, відаць, няма мазгоў! Як мы будзем жыць?! — закрычала яна і кінулася да мяне з кулакамі. Я саступіў, выйшаў з дому.

Я заўсёды намагаўся жыць з жонкаю ў згодзе і хоць злаваўся на яе за гэты крык, але крыху яе разумеў. Жыццё мядзведніка нялёгкае. Вядома, можна зарабіць. Бачыш той дом? Ён стаіць дзякуючы працы нашай Валянціны. У добры дзень каля мора я зарабляў больш, чым за цэлы месяц работы ў калгасе.

Але ў гэтай працы ёсць свая цана. Трэба ўвесь час пільнаваць, каб мядзведзь не здзічэў і не зрабіў табе крыўды. Вэла была з намі дваццаць гадоў, а мы ні на момант не маглі страціць пільнасці. Ты не ведаеш, калі ў тваім мядзведзі можа абудзіцца інстынкт. У майго сябра з суседняй вёскі, Івана Міцева, мядзведзіца была пятнаццаць гадоў. Ён набыў яе ў цырку, таму можна было меркаваць, што з ёю будзе поўная бяспека — матка ды бабка не ведалі волі, значыць, інстынкты яна мусіць мець прытупленыя. Але аднойчы Іван яе добра не прывязаў, яна сарвалася, забіла трох курэй і іх з'ела. Як яна гэта зрабіла — не ведаю. Па Вэле часам куры ледзь не скокалі, а яна да такога не дадумалася. Ну але здарылася тое,

што здарылася. У мядзведзіцы прачнуўся інстынкт і яна пачала кідацца — на майго сябра, ягоную жонку, дзяцей. Хацела іх грызці. Гэта стала вялікаю праблемай. Мядзведзь, на жаль, не ведае пачуцця ўдзячнасці і не ўзгадае, як цягам пятнаццаці год ты карміў яго кукурузай ды бульбай. Калі ён здзічэе, ён будзе грызці.

Апроч усяго, мядзведніка не чакаюць у кампаніі людзей. Нас не паважаюць. У мяне доўга была такая праблема, я ніколі, ні разочку не выступаў з Вэлаю ані тут, у Др'яноўцы, ані ў суседніх вёсках. Толькі за шэсцьдзесят кіламетраў ад нас, даехаўшы да Шумен, я даставаў гуслі і пачынаў працаваць.

Таму мая жонка, калі я прывёз дадому малое мядзведзяня, цудоўна ведала, чым гэта ўсё скончыцца. Кабеты вельмі разумныя: толькі ўбачыўшы гэтае малое кудлатае нештачка, яна ўжо бачыла і людзей, што будуць смяяцца, і ночы, праведзеныя пад дажджом, і цёганне ад падворка да падворка, каб хтосьці падкінуў нам пару стоценак.

Але я таксама ведаў маю святой памяці жонку. І я ведаў, што, як толькі ператрываю ейны выбух злосці, яна будзе любіць гэтае мядзведзяня, як уласнае дзіцятка.

Я не памыліўся. Першаю ж зімою гэта яна прыспешвала мяне, каб як найхутчэй зрабіць для Вэлы навес, бо тая мерзне. А як пачынаўся дождж, жонка неслася з парасонам пад дрэва, да якога была навязаная Вэла, каб ейнае мядзведзянятка не змокла. Калі б магла, яна б трымала мядзведзіцу ў хаце, як некаторыя людзі ў гарадах трымаюць сабак.

5

Калі я прывёз сюды малую, найбольшая праблема ў мяне была з адным маёрам міліцыі — а можа, гэта ўжо была паліцыя? Не памятаю, змены адбываліся гэтак імкліва, што я за імі не паспяваў. Ён даведаўся, што я маю мядзведзянятка, прыйшоў і паведаміў: — Грамадзянін Мірчаў. Я даведаўся, што ў вас тут ёсць мядзведзь. Даю вам тэрмін 7 дзён, каб ад яго пазбавіцца.

Я спрабую яму ўсё патлумачыць, спадар маёр, але як жа, гэта ж я легальна мядзведзя набыў. У мяне ёсць пацверджанне пакупкі з парку Кармісаж. Апроч таго, калі ўжо з-за вашае перабудовы ў мяне забіраюць працу, дайце мне займацца нечым іншым!

Але маёр нават слухаць не жадаў. Тэрмін ся-мі-дзённы, кажа, і я б не хацеў, грамадзянін Мірчаў, паўтараць.

Гэта было дзіўнае стаўленне, бо тады ў нашай вёсцы было шэсць іншых мядзведзяў, у тым ліку адзін майго брата Стэфана. Чаму той маёр прычапіўся акурат да мяне? Не ведаю. Можа, яму абрыдлі мядзведзі? А можа, ён чакаў хабару? Я не цяміў. Усё было цалкам легальна, таму не было ніякай нагоды, каб яму нешта даваць. Я паехаў у Шумен да прадстаўніка міністэрства культуры і папрасіў, каб за мой кошт патэлефанавалі ў Сафію і там пацвердзілі, што я маю ўсе патрэбныя дакументы. Мядзведзя нельга было трымаць па-дзікаму. Яго мусіў агледзець ветэрынар, а міністэрства культуры мусіла пацвердзіць, што мая праграма мае высокую мастацкую вартасць. Міністэрства пацвердзіла, што ў мяне ёсць

усе паперы, у Разградзе мне выдалі дадатковы свісток, і маёр мусіў пакінуць мяне ў спакоі.

І пакінуў. Сказаў толькі, што будзе пільна сачыць за мною, разы два я яго яшчэ бачыў, а потым ён знік.

Засталося толькі дрэсаванне. Тут існуюць дзве школы.

Бываюць мэчкадары, якія выбіраюць рэзкасць. Б'юць мядзведзяў, цягаюць за пысу, даюць выспятка.

Я ніколі не быў гэткім. Па-першае, гэта супярэчыць майму характару — я належу да людзей лагодных. Па-другое, бацька заўжды паўтараў мне, што Бог усё бачыць. Ён табе даў гэтага мядзведзя, і калі ты будзеш ставіцца да яго дрэнна, то гэта будзе тое самае, што абражаць Бога. Я ў гэта веру, бо шматкроць ды са многімі мядзведнікамі гэта ўжо здаралася. Рана ці позна Бог заплаціць табе за зло.

Біты мядзведзь будзе толькі й чакаць, каб табе адпомсціць. У мяне быў сябар, які свайго мэчку біў супрацьпажарнаю рыдлёўкай. І мядзведзь, калі бачыў рыдлёўку, быў асцярожны. Але калі аднойчы сябар падышоў без рыдлёўкі, мядзведзь пагрыз яго, і пагрыз вельмі капітальна.

Іншы прыклад — гэта Іван Міцеў, той, чыя мядзведзіца навучылася есці курэй. Ён зрабіў найгоршую рэч, якую можна зрабіць. Запанікаваў. Папрасіў паляўнічага яму дапамагчы. Выпусцілі мядзведзя ў бок лесу, паляўнічы стрэліў і забіў. А праз некалькі месяцаў самога Івана ўжо не было сярод жывых. Сэрца. Кажу табе: Бог бачыць, што ты робіш са сваім мядзведзем, і рана ці позна табе за гэта заплаціць.

Я б ніколі мядзведзя не ўдарыў. А Вэлу? Божа, як толькі ўяўлю сабе, мае вочы напаўняюцца слязьмі. Я б хутчэй сам сябе мучыў, чым яе.

Як у такім выпадку я з ёю займаўся? Што ж, я адвёз яе падалей ад вёскі, узяў гадулку, то-бок гуслі, крыху цукерак, пачаў граць. І спрабаваў неяк яе ўгаварыць, каб яна стала на заднія лапы. Калі ставала — атрымлівала цукерку.

Яна скеміла вельмі хутка. І толькі пасля гэтага, калі ўжо вясна прыйшла, я пачаў навучаць яе больш складаным рэчам. Казаў, напрыклад: — Пакажы нам, Вэла, як маладая цалуе руку свёкра. І яна вельмі хораша цалавала мужчын у рукі, за што падчас нашых паездак па краіне мы вельмі шчодра атрымлівалі на гарбату.

У нас была такая вядомая гімнастка Марыя Гігова, яна была вельмі папулярная, нават пасля заканчэння кар'еры. Часам я затрымліваўся з Вэлаю дзе-небудзь пасярэдзіне горада і казаў: — Пакажы нам, Вэла, як Гігова здабывала медалі. І Вэла падскоквала, прыгожа складаючы лапы, а ў канцы выконвала паклон. Людзі смяяліся, пляскалі, фатаграфавалі, а мы зараблялі грошыкі.

Быў таксама такі Янко Русаў, штангіст з Шумен, алімпійскі чэмпіён ды пяціразовы чэмпіён свету. Я казаў: — Пакажы нам, любая, як Русаў падымаў цяжар. І яна прысядала, складала лапы, як штангіст, які падымае штангу, і цяжка сапла.

А калі наш выбітны футбаліст Хрыста Стаічкаў пачаў гуляць у Барселоне, я казаў: — Вэла, пакажы, як Стаічкаў

сімулюе фол. А Вэла клалася на зямлю, хапалася за нагу і пачынала страшэнна хрыпець.

Былі мядзведнікі, якія выкарыстоўвалі палітычныя тэмы. Штосьці пра Жыўкава, нешта пра ягоных людзей, нешта пра чарговыя ўлады. Пасля падзення Жыўкава ўзніклі сотні жартаў на ягоную тэму.

Я гэтага ніколі не любіў. Па-першае, з уладаў лепш не кпіць, бо я памятаў майго маёра, які толькі й чакаў, каб з мяне вантробы павыцягваць. Ці доўга працягнуць новыя ўлады, ніхто не ведаў, а маёр падаваўся вечным.

Па-другое, я ўсё жыццё ёсць і быў перакананым камуністам. Да вайны цыган быў ніхто. За тое, што пасля вайны мы атрымалі ўсе правы, працу, кватэры, што людзі навучыліся чытаць і пісаць, што балгары пачалі хоць трохі з намі лічыцца, за гэта мусім быць удзячныя толькі і выключна камуністам.

У балгараў падчас камунізму таксама справы спорыліся. У дзень святога Грыгорыя ў нас традыцыйна забіваюць ягня. Амаль кожны ў вёсцы меў грошы, каб набыць яго і з'есці ў гэты асаблівы дзень. Сёння ж на ўсю вёску забіваюць толькі некалькі ягнятаў. А ў калгасе, які раней браў на працу некалькі дзясяткаў чалавек, сёння працуюць тры. І раз ім плацяць, а іншы не плацяць. Калі я чую, якія гэта былі злачынныя часы падчас камунізму, адчуваю сябе нядобра, бо людзі ўсё памятаюць зусім інакш.

Для мяне камунізм быў цудоўным часам. Я ажно шкадую, што тады не меў мядзведзя. Людзі тады мелі лепшы настрой, былі шчаслівыя. А сёння? Расчараванне. Кожны гоніцца за ўласным хвастом.

Зірні, той хлопец, што стаіць пад домам, гэта мой унук Іван. Найбольш здольны з маіх хлопцаў. Ён якраз здаў іспыты ў школе, у яго адзнакі добрыя, таму хацелася б, каб ён пайшоў далей.

Каб меў дзед мядзведзя, сеў бы ў машыну або аўтобус і, пакуль жывы, зрабіў бы кола ад Варны да Бургасу ды зарабіў яму на ўніверсітэт. І мо праз некалькі гадоў быў бы ў нашай сям'і інжынер. І такое здаралася сярод мядзведнікаў.

Але ў мяне няма мядзведзя. Няма пра што гаварыць, хлопец здаў іспыты і замест таго, каб ісці далей вучыцца, будзе вымушаны ісці шукаць працу.

Дык вось я з камуністаў ніколі не смяяўся. Затое адзін мой прыяцель калісьці жартаваў з цара Сімяона, які быў нашым прэм'ерам і, калі пераймаў урад, абяцаў цягам ста дзён палепшыць жыццё ўсіх балгараў. І той мой сябар браў свайго мядзведзя і казаў: пакажы нам, мой дарагі, як цар Сімяон палепшыў жыццё балгараў. А мядзведзь клаўся на зямлю, накрываў лоб лапамі і страшэнна рычаў.

Гэта быў цудоўны нумар, які вельмі добра паказвае, як змянілася жыццё ў Балгарыі пасля падзення камунізму.

6

Апроч нумароў людзі хацелі, каб мядзведзь іх масаваў ды лячыў. Калі нехта быў сапраўды хворы і лекары ўжо не маглі яму дапамагчы, прыходзілі да мядзведніка. Мядзведзь клаўся на такога чалавека, і людзі верылі, што хвароба пераходзіць на звера. А паколькі ён вялікі і моцны, то не здохне, пераможа хваробу. І скажу табе, што

нешта ў гэтым ёсць, бо, калі я хадзіў па кірмашах, штогод заходзіў у адныя і тыя ж вёскі. Дагэтуль памятаю даты ўсіх кірмашоў у нашым раёне: Русакастра — 6 траўня. Каменава — 24 траўня. Баяджык — 2 чэрвеня. І гэтак далей.

На тых кірмашах я шмат разоў бачыў людзей, якія яшчэ год таму выглядалі так, быццам меліся памерці, а пасля таго, як Вэла на іх клалася, — здаравелі. Прыходзілі, дзякавалі, прыносілі ёй слодычы. Часта я чуў: — Гэта ваш мядзведзь выратаваў мне жыццё.

Масаж — гэта ўжо іншая гісторыя. Гэтак, як мядзведзь, нішто не ратуе ад боляў хрыбетніка. Чалавек лягае на жывот, а мядзведзь кладзе на яго лапы і перасоўвае зверху ўніз. Жонка старасты, якая прывезла цябе да мяне, мусіць памятаць, як калісьці я прыехаў з Вэлаю масаваць ейнага бацьку. Яна тады была малою дзяўчынкай і страшэнна плакала, баялася, што зробім тату нешта кепскае. Мы мусілі зрабіць выгляд, што я выходжу, мама яе забрала ў іншы пакой, і толькі тады мы змаглі зрабіць масаж. Які дапамог. Лекаванне было адзінаю рэччу, якую я згодны быў выконваць у сваёй вёсцы. Выступаць я не пагаджаўся, саромеўся. Але ў лекаванні адмаўляць нельга.

Затое калі хварэла Вэла, я лячыў яе сам. Я цудоўна разумеў, што ёй баліць. Я бачыў, калі яна пачуваецца дрэнна. Я лепш разумеў яе, чым многіх людзей. Дастаткова было паглядзець на яе, і я ўжо ведаў, што яна хоча мне сказаць.

Калі ёй балеў зуб, яна паказвала лапаю на пысу, а я тады мачыў вату ў ракіі і ёй прыкладаў. Бо я не выбіваў ёй зубоў. Іншыя мядзведнікі смяяліся, што яна мяне

пагрызе і за сваё дзівацтва я атрымаю. Можа, і сапраўды я быў дурны. Хаця неяк адзін п'яны студэнт спрабаваў прыпячы яе цыгарэтай. Вэла схапіла ягоную руку ў зубы, але не сціснула. Таму, можа, гэтае маё выхаванне мела сэнс? Калі б яна сціснула, нас бы не было. Яе б усыпілі, мяне б пасадзілі, а студэнт хадзіў бы сёння па свеце без рукі.

Карміў я яе сумленна, бо галоднаю яна не хацела працаваць. За дзень яна з'ядала восем боханаў хлеба. Ёсць такая балгарская прыказка: галодны мядзведзь хору не затанчыць. Хора — гэта наш нацыянальны танец. І я з прыказкай згодны. Не дасі есці — не чакай, што звер будзе дзеля цябе працаваць.

Раз на месяц мы мядзведзіцу купалі, яна гэта бязмежна любіла. Мы прыносілі балею, Вэла ў яе залазіла, і мы з жонкаю даносілі цёплую ваду. Ёй у нас не было кепска. Ты кажаш, што недзе чытаў пра мядзведнікаў, якія вучаць звяроў танчыць на распаленай пліце. Гэта казкі. Можа, так рабілі да вайны, я не ведаю. Пасля вайны такога дакладна не было. Я не дазваляў Вэле хадзіць нават па распаленым асфальце, каб ёй лапкі не балелі.

7

Гэта вялікае шчасце, што мне трапіўся мядзведзь, якога не трэба было ані біць, ані мучаць, каб ён паказваў штукі. Калі б ён гэтага не ўмеў, я б, хутчэй, яго каму-небудзь прадаў.

На шчасце, яна сама гэта любіла. Яна была па прыродзе артыстка, ёй падабалася, як людзі ёй пляскаюць,

як смяюцца, як даюць нам на гарбату. Або як наліваюць ёй піва. Гэта ёй падабалася асабліва. Я перакананы, што ў тым рэзерваце, куды яе забралі, ёй не хапае гэтых нашых выступаў.

Але здараліся ў яе і такія дні, калі яна — таксама як сапраўдная артыстка — не жадала выступаць. Я казаў: — Вэла, пакажы нам, як Гігова скача праз казла. А яна рыкае, ные, скуголіць. Нічога дзіўнага — сёння яна не ў гуморы і працаваць не будзе. І я гэта заўсёды шанаваў. Часам у такі дзень мы ставалі пад шапікам суперлато і людзі, якія збіраліся даслаць купон, гладзілі Вэлу на шчасце. А часам мы папросту рабілі сабе выходны.

Толькі аднойчы я мусіў яе пакатаваць, калі ўбіваў колца ёй у нос — холку.

Я завёз яе ў лес.

Распаліў малое вогнішча.

Разагрэў да чырвані металічны прут.

Сказаў: — Будзе балюча, малая, але так трэба. Інакш мы з табою не справімся. Ці мне зробіш крыўду, ці камусьці іншаму.

Выйсця не было. Холка — гэта стырно ад мядзведзя, без яе не атрымаецца завесці звера туды, куды хочаш, бо ён будзе вырывацца, а мядзведзь жа важыць больш за дзвесце кілаграм.

Спачатку я ўбіў ёй у нос гэты распалены прут.

Яна страшэнна вырывалася.

Раўла.

Спрабавала ад мяне ўцячы, але я трымаў яе з усяе моцы каленямі і локцем.

Нічога дзіўнага. У мядзведзяў вельмі далікатны нос. Апроч таго, не вельмі спраўна ў мяне ўсё гэта выходзіла, бо Вэла была маім першым мядзведзем. Мой брат Стэфан дакладна зрабіў бы гэта значна лепш, але не выпадала ў яго прасіць. Вельмі важна, каб холку ўбіў той мядзведнік, які будзе займацца зверам. Чаму? Бо той запомніць гэта на ўсё жыццё. Убіў у нос колца — значыць, ты ягоны гаспадар. Холка — гэта стырно ад мядзведзя, а ў цябе ёсць ключыкі ад замка.

Урэшце атрымалася прабіць дзірку ў ейным носе. Спачатку было крыху крыві, потым гной. Вэла рыкала, вырывалася, глядзела з жахам у вачах.

Я хутка засунуў у дзірку дрот і загнуў яго абцугамі. Потым каваль заціснуў мне яго так, каб ён дакладна ніколі не адчапіўся. Некалькі наступных дзён Вэла яшчэ хапалася за пысу. Але неўзабаве пра ўсё забылася і ўспрымала холку як частку ўласнага носа.

8

Незадоўга да смерці жонка прызналася мне, што лепшага жыцця, чым было ў нас з Вэлаю, яна сабе не ўяўляла. Яе моцна падкасіла, калі ў 2006 годзе ў нас адабралі мядзведзіцу. Мы абодва не елі цэлы месяц. Сумавалі як халера. Я й да сёння сумую. Мая жонка ўжо на тым свеце. Яна захварэла праз колькі месяцаў пасля таго, як Вэлу забралі ў Беліцу.

Аднойчы я прапанаваў: — Хадзем, сядзем у аўтобус, паедзем туды. Паглядзім, што ў нашай Вэлы. Ці яна пазнае нас? Ці ўжо канчаткова здзічэла, ці яшчэ будзе танчыць? Калі, убачыўшы нас, затанчыць, гэта будзе азначаць, што ўсё яшчэ нас любіць. Бо яна любіла нас гэтак жа, як мы яе. Я ў гэтым перакананы.

Але жонка толькі адмахнулася: — Мне давядзецца размаўляць з тымі бандытамі, якія ў нас яе скралі. Не хачу, — сказала яна.

Для яе сыход Вэлы быў найбольшаю трагедыяй жыцця. Яна лічыла, што мы сутыкнуліся з вялікаю несправядлівасцю. Што ў нас забралі чальца сям'і.

Зрэшты, я таксама так лічу.

II. СВАБОДА

1

Таго дня, калі доктар Амір Халіл забраў у іх мядзведзя, ніхто з сям'і Станевых не забудзе да канца жыцця.

Чэрвень 2007-га, на вуліцы Пеларгоніі ў вёсачцы Гецава на поўначы Балгарыі дрэвы лупяць па вачах сваёю зялёнасцю. Пад шэрыя неабтынкаваныя дамы-блізняты з самай раніцы пад'язджаюць машыны. Журналісты, абаронцы правоў жывёл, паліцыя, адміністрацыя, разепы, суседзі, а яшчэ й зграя дзяцей, што бегаюць паміж дарослымі, кідаюцца палкамі ў машыны, сваволяць. Усім хочацца паглядзець, чым скончыцца — як наступнага дня паведамяць медыя — варварская традыцыя мядзведжых танцаў. Праз пару хвілінаў завершыцца гісторыя з вялікай літары «Г» — і разепы пабягуць распавядаць пра гэта суседзям, а журналісты — гледачам ва ўсім свеце.

У правай палове дамоў-блізнятаў жыве Дымітр Станеў, відны мужчына з вусамі, са сваёю жонкай Марыйкай.

У левай — два ягоныя сыны з жонкамі і дзецьмі.

Кожная з гэтых трох параў мае свайго мядзведзя. Так ужо павялося, што мядзведнікі жывуць побач і адно аднаму з'яўляюцца сваякамі; утвараюць некалькі пакаленняў сем'яў, якія раздзяляюць краіну на малыя раёны, каб не пераходзіць адны адным дарогу ды не адбіраць кліентаў.

Дакладней, так было, бо сям'я Станевых — гэта апошнія мядзведнікі ў Балгарыі і апошнія ў Еўразвязе. Адсюль столькі цікаўных і столькі журналістаў. Нешта незваротна сканчаецца. Людзі любяць такія незваротныя завяршэнні.

За ўсё сваё шасцідзесяцігадовае жыццё Дымітр нічым, апроч мядзведніцтва, не займаўся. Дрэсіроўшчыкі з'язджаліся да яго з усёй Балгарыі, каб павучыцца прафесійным трукам, а часам — каб ён дапамог з набыццём новага мядзведзянятка. Ён моцная галава, хітры, пра яго кажуць, што ён дбае пераважна пра сябе, але хапае ў ім і абаяльнасці. Апроч таго — у сваёй справе ён сапраўдны майстар. Заўжды мог дапамагчы парадаю і заўжды ведаў, хто мае мядзведзя на продаж.

Гэтаксама ягоны брат, Пэнча Станеў, вусаты, з заўсёднаю прыклеенаю да кутка рота цыгарэтай, стаў легендаю. Калі дырэктар аднаго з заалагічных садоў загнуў яму занадта высокую цану за малога мядзведзіка, Пэнча сам злавіў сабе мядзведзя ў лесе. Падобныя гісторыі мядзведнікі распавядалі пра сваіх дзядоў ды прадзедаў, але каб хтосьці ў XX стагоддзі сам лавіў мядзведзя ў лесе? Такога не здаралася. Цыганы на Балканах доўгі час набывалі іх у дырэктараў заалагічных садоў

або ў паляўнічых. Пра лоўлю мядзведзяў чулі толькі з легендаў, таму Пэнча адразу здабыў павагу ўсяго асяроддзя.

Некалькі тыдняў таму Станевы ў натарыуса засведчылі на паперы, што ўрэшце, пасля сямі гадоў змаганняў, аддадуць сваіх мядзведзяў фонду «Чатыры Лапы».

— Звяры Станевых — апошнія мядзведзі, якія танчаць, у цывілізаванай частцы свету, — кажуць працаўнікі «Чатырох Лап». А кіраўнік праекта, аўстрыйскі ветэрынар доктар Амір Халіл, шырока ўсміхаецца.

Відэааператары выстаўляюць камеры ў месцах, адкуль будзе бачна найбольш. Гэта нялёгка: усё дзейства разыграецца ў вузкім праходзе паміж домам цыганоў і плотам іхнага балгарскага суседа.

«Да якога кадра падрыхтавацца?» — думаюць аператары. І выбіраюць: ці залезці на дах машыны, ці стаяць з камераю на плячы, а мо ўскараскацца на дрэва?

— Гэта была вельмі папулярная тэма, — значна пазней распавядзе мне балгарская журналістка, якая ў той дзень была ў Гецаве. — Вось цыганы, якія крадуць — або нелегальна набываюць — малых мядзведзянятаў. Убіваюць ім у нос металічнае колца, якое называецца холка. У мядзведзя нос надзвычай далікатны. Убіць яму што-небудзь у нос — як мужчыну ў пеніс усадзіць іржавы цвік. І вось яны ўсё жыццё цёгалі мядзведзяў за тыя насы, змушаючы танчыць. Гэта было вельмі сумнае відовішча. Усім было зразумела, што яны мучаць жывёл. Таму ў той дзень я адчувала гонар за людзей з «Чатырох Лап», якія раз і назаўжды вырашылі гэтую праблему.

2

Да перадачы мядзведзяў усе падрыхтаваліся дасканала.

Паліцыя падрыхтаваная, што можа быць супраціў. Сям'я Станевых заўжды намагалася жыць у згодзе з уладамі. Але ўсе ў ваколіцы ведаюць, што мядзведзі былі для іх самым важным, яны рабілі ўсё, што маглі, каб іх не аддаваць.

Адміністрацыя падрыхтаваная да поспеху. Цяжка сабе ўявіць лепшую рэкламу ўсяго рэгіёна, калі сярод журналістаў — прадстаўнікі самых сур'ёзных еўрапейскіх СМІ.

Разепы падрыхтаваныя да відовішча.

Калі хто й не падрыхтаваны, дык гэта мядзведзі, якія нервова круцяцца і не разумеюць раптоўнай мітусні.

3

Сям'я Станевых чакае ў хаце за зачыненымі дзвярыма. Там стары Дымітр. Таксама абодва ягоныя сыны, жонка ды зграя ўнукаў.

Тут жа і героі гэтага дня.

19-гадовы Міша. 17-гадовая Светла. 6-гадовая Міма. Яны сядзяць дома разам з сям'ёю, у насах — металічныя холкі, ад якіх цягнуцца жалезныя ланцугі.

Мішу з самай раніцы здымалі, фотарэпарцёры давалі яму шакалад і батонікі «Snickers». Сын Дымітра, Вэсэлін Станеў, каб паказаць, як моцна ягоная сям'я зжылася з мядзведзямі, нават пхаў яму ў пашчу нагу свайго некалькімесячнага сына. Мядзведзь ножку палізаў. Для Вэсэліна гэта быў доказ наймацнейшай прывязанасці звера да ягонай сям'і — бо

дзікі мядзведзь найперш бы зжэр немаўля, потым Вэсэліна Станева, урэшце — журналістаў разам з іхнымі камерамі. Але Міша дзікім не быў. Ён быў — і Вэсэлін гэта падкрэсліваў — чальцом сям'і Станевых. Паўнапраўным.

А дзясятай у дзверы Станевых грукае доктар Халіл, каб ператварыць жыццё мядзведзя ў мару з турыстычнай рэкламы — з сасновым лесам, купаннямі ў басейне, відам на горы Рыла.

Што дакладна кажа доктар Халіл? Пэўна, тое ж, што звычайна кажуць у такім выпадку: — Добры дзень, згодна з дамоваю мы прыехалі па вашых мядзведзяў.

Або яшчэ прасцей: — Вы ведаеце, з якой нагоды мы тут.

Больш істотна тое, што Халіл скажа журналістам у той момант, калі Станевы запускаюць мядзведзяў у загадзя падрыхтаваныя клеткі.

Ён кажа: — Спадары і спадарыні, 14 чэрвеня 2007 года ў Балгарыі скончылася традыцыя мядзведжых танцаў.

4

Было б найлепш, каб у той момант, калі Халіл прамаўляе гэтыя словы, ягоныя людзі ў фірмовых джэмперах з лагатыпам «Чатыры Лапы» па чарзе выносілі з дому Мішу, Светлу і Міму. Гэта выглядала б добра ў навінах, радыйныя карэспандэнты ў дадатак мелі б цікавыя эфекты — напрыклад, рык мядзведзя. Паколькі фонд «Чатыры Лапы» існуе на датацыі, ён мусіць дбаць пра тое, каб СМІ мелі добрыя здымкі і добрыя гукі. Фотакарэспандэнты дадалі б да гэтага некалькі фантастычных здымкаў — і справа скончылася б без праблемаў.

Але тут вось не выйшла.

Спачатку Вэсэлін Станеў, пакінуўшы доктара Халіла на ўваходзе, выйшаў на вуліцу і паведаміў журналістам, што, калі нехта хоча мець эксклюзіўныя здымкі з перадачы апошніх мядзведзяў, якія танчаць, зробленыя ў хаце іхных апошніх дрэсіроўшчыкаў, мусяць заплаціць тысячу еўра.

— Я сказаў яму, што ён з розуму выбіўся, — кажа Васіль Дымітраў з «Чатырох Лап». — Што не збіраюся гэтага перакладаць на ангельскую мову. Але ён упёрся, таму я сказаў журналістам, што мне няёмка, але гэты дурны, хцівы цыган хоча тысячу еўра за здымкі. Чаму дурны? А як інакш ты патлумачыш такія паводзіны? Але ведаеш што? Карэспандэнт аднаго з нямецкіх тэлеканалаў папросту дастаў з кішэні грошы і яму даў. Немцы ніколі не перастануць мяне здзіўляць.

Дымітраў, нямецкая здымачная група і сям'я Станевых разам з клеткамі знікаюць у неабтынкаваным доме. Наймалодшая Міма ўваходзіць у клетку без праблемаў. Малодшы з братоў Станевых кладзе ёй у куце клеткі кавалак хлеба, пазірае сувора, таму мядзведзіца нават не спрабуе працівіцца.

Але з двума астатнімі ўжо не так лёгка.

— Яны плакалі, — распавядае Марыйка, жонка Дымітра. — Я ведаю, цяжка паверыць, што мядзведзь можа плакаць, як чалавек. Але я паўжыцця правяла з мядзведзямі, ведаю, што кажу. Слёзы ліліся па іхных шчаках, як зярняты сачавіцы.

— Не ведаю, ці яны плакалі, — паціскае плячыма Васіль Дымітраў. — Ведаю, што Станевы ім толькі дапама-

галі. Гэта яны плакалі, крычалі, кідаліся — то на нас, то на мядзведзяў. Баба рвала на сабе валасы, дзед лупіў кіем і абзываў нас злодзеямі. Іхны сын жадаў нам, каб мы смажыліся ў пекле. Гэта дакладна не дзейнічала на мядзведзяў найлепшым чынам. Міма ўвайшла ў клетку. Светла таксама паслухалася — нейкім цудам. А Міша заўпарціўся. Гадзіну мы з ім змагаліся. Вэсэлін і Дымітр яго пераконвалі, клалі слодычы ў клетку, нешта яму нашэптвалі на вуха. А Міша не рэагуе, стаіць на дзвюх лапах, рыкае, сапіць.

Вэсэлін кажа: — Я магу яго туды сілаю зацягнуць за нос. Але калі абарвецца холка, я не ведаю, што будзе. Ён можа нас знішчыць. Не забывайма, што гэта дзікі звер. Калі ў ім прачнецца інстынкт — мы трупы.

Яны захацелі, каб і я, і нямецкая здымачная група выйшлі з дома. Немцаў не спатрэбілася прасіць двойчы, у іх ужо былі знятыя два мядзведзі, навошта ж рызыкаваць?

Але я баяўся, што супраціў Мішы — гэта нейкі чарговы цыганскі фокус. Я не верыў ніводнаму іхнаму слову, таму сказаў, што застаюся да канца.

Яны працівіліся, але ўрэшце далі згоду. І калі немцы выйшлі, Дымітр паклікаў свайго малога ўнука, на вока гадоў пяці. Малы ўвайшоў у пакой, сказаў нешта мядзведзю на вуха, прытуліўся да яго, пакудлаціў, пачухаў, пасля чаго сам увайшоў у клетку.

Міша, як загіпнатызаваны, увайшоў за ім.

Я аслупянеў. Зразумеў, што, калі з малым нешта здарыцца, калі Міша яго хаця б драпане, усё наша свята з дымам пойдзе.

Усе — і мядзведзі, і Станевы, і я — былі знерваваныя. Я баяўся, што хтосьці крыкне; што нешта грукне; што нехта пастукае ў дзверы, і Міша ад стрэсу зробіць штосьці неразумнае. У мядзведзя шасцісантыметровыя кіпцюры. Калі б ён іх ужыў, ад твару хлопчыка застаўся б блін. Праўда, для гэтага патрабавалася няшмат.

Ты пытаеш, чаму я наогул пагадзіўся, каб хлопчык увайшоў у тую клетку? Але ніхто ў мяне дазволу не прасіў! Я не паспеў зарыентавацца, а яны ўжо зрабілі гэта.

Апроч таго, нам залежала на тым, каб мядзведзі выехалі адсюль без засыпляльнага ўколу. Мы везлі звяроў у парк, які для ўратаваных з цыганскай няволі мядзведзяў наш фонд адчыніў у Беліцы, у гарах Пірын. Там, на месцы, мы мусілі ненадоўга засыпіць мядзведзяў, каб зрабіць ім усе аналізы, аднак часта рабіць такі ўкол нельга. Таму калі ўжо ім вядомы спосаб завесці мядзведзя ў клетку без уколу, то чаму б і не? Яны жывуць з гэтымі мядзведзямі, малы — гэта іхны сын, таму хіба яны ведаюць, што робяць, ці не так?

Мы зачынілі клетку з аднаго боку. Міша быў спакойны. Заставалася адна праблема — як дастаць адтуль хлопчыка.

Клетка, у якой мы перавозім мядзведзяў, зачыняецца з абодвух бакоў. Бацька сказаў хлопчыку, каб той паклаў галаву як мага бліжэй да таго другога выйсця. Ён меўся хуценька адчыніць клетку — а малы мусіў хуценька з яе выскачыць.

Праблема толькі ў тым, што хлопчык зусім не збіраўся з той клеткі выходзіць. Ён лашчыўся да мядзведжай

поўсці. Калмаціў Мішу, цалаваў яго ў лоб і нават чуць не жадаў, што мусіць яго пакінуць.

Нервы распаліліся. Светла і Міма пачалі паскугольваць. Вэсэлін гневаўся і лаяўся, але пад нос — каб без патрэбы не нерваваць мядзведзя. Усе чакалі, калі дзядуля Дымітр нешта зробіць. Скажа адно слова і загіпнатызуе — ці хлопчыка, ці мядзведзя. Адкашляецца. Сплюне. Зробіць што заўгодна, каб разблытаць гэты вузел.

Але дзядуля Станеў не зрабіў анічога. Ён глядзеў у вакно і, здаецца, думкамі быў недзе далёка.

5

Ніхто не мог дапусціць, што менавіта тады ўпершыню праявілася хвароба, якая ўжо неўзабаве пакладзе дзядулю ў труну.

6

Некалькі хвілінаў, здаецца, доўжацца вечнасць. Урэшце бацьку хлопчыка, Вэсэліну Станеву, удаецца дагрукацца да сына. Васіль з «Чатырох Лап» адчыніў дзверцы, хлопец выкаціўся адтуль, другое выйсце замкнулі.

Урэшце відэааператары маюць свае здымкі, а журналісты свае высновы — апошнія замучаныя мядзведзі Еўропы выходзяць на волю.

— Ідуць на свабоду ў клетках, — пракаментаваў нехта, але гэтая лагодная іронія не сапсуе атмасферы ўзнёсласці і поспеху.

7

Атмасферу спрабавалі яшчэ папсаваць Станевы. Малая Вэсэліна, сёння шаснаццацігадовая дзяўчына, памятае, як ейны бацька крычаў на доктара Халіла. Калі разгубленыя мядзведзі — разгубленыя, бо яны ж не ведалі, што доктар завязе іх у краіну з мядзведжых сноў, з соснамі, басейнам і свабодаю, — рычалі і спрабавалі вырвацца з клетак, Вэсэлін Станеў крычаў:

— Ну і хто тут мучае жывёлаў? Ну хто?

А потым дадаваў: — У нас яны ніколі не сядзелі ў клетцы. Ніводзін з іх. Ніводнай хвіліны. Яны з намі жылі, елі тое ж самае, што і мы.

— Але ж вы іх білі, — вырвалася ў кагосьці з журналістаў.

— Дзеці таксама часам атрымліваюць па срацы. Дык мо яшчэ й дзяцей у мяне пазабірайце! — раз'юшваўся Станеў. — Рукі даю на адцін — яны жылі не горш за нас.

Выказванні цыгана журналісты пазней выкарысталі выключна дзеля забаўнага эфекту — мучыў звяроў, а зараз галосіць. Журналісты маюць тэндэнцыю апісваць новае жыццё мядзведзяў выключна каляровымі ці хаця б злёгку каляровымі фарбамі, а старое — як шэраг нескончальных пакут. «Вязні ўрэшце на волі»; «Скончыліся мукі балгарскіх мядзведзяў» — пісалі на наступны дзень мясцовыя газеты.

Пачуўшы, што мядзведзі елі тое самае, што й сям'я Станевых, доктар Халіл можа толькі скрывіцца. Ягоныя людзі з ахвотаю тлумачаць усім зацікаўленым, наколькі

дрэнна, што мядзведзі елі тое самае. Што дыета мядзведзяў мусіць быць разнастайнаю, бо ў прыродзе яны амаль усяедныя: ядуць і садавіну, і агародніну, і арэхі, а не так, як сям'я Станевых, — хлеб, бульбу з засмажкаю, чыпсы і слодычы. Таму ад дурнаты людзей, што называюць сябе мядзведнікамі, людзі з «Чатырох Лап» могуць толькі заплакаць.

Дзверы хуткай, адмыслова прыстасаванай пад перавоз мядзведзяў, зачыняюцца. Кіроўца заводзіць рухавік і ўключае кандыцыянер — ён настроены на ідэальную для мядзведзяў тэмпературу. Уключаецца крыху прыглушанае святло — паводле звярыных псіхолагаў, гэткае іх супакойвае.

Грошы на хуткую далі заходнія дабрачынцы, у якіх душа трымціць ад жадання дапамагчы балгарскім мядзведзям.

Яшчэ восем гадзін дарогі да горнага хрыбта Рыла — і мары мядзведзяў, пра якія яны пакуль не здагадваюцца, стануць рэальнасцю.

8

У беліцкі парк мядзведзяў-танцораў трэба ехаць па маляўнічай дарозе. Яна прыгожа лунае, абгінаючы горы, але час ды вада, якая сплывае з гор, здзерлі з яе амаль увесь асфальт.

Калі дагэтуль Міша, Светла і Міма досыць нядрэнна трывалі доўгае падарожжа з Гецава, апошнія дванаццаць кіламетраў у іх могуць выклікаць ваніты. Хуткая штохвілінна падскоквае на калдобінах, а кіроўца пад нос праклінае

мясцовыя ўлады, якія цягам доўгіх гадоў не могуць дамовіцца з абласнымі пра рамонт дарогі.

Найперш мядзведзі трапляюць да ветэрынара, які пад наркозам робіць ім асноўныя даследаванні: кроў, ціск, стан зубоў, вочы, органы рэпрадукцыі.

Праблемы са скурай і зубамі ёсць у ва ўсіх. — Па-першае, у сваіх гаспадароў яны елі зашмат слодычаў, — кажа Дымітар Іваноў, дырэктар парку ў Беліцы. — Па-другое, цыганы часта выбівалі зубы малым мядзведзям. Тады яны маглі быць упэўненыя, што звер іх не ўкусіць. Тое, што, дзякуючы ім, ён не зможа пражаваць ежу і потым пачне хварэць, іх не хвалявала. Усе нашыя мядзведзі маюць праблемы з зубамі. Раз на год да нас прыязджае стаматолаг з Нямеччыны, каб ім дапамагчы.

Найгоршыя вынікі даследаванняў былі ў Мішы. — Мы да гэтага былі падрыхтаваныя, — кажа дырэктар Іваноў. — У яго амаль зусім не было поўсці, а калі ў мядзведзя выпадае поўсць, гэта сведчыць пра сапраўды сур'ёзныя праблемы са здароўем. Апроч таго, у яго быў высокі ціск і сур'ёзная інфекцыя зроку. Давялося запрасіць акуліста з Сафіі, каб ратаваў ягоныя вочы. Атрымалася. Сёння Міша добра бачыць.

Іншая праблема, якую нам выпала вырашаць, — гэта залежнасць ад слодычаў. І алкагалізм. Вы ведаеце, што цыганы адмыслова іх спойвалі, каб дакладна ведаць, што яны не збунтуюцца? Яны рабілі гэта цягам стагоддзяў. Залежны ад алкаголю не мае сілаў на бунт.

Нам давялося шмат папрацаваць з тымі мядзведзямі, якія цягам дваццаці гадоў пілі штодня. Калі б мы ў адно

імгненне перасталі даваць ім алкаголь, яны б здохлі. Трэба было рабіць гэта паступова. Сёння, кажу я з гонарам, усе нашыя мядзведзі — абстыненты.

9

Абудзіўшыся пасля наркозу, некалькі дзён мядзведзі праводзяць у малой пячоры, выкапанай для іх працаўнікамі парку. Дымітар Іваноў: — Яны мусяць асвоіцца ў новым месцы, між новых пахаў, прызвычаіцца да новай ежы. Мы даем ім на гэта некалькі дзён, а потым іх выпускаем.

На свабоду.

Свабода для мядзведзя — гэта такі шок, што нельга яго проста з клеткі выпусціць у лес. Трэба даць яму некалькі дзён, каб пераключыцца.

Свабода — гэта новыя выклікі.

Новыя гукі.

Новыя пахі.

Новая ежа.

Свабода для іх — гэта адна вялікая прыгода.

— Калі мы ўрэшце выпускаем іх у лес, яны не ведаюць, што рабіць, ажно п'янеюць ад гэтай свабоды, — дадае адзін з супрацоўнікаў парку.

— Яны хочуць паўсюль пайсці, усё даследаваць, усё спраўдзіць. Не здзіўляюся. Калі нехта дваццаць гадоў хадзіў выключна на ланцугу, гэта нармальная рэакцыя.

III. ГАНДЛЯВАННІ

1

Васілу трохі за сорак, у яго чорныя валасы, якія спадаюць на твар, і абаянне хлопца з малога мястэчка, які навучыўся размаўляць з людзьмі з вялікіх гарадоў. Ён працуе ў парку мядзведзяў-танцораў у Беліцы. Тут ён нарадзіўся, тут скончыў школу, тут распачынаў кар'еру дыджэя, якая завяла яго ў музычныя клубы Сафіі, Залатых Пяскоў ды Бургаса. І ўрэшце тут некалькі год таму пастанавіў змяніць сваё жыццё і падаў CV у адміністрацыю парку.

— На сумоўі тагачасны дырэктар запытаўся ў мяне: чаму ты хочаш змяніць працу дыджэя на працу з намі? Я з каменным тварам адказаў, што мядзведзям, якія танчаць, дыджэй будзе нялішні, — распавядае Васіл. — Яны смяяліся. Але, убачыўшы ў дакументах, што я скончыў ветэрынарны, адразу далі мне гэтую працу. Дыджэйства мне крыху надакучыла. Хацелася пасталець.

Шэсць гадоў Васіл адказваў за вываз мядзведзяў ад іхных гаспадароў. Ён забраў іх больш за дваццаць. Амаль

усіх, у тым ліку апошніх, то-бок Светлу, Мішу ды Міму. Толькі першыя два мядзведзі трапілі ў Беліцу без ягонай дапамогі.

— У гэтай працы найважнейшаю з'яўляецца першая размова, — кажа ён і глядзіць мне ў вочы, як быццам хоча ўпэўніцца, што я яго разумею. Відаць, такія гандляванні — справа далікатная ды складаная, і не ўсе разумеюць яе з першага разу. На шчасце, Васіл тлумачыць усё сам: — Нельга прыехаць да цыгана, стаць пад дзвярыма, пагрукаць і сказаць: «Добры дзень, я тут прывёз клетку і забіраю твайго мядзведзя». Гаспадара можа не аказацца дома, а нават калі акажацца, ён будзе абараняцца. Зачыніць браму. Цыганкі пачнуць крычаць. Збягуцца суседзі з усёй ваколіцы.

Аддаванне мядзведзя трэба падрыхтаваць нашмат раней. Гэта толькі прэса і донары бачаць усё як спантаннае дзейства. Мы селі ў машыну — пад'ехалі — нам аддалі звяроў. У рэальнасці пра такія рэчы дамаўляешся месяцамі. Трэба сесці за стол, адзін раз, другі, трэці. Пасябраваць, пранікнуцца пэўным даверам.

Без узаемнага даверу ніхто мядзведзя не аддасць. Хутчэй ужо заб'е яго. А здаралася й такое. Адзін цыган пад Русэ не спраўляўся са сваім мядзведзем, таму забіў яго. Ён мог аддаць яго нам, але баяўся — што штраф, што ўчастковы, што арышт. Яны паўтаралі адно аднаму плёткі пра тое, што мы можам нават дом у іх забраць, калі не аддадуць мядзведзя. Гэта глупства, мы б ніколі такога не зрабілі. Але яны дастаткова прымітыўныя, каб у такія гісторыі верыць.

Таму мусяць нас ведаць і любіць. І думаць, што мы на іхным баку.

Мы з Васілам стаім на тэрасе парку мядзведзяў, якія танчаць. Перад намі горны хрыбет Пірын з вышэйшаю за 2900 метраў вяршыняй Віхрэн, справа — горы Рыла, у іх размясціўся манастыр, унесены ў спіс каштоўнасцей UNESCO.

Пад намі — дванаццаць гектараў, якія аўстрыйскі фонд «Чатыры Лапы» пераўтварыў у мядзведжы рай. Звяры, якіх забралі ў цыганоў, тут плаваюць у басейне, маюць мноства цацак і тры паўнавартасныя прыёмы ежы на дзень.

Сама тэраса нагадвае карабель, карма якога ўразаецца ў лес колеру хакі. Зеляніна, перарэзаная сіняватымі нітачкамі ды брунатнымі плямамі.

Плямы — гэта адабраныя ў цыганскіх гаспадароў мядзведзі.

Сіняватыя нітачкі — гэта калючы дрот пад токам. Свабода таксама мае свае межы.

2

Каб патрапіць сюды, трэба з гарналыжнага курорта Баньска паехаць у бок вядомага сваімі мінеральнымі водамі горада Вэлінград.

Далей праязджаеш пад віядукам вузкакалейкі, якая ў іншай краіне была б вялікаю турыстычнаю адметнасцю, а тут яна проста возіць людзей па маляўнічай дарозе, праз горы, паміж гарадамі Дабрыніштэ і Сэптэмвры.

Адразу перад віядукам — знак з вялікім брунатным мядзведзем і подпісам: Парк за танцуващи мечки — Парк мядзведзяў, якія танчаць — 17 кіламетраў.

Трэба праехаць пад гэтым віядукам, потым мінуць малую, замкнёную на чатыры абароты царкоўку, потым — поле кукурузы.

Першыя чатыры кіламетры дарогі — асфальтоўка да Беліцы. Над гэтым невялікім мястэчкам узвышаюцца дзве вежы: вежа размешчанай на гары царквы і мінарэт невялікай мячэці, які стаіць на беразе ракі Белішка. Мусульмане складаюць траціну насельніцтва мястэчка. — Большасць з іх гаворыць выключна па-балгарску ды не адмовіцца ад шкляначкі ракіі, але бываюць і артадаксальныя, — тлумачыць Васіл.

Пра тое, што мы ў цэнтры мястэчка, сведчыць «Hotel Belica», яго рамантуюць ужо тры гады. — І будуць яшчэ наступных пяць рамантаваць, — кажуць мне мінакі. — Чаму? Бо гэта дзяржаўны гатэль. Нікому справы няма.

Затое ззаду, за гатэлем, збіраецца чарга тых, хто хоча атрымаць ад сацыяльных службаў хлеб і пачак макароны. Гэта доўгая чарга; трэба або прыйсці значна раней, або стаяць амаль гадзіну. Стаяць у ёй пераважна беліцкія цыганы, але часам трапляюцца і балгары. Я пытаюся ў Васіла пра гэтую чаргу.

Але Васіл толькі паціскае плячыма. Вядома, не ўсім у Балгарыі шанцавала пасля падзення камунізму. Пра што тут гаварыць?

Вяртаемся да размовы пра мядзведзяў.

3

— На першую сустрэчу цыгана трэба запрасіць у рэстарацыю, — кажа Васіл. — Не самую дарагую, каб занадта не разбудзіла ягоную фантазію, бо будзе падымаць цану да межаў магчымага, але і не самую танную, каб цыган не абразіўся. Яны — і гэтага ў іх не адбярэш — вельмі адчувальныя ў пытанні гонару. На гэта катэгарычна нельга забывацца, інакш потым яны будуць адмыслова рабіць усё табе назло: ты яму назавеш добрую цану, напрыклад, пяць тысяч леваў за мядзведзя, а ён скажа, што хоча мільён. Калі цыган упрэцца, справа і за год не зрушыць з месца. Будзеш вымушаны праводзіць вялікую кампанію: пераконваць старастаў, цыганскіх старэйшын ды іхных сваякоў, каб яны цябе падтрымалі, інакш з абражаным цыганом справы не зробіш.

Лепш адразу добра пачаць.

Калі цыган ужо ў рэстарацыі, трэба замовіць нейкія стравы і добра наліць ракіі. Запытаць, якую ён любіць, сядзець з ім і піць. Няважна, што ты можаш не любіць цыганоў — хто ж іх, урэшце, любіць? Што? Ты любіш? У цябе ёсць між іх сябры? Што ж, можа, у вас у Польшчы іншыя цыганы. У кожным выпадку, ты мусіш увесь час памятаць, што ты тут не дзеля сябе, што твая мэта — мядзведзь. Так нас вучылі на занятках у Аўстрыі. Для нас нават распісалі такую схему:

Мэта — мядзведзь.

Місія — вызваленне мядзведзя.

Мядзведзь, мядзведзя, мядзведзю, з мядзведзем, аб мядзведзі.

Калі памятаеш, дзеля чаго ты тут, прасцей гэта вынесці. Мядзведзь — гэта, мушу табе сказаць, цудоўны звер. Разумны, высакародны, каралеўскі. Прырода ў сваёй самай дасканалай праяве.

Таму мусіш напаіць цыгана, што дастаткова складана, бо п'еш з ім разам. Калі нап'ецца ён, ты таксама нап'ешся. Гэта праблема, але, з іншага боку, ты ў больш выйгрышнай пазіцыі. У цябе ёсць фантазія; ты ведаеш, чым скончыцца ўся гэтая сітуацыя. Ведаеш, як будзе выглядаць наш прыгожы парк у Беліцы, і ўжо ўяўляеш сабе гэтых бедных мядзведзяў на волі. Адным словам, умееш трымаць эмоцыі на павадку. Не паддаешся ні на якія п'яныя сентыментальныя абдыманкі з цыганом, а калі ўжо такое здарылася, то не больш, чым таго вымагае сітуацыя. І ўвесь час кантралюеш размову.

Калі цыган спрабуе гаварыць пра сям'ю, дзяцей, урад, кошты паліва, ты ветліва слухаеш, але неўзабаве падліваеш ракіі і кажаш: — Дык калі мы можам прыехаць па мядзведзя?

Як мы кажам у Балгарыі — кропля па кроплі збіраецца возера.

Таму трэба штохвіліны даліваць ракіі. І яшчэ трэба памятаць пра падарункі. Цыганы надзвычай любяць падарункі. Няважна, што гэта будзе. Можа быць падвесак, цішотка, кепка, запальнічка. Што заўгодна. Важна, каб гэта было хораша запакавана: у вялікі пакет, шалёсткі, з якімі-небудзь малюнкамі. П'яце, і ты раптам кажаш: у мяне для цябе невялічкі сувенір. І выцягваеш, пакет шалясціць, колеры пераліваюцца. Цыган будзе цешыцца,

як дзіця, што б там ні было. Яны не ўмеюць вызначыць вартасці прадметаў. Калі нешта ззяе ды шамаціць, цыган будзе шчаслівы.

І яшчэ адна рэч, ключавая.

У пэўны момант ты мусіш сказаць нешта накшталт:

— Насамрэч я не павінен табе гэтага даваць, але...

Або: — Мой шэф не мусіць пра гэта даведацца, але...

І тады ты прыносіш нешта з машыны або дастаеш з курткі. Гэта зноўку можа быць кепачка, падвеска або цішотка. Але цыган з гэтага імгнення перакананы, што ты на ягоным баку. Калі разам робіце нейкую справу, калі ўжо падманваеш уласнага шэфа, каб нешта яму даць, — значыць, ты сапраўдны сябар.

4

Я правёў некалькі дзясяткаў такіх размоваў з цыганамі. Я атрымаў больш за дваццаць мядзведзяў; амаль усіх, якія жывуць у нашым парку. Кіраўніцтва мне цалкам давярае. Калі я выгандляваў мядзведзя за дзесяць тысяч леваў, значыць, столькі трэба заплаціць. За дваццаць тысяч — значыць, танней не атрымалася.

Але часам атрымлівалася выгандляваць і за дзве тысячы. І яшчэ мужчына, які столькі ўзяў, сам прывёз нам таго мядзведзя на ўласным аўто.

Што самае істотнае? Цыган мусіць табе давяраць. Ён павінен быць перакананы, што хутчэй уласная сям'я яго выдасць, чым ты.

Я мушу пахваліцца, што — невядома з якой нагоды — усе, абсалютна ўсе цыганы мне верылі. Я ім казаў так: — Слу-

хай, я да цябе прыходжу як сябар. Зраблю так, каб ты атрымаў грошы з Нямеччыны. Атрымаеш добрыя грошы, могуць заплаціць і тры тысячы леваў. А калі не дамовішся са мною, прыедзе паліцыя і канфіскуе твайго мядзведзя. І не атрымаеш увогуле нічога.

Тады цыган заўжды казаў: — Што?! Тры тысячы леваў за майго Мішу, за маю Вэлу, за маю Ізаўру? — бо яны яшчэ часта называлі мядзведзіц Ізаўрамі ў гонар такой рабыні з бразільскага тэлесерыяла. — Ты, відаць, жартуеш? — тут цыган пачынаў свой маленькі тэатр і распавядаў, які той Міша малады і якія ведае трукі, якая Вэла спрытная і як турысты яе любяць, якая Ізаўра рахманая і як яна п'е піва. І спрабаваў сваім дурным цыганскім метадам выцягнуць з цябе як мага больш бабак. Казаў, што тры тысячы леваў — гэта жарт. Што ён — і так нам сказаў першы цыган, з якім мы размаўлялі, — хоча мільён нямецкіх марак.

І ты мусіш з гэтага мільёна апусціць яго на зямлю і заплаціць, скажам, дзесяць тысяч.

Некаторыя будуць трымаць мядзведзя да канца. Насуперак логіцы, бо свет жа вельмі змяніўся, і ў XXI стагоддзі, дзе мы размаўляем пры дапамозе айфонаў і лётаем у космас, няма месца для мядзведзяў, якія танчаць.

Але некаторыя папросту прызвычаіліся да такой працы. Так у іх арганізаванае жыццё, і я нават не здзіўляюся, што ім складана цяпер нешта мяняць.

Такому кажаш: — Аддай мядзведзя. Інакш у цябе будуць праблемы.

А ён адказвае, што аддасць, ды здаецца табе ўжо апрацаваным. Толькі пасля таго, як вы разыдзецеся, ён

пагаворыць са сваімі сябрукамі-цыганамі і зменіць меркаванне, схаваецца ў стрыечнага брата, а мядзведзя табе не аддасць.

Ты яму кажаш: — Наша краіна — чалец Еўразвяза. Турысты ва ўсім свеце пратэстуюць супраць такіх, як ты. Мусіш аддаць мядзведзя.

(Гэта праўда, што ёсць пратэсты, іх ініцыяваў наш аддзел, адказны за public relations.)

Ён кажа, што аддасць. А на другі дзень — што ўсё ж не аддасць, што на злосць Еўразвязу завядзе сабе яшчэ аднаго.

І дадае — і ў маім разуменні, гэта самае нахабнае, — што ён лепш ведае, што для мядзведзя лепш. Што кукуруза і хлеб лепшыя за нашыя арэхі ды яблыкі. Што цыганскі ланцуг для мядзведзя лепшы за нашыя дванаццаць гектараў.

А найбольш мяне раздражняе, калі ён кажа, што любіць гэтага мядзведзя. Што мы хочам забраць у яго чальца сям'і.

Чалавеча, думаю я, ты мучыш гэтага звера. Прыніжаеш яго. Прымушаеш паводзіць насуперак ягонай прыродзе. З дзікага, гордага звера робіш смеху вартага. Дурня з яго робіш!

Але што такі дурны цыган зразумее, нават калі я скажу яму пра гэта ўсё?

Цягам доўгіх гадоў яны чулі, што мядзведзяў трэба будзе аддаваць, і прызвычаіліся да гэтага. Яны думалі, што зноў усё скончыцца словамі. Не разумелі, што мы не здамося. Што мы падрыхтуем рэзерват. Што нас падтрымліваюць важныя людзі — палітыкі, акторы, журналісты.

І яны, сядаючы з намі за стол з ежаю, ракіяй ды падарункамі, ужо прайгралі, бо ўсе на нашым баку, а яны застаюцца толькі дурнымі цыганамі, што захоўваюць традыцыі свету, якога больш няма.

5

Яшчэ адна істотная дэталь. Мы вельмі хацелі ім давесці, што грошы, якія яны атрымліваюць, — гэта не грошы за мядзведзя. Яны часта прадавалі мядзведзяў адно аднаму і напачатку нас таксама ўспрымалі як новага кліента на рынку.

Адзін такі кажа: — Майму мядзведзю толькі пяць гадоў. Мне ты мусіш заплаціць больш, чым майму суседу, бо ягонаму мядзведзю ўжо больш за трыццаць год, і той хутка здохне. Спрабавалі нас падманваць: калі старому мядзведзю нальеш алкаголю, ён пачынае свавольнічаць, як малады. Таму перад сустрэчаю з намі спойвалі ім пляшку ракіі і пераконвалі нас, што гэта малады звер, за якога трэба дадаткова заплаціць. Або фарбавалі ім футра шампунем з колерам.

Але мы ад пачатку падкрэслівалі, і гэтак напісана ў кожным кантракце: не плацім за мядзведзя.

Ты атрымліваеш грошы, бо ты бедны, і мы хочам цябе падтрымаць. У цябе складаная сітуацыя. Тваё месца працы толькі што ліквідавалі. У цябе не будзе за што жыць, табе спатрэбіцца навучыцца нечаму новаму. Мо пляценню кошыкаў, мо будаванню дамоў, мо вырабу ікебанаў. А можа, ты адчыніш прадуктовую краму ці пункт прыёму шклатары — гэта твая справа.

Мы ж, з гледзішча тваёй складанай сітуацыі, хочам цябе падтрымаць наступнаю сумай.

Мы не мусілі гэтага рабіць, бо ў Балгарыі навучанне мядзведзяў танцам ужо забароненае, мы маглі прыехаць з паліцыяй і пазабіраць звяроў. Але на наступны дзень мы б судзіліся з арганізацыяй, што бароніць правы цыганоў. Вось гэта быў бы цырк — абаронцы правоў жывёл судзяцца з абаронцамі правоў ромаў. Лепш ужо заплаціць.

Да самага канца яны спрабавалі гандлявацца. І нічога дзіўнага, што спрабавалі. Гэта цыганы, гэта іхная прырода. Але ўрэшце да іх даходзіла, што мы не прагнемся, што нам сапраўды істотны сам мядзведзь, а не ягоны ўзрост ці колер поўсці. Яны заўважалі, што мы належым да крыху іншага свету, чым яны. Са свету, які не трактуе мядзведзяў як тавар, са свету, які шануе кожнае стварэнне і хоча, каб кожнае стварэнне было свабоднае і шчаслівае.

Тады яны супакойваліся.

Трэба было яшчэ раз ці два сустрэцца за вячэраю ды ракіяй. Яшчэ крыху пагандлявацца. Яшчэ раз патлумачыць, што або ён зараз аддасць мядзведзя, або праз месяц прыедзе паліцыя — і ён не атрымае ані стоценкі. Але сітуацыя паволі набліжалася да завяршэння.

6

Пасля апошняй вячэры мы дамаўляліся на падпісанне кантракта з натарыусам. Але, калі ты лічыш, што на гэтым розныя хітрыкі ды выбрыкі скончаліся, ты памыляешся.

Першы цыган, які з намі дамовіўся, меў двух мядзведзяў. Ягоная сям'я з чатырох пакаленняў жыла з гэтага; гэта тыя ж самыя, што напачатку хацелі мільён марак.

Нам удалося выгандляваць добрую цану — дваццаць з нечым тысяч леваў. Мы былі вельмі задаволеныя, бо гэта вядомы мядзведнік, і нам здавалася, што, калі мы дамовімся з ім, з іншымі пойдзе хутчэй. Я шмат разоў яму паўтарыў: не кажы іншым, колькі мы табе даем. Толькі табе плацім так шмат, бо ты паважаны, і нам істотны твой удзел. А цыган ківаў галавой, піў з намі, і нам здавалася, што ўсё пад кантролем. Ён аддаў нам мядзведзяў, нават усміхнуўся.

Мы завезлі звяроў у наш парк, заняліся імі, пачынаем размовы з іншымі цыганамі, а тут... поўная блакада. Ніхто не жадае размаўляць. А калі ўжо хто й гаворыць, то прапаноўвае цэны кшталту мільёна марак.

Мы былі перакананыя, што той мільён з'явіўся не проста так. Што гэта стары ім нагаварыў такой лухты. Гэта нас неверагодна раз'юшыла, хаця мы і былі падрыхтаваныя да такога сцэнарыя.

Прайшло некалькі месяцаў і нам, у Беліцу, патэлефанавалі ды распавялі, што стары цяпер каля мора, недалёка ад Варны — увага! — з мядзведзямі. І што гэта тыя самыя мядзведзі, з якімі ён быў год таму.

Мы тут жа паехалі туды. Цыган сустрэў нас вельмі добразычліва, ён рабіў выгляд, нібыта вельмі здзівіўся, што штосьці не так.

— Ты ж аддаў нам мядзведзяў. Атрымаў грошы за гэта, — кажу яму я.

— Ну так... Вы хацелі двух мядзведзяў. І атрымалі двух мядзведзяў. У чым жа тады справа? — ён корчыў з сябе дурня.

Аказалася, што стары перакупіў мядзведзяў у сваіх менш вынаходлівых сваякоў з гор. Ён паўтарыў ім слова ў слова тое, што чуў ад мяне: што ці ён ім зараз дасць па тысячы пяцьсот леваў, або прыйдзе паліцыя ды забярэ звяроў. Тых мядзведзяў ён аддаў нам па трыццаць пяць тысяч, сваіх жа на гэты час схаваў у суседа.

Мяне як агнём апякло. Я хацеў прывезці паліцыю і адабраць у яго тых мядзведзяў. Але калегі папярэдзілі мяне, што тады цыганы наогул перастануць з намі размаўляць. Апроч таго, не было ўпэўненасці, што паліцыя захоча дапамагчы. Гадамі яны бралі хабар у мядзведнікаў, быццам не заўважаючы іхных дзікіх табараў. Мы не сталі ўмешвацца. Стары яшчэ пяць гадоў хадзіў са сваімі мядзведзямі, пакуль удалося яго схіліць, каб ён іх аддаў. А мы навучыліся яшчэ адной рэчы. З той пары кожны цыган падпісваў абавязальніцтва, што ніколі больш не возьме на дрэсуру аніводнага мядзведзя. Калі яго парушыць — мы канфіскуем мядзведзя, а ён верне грошы.

Іншым разам у вызначаны натарыусам дзень прыязджаем пад дом, з паліцыяй, з ветэрынарам, з журналістамі, а цыгана і ягонага мядзведзя няма. Замест яго нас чакаюць каля сарака чалавек: жанчыны, дзеці, стрыечныя браты, нейкія старыя. Пытаемся ў жонкі — яна нічога не ведае, пачынае плакаць і крычаць. Пытаемся ў братоў — таксама не ведаюць. Тэлефануем гаспадару на мабільны — ён выключаны.

Я страшэнна раззлаваўся, бо гэта былі складаныя гандляванні, да таго ж уся група ехала па мядзведзя ажно пад Русэ, а гэта шэсць гадзін язды з Беліцы.

Трымаць людзей там, пад домам, сэнсу не было. Мы адправілі ўсіх назад і разам з калегам пачалі шукаць цыгана па навакольных вёсках.

Першыя два дні — нічога.

На трэці нехта сказаў, што ён схаваўся ў свайго стрыечнага брата праз дзве вёскі ад нас.

Еду туды — не хоча адчыняць.

Кажу: — Перадайце Станьку, што я тут адзін. Што мы мусім паразмаўляць. Што паліцыя яго зараз знойдзе.

Мы пайшлі да яго. Праходзіць пятнаццаць хвілінаў, ён выходзіць. — Ты бачыў, што адбывалася ў маім доме? — пытаецца. — Калі людзі даведаліся, што я аддаю мядзведзя, прыехалі нават такія сваякі, якіх я бачыў упершыню ў жыцці. Яны ўзялі з сабою намёты і расставілі іх каля хаты. Я не магу там узяць бабкі, бо яны ўсё ў мяне забяруць!

Я ўсё ўзважваю. Хуткая ўжо вярнулася ў Беліцу. Пакуль прыедзе, пакуль мы ўсё арганізуем, пройдзе дзень. За гэты час ён можа чатыры разы перадумаць, схавацца ў яшчэ далейшай вёсцы, можа зрабіць што заўгодна.

Ты не ведаеш, што можа прыйсці да галавы такому цыгану. Яны сапраўды не ўяўлялі сабе жыцця без сваіх мядзведзяў. На ўсіх занятках, якія я наведваў, нашыя калегі з Аўстрыі паўтаралі нам: калі не ведаеш, што рабіць, памятай, што самы важны для цябе — мядзведзь.

Мэта — мядзведзь.

Місія — вызваленне мядзведзя.

Мядзведзь, мядзведзя, мядзведзю, з мядзведзем, аб мядзведзі.

Пытаюся: — Як ты яго сюды прывёз?

А ён паказвае на старыя жыгулі, прычэп і кажа, што вось гэтым.

Я перахрысціўся, адправіў калегу на нашым аўто ехаць наперадзе і кажу: — Едзем.

А цыган адказвае, што ў яго няма правоў, і калі нас зловяць, могуць быць праблемы. Ёб тваю маць, думаю. Дык ты дваццаць год возіш мядзведзя на старых жыгулях па ўсім узбярэжжы, не маючы правоў?!

Але які ў мяне быў выбар? Мы далучылі прычэп да жыгулёў, я сеў за стырно, і мы паехалі. Спачатку мядзведзь ехаў спакойна, але потым мы мусілі праехаць частку дарогі па аўтастрадзе Бургас — Сафія. І там кожнага разу, калі нас абганяў грузавік, мядзведзь вельмі моцна палохаўся. Ён уставаў на ногі і ад жаху пачынаў трэсці прычэп.

Можаш уявіць, як паводзяць сябе жыгулі на дарозе, калі двухсоткілаграмовы звер трасе прычэп. Нас насіла злева направа. Я ехаў па ўзбочыне, але часам нас выносіла аж на левы край.

Я кажу цыгану: — Гэта немагчыма! Прыдумай што-небудзь!

Ён адказвае, каб я спыніўся на запраўцы. Я спыніўся, ён набыў пляшку ракіі, наліваў мядзведзю на лапу, а той клаў сабе лапу на пысу і піў. Выпіў усю бутэльку, пасля чаго мы без прыгодаў даехалі да самой Беліцы, дзе

мядзведзь адразу патрапіў на даследаванні і каранцін. А цыган? Неяк мусіў вярнуцца на сваіх жыгулях пад Русэ.

Як ён вярнуўся? Не ведаю. Не пытаўся. Шчыра кажучы, мяне ніколі не цікавіла іхнае жыццё пасля таго, як яны аддалі мядзведзяў.

IV. ГІСТОРЫЯ

1

— Нешта вам распавяду, але гэта таямніца, — і Марыйка, жонка Дымітра Станева, зазірае мне ў вочы, быццам жадае прачытаць па іх, ці я ўмею захоўваць таямніцы, ці буду апавядаць пра ўсё налева і направа. Марыйка вагаецца некалькі хвілінаў, разглядае мяне, быццам спрабуе разгадаць, сябар я ці вораг. Урэшце кажа: — Пасля вайны камуністы хацелі забараніць дрэсуру мядзведзяў. І забаранілі б, як у іншых краінах. Але не маглі — з аднае прычыны. Мой цесць меў такі нумар тэлефона, што мог змяняць рашэнне самой вярхушкі камуністычнай партыі ў Сафіі.

Я не веру. Марыйка гэта бачыць, бо пытаецца:

— Хочаце ведаць, адкуль у яго быў той нумар?

І распавядае гісторыю свайго цесця.

Гісторыя пачынаецца падчас Другой сусветнай вайны. Таварыш Пэнча Кубадынскі, прыгожы брунет дваццаці з нечым гадоў, які, правёўшы ў партызанах год, памужнеў ды пасталеў, мусіць хавацца.

Балгарыя ў час Другой сусветнай цесна супрацоўнічала з Гітлерам. Ейныя салдаты бралі ўдзел у наступах Трэцяга Рэйху на Грэцыю ды Югаславію. Іх рассылалі па ўсіх Балканах пільнаваць парадак і змагацца з лакальнымі рухамі супраціву. Яны маглі гэта рабіць, бо ў самой Балгарыі рух супраціву быў слабы, рассяроджаны і доўгі час не ўяўляў сабою вялікай небяспекі для ўрадавых войскаў.

Але былі і выключэнні. Адзін з іх — аддзел Кубадынскага, «Аўгуст Папоў», ён складаўся пераважна з даваенных камуністаў і з 1942 года рэгулярна задзіраўся з балгарскімі войскамі ў пакрытых лясамі ваколіцах Шумена і Разграда.

Вясною ж 1943 года балгарскі рух супраціву хоць і па-ранейшаму слабы, а ўжо надакучае гэтак, што ўрад у Сафіі распачынае наступ. Вайскоўцы ездзяць па вёсках, шукаюць партызанаў і пераследуюць людзей, абвінавачаных у спрыянні партызанам. Пятля на шыі Кубадынскага і ягоных таварышаў пачынае сціскацца.

На шчасце, яшчэ з даваенных часоў таварыш Пэнча ведаў некалькіх цыганоў, яны жылі за некалькі вёсак ад ягонага роднага мястэчка — Лазніцы. Звяртаецца да іх па дапамогу.

Цыганы не адмаўляюць.

Гэтак пачынаецца адна з самых яскравых гісторый балгарскага руху супраціву. Цыганы, якіх ведаў Кубадынскі, зарабляюць мядзведніцтвам. Насамрэч урад забараніў вадзіць мядзведзяў падчас вайны, але ніхто не мае часу, каб пераймацца выкананнем гэтага правіла.

Мядзведнікі, як і раней, ходзяць ад вёскі да вёскі і за свае выступы атрымліваюць ад людзей яйкі, малако, часам троху мяса.

Пэнча Кубадынскі далучыўся да іх. Правёў ён з мядзведнікамі некалькі дзён ці, можа, некалькі месяцаў — сёння ўжо невядома. З тых часоў засталося толькі некалькі легендаў.

Пра тое, што аднойчы табар, у якім знаходзіўся таварыш Пэнча, акружылі вайскоўцы. Цыганы хутка пераапранулі таварыша ў кабету — надзелі на яго доўгую квяцістую сукенку і каляровую хустку — і гэтак вывелі з засады.

Пра тое, што таварыш навучыўся вадзіць мядзведзяў, а яны яго гэтак добра слухаліся, быццам адчувалі, што маюць дачыненне з чалавекам надзвычайнага характару.

Урэшце, пра тое, што таварыш асабіста спрабаваў дужацца з мядзведзем. І што ў яго зусім нядрэнна выходзіла.

Найбліжэйшым сябрам таварыша Кубадынскага стаў Станька Станеў, цесць Марыйкі, бацька Дымітра і Пэнча. Таго самага Дымітра, які апошнім аддаў сваіх мядзведзяў «Чатыром Лапам», і таго самага Пэнча, які ўзяў з лесу дзікую мядзведзіцу і змог яе навучыць танчыць.

Відаць, яны пасябравалі гэтак моцна, што Пэнча атрымаў сваё імя ў гонар таварыша Кубадынскага.

— Цесць выратаваў яму жыццё. Балгарскія салдаты расстралялі б яго на месцы, — кажа Марыйка. — Ён ніколі на гэта не забываўся. І калі камуністы хацелі забараніць мядзведніцтва, ён стаў на наш бок. Прыязджаў да нас дахаты, піў ракію. Цесць мог пазваніць Кубадынскаму

з любой нагоды. Ці званіў ён? Не даводзілася. Усе ведалі, што ён можа патэлефанаваць, і гэтага было дастаткова.

2

Пасля вайны Балгарыя пачынае ўпэўнена крочыць па дарозе да камунізму, а таварыш Пэнча на гэтай дарозе грае ўсё больш важную ролю. Ён узбярэцца на самую вяршыню ў структуры камуністычных уладаў — будзе адным з найбліжэйшых паплечнікаў Тодара Жыўкава.

Кар'ера апошняга — гэта спаўненне american dream, толькі ў сацрэалістычнай версіі: ад беднага пастушка — да першага сакратара партыі. Жыўкаў паходзіць з беднай сям'і пастухоў з мястэчка Правэц. У сямнаццаць гадоў ён запісваецца ў моладзевае крыло кампартыі. Падчас вайны, як і Кубадынскі, ён змагаецца ў антыфашысцкім падполлі, адно пад Сафіяй.

Адразу пасля вайны малады партызан у балгарскай сталіцы атрымлівае пасаду кіраўніка міліцыі, адначасова падымаючыся па структурнай лесвіцы камуністычнай партыі. Яго прамоўтарам робіцца сам Вулка Чарвянкоў, Першы сакратар балгарскай камуністычнай партыі, цвердалобы сталініст, які моцнаю рукой кіруе Балгарыяй паводле савецкага ўзору. Жыўкаў ведае, што, калі хоча высока ўзняцца, мусіць трымацца бліжэй да Чарвянкова. У ягоных марах — найвышэйшыя пасады.

Шанец заняць іх з'яўляецца хутчэй за любыя спадзевы, у 1953-м, разам са смерцю Сталіна. Чарвянкоў страчвае былы ўплыў. Каб уратаваць сябе ад поўнага падзення, ён прапануе свайго тады саракадвухгадовага пратэжэ

ў якасці спадкаемца на пасадзе першага сакратара. Сам жа спадзяецца захаваць партфель прэм'ера.

Жыўкаў яшчэ не вядомы шырокаму колу таварышаў, таму ўсе лічаць рашэнне Чарвянкова геніяльным: новы першы сакратар будзе марыянеткаю папярэдняга. Чарвянкоў будзе ўсім кіраваць з-за куліс.

Таварышы недаацэньваюць Жыўкава, які ўжо некалькі гадоў працуе над уласнай пазіцыяй у партыі і групай людзей, што будуць працаваць на яго.

У групе той — Пэнча Кубадынскі.

Ужо ў 1956-м, на хвалі пацяплення пасля вядомага дакладу Хрушчова, у якім ён упершыню адкрыта сказаў пра тое, чым быў сталінізм, Жыўкаў пераймае ў Чарвянкова рэшткі ўлады. Хуткасць, з якою нядаўна ўсемагутнага прэм'ера зрынае чалавек, што ўсяго дамогся з ягонаю ж, прэм'еравай, дапамогай, уражвае. З тае пары Жыўкаў самастойна кіруе Балгарыяй да 1989 года. — Найдаўжэй з усіх сакратароў у гэтай частцы свету, — падкрэслівае Ілля Хрыстаў, гісторык з Сафіі.

На працягу ўсяго часу яго падтрымлівае Кубадынскі. І тады, калі на стыку 60-х і 70-х вайскоўцы некалькі разоў спрабавалі ажыццявіць пераварот. І тады, калі Жыўкаў замовіў забойства сваіх палітычных праціўнікаў. І тады, калі выслаў апазіцыянераў у створаны па мадэлі ГУЛАГу лагер у горадзе Бэлэнэ. І калі папрасіў Хрушчова, каб той далучыў Балгарыю да Савецкага Саюза ў якасці яшчэ адной рэспублікі (Хрушчоў яму адмовіў).

— Кубадынскі — вельмі неадназначная асоба, — кажа Ілля Хрыстаў. — З аднога боку, хутчэй за ўсё, ён бы і не быў

супраць далучэння нашай краіны да СССР. Разам з Жыўкавым яны вельмі інтэнсіўна дамагаліся, каб у 1968-м Варшаўская дамова наехала на Чэхаславакію. Туркаў, якіх у нас у Балгарыі больш за мільён і якіх камуністы пераследавалі, Кубадынскі абражаў. З іншага боку, гэта быў сапраўды чалавек з народа, які па-сапраўднаму верыў у камунізм, не быў, як многія апаратчыкі, фальшывым і цынічным. Пра тое, ці верыў у камунізм Жыўкаў, я не ведаю. Думаю, хутчэй за ўсё, ён верыў сам у сябе. І адзінае, што было яму патрэбна, — гэта кар'ера і фатэль.

Жыўкава з Кубадынскім аб'ядноўвала партызанскае мінулае ды нястрыманасць на язык.

— Некаторыя кажуць, што нашая ўлада трасецца. Яйкі ў барана таксама трасуцца, але не адвальваюцца! — сказаў Жыўкаў на адкрыцці аднае з фабрык.

— Нашыя кабеты скардзяцца ў лістах да партыі, што ў іх зашмат працы. Па-мойму, калі б так было, яны б не мелі часу пісаць лістоў, — гэта Кубадынскі з нагоды... Дня жанчын.

— Жыўкаў кіраваў гэтак доўга, бо мог знайсці агульную мову з кожным, хто быў пры ўладзе ў Маскве, — кажа Ілля Хрыстаў. — Поўны абсурд быў, калі кіраваць СССР пачаў Міхаіл Гарбачоў, а Жыўкаў ні з пушчы ні з поля пачаў гаварыць пра патрэбу... перастройкі, галоснасці, дэмакратызацыі! Падазраю, што, калі б камунізм не заняпаў, Жыўкаў і Гарбачову б палізаў сраку ды далей кіраваў.

Але перамены ў камуністычным блоку пайшлі ўжо далёка наперад. У чэрвені 1989-га ў Польшчы прайшлі першыя

свабодныя выбары. Праз некалькі месяцаў немцы зрынулі берлінскі мур, а румыны застрэлілі Нікалае Чаўшэску і ягоную жонку.

Нягледзячы на неспакой ва ўсім рэгіёне, у Балгарыі адзінымі, хто адкрыта пратэставаў, былі туркі, якія зазналі камуністычны пераслед. Толькі напачатку лістапада свежаскліканая балгарская арганізацыя Хельсінскага камітэта арганізавала ў Сафіі першую легальную маніфестацыю. І нягледзячы на тое, што ўдзел у ёй узялі ўсяго восем тысяч асоб, балгарскі камунізм дажываў апошнія дні.

— Камунізм у Балгарыі скончыўся, у вялікай ступені дзякуючы Кубадынскаму, — кажа Ілля Хрыстаў. — Ягоны голас быў вырашальным, калі ў 1989-м рэфарматары пад началам Пэтара Младэнава запатрабавалі адстаўкі Жыўкава. На самым важным галасаванні Пэнча прагаласаваў супраць Жыўкава. І, карыстаючыся нагодаю, — супраць сваёй уласнай біяграфіі.

Яйкі барана адваліліся 10 лістапада 1989 года. Афіцыйна — праз «пажылы ўзрост і ператамленне ад працы» Жыўкава.

— У 1990-м у нас распачаўся круглы стол уладаў з апазіцыйнымі партыямі, а адразу пасля яго — дэмакратычныя перамены, — кажа гісторык Хрыстаў. А Кубадынскага балгары памятаюць з двух нагодаў. Па-першае, ён быў вялікім аматарам паляванняў і ганаровым старшынёю ўсіх магчымых паляўнічых арганізацый. Па-другое, ён меў першы і цягам доўгіх гадоў адзіны ў Балгарыі джып, таёту.

3

Ваенны досвед Кубадынскага натхніў стваральнікаў фільма «На кожным кіламетры», класікі балгарскага серыяла, адпаведніка польскага «Чатыры танкісты і сабака». У адной з серый галоўны герой, таксама партызан-камуніст, патрапляе ў пастку балгарскіх салдатаў. Маляву пра тое, што набліжаецца дапамога, ён атрымлівае ад мядзведнікаў. Прывабная цыганка займае ўвагу салдатаў танцам, пакуль ейны калега перагаворвае з палонным камуністам.

— Хутчэй за ўсё, мядзведнікі дапамагалі балгарскаму руху супраціву і ў многіх іншых сітуацыях, — распавядае журналіст Красімір Крумаў. — Яны пераносілі зводкі, інфармавалі пра рух войскаў. Менавіта так гэта дзейнічала падчас змагання за вызваленне з турэцкай няволі. Ключавымі былі песні мядзведнікаў, шматстрофныя аповеды, гэткія цікавыя, што ніхто не мог адысці, не даслухаўшы да канца. Яны дзейнічалі, як тэлесерыял: ты абавязкова мусіш ведаць, што здарыцца далей. Песні часта насілі патрыятычны характар, распавядалі пра сутычкі балгарскіх паўстанцаў, пра іх чарнавокія каханні і кепскіх туркаў.

Гіёргій Мірчаў, мядзведнік з Др'яноўца, распавёў нам сэнс адной песні, якую спяваў ён сам, а да таго — ягоны дзед і бацька.

Сям'я маладога, прыгожага і багатага хлопца запрашае на ягонае вяселле ўсіх навакольных важных асоб. Запрасілі і бацюшку, і войта, і амаль кожнага, хто жыве

па суседстве, але, на няшчасце, забыліся на турка, вядомага сваёю з'едлівасцю суседа.

Вяселле атрымалася цудоўным, усе пілі вялізныя колькасці ракіі і захапляліся прыгажосцю маладой ды багаццямі ейнага мужа. Аднак стрэмкаю ў сэрцы сям'і сядзіць тое, што не запрасілі турка. З аднаго боку, гэта акупант і вядомы злыдзень. З іншага — усё ж сусед, а традыцыя кажа, што суседа, які б ён ні быў, належыць шанаваць.

Сям'я доўга разважае, як мусіць паводзіцца ў такой сітуацыі. Малады разам з братамі едзе да турка і прапануе розныя прысмакі.

Прапануе халву — турак не хоча.

Частуе цукеркамі — турак таксама не хоча.

Прывозіць пірог — турак адварочваецца з агідаю.

У сям'і маладога некалькі дзён абмяркоўваюць, што мусяць рабіць далей. Урэшце чарговы раз едуць да турка і прапануюць адмыслова для яго зарганізаваць яшчэ адно свята, на якім ён будзе ганаровым госцем, будзе сядзець побач з жаніхом ды нявестай.

Турак зноў адмаўляецца. Дадае толькі, што перастане злавацца, калі маладая сядзе яму на калена.

Для балгарскай сям'і гэта знявага. Ніводная прыстойная дзяўчына ці жонка не будзе сядаць на калена чужога мужчыны, і ўжо тым больш на калена турэцкага акупанта. Таму малады муж ідзе да яго і б'е сякерай па галаве. Турак памірае, а муж мусіць хавацца ад помсты іншых туркаў. Мараль песні ясная: турак твой вораг. Не дазваляй яму зашмат.

— Такая песня дзейнічала па-рознаму, — кажа Красімір Крумаў. — Натхняла змагацца з акупантам. Падтрымлівала патрыятычны дух. Апроч таго, мядзведнікі ў песнях перадавалі праўдзівую інфармацыю; схаваныя сігналы для руху супраціву. Ніхто, на жаль, ніколі гэтага добра не апісаў, таму гэты захапляльны свет адыдзе разам з апошнімі мядзведнікамі.

4

Маладая прыгожая дзяўчына распускае валасы і ў адчаі спрабуе ўтапіцца ў рацэ.

Яна ніколі не была з мужчынам, яна цнатлівая, але ёйны жывот расце і выразна паказвае, што дзяўчына цяжарная. У малой балканскай вёсцы незамужняя з жыватом — гэта сорам і пракляцце для сям'і. Найлепшым рашэннем тут падаецца самагубства.

Аднак адбываецца нешта незвычайнае. Як толькі дзяўчына падыходзіць да вады, рака адступае. Калі робіць яшчэ адзін крок, каб наблізіцца да ракі, тая аддаляецца зноў. Урэшце з ракі выходзіць мужчына і кажа: — Дзяўчына, не пазбаўляй сябе жыцця неразважна! Вось жа цябе выбралі, каб ты нарадзіла мядзведзя, які будзе працаваць, як чалавек.

Дзяўчына вяртаецца ў сваю вёску, а праз пару месяцаў сапраўды нараджае мядзведзя.

Такую легенду пра з'яўленне ўласнай прафесіі распавядалі гадамі балканскія мядзведнікі.

Гісторыю мядзведніцтва прасачыла Пэлін Тунайдын з універсітэта Сабанчы ў Стамбуле, якая піша доктарскую

дысертацыю пра мядзведнікаў. — Я памятаю мядзведзяў, якія танчаць, з дзяцінства, са Стамбула, — распавядае яна мне ў кавярні над Басфорам. — Для дзіцяці гэта было вельмі ўражвальна — дзікі звер устае на заднія лапы і танчыць. Цыганы прывязвалі іх да дрэваў і пакідалі на ноч у малым парку недалёка ад пляца Таксім. Аднойчы раніцаю яны прыйшлі ў парк, глядзяць — а мядзведзяў няма. Днямі дзяржава ўвяла забарону на трэнаванне мядзведзяў. Таму ўначы прыехала паліцыя і іх забрала. Цыганы нават не мелі каму скардзіцца. Яны пахадзілі, панаракалі і пайшлі дадому. Відаць, гэта пакінула глыбокі след у маёй памяці, раз праз столькі гадоў я не сумнявалася, што хачу пісаць уласна пра гэта.

Самы стары доказ таго, што людзі спрабавалі прыручыць мядзведзя, як піша Тунайдын у адным са сваіх артыкулаў, — гэта скіўіца мядзведзя, знойдзеная на тэрыторыі сённяшняй Францыі. Па зменах бачна, што жывёла жыла ў няволі. Паводле навукоўцаў, узрост гэтага чэрапа — шостае тысячагоддзе да нашай эры.

Аднак гэта не быў мядзведзь, які танчыў. Танцоры прыйшлі разам з цыганамі з іншага боку: з Індыі. Навукоўцы сцвярджаюць так, бо, па-першае, такіх мядзведзяў можна было сустрэць па ўсёй даўжыні вандроўкі з нашых краёў да Індыі, да сёння іх можна сустрэць у Пакістане. У Індыі мядзведжыя танцы забаранілі толькі пару гадоў таму.

Па-другое, мядзведнікі ў Індыі дрэсіравалі сваіх звяроў дакладна гэтак жа, як мядзведнікі ў Польшчы ці Балгарыі. І тыя, і іншыя таксама ўбівалі мядзведзям у нос

металічнае колца, як Гіёргій Мірчаў Марынаў сваёй Вэле.

Важныя цэнтры дрэсуры мядзведзяў знаходзіліся на Балканах, у Расеі і ў Польшчы. Найбольш вядомы — у Польшчы, самым вясёлым бараку ў лагеры мядзведнікаў. Тут у горадзе Смаргонь (сёння Беларусь) князь Караль Радзівіл «Пане Каханку» даў цыганам зямлю, каб яны адкрылі акадэмію для мядзведзяў, якія танчаць. Той, хто меў мядзведзя і хацеў навучыць яго розным штучкам, аддаваў звера ў Смаргонь на выхаванне. Найлепшыя мядзведнікі праводзілі з ім некалькі сезонаў, навучаючы танцам і гульням.

Якім?

Напрыклад, цыган казаў: — Пакажы нам, мішка, як мужыкі на паншчыну ідуць. А мядзведзь горбіўся, стагнаў, хапаўся за галаву.

Потым цыган казаў: — А цяпер пакажы нам, мішка, як халопы вяртаюцца з паншчыны. Тады мядзведзь выпроставаўся і бадзёра перастаўляў ногі, быццам маршыруючы.

Або цыган казаў: — Пакажы, мішка, як Касцюшка будзе вяртацца ў Польшчу. А мядзведзь салютаваў і крочыў, як жаўнер.

Так пра смаргонскую акадэмію пісаў выбітны знаўца цыганоў Ежы Фіцоўскі: «У княскіх лясах налавілі маладых мядзведзяў і пасялілі ў акадэміі — іх бывала некалькі дзясяткаў штук. (...) Гадоўляю ды дрэсураю тут займаліся больш за дзесяць цыганоў, для якіх гэта была сталая праца. Навучанне ж у акадэміі трывала каля шасці

гадоў. Цыганы-мядзведнікі, атрымаўшы дазвол ад караля, разам з выпускнікамі разыходзіліся па свеце»*.

Далей Фіцоўскі цытуе кніжку «Узоры хатняга сумеснага жыцця ў Літве» графа Яўстаха Тышкевіча, археолага і гісторыка, чый бацька «як сапраўдны літвін заўжды меў у сябе пры кухні хатняга мядзведзя». Калі ж аказалася, што любімчык праяўляе талент да танца, яго выслалі на навучанне ў Смаргонь. «Сюды было нашмат прасцей запісаць вучня, чым у Вільню, тут не вымагалі ані пасведчання аб нараджэнні, ані даведкі пра прышчэпку ад воспы, а прыналежнасць да роду і так была відавочнаю, — піша Тышкевіч. І далей: — Цыган вучыў мядзведзя, як уставаць на заднія лапы. Для гэтага быў вялікі пакой, а ў ім замест падлогі кафляная печ са слупам пасярэдзіне. Да гэтага слупа вучня прывязвалі за заднія лапы; печ напальвалася да чырвані, заднія лапы мядзведзю заварочвалі ў анучы і абувалі ў лапці, таму вучань, апёкшы пярэднія лапы, міма волі ўставаў на заднія, а цыган, які ў гэты момант стаяў на ўваходзе, трубіў. Гэткім чынам мядзведзь прызвычайваўся і потым на гук трубы, відавочна, думаючы, што зараз будзе горача ў ногі, падымаўся і выраблаў розныя выкрутасы».

Распавядалі, што, у адрозненне ад балгарскіх мядзведнікаў, якія выбіралі сабе мядзведзіц, смаргонскія прымалі толькі самцоў. Балгарскія цыганы кажуць, што самкі лягчэй паддаюцца муштраванню, яны менш агрэсіўныя

---

* Больш на гэтую тэму: Jerzy Ficowski «Cyganie na polskich drogach», Wydawnictwo Literackie, Kraków 1985.

і не нападаюць на людзей. Польскія ж цыганы лічылі дрэсуру мядзведзіц неганароваю справаю. Мядзведзіцы, паводле іх, мусілі нараджаць малых, каб у мядзведнікаў заўжды хапала мядзведзяў для працы.

У Балгарыі мядзведзям забаранялі зімоўку мядзведзяў, у Смаргоні жа наадварот. З 1 лістапада да канца лютага акадэмія стаяла зачыненая, а некалькі пакояў былі пакрытыя іглічаю і галінамі. Там мядзведзі пагружаліся ў зімовае спанне.

Падчас кіравання Сасаў ангельскі пасол у Польшчы ў сваім лісце ў Лондан высмейваў стан польскай адукацыі, пішучы, што «найлепшая [у гэтай краіне] — смаргонская акадэмія ў Літве, дзе вучаць мядзведзяў танчыць».

Смаргонскую акадэмію царскія ўлады зачынілі падчас лістападаўскага паўстання, але мядзведзь дагэтуль прысутнічае на гербе Смаргоні, зацверджаным прэзідэнтам Лукашэнкам, а ўлады горада на памяць пра акадэмію плануюць узвесці фантан у цэнтры.

Яшчэ ў міжваенны перыяд выказванне «ты смаргонскі акадэмік» у Польшчы было сапраўднаю абразай.

Над Віслаю ваджэнне мядзведзяў было забароненае яшчэ да вайны, але Караль Парна Герліньскі з цыганскай групы сінці ўзгадвае, што яшчэ ў 50-я ў табары, з якім ён ездзіў па Польшчы, былі два мядзведнікі. — Яны ўжо менш танчылі, а больш лячылі, — распавядае ён. — Людзі ў вёсках верылі, што мядзведзь лепшы за самага разумнага доктара.

5

Мядзведзіца Вэла з сям'ёй Мірчавых правяла пятнаццаць гадоў. Усё сваё жыццё, бо Гіёргій Мірчаў Марынаў набыў яе, калі ёй было ўсяго некалькі месяцаў. Кожны ейны год выглядаў падобна: вясною і летам яна хадзіла па вясковых кірмашах і прыморскіх курортах. Паказвала трукі, дазваляла сябе гладзіць, каб, дзякуючы гэтаму, людзі выйгралі ў латарэю, вылекаваліся або знайшлі лепшую працу.

Восень жа і зіму Вэла праводзіла, прывязаная да драўлянага кала пасярод падворка Мірчавых, у стане напаўспання.

Ажно аднойчы ў жыцці Вэлы пачалася серыя незвычайных падзей, за якімі мядзведжая галава аніяк не паспявала.

Спачатку прыехалі людзі ў зялёных строях, засунулі яе ў клетку і некуды везлі цягам доўгіх гадзін.

Потым перанеслі з клеткі ў памяшканне, дзе ўсё было белае.

Там яна адчула ўкол, пасля якога заснула. Калі прачнулася — нешта дзіўнае здарылася з ейным носам. Ён быццам паменшаў. Чагосьці ў ім не хапала.

Ён перастаў балець — раней боль носа быў для яе гэткім жа звыклым, як дыханне.

Сваімі мядзведжымі мазгамі Вэла не магла гэтага ўсяго зразумець. Яна праводзіла цэлыя дні, трымаючыся за пысу лапамі. Рычала, церлася аб дрэва. Грызла сябе за лапу.

Са здзіўленнем яна заўважыла, што не прывязаная за нос ні да дрэва, ні да плоту. Упершыню ў жыцці яна магла рухацца свабодна.

Зусім не ведала, што ўсё гэта значыць і што рабіць у гэтай новай сітуацыі.

— Нашыя мядзведзі мелі холку цягам усяго свайго жыцця, — кажа дырэктар парку ў Беліцы Дымітар Іваноў. — Для іх гэта як ампутаваць кавалак цела. Ці кавалак іхнай асобы. Той, што рабіў з іх нявольнікаў.

Большасць колцаў выняў асабіста доктар Амір Халіл, кіраўнік праектаў у «Чатырох Лапах». Яму падабалася рабіць гэта. Ён лічыў, што гэта вельмі істотны момант для мядзведзя; сімвалічнае вяртанне яму свабоды.

— Мы заўжды гэта робім пад наркозам. Мядзведзі парознаму рэагуюць на адсутнасць колца. Некаторыя цягам некалькіх дзён пачуваюцца няўтульна, кладуць лапы на твар у разгубленасці. Так было з Вэлаю.

Вэла доўга прыкладала лапу да носа, шукаючы холку. Усё жыццё гэтае колца муляла, а зараз яна не ведала, як жыць без яго. Яна быццам гэтак прызвычаілася да рабства, што ўспрымала нечаканую свабоду як небяспеку і баялася яе больш, чым болю.

Гэтак жа было і з Мімаю, якую адабралі ў сям'і Станевых.

Але бываюць мядзведзі, якія ўжо праз некалькі хвілінаў пачуваюцца цудоўна і нават не задумваюцца, куды падзеўся метал, які цягам усяго ранейшага жыцця рабіў ім балюча.

Гэтак было з Мішам і Светлай. Адсутнасць холкі яны ўспрынялі як самую звычайную рэч на свеце. Яны адразу заняліся змаганнем за ўласнае месца ў групе, а пазней — заляцанкамі. Ні на хвіліну іх не зацікавіла, чаму няма колца.

6

Свабоду мядзведзям падаюць патроху.

Пасля таго, як з насоў дастаюць холкі, яшчэ дзень, часам два, мядзведзі праводзяць у забетанаваным памяшканні, падобным да пячоры, дзе звыкаюцца з новай сітуацыяй.

З пячоры іх выпускаюць у адмысловы сектар парку, які суседнічае з іншымі мядзведзямі, але ад іх аддзелены сеткаю. Звер асвойваецца з пахам іншых мядзведзяў, бачыць іх, есць ежу недалёка ад іх, але не мае з імі фізічнага кантакту. Зараз адзіны жыхар гэтага сектара — мядзведзь Монці, самы малады ў парку, яму няма двух гадоў. Працаўнікі баяцца, што іншыя мядзведзі могуць яго замучыць. Таму яшчэ як мінімум год ён пасядзіць у гэтым сектары.

— Гэта не назавеш сацыялізацыяй, бо мядзведзь па натуры самотнік, — кажа дырэктар Іваноў. — Але гэта час, калі яны мусяць навучыцца жыць з іншымі. Прымаць іхны пах ды іхную прысутнасць. Адныя гэтага дасягаюць хутчэй, іншым трэба некалькі месяцаў. Мы іх назіраем і на сваіх нарадах вырашаем: яшчэ не час. Або: пара паспрабаваць.

Першае і самае важнае, чаму мядзведзі мусяць навучыцца на волі, гэта што воля мае свае межы.

У іхным выпадку мяжа — гэта электрычны плот пад напружаннем, расцягнуты вакол усяго парку. Ён мусіць быць тут, каб мядзведзі не ўцяклі ў той свет, у якім яны не ўмеюць жыць. У рэзерваце яны могуць рабіць усё — могуць ісці куды хочуць, есці што хочуць, могуць спаць, могуць забаўляцца, могуць займацца сэксам.

Абы не датыкаліся да плоту.

— На шчасце, мядзведзі вельмі разумныя, — кажа дырэктар Іваноў. — Першага, у скрайнім выпадку другога кантакту з плотам звычайна дастаткова.

V. ІНСТЫНКТЫ

1

Дымітар Іваноў носіць чорную як смоль бародку, ходзіць у скураной куртцы — таксама чорнай, і бязмежна адданы ўласнай працы. Калі ён гаворыць пра мядзведзяў, узрушваецца, жэстыкулюе, нават ягоная міміка падкрэслівае поўную ангажаванасць.

Горш, калі размова кранае чалавечых тэмаў. Узрост? Трыццаць з нечым. Адукацыя? Экалогія. Мары? Каб мядзведзям лепш жылося. І, вядома, іншым звярам таксама.

Ад тэмаў чалавечых Іваноў пазбаўляецца красамоўным маўчаннем.

Дырэктарам парку мядзведзяў, якія танчаць, ён стаў пяць гадоў таму. З тае пары са сваімі падапечнымі ён праводзіць найбольш часу.

Ягонае хобі — вяртанне ім іхных інстынктаў.

— Іншага спосабу вярнуць мядзведзяў прыродзе няма, — кажа дырэктар Іваноў.

2

Я добра памятаю, як бацькі ўпершыню паказалі мне мядзведзя-танцора. Была вясна, і нейкі цыган прыехаў у наша мястэчка. Тады я яшчэ не ведаў, як страшна гэтыя людзі іх мучаць. Я ўспрыняў гэта як нешта нармальнае. Мы паглядзелі, мядзведзь стаў на заднія лапы, цыган зайграў на гуслях, тата даў нешта на гарбату. Я нават не памятаю, ці мне спадабалася. Толькі такі кадр: цыган і мядзведзь. Гэтак гадамі было ў Балгарыі: бацькі паказвалі дзецям мядзведзяў, якія танчаць, як нешта самае нармальнае на свеце. Раз на нейкі час прыязджае цыган, з ім мядзведзь, таму мы ідзем паглядзець. Што ў гэтым дрэннага? Нічога. Я цешуся, што працую ў арганізацыі, якая нас вывела з такой логікі. Самі мы б гэтага, відаць, не зрабілі ніколі. Нам спатрэбіўся націск «Чатырох Лап», якія здолелі раскруціць кампанію супраць мядзведнікаў ва ўсёй Еўропе.

«Чатыры Лапы» ўтварылі аўстрыйскія эколагі ў 1988-м, каб пратэставаць супраць умоў, у якіх на фермах утрымлівалі пушных звяроў і курэй. Сёння ў арганізацыі офісы ў дванаццаці краінах. Гэта першая арганізацыя, што займаецца звярамі, якая склікала групу дзеля паездак у месцы прыродных катастроф — пасля землятрусу або ўрагану, калі зазвычай мала хто памятае пра звяроў. Яны таксама ачольваюць вялікія міжнародныя праграмы, як, напрыклад, кастрацыю нічыйных сабак на Шры-Ланцы, ва Украіне, Косаве і Балгарыі. Гадавы бюджэт цэнтральнай управы — некалькі мільёнаў еўра; усё з ахвяраванняў.

Парк у Беліцы — гэта адзін з вядучых праектаў «Чатырох Лап». На дванаццаці гектарах, у сямі сектарах жывуць 27 мядзведзяў, з іх толькі адзін — наймалодшы Монці — не быў мядзведзем-танцорам. Адзін чалавек трымаў яго ў сваёй рэстарацыі як цікавінку.

— Каб зразумець сэнс нашай працы, вы павінныя ведаць, як іх вучылі танчыць, — кажа дырэктар Іваноў. — Пра колца, якое мядзведзь меў у носе, вы ўжо ведаеце. А ці ведаеце, што ў той руцэ, у якой цыган трымаў смычок да гусляў, ён таксама меў кій, на канцы якога быў мядзведжы нос? Мядзведзь спрабаваў паспець за смычком, і гэта стварала ўражанне, што ён танчыць у рытм. Тым часам усё гэта былі ўцёкі ад болю. Усё іхнае жыццё было няспынным болем. А яшчэ кепскае харчаванне. Недахоп патрэбнага ім руху. Стрэс.

Сёння шмат мядзведзяў у парку хварэе на рак. З трыццаці пяць памерла ад новаўтварэнняў — Калінка і Мілена ў 2010-м, Ізаўра ў 2012-м, Мар'яна і Мітку ў 2013-м. Найстарэйшаю з іх была Ізаўра, ёй было 35 гадоў.

Яны жылі з людзьмі і сёння хварэюць на тое ж, што й людзі.

У парку ім робяць рэгулярныя падрабязныя даследаванні — кроў, ціск, мача, тэмпература. У ежу дадаюць прэпараты для ўмацавання арганізма. Без перапынку спраўджаюць кал, ці няма ў ім глістоў.

Але ўсё роўна здараюцца сітуацыі, да якіх працаўнікі парку не гатовыя.

Мядзведзь Мітку на пачатку 2013 пачаў траціць вагу, прычым вельмі імкліва. За месяц яго стала менш амаль

напалову. У яго не было апетыту. Ён цэлымі днямі сноўдаў па сваім сектары з адсутным выглядам.

Ветэрынар пачаў ад аналізу калу, думаючы, што ў мядзведзя ламбліі. Але пад мікраскопам нічога не было.

Мітку пасадзілі ў клетку, а клетку ўставілі ў хуткую, якая павезла яго ў Сафію, дзе яму зрабілі падрабязнае УГД. Аказалася, што ў мядзведзя рак нырак, вантробы і ўсяго страўнікава-кішачнага тракту. Ён ужо не вярнуўся ў Беліцу. Хвароба дала метастазы, ён ужо не паддаваўся лекаванню. Яго ўсыпілі на месцы, а сталічны крэматорый у той жа дзень спаліў яго, ператварыўшы ў прах.

У сваю чаргу Ізаўра захварэла на такі складаны рак, што нават дырэктар Іваноў не ў стане запомніць яго назву.

Пачалося ўсё з малой кропкі на левай шчацэ. У парку думалі, што гэта нейкі прышч, які знікне праз пару дзён. Але і праз тыдзень прышч не знік, а пачаў павялічвацца.

Ветэрынар зрабіў Ізаўры аналіз крыві. Вынікі былі трагічныя. У яе быў недахоп чырвоных часцінак, лейкацытаў, усяго. — Нешта зжырала яе знутры, а мы не ведалі, што гэта, — кажа адзін з працаўнікоў парку.

У хуткім часе кропка ператварылася ў пляму. Пляма распаўзлася ад шчакі спачатку на верхнюю, а там і на ніжнюю вусны. Менш чым за два тыдні дайшла да вока.

Тады Іваноў выслаў здымак пысы Ізаўры ў Сафію. — Праз гадзіну мы даведаліся, што губляем Ізаўру незваротна, — кажа ён. — Што ў нас засталося зусім няшмат часу, бо гэтае свінства расце ў страшным тэмпе.

Праз месяц Ізаўры ўжо не было.

Дырэктар Іваноў: — Прыкра глядзець, як звер, што ў прыродзе адрозніваецца моцаю, нават насмарку не мае, праз кантакт з чалавекам пачынае хварэць на цукроўку, рак, цыроз вантробы, катаракту. Тое, што мы робім з сабою, робім і з імі. Прабачце, ці можаце паўтарыць пытанне? Ага, вы кажаце, што гэта дрэнна сведчыць пра нас як пра від. Што мы самі сябе знішчаем кепскаю ежай, стрэсам, алкаголем. Што ж, можа, вы маеце рацыю.

3

Працаўнікі парку кажуць, што іхняя работа палягае на тым, каб назіраць і рэагаваць на праблемы. Але ў першую чаргу — на абуджэнні інстынктаў. На вяртанні мядзведзяў прыродзе. Як кажа дырэктар Іваноў, на забіванні мядзведзя-раба і абуджэнні вольнага, моцнага, незалежнага, дзікага звера, якім кожны з іх мусіць быць.

Галоўная праблема ў тым, што ў прыродзе мядзведзь тры чвэрці дня праводзіць у пошуку харчавання. Тым часам у Беліцы ежа прыязджае да іх гатовая. А з днём трэба нешта рабіць.

Таму асноўная задача для працаўнікоў парку — крэатыўнае кармленне, ці, кажучы інакш, хаванне ежы. Адзін з першых інстынктаў, які можна абудзіць у мядзведзя, — гэта інстынкт лаўца. — Ну, скажам, інстынкт шукання ежы, — папраўляюцца працаўнікі парку. — Бо яны не палююць, а шукаюць ежу, якую мы схавалі.

Ежу хаваюць па ўсім парку. Напрыклад, у дупле дрэва. І мядзведзь мусіць яе найперш вынюхаць, знайсці, а потым ускараскацца і выцягнуць. — Або закапваем

у зямлю. Пад камяні. Або рэжам курыныя сэрцы на малыя кавалкі і раскідваем па вялікай тэрыторыі — тады мядзведзь мусіць добра напрацавацца, каб гэта ўсё пазбіраць і з'есці.

Працаўнікі выдумляюць таксама розныя цікавыя прыстасаванні. Напрыклад, засыпаюць арэхі ў трубку, адкуль дастаць іх можна толькі па адной штуцы. Мядзведзь мусіць пастарацца, каб наесціся.

На жаль, кажуць у парку, мядзведзі надта разумныя. Міша, напрыклад, змарыўся выцягваць па арэшку, ударыў трубкай аб дрэва і ўсё выеў.

— Кожная хвіліна іхнага засяроджання — гэта наша ўдача, бо мы хочам, каб яны паслугоўваліся ўласнымі галовамі, а не цягліцамі, — гавораць у такіх сітуацыях працаўнікі парку. І думаюць, як замацаваць трубку, каб у наступны раз Міша яе не адарваў.

Харчаванне мядзведзяў дапасаванае да пораў года; да таго, што б у гэты час мядзведзь еў у жывой прыродзе. Увесну яны ядуць раннюю агародніну. Улетку — шмат летняй агародніны і садавіны. Восенню — слівы, яблыкі, грушы і арэхі.

Спачатку яны атрымлівалі арэхі цягам усяго года, але потым пачалі таўсцець. Нельга дазваляць, каб таўсцелі. У Нямеччыне, у парку, падобным да гэтага ў Беліцы, жыве мядзведзь з вялізнаю лішняю вагой — больш за 400 кілаграмаў. Таму мядзведзі ў Беліцы арэхі ядуць толькі восенню, каб назбіраць троху тлушчыку да зімоўкі.

Гэтак дыету мядзведзі маюць амаль ідэальную, толькі ад пшанічнага хлеба іх немагчыма адвучыць. Шкада, бо ён разбурае іхны страўнікава-кішачны тракт. Але яны

настолькі прызвычаеныя да такой ежы, што, калі б мы паспрабавалі прыбраць хлеб, маглі б зрабіць ім шкоду.

Мара дырэктара Іванова — вызваліць у іх інстынкт сапраўднага драпежніка. Толькі як гэта зрабіць?! — Вядома, мы б маглі запусціць сюды курэй і ўбачыць, ці нашыя мядзведзі на іх накінуцца, — разважае дырэктар. — Але гэта супярэчыла б нашым прынцыпам, што кожная істота заслугоўвае павагі. Ніколі мы такога не зробім.

Як жа пры наяўных абставінах развіваць гэты інстынкт? Вельмі добрае пытанне, адказу на якое Іваноў шукае некалькі гадоў. У яго ўжо ёсць адна ідэя. Ён плануе ў бліжэйшым часе нацягнуць вяроўку паміж дрэвамі, каб атрымаўся квадрат. Да вяроўкі прычапіць мёртвую рыбу. З дапамогай маторчыка рыба будзе рухацца па квадраце ўверх-улева-уніз-управа. А мядзведзь, каб суняць голад, будзе вымушаны яе лавіць.

Для мядзведзя з Аляскі ў гэтым не было б аніякай праблемы, яны робяць такое штодня.

Але для беліцкіх гэта сапраўднае выпрабаванне. І шмат, шмат хвілінаў, на якія ўдасца прыкуць іхную ўвагу.

Аднак, кажа дырэктар Іваноў, падчас гэтай забавы ён будзе ўважліва сачыць за падапечнымі. — Ніхто да нас гэтага не спрабаваў, ніхто не вяртаў прыродзе жывёл, якія цэлымі пакаленнямі жылі з чалавекам. У мяне ёсць некаторыя страхі. Не ведаю, ці не адчыняем мы скрыню Пандоры. Адблакоўваем ім чарговыя рэчы ў галовах — хто ведае, куды гэта нас прывядзе. Дзікія мядзведзі за два дні знайшлі б спосаб адсюль збегчы. У іх не было б праблемаў нават з нашым плотам пад напружаннем. Яны

вельмі самаўпэўненыя і больш крэатыўныя. Можа, у пэўны момант нашыя мядзведзі таксама накінуцца на электрычны плот, знішчаць яго і пойдуць далей? Гэта была б нашая перамога, але з іншага боку — гэта была б і нашая параза. Чаму? Бо на волі нашыя мядзведзі не пражылі б і тыдня. З ахвотаю вам пра гэта распавяду, але зараз акурат пачынаецца пара кармленняў. Хлопцы прывезлі хлеб. Хадзем, дапаможаце мне яго раскідаць.

4

Міша, Міма і Светла, апошнія мядзведзі-танцоры Еўропы, першыя два дні ў Беліцы правялі, гуляючы каля штучнага возера, церучыся аб дрэвы і разглядаючы мядзведзяў у суседнім сектары.

Праз некалькі дзён аказалася, што ў Мішы і Светлы раман. Міша пачаў хадзіць вакол мядзведзіцы і рыкаць, але ў зусім іншай танальнасці, чым раней. У парку жартуюць, што ён спяваў ёй серэнады.

І што свабода абудзіла ягонае нутро.

Светла прымала гэтыя заляцанні, як прынцэса, што ведае ўласную вартасць і ведае, што вартая такіх знакаў увагі. Убачыўшы Мішу, яна рабіла выгляд, што нечым занятая. Чым заўгодна: жаваннем, выцягваннем арэхаў з пластыкавай трубкі, чуханнем футра. Пры гэтым яна пачала адганяць ад самца наймалодшую Міму. Калі Міма не захацела сыходзіць, атрымала лапаю па пысе. Да крыві.

Дымітар Іваноў: — Мы цешыліся, што мядзведзі сышліся. Гэта было першае такое каханне ў парку. А агрэсія?

Што ж, гэта частка мядзведжай прыроды, калі яна з'яўляецца, да яе трэба ставіцца як да вяртання да каранёў. Мы хочам, каб яны маглі выражаць свае эмоцыі. Калі з'яўляецца злосць, агрэсія — натуральны спосаб, каб яе разгрузіць. Калі мы выпускаем мядзведзя з «нулявога» сектара ў іншыя, мы мусім з гэтым лічыцца. Хаця, зразумела, усё адбываецца пад нашым кантролем — мы не можам дазволіць, каб яны пазабівалі адно аднаго.

Першы сектар — для спакойных мядзведзяў.

Другі — для тых, хто хоча дамінаваць.

Трэці сектар — найбольшыя і самыя агрэсіўныя мядзведзі. Там у нас Бобі, Чарлі, Дана, Натка і Рада, якая насамрэч мядзведзь невялічкі — яна важыць усяго 120 кілаграмаў, — але любіць дамінаваць, і ў двух іншых сектарах з ёю былі праблемы.

Мы сядзім у нашай абсерваторыі, глядзім, як яны сябе паводзяць, і разважаем. Колькі агрэсіі можам ім дазволіць. Ці яны ўжо перайшлі мяжу, ці яшчэ можам даць ім хвіліну, каб астыць.

У іх ёсць патрэба, каб у сектары падзяліцца на галоўных і падпарадкаваных. Мы гэтага не хочам, бо, калі ніхто з іх не будзе пачувацца больш пакрыўджаным, яны проста крыху памахаюць кіпцюрамі, пабурчаць, але гэтым усё скончыцца.

Але калі хтосьці з іх пачуецца больш пакрыўджаным, ён будзе сядзець ціха, а ўрэшце выбухне і накінецца на іншых. Пакуль такога ў нас не было, але гэта можа здарыцца ў любую хвіліну. Раззлаваныя мядзведзі могуць нават забіць адно аднаго.

VI. ЗІМОЎКА

1

Ёсць адна ключавая рэч для вяртання мядзведзям свабоды і для ўсёй працы з імі ў Беліцы.

Гэта зімоўка.

Іншымі словамі — зімовы сон, у які западаюць дзікія мядзведзі.

Для працаўнікоў парку гэта вельмі важны паказчык. Калі іхныя мядзведзі заснуць, гэта будзе сапраўдны поспех. Не заснуць — параза.

У няволі мядзведзі ўвогуле не мелі зімоўкі; яны жылі гэтак жа, як іхныя гаспадары. Некаторыя западалі ў нешта накшталт паўспання, у летаргічны сон, але былі і такія мядзведзі, якія на працягу ўсёй зімы рухаліся і елі, як звычайна; у іх не было дастатковай колькасці тлушчу, каб дазволіць сабе сон на некалькі месяцаў.

Зімоўка — гэта тэст і для самога мядзведзя на вынаходлівасць і пачуццё ўласнай годнасці. Калі ён пачуваецца настолькі самаўпэўнена, што ўмее пра сябе паклапаціцца,

то-бок найперш адкласці крыху тлушчавай тканкі на цяжкія часы, потым знайсці адпаведнае месца і выкапаць яму, паслаць у ёй, урэшце — запасці ў сон, значыць, праца з ім мае плён.

2

Зімоўка мядзведзяў — гэта прыродны феномен, які мы не можам дакладна патлумачыць. Па-першае, звычайна ў звяроў, якія западаюць у спанне, істотна зніжаецца тэмпература цела. Але не ў мядзведзяў. У іх тэмпература зніжаецца ўсяго на адзін градус — з 36 да 35. Яны лёгка могуць прачнуцца кожную хвіліну, іхныя вушы працягваюць працаваць, яны застаюцца пільнымі, і калі хтосьці падыдзе занадта блізка, мядзведзь устане.

Па-другое, мядзведзі не ходзяць у прыбіральню цягам усёй зімоўкі. Яны спяць 3–4 месяцы, але не аблягчаюцца. Невядома, як такое магчыма.

Па-трэцяе і апошняе, яны па некалькі месяцаў ляжаць у той самай пазіцыі, часта нават на сантыметр не скранаючыся з месца. Не дранцвеюць, не маюць пролежняў. А потым устаюць як нічога ніякага і ідуць шукаць ежу.

3

У Беліцы мядзведзь мае зашмат часу, з якім трэба нешта рабіць. Раней цэлымі днямі ён працаваў на цыгана. Мусіў танчыць і выконваць розныя трукі.

А тут раптам у яго цэлы дзень для сябе.

Мядзведзі ад гэтага зусім разгубляюцца. Калі б яны жылі на волі, тры чвэрці дня ў іх бы займаў пошук ежы. Але тут іх кормяць. Што рабіць з рэштаю дня?

Тое, што мядзведзі з Беліцы не ўмеюць кіраваць уласным часам, найлепш відаць, калі прыходзіць зіма. — Сутнасць зімоўкі ў тым, што ты мусіш падрыхтавацца да горшых часоў, — кажа дырэктар Іваноў. — Адкласці тлушч, якім мядзведзь будзе карыстацца, калі насыпле снегу. Калі не падрыхтуешся, можаш памерці. У Беліцы, зразумела, не памруць, мы іх выратуем. Але ж мы хочам рабіць усё так, як было б, каб гэтыя мядзведзі жылі ў прыродзе. Не ўмешваемся столькі, колькі магчыма не ўмешвацца.

Елена, якая ў 2009 прыехала з Сербіі, цягам года паказвала прагрэс, была лідаркаю сектара, першаю адгадвала, як дабрацца да ласункаў, схаваных пад камянямі.

Але раптам, калі пачала набліжацца зіма, Елена падурнела. Прайшоў першы снег, а яна пачала хадзіць па коле, разгойдвацца на нагах, была зусім ачмурэлая. Арганізм падказваў ёй нейкі ключ да гэтай сітуацыі, але яна зусім не ўспрымала гэтых сігналаў. Яна не ведала, як адказаць, таму адказала канвульсіямі. Пачала цэлымі днямі гайдацца, як дзіця, што пакутуе на сірочую хваробу. Амаль перастала есці — гэта быў нонсэнс, бо менавіта тады, перад зімоўкай, мядзведзь мусіць есці найбольш.

Усе ў парку думалі, як ёй дапамагчы.

Людзі з «Чатырох Лап» спрабавалі яе заняць чымсьці іншым. Пачалі хаваць ежу ў зусім новыя месцы. Але тады Елена амаль цалкам перастала есці.

Яе перасялілі ў іншы сектар. Але там яна яшчэ больш нервавалася.

Спрабавалі выкапаць у зямлі яму, каб падказаць ёй, што яна мусіць рабіць. Не дапамагло.

Тады нехта прыдумаў зрабіць будку. Такую, як для сабакі, але крыху большую. Працаўнікі парку хутка збілі некалькі дошак, засыпалі іх лісцем. І пайшло бы маслам памазалі. Елена пачала адграбаць снег, перастала гайдацца, а праз тры дні заснула.

— З тае пары мы будуем пяць-шэсць такіх будак на кожную зіму, — кажуць у парку. — Летась імі пакарысталася толькі Сэйда, якая насамрэч сама выграбла яму ў зямлі, але ейная яма праваліласа. У лёгкай летаргіі Сэйда перайшла ў адзін з дамкоў і спала далей.

4

У першыя гады спалі толькі некалькі мядзведзяў.

Два гады таму — ажно васямнаццаць.

Але найлепш было год таму, калі з 27 мядзведзяў у зімовае спанне запалі ажно 26.

Вядома, было б лепш, калі б яны ўсё гэта ўмелі зрабіць самі. — Можа, яны яшчэ навучацца? — задумваецца доктар Іваноў. — Але вы не можаце проста выпусціць мядзведзяў і чакаць, што яны з усім разбяруцца самастойна. Свабода — гэта страшна складаная штука. Яе трэба даваць павольна і паступова. А зімоўка паказвае, што нашы мядзведзі прасоўваюцца ў кірунку свабоды. Што яны не жывуць адным «сёння». Што навучыліся рыхтавацца да горшых часоў.

VII. ЛЬВЫ — У АФРЫКУ

Апошнімі гадамі ў «Чатырох Лап» няма праблемаў з мядзведзямі, якія танчаць, — усіх ужо пазабіралі ў цыганоў, усе патрапілі ў Беліцкі рай. Гэта не азначае, што працаўнікі парку могуць пачаць пошукі новай працы. Тым больш што арганізацыя паставіла новую важную мэту. Якую? Высылае львоў у Афрыку.

Дымітар Іваноў асабіста выслаў ужо двух.

— Львоў набываюць людзі, у якіх гэтак шмат грошай, што яны не ведаюць, куды іх падзець, — кажа ён. — Першым, пра каго мы даведаліся, быў мужчына з-пад горада Мелнік, які разбагацеў на наркотыках. Кажуць, што ён меў фабрыку амфетаміну, зарабіў на ёй вельмі многа і ліквідаваў, адчыніўшы рэстарацыю на поўначы краіны, каля прыгожага возера. Леў служыў там цікавінкаю.

Мы мусілі — гэтак жа, як і з мядзведзямі — ясна акрэсліць мэту.

Мэта — леў.

Місія — вызваленне львоў.

Леў, львом, льва, з ільвом, аб ільве.

Найперш я паехаў на разведку ў тую рэстарацыю. Я мушу добра падрыхтавацца да такога падарожжа. У Балгарыі я часта выступаю ў СМІ, ніколі не вядома, хто можа пазнаць мой твар з тэлебачання ці газет. Маё галоўнае правіла ў такіх падарожжах наступнае: рабі выгляд, што ты дурнейшы, чым ёсць насамрэч. Нашмат дурнейшы.

Таму я надзеў сонечныя акуляры, саламяны капялюш, зрабіў твар дурнога турыста і паехаў наўпрост у той гатэль. Кажу, што хачу прыехаць да іх з дзецьмі і чуў, што ў іх ёсць такая забава. А яны адказваюць, што сапраўды, забава ёсць.

Другое правіла такое, што, пасля таго як яны праглынуць нажыву, я даю ім гаварыць як мага больш. Сам толькі мяняю выразы твару і ківаю галавою; часам магу задаць якое-небудзь пытанне, галоўнае, каб не занадта разумнае. У гэтым гатэлі ўсё гэта спрацавала ідэальна, бо ўжо на рэцэпцыі мне падалі ўсе падрабязнасці: што гэта за леў, як доўга ён у іх, што яму даюць есці. Урэшце я пайшоў яго сфатаграфаваць.

З такімі доказамі я б мог адразу ехаць у паліцыю.

Але тут часта пачынаецца збой. У балгарскай правінцыі ўладальнік вялікага гатэля ведае ўсіх — чыноўнікаў, паліцыянтаў, мэра. І сёння яны будуць ківаць галовамі і казаць, што і сапраўды ўтрымліванне льва на прыватным участку парушае закон. Але потым яны будуць усё зацягваць, выдумляць перашкоды. Ну бо як жа — забраць ільва ў свайго прыяцеля? Таму яны скажуць, што паліцыянты не навучаныя перавозіць такіх звяроў. І каб ты вярнуўся праз год, а лепш праз пяць, паліцыянты змогуць

прайсці адмысловыя курсы. Перабудова перабудовай, але некаторыя рэчы ў Балгарыі яшчэ доўга не зменяцца.

Што можна зрабіць у такой сітуацыі? Трэба звярнуцца да вышэйшых інстанцый. Не адразу ў Сафію, але ў сталіцу рэгіёна. Там гэтыя лакальныя парадачкі ўжо не дзейнічаюць, і абавязкова знойдзецца нехта, хто дапаможа. Яны добра ведаюць, што наша арганізацыя мае добрых знаёмых і ў міністэрстве, і ў парламенце, і што мы заўжды можам звярнуцца яшчэ вышэй.

У Міністэрства навакольнага асяроддзя ёсць мясцовыя аддзяленні. Тэарэтычна ўсю працу мусяць рабіць менавіта гэтыя людзі, але, калі б мы на іх разлічвалі, цыганы б да сёння ездзілі па Балгарыі з мядзведзямі на ланцугу. Яны атрымліваюць па восемсот леваў заробку і, на жаль, галоўны іхны клопат — як нікому не трапіцца пад гарачую руку ды не страціць працу.

Таму мы ўсё мусілі зрабіць самі.

На тое, каб сабраць усе дакументы, патрэбныя для канфіскацыі льва, у нас пайшло некалькі месяцаў. Урэшце ў нас ёсць паперы, у нас ёсць паліцыя, якая канфіскуе льва, у нас ёсць ветэрынар, які спраўдзіць стан здароўя звера і паставіць пячаткі на ўсіх патрэбных дакументах. Мы едзем на месца і кажам уладальніку гатэля: добры дзень, вы трымаеце льва. Згодна з законамі Балгарыі, утрымліванне льва нелегальнае. Мы прыехалі яго канфіскаваць. Просім выдаць нам звера.

Мужчына глядзіць на нас, глядзіць на паліцыю, на нашыя паперы. Прыглядаецца, відаць, разважае, каму можа патэлефанаваць і ці дасць гэта нейкі плён. Урэшце

нешта ўзгадняе сам з сабою, адчыняе нам браму і кажа: — Раз так, не маю іншага выйсця. Заходзьце.

Табе здаецца, што атрымалася вельмі лёгка, праўда? Мне таксама так адразу падалося, я быў здзіўлены. Але мужчына быў папросту перакананы, што мы не зможам гэтага льва забраць, што яму пашанцуе. Мы пагаворым, папавучаем, а леў застанецца. І толькі тады, калі ён ужо адчыніў браму і ўбачыў, як уязджае хуткая разам з ветэрынарам і нашымі працаўнікамі, ён зразумеў, што мы не жартуем.

Мужчына ашалеў. Пачаў крычаць. А такія людзі цудоўна адчуваюць, на каго крычаць можна, а на каго не. Ён не чапляўся ні да мяне, ні да каго з «Чатырох Лап», ні да паліцыянтаў. Ён выбраў ветэрынара. Стаяў у яго над галавою, калі той спрабаваў даць ільву наркоз. І галасіў. І галасіў. І галасіў.

— Хто табе, блядзь, даў дыплом?! — крычаў ён. — Ці ты ведаеш, як рабіць укол ільву? Ты ўвогуле калі-небудзь бачыў ільва?!

Ветэрынар пачаў трэсціся. Мяне гэта зусім не здзіўляе. Мужчына быў двухметровы і складаў уражанне чалавека, гатовага зараз жа нас пабіць, а паліцыянты рабілі выгляд, што нічога тут не адбываецца. Стаялі каля сваёй машыны. Мы возьмем ільва і паедзем адсюль; яны будуць надалей жыць тут і сустракаць гаспадара гатэля на вуліцы. І ветэрынар ведае, што, калі мужчына выбера яго сваёю ахвярай, ніхто яго не выратуе.

Ці мог я неяк дапамагчы яму? На жаль, не. Для мяне тут галоўны леў. Я мушу як мага больш бяспечна засунуць

яго ў хуткую і адправіць на самалёце ў паўднёвую Афрыку. І так яно адбылося.

З падобнаю дылемай я сутыкнуўся некалькі месяцаў таму, калі мы забіралі іншага льва з прыватнага маёнтка.

З некалькіх незалежных крыніц мы даведаліся, што там трымаюць ільва. Цяжка было здабыць фотаздымак. Я некалькі месяцаў спрабаваў штосьці зрабіць, але ніхто мне не мог дапамагчы. Але ўрэшце сам той чалавек выйшаў нам насустрач. Ён быў так упэўнены ў сабе, што даў інтэрв'ю адной бульварнай газеце, дзе яны разам з жонкаю распавялі пра сваю маёмасць. На цэнтральным месцы быў вялікі здымак з ільвом. «Наш сябар, які вуркоча» — сведчыў подпіс.

Паколькі ён сам сябе падставіў, мы не сталі чакаць. За пару дзён сабралі каманду, пад'язджаем пад дом, паліцыя прадстаўляецца, паказваем дакумент на канфіскацыю льва.

Мужчыны няма ў хаце, але жонка з намі вельмі ветлівая. — Раз гэта нелегальна, вядома, забірайце льва, — кажа яна. Узамен я абяцаю ёй, што яны заплацяць найменшы штраф. Яна нават дзякуе мне, ужо адчыняе перад намі дзверы, толькі яшчэ мусіць паведаміць пра ўсё мужу.

Тэлефануе яму, і раптам сітуацыя мяняецца на 180 градусаў. Праз імгненне жонка перадае слухаўку кіраўніку паліцыянтаў, і я бачу, як ён слупянее. І чую толькі паасобныя:

— Да. Да. Да. Да.

Праз хвіліну паліцыянт аддае слухаўку жонцы і кажа мне, што, паводле ягонай апошняй інфармацыі, у гэтым

доме няма ніякага льва. Мы ж бачым, як з-за будынка ў невядомым кірунку ад'язджае джып.

Жонка гаспадара раптам знікае, а ў дзвярах з'яўляецца нехта накшталт прыслужніка. — Леў? — здзіўляецца ён. — Які леў? Вы ж ведаеце, спадарства, што ўтрымліванне льва нелегальнае...

Абшукваем, ужо не верачы, дом і тэрыторыю вакол яго. Тут стаіць нават клетка і сляды таго, што яшчэ нядаўна тут быў звер, — рэшткі ежы, адкіды. Паліцыя ж нават не спрабуе збіраць доказы. «Наяўнасць ільва не пацверджаная», — пішуць у пратаколе. Мы можам вяртацца ў Беліцу.

Менш чым праз тыдзень уладальнік ільва тэлефануе мне на прыватны мабільны. — Я яго аддам, але без паліцыі, без сведкаў і без штрафу.

Не вагаюся ні хвіліны. Найважнейшы леў. Калі я яго не ўратую, мужчына можа яго застрэліць. Было шмат такіх выпадкаў, калі нехта трымаў ільва, пакуль той быў маленькі, міленькі і выглядаў як маленькі каток. А калі той падрастаў — гаспадар клікаў знаёмага паляўнічага або сам хапаў зброю і забіваў.

Дамаўляемся ў лесе, недалёка ад паселішча. Пад'язджаем разам з хуткаю, а той мужчына, нехта накшталт прыслужніка, падвозіць клетку з ільвом. Мы бярэм клетку і вязем яе ў паліцыю. Там сведчым, што леў самотна бегаў па мястэчку. У нас атрымалася злавіць яго ў гарадскім парку і пасадзіць у клетку.

Усе ведаюць, як яно было насамрэч, але гэта Балгарыя. І не такія рэчы часам даводзіцца пісаць на паперы.

Мы падпісваем пратакол, ільву даюць наркоз і ўжо праз два дні ён ляціць на самалёце ў ПАР. А я цешуся, што мы можам дапамагчы не толькі мядзведзям, а і іншым звярам.

VIII. КАСТРАЦЫЯ

1

Нягледзячы на тое, што працаўнікам парку ўдаецца ўсё больш на шляху развіцця інстынктаў у мядзведзяў і вяртання іх прыродзе, на жаль, варта з прыкрасцю адзначыць, што мясцовая грамада горада Беліца не да канца дарасла да таго, каб жыць па суседстве з паркам мядзведзяў-танцораў.

Чаму?

Бо калі дырэктар Іваноў прыгожа распавядае пра ратаванне жыцця мядзведзяў і львоў, жыхары Беліцы каментуюць гэта зусім па-дурному.

Пытаюцца, напрыклад: — А колькі каштуе білет на самалёт для льва ў паўднёвую Афрыку?

Або: — Колькі каштуе месяцовае ўтрыманне мядзведзя?

Або: — Колькі каштуе іхная ежа?

На гэтыя пытанні няма добрых адказаў. Калі парк не адказвае, людзі пачынаюць выдумляць шматмільённыя

лічбы і называць іх усур'ёз. Але калі падаць ім сапраўдныя лічбы — лепш не будзе.

Напрыклад, кошт ежы аднаго мядзведзя за месяц — 400 еўра. Месяцовы кошт утрымання ўсяго парку — 20 тысяч еўра.

Гэтыя лічбы не з'яўляюцца таямніцай, і жыхары Беліцы робяць з іх памылковыя высновы. Калі ўжо зайшло пра фінансы, яны пачынаюць параўноўваць, колькі жыхароў Беліцы можна было б за гэта пракарміць, колькі змаглі б набыць паліва на зіму, колькі набылі б дзецям абутак, а колькі дзяцей змаглі б атрымаць бясплатны абед у школе: недакормленыя дзеці — гэта, нягледзячы на амаль паўвека перабудовы, усё яшчэ вялікая праблема балгарскай правінцыі.

Калі яны чуюць пра 400 еўра, іх дрыжыкі працінаюць. Мала якая сям'я ў Беліцы мае столькі на месяц, пры гэтым тут дзясяткі шматдзетных сем'яў.

І калі жыхары складаюць разам гэтыя вялікія лічбы, яны даходзяць да непрыемнай высновы, што пра мядзведзяў дбаюць нашмат больш, чым пра іх. Што, пакуль мядзведзяў вучаць вынаходлівасці, уменню выходзіць з канфліктаў, западаць у зімовае спанне; пакуль для іх будуюць басейны і пляцоўкі, прыстасаваныя для мядзведжых гульняў, жыхары Беліцы пакінутыя на вытвор лёсу. Яны вучацца жыць на свабодзе даўжэй, чым мядзведзі, але з імі няма групы адмыслоўцаў, якія дапамаглі б прайсці праз перабудову.

— Я шкадую, што не нарадзіўся мядзведзем, — сказаў аднойчы былы мэр Беліцы Хасан Ілан, калі параўноўваў бюджэт парку і бюджэт мястэчка.

Працаўнікі парку намагаюцца прапускаць між вушэй падобныя заўвагі. Яны добра ведаюць, што не мусяць быць адрасатамі гэткіх прэтэнзій. І няма ж іхняй віны ў тым, што арганізацыя «Чатыры Лапы» паспяхова здабывае фінансавыя сродкі на мядзведзяў ды іншых звяроў, а не на жыхароў балгарскай правінцыі, разгубленых у працэсе перабудовы. Белічукі мусяць мець прэтэнзіі да свайго ўрада і ад яго чакаць паляпшэння ўласнага лёсу, а не азірацца на мядзведзяў.

2

Нягледзячы на ўсе непаразуменні, для працаўнікоў парку добрыя стасункі з жыхарамі Беліцы і ваколіц — адзін з прыярытэтаў.

Яны робяць усё, каб заахвоціць жыхароў наведваць парк, і спрабуюць усталяваць добрыя адносіны. У мястэчку расставілі табліцы са здымкамі вызваленых мядзведзяў. Урад горада выкарыстоўвае мядзведзяў для самарэкламы ў інтэрнэце. Каб пайсці яшчэ далей, працаўнікі прыдумалі штогод запрашаць дзяцей з беліцкіх школаў на велікодную сустрэчу.

У першы раз яны падрыхтаваліся вельмі грунтоўна. Тут былі конкурсы, клоўн, быў стол з пачастункамі і аніматары на гульнявой пляцоўцы. Свята атрымалася цудоўнае. Якое ж было расчараванне працаўнікоў парку, калі аказалася, што адзінае, чым у Беліцы займаюцца бацькі запрошаных дзяцей, гэта пустаслоўе на тэму таго, што здарыцца, калі нейкі з мядзведзяў уцячэ, пачне нападаць на людзей і іх з'ядаць. — Ніхто добрага слова не сказаў: што файнае

свята, што прыемна, што дзеці задаволеныя, — скардзіцца адзін з працаўнікоў. — Затое ўсе пыталіся: — А вы дакладна ўмееце тых мядзведзяў пільнаваць? Мы адказваем, што вядома, мы ж маем электрычнага пастуха пад токам і высокі плот. А людзі зноў: — Ну добра, а што будзе, калі мядзведзь зробіць падкоп? Мы на гэта: — У нас жа ёсць камеры. Калі нейкі з мядзведзяў пачне нешта выдумляць, мы адразу ўбачым. На гэта адзін мужчына пытаецца: — А што будзе, калі нейкі з мядзведзяў паспрабуе ўцячы па галінах дрэваў? Ну рукі ападаюць!

На шчасце, прайшло некалькі гадоў, ніводзін з мядзведзяў не ўцёк, да таго ж некалькі чалавек з Беліцы пачалі працаваць у парку. Людзі звыкліся з пенсіянерамі-мядзведзямі, усё паказвала на тое, што іхныя стасункі будуць толькі паляпшацца.

На жаль, неўзабаве жыхары Беліцы даведаліся пра тое, што раз на пару месяцаў да мядзведзяў наведваецца стаматолаг з Нямеччыны, доктар Марк Лёзэ. І зноў пачалося плявузганне, што як можна прывозіць адмысловага дантыста для мядзведзяў, калі ў самой Беліцы дзевяноста адсоткаў жыхароў не маюць грошай на лячэнне і ходзяць або з дзіркамі ў зубах, або без зубоў наогул. — Мала хто можа заплаціць за пломбу, — прызнае Ліліяна Самарджава, мясцовая дантыстка, якая працуе ў малым доміку пад чырвоным дахам. — Найчасцей зубы папросту вырываюцца. Калі прыходзіць чалавек і я кажу, што лячэнне зуба будзе каштаваць трыццаць пяць леваў, а вырыванне — дваццаць, выбар амаль заўжды аднолькавы: рвем. Хаця ў многіх людзей няма грошай і на вырыванне. Што

я раблю тады? Вырываю ў крэдыт. Калі пазней у іх будуць грошы, можа, прыйдуць аддадуць.

— Людзі не мусяць так да гэтага ставіцца, — кажа Дымітар Іваноў, дырэктар парку. — Ім ніхто адмыслова зубоў не выбіваў. А гэтых мядзведзяў мучылі наўмысна. Многія з іх напачатку не могуць нічога пражаваць і, калі мы ім не дапаможам, здохнуць ад голаду або будуць цяжка хварэць. Сапраўды сумная карціна, калі вызвалены мядзведзь бярэцца разжаваць арэх то левым, то правым бокам шчакі і бачна, што ён бы хацеў, але зусім нічога ў яго не атрымліваецца.

3

Але найбольшы скандал на лініі «горад — парк» разгарэўся на самым пачатку. Тагачасны дырэктар хацеў, каб як мага больш жыхароў прыехалі паглядзець на новых суседзяў.

Падалі адмысловыя аўтамабілі, на якіх кожны ахвотны мог паехаць у парк і паглядзець на мядзведзяў. А паколькі ўсё ў парку празрыстае, людзі маглі зайсці ў любое месца — і на аглядную вежу, і ў малую кавярню, і ў крамку, і ў мядзведжую кладоўку.

Якраз стаяла вясна і, паколькі стол у мядзведзяў цалкам адпавядае таму, што б гэтаю парой яны елі ў прыродзе, у кладоўцы стаяла некалькі скрынак з трускалкамі. — І пачалося, — распавядае адзін з працаўнікоў. — Нікога не цікавіла, чым мы займаемся. Колькі мядзведзяў мы змаглі выратаваць. Як гэта істотна і для горада Беліца, які, дзякуючы нам, робіцца вядомым на ўвесь свет, і для

мядзведзяў, якіх мы ўратавалі ад варварскіх практык. Не. Тэма была толькі адна: мядзведзі жаруць трускалкі.

«Нашыя дзеці не ядуць трускалак, бо ў нас няма грошай на гэта, — казалі людзі. — А яны мядзведзям цэлымі скрынямі кідаюць».

Таго, што калі там стаіць пяць скрынак, дык на аднаго мядзведзя прыпадае паўкілаграма трускалак, ніхто ўжо не лічыў. Таго, што мядзведзь мусіць есці трускалкі, бо, раз мы ствараем ім падабенства да волі, мусім зрабіць гэта ў тым ліку праз харчаванне, таксама ніхто не адзначыў. Я размаўляў з людзьмі і задаваўся пытаннем, ці яны ўвогуле разумеюць канцэпцыю нашага парку, сэнс гэтай вялікай перамены, якую мы тут робім. Адзін мужчына запытваў: — Скажы, чаму ваш парк называецца «парк мядзведзяў, якія танчаць», калі яны наогул не танчаць? Ну рукі ападаюць, калі такое чуеш!

4

— Афіцыйна кажуць, што ў гарах, якія акаляюць наш парк, жывуць каля пяці сотняў дзікіх мядзведзяў, — кажа дырэктар Іваноў.

Мы доўга разважалі, як гэта можа ўплываць на нашых гадаванцаў — дзікія мядзведзі навокал і яны, завіслыя недзе паміж воляю і няволяй. Хадзем на тэрасу, калі ласка, паглядзіце. Перад намі — горы Пірэн. Там, на тым схіле, летась мы бачылі мядзведзіцу з двума малымі. З левага боку бачны горны масіў Рыла. Там мы бачым самотнага самца; падазраем, што гэта ягоная тэрыторыя. З левага боку таксама часам прыходзіць самец.

Здаецца натуральным, што, калі на іх тэрыторыі раптоўна з'яўляюцца амаль трыццаць мядзведзяў, іх гэта павінна зацікавіць. Яны мусяць неяк адрэагаваць, праўда?

Мы думалі, як будзе выглядаць кантакт паміж імі. Ці нашыя самкі будуць цікавіць самцоў на волі? Ці не будуць яны якім-небудзь чынам злучацца ў пары, не зважаючы на наш плот? Ці не будуць спрабаваць уцякаць?

У такіх роздумах было нешта захапляльнае. Бо, вядома ж, гэта можа парушыць розныя планы, якія мы маем. Але з іншага боку — мы ніколі не зможам перадаць ім веды пра жыццё на волі. А вольныя мядзведзі, магчыма, змаглі б.

Хутка ж, аднак, аказалася, што дзікія мядзведзі да нашых увогуле не падыходзяць. Нават не набліжаюцца да плота. Ігнаруюць іх. Можа, справа ў паху? Можа, нявольнікі пахнуць інакш?

Можа, дзікія адчуваюць, што тут няма чаго шукаць, раз самкі стэрылізаваныя, а самцы таксама нейкія дзіўныя?

А можа, папросту тут зашмат людзей, і ніводзін прыстойны мядзведзь не будзе падыходзіць блізка, нават калі адчувае пах самкі? Прыстойны мядзведзь дзікі, моцны, упэўнены ў сабе, незалежны. Можа, адчувае, што нашы не такія. І што не варта з імі працягваць свой род.

5

На жаль, сумная, але сумленная выснова такая: месца, у якім жывуць нашы мядзведзі, — толькі імітацыя волі. Гэта не наш выбар, мы б з задавальненнем патрымалі іх тут год-два, а потым выпусцілі ў лес — і няхай даюць рады.

Але той, хто большую частку жыцця быў нявольнікам, не мае шанцаў даць рады на свабодзе.

З людзьмі бывае гэтак жа, не думаеце?

Я не сумняюся, што, калі б аднойчы мы прынялі наш электрычны плот і выпусцілі мядзведзяў, яны б і года не працягнулі. Або замерзнуць, бо не здолеюць знайсці месца для зімоўкі. Або іх заб'е першы самец, на чыю тэрыторыю яны зойдуць. Або пачнуць шукаць ежы па сметніках — і хтосьці іх застрэліць.

У Румыніі «Чатыры Лапы» маюць цэнтр, куды трапляюць мядзведзі-сіроты. Паляўнічыя адстрэльваюць матку, хтосьці знаходзіць малое, яно жыве ў цэнтры два гады, а потым яго выпускаюць на свабоду. На жаль, вынікі несуцяшальныя. Ніводнаму не ўдалося дажыць да пятага года. У прыродзе маладыя таксама часта гінуць; іх могуць забіць нават старэйшыя самцы, каб пазбыцца суперніка да таго часу, як ён падрасце. Для іншых драпежнікаў малады мядзведзь таксама можа быць ласым кавалкам.

Але ў прыродзе гінуць 30–40 адсоткаў, а з таго парку ў Румыніі гінуць усе.

Людзі — гэта тэма для іншага аповеду. Яшчэ колькі год таму мядзведзь у Балгарыі нікога асабліва не здзіўляў. У гарах Рыла іх крыху больш за пяцьсот, і цалкам натуральна, што раз на нейкі час хтосьці мусіць убачыць мядзведзя.

Але па меры таго, як мы робімся больш заходнімі, людзі ўсё горш рэагуюць на кантакт з дзікай прыродай. Некалькі год таму мужчыну забіў мядзведзь. Адразу ж

паднялі трывогу, што мядзведзяў зашмат, і іх трэба адстрэльваць. Я страшна раз'юшыўся. Адзін з тэлеканалаў папрасіў мяне даць каментарый, таму я сказаў, што, калі нехта ўтопіцца ў рацэ, ніхто пасля не спрабуе асушаць рэк. Калі жывеш побач з прыродай, то часам трэба заплаціць за гэта вялікую цану. А шмат краін Захаду далі б багата, каб памяняцца з намі месцамі, бо яны — немцы, аўстрыйцы — сваю прыроду ўжо цалкам знішчылі.

6

Нямецкі падыход дасканала адлюстроўвае сітуацыя колькігадовай даўнасці. Там з'явіўся першы за шмат гадоў дзікі мядзведзь. Прыйшоў з Італіі. У СМІ паднялася істэрыя — што звер дзікі, што зараз будзе забіваць скаціну, а потым людзей.

Праз пару дзён яго адстрэлілі, хоць ён нікому не пагражаў.

Я баюся, што яшчэ пару гадоў — і тут будзе тое ж самае.

7

Вяртаючыся да нашых мядзведзяў. Яны — без зубоў, з катарактай ды эмацыйнымі праблемамі — на волі не маюць ніякіх шанцаў. Асабліва праз тое, што ў іх не было мядзведжай школы, якую звычайна сваім нашчадкам дае матка.

У прыродзе малое медзведзяня праводзіць з ёю два першыя гады жыцця. Матка вучыць яго ўсяму. На Алясцы навукоўцы запісалі цэлыя мядзведжыя лекцыі, падчас

якіх маткі прыводзяць сваіх малых да ракі і паказваюць, як складаць лапы, каб злавіць рыбу.

А чаму нашыя мядзведжыя маткі маглі б навучыць сваіх нашчадкаў? Хіба толькі таму, што калі едзе аўтамабіль, то варта чакаць ежы. Або таму, што, калі сам не здолееш выкапаць яму для зімоўкі, прыйдзе чувак з валасамі на твары і скалоціць табе будку з дошак.

На жаль, у нашых мядзведзяў не толькі пах, але і ментальнасць рабоў. За дваццаць, трыццаць гадоў яны прызвычаіліся, што нехта за іх думае, забяспечвае іх заняткам, кажа, што яны мусяць рабіць, што яны будуць есці і дзе спаць. Гэта не ідэальнае жыццё для мядзведзя, але іншага яны не ведалі.

Таму мы вырашылі, што кастрыруем усіх нашых мядзведзяў. Нам цяжка бачыць, як кожную вясну яны круцяць раманы і потым чакаюць малых. І здзіўляюцца і расчароўваюцца, што гэтыя малыя ніяк не з'яўляюцца.

Але, на жаль, мы мусілі зрабіць гэта. І магчыма, праблемы, пра якія я зараз вам распавяду, вынікаюць менавіта з гэтага.

IX. МЯДЗВЕДЗІ, ШТО ТАНЧАЦЬ

1

Самым стрэсавым днём для мядзведзя па мянушцы Добры быў той, калі ў Беліцу прыехаў ягоны былы гаспадар. Цыган, імені якога ніхто ў парку не памятае і памятаць не жадае, быў героем нейкага дакументальнага фільма пра жыццё балгарскіх ромаў, які здымала адна з заходнееўрапейскіх кінакампаній. У галаву рэжысёра прыйшла геніяльная ідэя: раз гаворка пра мядзведніка, у якога адабралі мядзведзя, трэба арганізаваць ім сустрэчу.

— Я прысутнічаў пры гэтым, — кажа дырэктар Дымітар Іваноў. — Добры сляпы. Нягледзячы на тое, што лекар залячыў ягоную катаракту, аказалася, што гаспадар біў яго і пашкодзіў зрок. І раптам праз некалькі гадоў у Беліцы Добры пачуў ягоны голас.

Замёр.

Лёг на траве.

Лапамі накрыў пысу, быццам просячы пра штосьці.

Натапырыў вушы.

Цыган крычаў яму, махаў, усяляк звяртаў на сябе ўвагу. Плакаў, звяртаўся «маё дзіцятка», «маё мядзведзянятка», «маё сэрца». А Добры ляжаў на траве, натапырыўшы вушы і прыкрыўшы пысу лапамі. Ляжаў і не кратаўся.

Цыган пачаў кідаць яму яблыкі. Іншыя мядзведзі, якія не ведалі гэтага чалавека, падыходзілі і елі. Добры — не.

Добры нават не паварушыўся.

Нехта з групы запытаўся, ці мог бы цыган цяпер, праз некалькі год, прымусіць яго танчыць. Я сказаў, што няхай толькі паспрабуюць — прымушу танчыць іх саміх.

Яны з'ехалі расчараваныя.

2

Хоць дырэктар Іваноў дбае пра сваіх гадаванцаў амаль гэтак жа добра, як дбае матка пра сваіх дзяцей, хоць мядзведзі ў парку харчуюцца адпаведна з парой года і патрэбамі іхных арганізмаў, хоць у іх там сосны, басейны і дванаццаць гектараў парку для ўсіх патрэбаў, хоць прафесійная, дасканала навучаная каманда займаецца імі ўдзень і ўначы, спрабуючы вырашыць любую праблему, ды нават думкі спрабуе чытаць, хоць мядзведзі тут на свабодзе і з кожным днём усё лепш гэтым карыстаюцца, ёсць адна рэч, пра якую працаўнікі парку гавораць з заклапочанасцю і неахвотна.

Я разумею іхную заклапочанасць.

Дык жа, нягледзячы на ўсе цудоўныя ўмовы, нягледзячы на мёд, трускалкі, арэхі, будкі для зімоўкі, сотні тысяч долараў, укладзеныя ў парк, грамадскія кампаніі ў Балгарыі ды па ўсім свеце, нягледзячы на асабістую заангажаванасць Брыджыт Бардо, чый фонд пакрывае

палову расходаў парку, і іншых уплывовых абаронцаў жывёл, нягледзячы на хаванне ежы пад камянямі, нягледзячы на частыя візіты нямецкага стаматолага, нягледзячы на рэгулярныя аналізы крыві, калу і мачы, нягледзячы на тое, што ім вылечылі катаракту, адрэгулявалі ціск, на тое, што яны атрымліваюць дастатковую колькасць калорый, што холкі ўжо пакрываюцца ржою ў выставачнай зале, а колішнія дрэсіроўшчыкі маюць хворае сэрца, рак, цыроз вантробы або ўжо памерлі, дык вось, нягледзячы на ўсё гэта

амаль усе мядзведзі

да сёння

танчаць.

Як убачаць чалавека — становяцца на заднія лапы і пачынаюць гойдацца з левай на правую. Быццам яны кленчаць — як раней — хлеб, цукерку, глыток піва, пяшчоту, вызваленне ад болю. Болю, які ўжо даўно ніхто ім не робіць.

3

Гэта здараецца ў розных сітуацыях і — як кажуць працаўнікі парку — выклікае пачуццё няёмкасці.

Часам дастаткова, каб яны проста ўбачылі цень чалавека на далягляцдзе.

Часам яны адчуюць нейкі пах, напрыклад парфумы, які нагадвае ім ранейшае жыццё. Хто ж можа прадбачыць, што адна з наведніц парку пырснулася тою парфумай, якую — ну, дапусцім — ужывала жонка дрэсіроўшчыка? Або адэкалонам, які ўжываў сам дрэсіроўшчык? Ці чыёсьці дзіця будзе пахнуць, як іхнае дзіця?

Чалавек такіх нюансаў не адчуе, але ў мядзведзя нюх — гэта самае развітае пачуццё. У прыродзе яны адчуваюць пахі на некалькі кіламетраў. Вясною дзікія мядзведзі могуць выкапаць у снезе глыбокую яму, бо адчуваюць, што ўнізе — прысыпаныя зямлёю рэшткі казулі. У парку дастаткова фанціка ад цукеркі, які ляжыць у чыёй-небудзь кішэні, каб разбудзіць нейкі глыбока прыхаваны ўспамін.

А можа, яны танчаць, таму што іх зашмат на малой тэрыторыі? Дзікаму мядзведзю трэба як мінімум 30 квадратных кіламетраў, каб ён мог песціць сваю адзіноту. Бо адзінота — гэта асноўны складнік мядзведжай натуры. А тут яны мусяць прыняць, што ў адным сектары іх адразу некалькі. На большасць з іх прыпадае толькі 250 квадратных метраў.

Таксама можа быць так, што парк не выконвае ніводнай з мядзведжых патрэбаў. Не выконвае патрэбы натуральнай — бо, не будзем нікога падманваць, умовы тут не такія, як у прыродзе. Не выконвае і той, у якой мядзведзь вырас і правёў усё колішняе жыццё. Гэта гібрыд, які завіс недзе паміж воляй і няволяй. І гэта можа мядзведзя канфузіць.

А можа, мядзведзі танчаць, калі яны галодныя або нявыспаныя? Або калі прыходзіць момант, у які арганізм сігналіць, што пара западаць у спанне, а яны не ведаюць, што рабіць з гэтымі сігналамі?

У гэтыя моманты могуць узнікаць кампульсіўныя паводзіны, накшталт хаджэння па коле або аўтадэструкцыі. Добры, калі не ведае, што рабіць, грызе сваю лапу. Да крыві. Ён робіць гэта, калі не знаходзіць у сваёй галаве ключа да таго, што адбываецца.

Але большасць устае на заднія лапы і робіць менавіта тое, чым за апошнія гады зарабляла сабе хлеб, цукеркі і алкаголь.

Вядома, некаторыя іхныя паводзіны могуць выглядаць як танец, але танцам не з'яўляцца. Аднойчы ўдзельнікі школьнай экскурсіі пачалі пляскаць і здымаць Міму, бо яна ўстала на заднія лапы. Дзеці думалі, што яна танчыць, а яна ўсяго толькі прагаладалася і хацела разгледзець, ці не едзе ў ейны бок аўтамабіль з абедам.

Але часцей за ўсё іхныя паводзіны настолькі яўныя, што тут нікога не падманеш. Калі ў жыцці мядзведзяў з'яўляецца стрэс, яны спрабуюць рабіць тое, што ўбілася глыбока ў падсвядомасць.

— Ці перастануць яны калі-небудзь танчыць? — разважае дырэктар Іваноў. — Я думаю, што з года ў год яны будуць рабіць гэта ўсё радзей. Але я не ўпэўнены. Я ўжо казаў, што гэта праца над жывым арганізмам. Таму я не здзіўлюся, калі аднойчы, пад уплывам нейкіх знешніх фактараў, нашыя мядзведзі забудуць, чаму мы іх навучылі, і ўсе адначасова пачнуць танчыць.

X. КАНЕЦ

1

Восень у вёсцы Гецава, на вуліцы Пеларгоніі — гэта каскад колераў, якія спадаюць з дрэваў проста на дом колішніх мядзведнікаў. Даехаць сюды можна адною з тых дарог, да якіх яшчэ не дабраліся і, відаць, у хуткім часе не дабяруцца еўразвязаўскія фонды. Тут багата месцаў, дзе асфальт саступае месца камяням, жвіру і калюжынам.

Нягледзячы на тое, што мядзведзяў няма ў вёсцы ўжо шэсць гадоў, калі запытваем пра мядзведнікаў, нават найменшыя дзеці могуць паказаць дарогу. А тыя, хто хадзіў у дзіцячы садок, узгадваюць, як пасля заняткаў станавіліся каля брамы і кідалі мядзведзям цукеркі. Часам мядзведнік быў у добрым гуморы або папросту бачыў знаёмае дзіця. Тады ён адвязваў мядзведзя і падводзіў яго пад браму, каб той паказаў колькі трукаў.

Таму мы знаходзім шэры кубік дзіцячага садка, акружаны стракатым арнаментам арэляў і горак.

Насупраць садка бачым дом з аблупленым тынкам, зялёнаю брамай з вінаградам і цыганкай сярэдняга ўзросту, якая, пачуўшы пра мядзведзяў, пачынае гаварыць на ўсіх мовах гэтай часткі свету.

Красімір Крумлаў, балгарскі журналіст, які мне спадарожнічае, пераконвае, што будзе лепш, калі мы пагаворым па-балгарску, а ён мне ўсё перакладзе на польскую. Цыганка моцна ўсхваляваная.

— З нас зрабілі звяроў, — кажа яна, зацягваючыся цыгарэтай. — Мяне завуць Івэліна, я нявестка і жонка мядзведнікаў, нявестка Дымітра, жонка Вэсэліна. Мне балюча, што па ўсім свеце панеслася, быццам сям'я Станевых мучыць мядзведзяў. Гэта пры тым, што іншага такога мядзведніка, як мой цесць, нідзе не было!

— Мядзведзі слухаліся яго, як роднай маткі, — дадае старэйшая цыганка. Гэта жонка Дымітра Станева, Марыйка.

— Ён любіў іх, а яны любілі яго, — дадае Івэліна.

А ўнучка Дымітра, Вэсэліна, кажа, што самы шчаслівы ўспамін ейнага дзяцінства — вясновыя дні, калі дзядуля з мядзведзем пачыналі рыхтаваць праграму на новы год.

— Дужаліся на руках. Міша часам перамагаў дзядулю, — усміхаецца Вэсэліна. — Было бачна, які ён задаволены, калі дзядулю ўжо здавалася, што ён паклаў звера, яшчэ сантыметр, можа, два, і той апынецца на зямлі, а той раптам, зусім не ўжываючы сілы, — бах! — клаў дзядулю. Ажно морда ў яго смяялася ад таго, што такі нумар удаўся.

Дымітр і ягоныя сыны — тыя, што апошнімі прадалі сваіх мядзведзяў, — апошнія мядзведнікі ў Балгарыі.

Гэта Дымітр сядзеў, павярнуўшы галаву да вакна, калі ягоны ўнук, сын Вэсэліна, быў замкнёны ў клетцы з мядзведзем і не хацеў адтуль выходзіць.

Тады ягоная хвароба праявілася ўпершыню.

— Калі Мішу засунулі ў клетку і вывезлі, муж сеў, схапіўся за сэрца і гэтак сядзеў, — кажа ягоная жонка Марыйка. — Некалькі гадзін ён прасядзеў у маўчанні. Усе жанчыны ў доме — я, дачка, нявесткі, унучкі — плакалі, а ён не. Нават вокам не міргнуў. Мы хаваліся па кутах, каб ён не глядзеў на нашыя слёзы, але яму было ўсё адно. Ён нас нават не заўважаў.

2

Пахаваны Дымітр на могілках на ўскрайку вёскі, ягоная магіла ляжыць паміж каменнымі крыжамі Бог ведае якога стагоддзя, навейшымі магіламі паважаных і менш паважаных жыхароў і купінкамі травы, якою зарастаюць усе магілы без выключэння.

Нявестка Івэліна сядае ў наш аўтамабіль з глінянаю філіжанкай кавы і сарванаю па дарозе кветкай. Кветку пакідае каля фотаздымка цесця, каву ставіць на надмагільную пліту.

— Заўсёды, убачыўшы мяне, ён крычэў: — Мая найдаражэйшая нявестка, зрабі мне кавы! — кажа яна. — Часам па тры, чатыры разы на дзень. Таму заўсёды, калі я сюды іду, я прыношу яму каву. Такую, як ён любіў: без малака, без цукру, паўтары лыжачкі.

— У труну мы яму паклалі акардэон, бо ён з дзяцінства вельмі добра граў, — выцірае вочы жонка. — Прашу

прабачэння, звычайна я ўжо не плачу на ягонай магіле. Але сёння святога Дымітра. Мы заўжды ў гэты дзень разам весяліліся, пілі, спявалі. Нашыя мядзведзі таксама атрымлівалі нейкі добры пачастунак. Яны для нас танчылі. Мы былі шчаслівыя. А сёння? Няма ні мядзведзяў, ні мужа, ні дзяцей. Сыны мусілі з'ехаць у Грэцыю, бо тут няма перспектываў ніякай працы. Большасць былых мядзведнікаў выехалі. Пэнча, брат мужа, спачатку ездзіў на аўтацыстэрне, цяпер жа і ён у Грэцыі, працуе на будоўлі. Стэфан, наш швагер, цяпер у Італіі. Спачатку працаваў на запраўцы, цяпер хварэе.

Я гляджу на здымак Дымітра. Да каменнага помніка прыклееная фатаграфія віднага мужчыны з вусамі, які стаіць побач з выпрастаным Мішам, што пазуе на задніх лапах. Надпіс сведчыць: «Для Дымітра, які цягам доўгіх гадоў забаўляў дзяцей ад Варны да Залатых Пяскоў са сваім мядзведзем-танцорам».

У адной руцэ Дымітр трымае прывязаны да Мішы павадок.

У другой — гуслі, на якіх заўжды граў мядзведзю падчас танца.

— Уласна, гуслі! Што цяпер з гадулкай Дымітра? — запытваю, а Красімір перакладае маё пытанне цыганкам.

— Ён забраў з сабою акардэон. Гуслі яму я занясу, — кажа жонка Марыйка.

З таго моманту ўсю дарогу ад могілак да іх дома мы маўчым.

3

Дымітр Станеў пачаў хварэць адразу пасля ад'езду мядзведзяў.

— Чалавек, які заўжды быў самы здаровы ў сям'і, — падкрэслівае жонка Марыйка. — Які да позняй восені мог спаць на двары, прыкрыты абы-чым, і нават насмарку не зарабіць. Чыім каронным нумарам было дужанне з мядзведзем. Хто ў дужанні на руках клаў усіх у ваколіцы. Ён раптам зрабіўся слабы, як травінка.

Ездзіў да лекара ў Разград. Пасля ў Шумен. У Варну.

Ён хадзіў па доме, быццам яго не было. Нешта казаў, але ў сярэдзіне сказа забываўся, пра што хацеў сказаць.

— Дзядуля заўжды цудоўна граў на акардэоне, — кажа ўнучка. — Аднойчы ўвесну, можа, праз два гады пасля таго, як у нас забралі мядзведзяў, да яго ўрэшце вярнуўся добры настрой. Ён сказаў, што трэба жыць далей. Ён узяў свой народны строй, узяў гармонік і найперш паехаў у Варну, а потым патэлефанаваў, каб сказаць, што едзе са знаёмымі ў Грэцыю. Там ён хадзіў па рэстарацыях з акардэонам, спяваў і збіраў грошы.

— Яго не было паўтара месяца, — кажа жонка. — Ён вярнуўся яшчэ больш сумны. «Я пачуваўся дурнем, — сказаў ён. — Гэтыя песні не спяваюцца без мядзведзя».

І зноў занурыўся ў сябе.

За год ён назбіраў поўную торбу лекаў. Такую, са штучнай скуры. Адныя ад высокага ціску, другія для вантробы, трэція для нырак. Сям'я дагэтуль не можа тую торбу выкінуць.

Можа, калі б Дымітр жыў у іншай краіне, ён бы патрапіў да лекара, які б выявіў у яго дэпрэсію, прапісаў лекі, што папраўляюць самаадчуванне, а мо нават некалькі тэрапеўтычных сеансаў, дзе б ён дзяліўся болем пасля ад'езду мядзведзя. Можа, тэрапеўт бы дапамог перажыць гэтую траўму так, як дапамагаюць блізкім ахвяраў аўтамабільных аварый або блізкім памерлых ад раку. Бо Міша быў у ягоным жыцці дзевятнаццаць гадоў.

Быць можа, калі б арганізацыя, што забірала мядзведзяў, працавала ў трохі іншым стылі, яны б самі прапанавалі Дымітру такую дапамогу. Нескладана здагадацца, што, калі нехта цягам жыцця займаецца адною справай, яму цяжка ўмомант прыдумаць сабе новы занятак. Нават калі лічыць ягоную працу варварскай, не паспрачаешся, што ў Дымітра з Мішам была глыбокая сувязь.

Але не. «Чатыры Лапы» думаюць толькі пра звяроў. Калі запытаць у іх пра мядзведнікаў, яны кажуць: ёсць адмысловыя арганізацыі, што займаюцца правамі ромаў. Вось да іх і трэба звяртацца.

4

Праз некалькі месяцаў пасля вяртання з Грэцыі Дымітра схапіў першы інфаркт. У хаце. Ён зваліўся ў кухні, паміж сталом і лядоўняй.

Хуткая завезла яго ў Разград. Лекары сказалі, што ягонае сэрца зусім слабое. Што наступнага інфаркту (а наступны інфаркт — гэта толькі справа часу) ён не перажыве.

Дымітр вярнуўся дадому з яшчэ большаю порцыяй лекаў і загадам нічым не пераймацца. Перастаў глядзець

навіны. Перастаў слухаць радыё. Нават кавы стараўся не піць.

У шпіталь у Варне ён патрапіў праз мікраінфаркт. Адтуль ён ужо не вярнуўся.

— Дзядуля памёр летась, ад суму. Ад суму па Мішы, — унучка Вэсэліна ад эмоцыяў пачынае заікацца. І плача.

Смерці Дымітра Міша не зразумее сваёю мядзведжай галавою. Ён, відаць, ведае толькі тое, што быў чалавек, быў доўга — часам чалавек быў ударам, часам цукеркаю, часам хлебам — і раптам гэты чалавек знік.

Часам чалавек вяртаецца да яго як пах, як смак. Тады Міша на імгненне траціць упэўненасць у сабе. Але гэта не перашкаджае яму рабіць цудоўныя крокі на шляху да волі.

У яго сапраўдная мядзведжая дыета. Ён навучыўся западаць у спанне, нават сам можа выкапаць сабе яму. Карані зубоў, якія перашкаджалі яму жаваць больш цвёрдыя кавалкі мяса, яму вырваў прафесійны дантыст, а след ад холкі ўжо зацягнуўся шнарам.

Калі прыходзіць вясна, Міша абуджаецца ад летаргіі і ідзе да Светлы. Кружыць вакол яе, як нясмелы падлетак. То падыдзе, то зноў аддаліцца. Рыкае, трэцца аб дрэва, зноў падыходзіць. Светла цярпліва глядзіць гэты тэатр.

Урэшце яны падыходзяць адно да аднаго.

Спроба прадоўжыць род цягнецца нядоўга. Калі яна сканчаецца, Светла на некалькі тыдняў пагружаецца ў стан шчасця. Толькі праз месяц ці два яна пачынае ўсведамляць, што нешта пайшло не так. Тады і яна, і Міша пачынаюць танчыць — у розных кутках парку мядзведзяў-танцораў у Беліцы. Парку, як з турыстычнай брашуры.

Частка 2

I. ЛЮБОЎ

Хлеба ёй заўжды хапала. Найлепшага алкаголю. Трускалак. Шакаладу. Батонікаў. Каб я мог, насіў бы яе на спіне. Таму, калі ты кажаш, што я біў яе, што ёй са мною было кепска, хлусіш.

Надыходзіць МакРэвалюцыя

— Барадач ужо доўга не пацягне, — кажуць людзі ад Гуантама да Пінар-дэль-Рыё.

— Ён ужо памёр, толькі яны баяцца сказаць. Каб народ не ашалеў ад жалю, — іранізуе Альфонса, таксоўшчык з Гаваны. У тым, што Фідэль памёр, ён перакананы: швагер знаёмага працуе санітарам ва ўрадавым шпіталі і, падобна, бачыў Фідэля на ўласныя вочы. Кастра — паводле швагра — паміраў. — У вярхушцы ўжо вядуцца размовы, хто яго заступіць і які будзе наш новы парадак, — кажа Альфонса. — Бо тое, што камунізм не апраўдаў сябе, відавочна. Але капіталізм таксама ў нас не могуць увесці адразу, бо гэта так, як камусьці, хто доўга нічога не еў, раптоўна даць пяць гамбургераў адразу. Страўнік не вытрымае.

Адным словам — нашыя палітыкі мусяць падрыхтавацца да зменаў.

— Як падрыхтавацца?

— Ну, як заўсёды ў падобных выпадках. Упэўніцца, што пэўныя прывілеі ў іх застануцца. Што ніхто не забярэ ў іх маёнткаў. Што іхныя людзі змогуць адкрыць уласны бізнес. Калі яны дамовяцца, у нас пачнуцца перамены. Як у Польшчы, як ва Усходняй Нямеччыне, як у Румыніі.

— Якія палітыкі? Рауль Кастра?

— Нееее, — надзімае вусны Альфонса. — Гэта ўжо адбываецца па-за ягоным светам. Браты Кастра ментальна затрымаліся на ўзроўні халоднай вайны. Дамаўляюцца тыя, чыіх прозвішчаў не ведаем ні ты, ні я. Так гэта працуе, ты ж мусіш сам ведаць, — і Альфонса глядзіць на мяне з дакорам, як глядзяць на таго, хто зусім не ведае жыцця. Такім, відаць, ён мяне бачыць: мала таго што, насуперак пераконванням швагра, не веру ў смерць Кастра, дык яшчэ й не ведаю, як змяняецца палітычны лад.

Марыя, уладальніца латка з яйкамі ў цэнтры Гаваны, між тым, лічыць інакш: — Фідэль жывы. Але ён не разумее, што адбываецца навокал. Яго штучна ўтрымліваюць пры жыцці. І вядома ж, рашэнні прымае не ён.

Марыя ведае кіроўцу, які вазіў Фідэля ў шпіталь. — Яму засоўваюць асадку ў руку, каб ён нешта падпісваў, але рукою водзіць Рауль, — кажа ў непахісным перакананні.

— Гэта ўсё дурната, — злуецца Мірургія, сапраўдная камуністка. Ейны муж працуе ў адным з міністэрстваў, таму яна мае — як сама сцвярджае — доступ да самай свежай, найбольш дакладнай інфармацыі. — Фідэль Кастра

адчувае сябе ўсё лепш, і ўсе ворагі будуць здзіўленыя, калі ўбачаць, колькі яшчэ добрага ён зробіць для Кубы, — кажа яна, а ейны валляк ажно трасецца ад абурэння, што нехта можа думаць інакш.

Колькі людзей, столькі меркаванняў. Столькі ж у большай ці меншай ступені выдуманых знаёмых, сярод якіх кожны мае доступ да навінаў ад кіроўных вярхоў. І столькі ж ідэяў, што станецца з Кубай, калі старэйшы з братоў Кастра ўрэшце памрэ.

Шчоткі замест паваротнікаў

У 2006-м у Фідэля здарыўся сур'ёзны ўнутраны крывацёк, і ўвесь свет чакаў, што неўзабаве прагрыміць навіна пра ягоную смерць. Мы з Альбертам Завадай, які тады працаваў фотарэпарцёрам «Газеты Выборчай», хацелі ўбачыць, як кубінцы адрэагуюць на гэтую смерць. Мы паляцелі на востраў, у турыстычнае мястэчка Варадэра, дзе на райскіх пляжах апаляюцца натоўпы турыстаў з усяго свету, і знялі аўтамабіль, найтаннейшы, які быў, — пежо 206.

Нягледзячы на тое, што ён быў танны, ягоныя чырвоныя нумары ператварылі нас у звышлюдзей.

Па-першае, арэнда аўто на дзесяць дзён каштуе столькі ж, колькі прадстаўнік дарожнай паліцыі — прынамсі, афіцыйна — зарабляе за два гады. Па-другое, з чырвонымі нумарамі па Кубе ездзяць збольшага турысты, а вялікая колькасць кубінцаў жывуць дзякуючы іхным грошам. Відаць, таму паліцыянт затрымаў нас толькі адзін раз. Славіў нас, калі мы нахабна імчалі па сустрэчнай. Спыніў і ветліва папрасіў, каб больш так не рабілі.

Па-трэцяе, аўтамабіль на Кубе — гэта рарытэт. Аўтобусы ездзяць рэдка, нерэгулярна і часта псуюцца. Калі ў іх перагараюць лямпачкі ў паваротніках, кіроўцы прымацоўваюць шчоткі на матузку і цягнуць за матузок то з левага, то з правага боку, калі якраз збіраюцца паварочваць. І калі маюць, дзе набыць шчотку. Кожны, хто мусіць некуды ехаць, галасуе на дарозе. Для аўтаспыннікаў пабудавалі нават адмысловыя навесы, гэтак званыя пункты альтэрнатыўнага транспарту. Чалавек ва ўніформе затрымлівае машыны і размяркоўвае месцы. Чаканне займае гадзіны. Таму кожны, хто мог, залазіў у наша аўто. За восем дзён з намі праехаліся:

- 25 працаўнікоў сельскай гаспадаркі,
- 6 паліцыянтаў у форме і адзін у цывільным,
- 4 інжынеры,
- 8 мядсёстраў і 2 лекары — усе ў белых фартухах,
- 1 ксёндз, асістэнт мясцовага біскупа,
- 6 салдатаў,
- 12 дзяцей — у ці са школы,
- 3 цяжарныя жанчыны і 4 з дзіцём на руках,
- 12 пенсіянераў і шмат іншых.

Разам — нашмат больш за 100 чалавек.

Сапраўдная камуністка: Буш хоча забіць нас

Мы едзем па дарозе з Санцьяга дэ Куба ў горы Сьера Маэстра, у якіх Фідэль вёў сваю рэвалюцыю. Адсюль ён рушыў, каб заваяваць Гавану, каб у 1959-м разам са сваімі партызанамі ажыццявіць канчатковы штурм войскаў прэзідэнта Флюгенсія Батысты, якога падтрымлівала Амерыка.

Джунглі тут па-цнатліваму нахабныя і экспансіўныя, ствараецца ўражанне, што, калі б мы спынілі аўтамабіль на паўгадзіны, яны б пралезлі ў сярэдзіну, знішчылі абіўку, а пад канец разявілі пашчу і з'елі нас разам з нашым пежо. Зеляніна ажно пячэ, прычым не адным, а некалькімі дзясяткамі розных адценняў, паміж якіх, як коскі ў сказе, мільгаюць каляровыя птушкі.

Гэтае месца створанае, каб заставацца дзікім. Дарога выглядае тут абсурднаю, шэра-сіняю стужкай, якую нехта выпадкова кінуў паміж парослых зелянінай і спярэшчаных птушкамі гор. На гэтай дарозе стаіць элегантная пульхная цемнаскурая кабета за пяцьдзясят. Мы спыняемся, запрашаем яе ў сярэдзіну. Яна старанна ўсаджваецца, папраўляе строй і прымацаваны да чорных-чорных валасоў капялюшык, а мы кіруемся ў бок найбліжэйшага мястэчка.

— Вітэк, — прадстаўляюся я, калі наша госця ўжо зручна ўселася. Мы ўжо ведаем, што яе завуць Мірургія і што яна вяртаецца ад сваёй маткі, якая жыве ў гэтых гарах і якая нядаўна захварэла. — Фідэк? — Мірургія не можа паўтарыць.

— Не, не Фідэль. Але раз ужо зайшла гаворка пра Эль Камандантэ... — усміхаюся сабе пад нос.

Гэтак мы пачынаем размову пра Кастра, які памірае. Наўпроставае пытанне тут недарэчнае — крытыка Барадача можа абярнуцца турмой. Але людзі, магчыма, на эмоцыях ад хваробы і, як здаецца, няўхільнага сыходу старэйшага з братоў Кастра, размаўляюць з намі на дзіва шчыра і адкрыта. І тыя, што Кастра любяць, і тыя, што жадаюць яму найгоршага.

Мірургія належыць да першай групы.

— Я б хацела, каб ён пражыў яшчэ столькі ж, — кажа з жалем у голасе і зноў папраўляе капялюшык.

— Чаму?

— Дзякуючы яму мы апошняя краіна, якою ЗША не кіруе за нітачку. У нас цудоўная сістэма адукацыі і аховы здароўя. Ніхто тут не памірае з голаду. Дастаткова паглядзець на Дамініканскую Рэспубліку ці Гаіці, якія ходзяць на павадку ў амерыканцаў. Там няма чаго есці. А ў нашых крамах можна набыць усё...

Мірургія — самая сапраўдная камуністка з усіх, каго я сустрэў. Яна чалец партыі, кіраўніца раённага Камітэта Абароны Рэвалюцыі і жонка міністэрскага чыноўніка. Прынамсі, яна так сцвярджае, хаця, раз ездзіць аўтаспынам, відаць, муж — чыноўнік ніжэйшага звяна. Сур'ёзнасці ёй дадае значок з рэвалюцыйнай зорачкай, прышпілены да лацкана пінжака. Здымак Фідэля яна трымае нават у гаманцы. Паказвае яго нам: Фідэль, яшчэ малады, з чорнаю як смоль барадой і цыгарай.

— Так, але звычайныя кубінцы не могуць увайсці ў такія крамы, — кажу я Мірургіі. — Усе тавары ёсць толькі ў крамах для турыстаў, за pecos convertables — валюту для замежнікаў. У крамах агульнага доступу я бачыў пустыя паліцы.

— Вядома, у нас бываюць цяжкасці. Амерыканцы робяць усё, каб аслабіць нашую гаспадарку...

— А вашая гаспадарка — гэта што?

— Трыснёг, тытунь, найлепшыя на свеце цыгары. Дастаткова?

— Каб пракарміць адзінаццаць мільёнаў чалавек? Ну, не ведаю...

— Яшчэ ёсць турысты. Нашмат больш за два мільёны. Яны ездзяць па ўсім узбярэжжы; у Гаване яны сядзяць у кожнай другой рэстарацыі. Нават тут, у Сьера Маэстра, мая мама бачыць іх амаль штодня.

Гэта праўда. Фідэль пачаў пускаць іх пасля падзення СССР, калі Куба апынулася на мяжы галечы. На курортах, якія зеўралі пустэчай, ізноў з'явіліся замежнікі, а гаманцы людзей пры ўладзе пачалі запаўняцца наяўнымі. Таму за турыстычным бумам стаяць людзі Рауля Кастра, пераважна вайскоўцы.

— Калі ўсё настолькі добра, чаму столькі людзей жабруюць? Чаму столькі jineteras, прастытутак?

— Бо не маюць годнасці, — абураецца Мірургія. — Хочуць атрымліваць грошы проста так, а на Кубе трэба працаваць. Прыстойны чалавек зарабляе працай, а не, даруйце, падстаўляннем сракі. Мае бацькі жылі ў вёсцы, былі страшэнна бедныя. Здаралася, што мы елі суп з кары дрэваў. Да ўсяго, што я маю сёння, я дайшла цяжкаю працай. Я скончыла школу, пайшла ва ўніверсітэт. Працую інжынерам, будую дамы, а больш за ўсё ганаруся шпіталем у Гаване. Я адказвала за адзін з ярусаў, і сам Фідэль мяне віншаваў. Ці магчыма гэта ў іншых краінах Карыбскага басейна? Там людзі дагэтуль ядуць кару. А наш галубок хай бы жыў дзвесце гадоў! Без яго-то якраз зробяць у нашай краіне бардак.

Гаспадар: За час трэба плаціць

Калі я снедаў у Матансасе, турыстычнай пярліне над залівам, што носіць такую ж назву, у дом маіх гаспадароў прыйшла маладая, апранутая з выклікам дзяўчына. На вока ёй было гадоў 17. Дзяўчыну прывабіла аўто з чырвонымі нумарамі. Яна пачала распавядаць пра сваю цяжкахворую бабулю, да якой я абавязкова мушу яе завезці. Я хацеў ёй дапамагчы, пачаў ужо абуваць чаравікі.

Гаспадар мяне спыніў. — Яна б загадала табе вазіць яе па ваколіцы і чакала, што між вамі нешта адбудзецца, — патлумачыў ён мне пазней. — Незалежна ад таго, ці адбылося б, ты мусіў бы даць ёй нейкія грошы. За час, праведзены разам. Тут многія спрабуюць так зарабляць.

Прыклад, як выцягваць грошы з замежнікаў, мясцовыя бяруць зверху. Фідэль усё жыццё жыў за савецкія грошы. Калі скончыўся Савецкі Саюз, ён знайшоў наступнага спонсара, Уга Чавеса з Венесуэлы.

Нямецкі біёграф Фідэля Фолькер Скерка прыводзіць такі анекдот: «Імя Фідэля Кастра ўпершыню з'явілася ў актах Белага Дому ў 1940-м. 12-гадовы навучэнец езуіцкага каледжа ў Санцьяга дэ Куба выслаў прэзідэнту Франкліну Д. Рузвельту ліст на тры старонкі, дзе павіншаваў прэзідэнта з перавыбраннем. Перад тым як падпісацца, хуліган выклаў асабістую просьбу: „Калі можаш, дашлі мне дзесяцідоларавую амерыканскую банкноту, бо я ніколі іх не бачыў, а хацеў бы мець адну з іх“. Кастра не атрымаў адказу ад прэзідэнта, а толькі

лісток з падзякаю ад Дэпартамента штата. У лісце не было банкноты. Ніхто тады не мог прадбачыць, што, калі той хлопец вырасце, ён канфіскуе ўсю амерыканскую ўласнасць на Кубе».

— Таксама ён канфіскаваў усю маёмасць кубінцаў. Таму яны і «канфіскуюць» у турыстаў усё, што могуць. Такая форма гістарычнай справядлівасці, — смяецца прадстаўнік адной з турыстычных фірмаў.

Працоўны: Я б памяняў жонку

Хасэ Мэндоза, прыгожы мулат, рассеўся на задняй сядушцы, як Кароль Малалітражных Аўто. Ён сеў у наш аўтамабіль на аўтастрадзе з Матансасу да Санта-Клары, г.зв. Autopista National. У вокнах нашай машынкі, якая тут нясецца з хуткасцю амаль сотні на гадзіну, прабягаюць цені пальмаў, асабліва доўгія гэтаю парою. Некалькі разоў мы праязджаем велічэзныя плантацыі цукровага трыснягу, работнікаў да якіх давозяць вялікія савецкія зілы. Убачыўшы калег, Хасэ гучна крычыць, махае рукамі і пухне з гонару, што сёння едзе з намі, а не з імі.

— Я ўпершыню еду на аўтамабілі, у якога ўсярэдзіне ёсць машына, якая робіць халодна, — усміхаецца, адчуваючы на скуры ветрык з кандыцыянера. — Я езджу на працу сціснуты, як шпрот. Я працую ў аграіндустрыяльным комплексе «Fernando de Dios», на вялікай плантацыі цукровага трыснягу. Штораніцы нас збірае зіл, ездзячы па вёсках, і, калі не зламаецца, давозіць нас на восьмую гадзіну на працу.

— Гэта добрая праца?

— Цяжкая. Трыснёг зразаецца пры дапамозе мачэтэ. Я мушу махаць мачэтэ па дзесяць гадзін на дзень, з кароткім перапынкам на найбольшую спёку.

— Колькі ты зарабляеш?

— 10 долараў. У месяц.

— Хапае?

— Жонка таксама працуе. А я падпрацоўваю на будоўлі. Калі няма жніва, магу падвоіць ці нават патроіць свой заробак. 30 долараў — гэта ўжо прыстойна, праўда? Тут кожны павінен падзарабляць. Мой брат прадае сыр на аўтастрадзе. Швагер перапрадае налева бензін са службовага аўто. Цётка гадуе курэй і возіць на кірмаш у Гальгіне. Жонка піша людзям лісты да ўладаў і чыноўнікаў, а цесць стрыжэ людзям валасы.

— Ты б памяняў што-небудзь у сваім жыцці?

— Я б памяняў жонку, бо мне ўжо нецікава. І працу. Я хацеў бы больш будаваць і менш працаваць на трыснягу. Але наракаць недарэчна. У мяне зусім нармальнае жыццё. І на плантацыю я не наракаю. Там я пазнаёміўся і з жонкай, і з каханкай. Найперш з жонкай. Яна працуе ў нас бухгалтаркай. А нядаўна я пазнаёміўся з Ёанай, яна мачэтэра ў жаночай групе. Мы разам падрыхтавалі насценгазету да 80-га дня народзінаў Фідэля. Мы разам паехалі ў Гальгін па таварыша з Гаваны, які зачытаў даклад пра значнасць вытворчасці цукровага трыснягу для непарыўнасці рэвалюцыі. Сёння ў нас будзе першае спатканне ў Гальгіне.

— А што ты думаеш пра здароўе Фідэля?

— Каб ён жыў сто пяцьдзясят гадоў! — з энтузіязмам кажа Хасэ. Але праз імгненне задумваецца.

— Што здарылася? — пытаю я.

— А нічога... Ведаеш, часам мне цяжка вырвацца з дому ў горад. А я якраз падумаў, — і тут Хасэ гарэзліва ўсміхаецца, — што, як Фідэль памрэ, дакладна трэба будзе зрабіць нейкую насценгазету.

Чэмпіёнка па сальсе: Мае пазногці для Фідэля

Бранзалеткі, каралі, ракавінкі і хусціны; штучныя кудзеры перамяшаныя з натуральнымі; вялікія завушніцы і даўжэзныя пазногці. Анна, выбітная танцорка і настаўніца сальсы, самая яскравая асоба, якую я бачыў у сваім жыцці, замірае на выцягнутых нагах, крыху адставіўшы руку. Побач з ёю муж і партнёр Асвальда.

Дзве гадзіны таму абодва стаялі каля дарогі і галасавалі. Яны вярталіся з Варадэра, дзе танчылі ў адным з гатэляў. Узамен за падвозку яны запрасілі нас на махіта і паказ сальсы.

Магнітафон, падобны да сабакі-таксы, трашчыць, пакой напаўняюць першыя гукі. Пачынаюць бубны, уступаюць трубы і праз хвіліну Ібраім Фэрэр з «Buena Vista Social Club» (здаецца, нашыя гаспадары яго ведалі асабіста) спявае пра каханне, складанае, але вартае ахвяраў. Асвальда робіць крок наперад, Анна адступае і трасе галавою — «не». Ён, засаромлены, робіць крок назад. Тады наперад ідзе яна. І так па коле, некалькі разоў, каб паказаць змаганне каханкаў, у якім самае складанае — каб супалі жаданні. Музыка распальваецца, гэтак жа і танцоры. У канцы яны моцна абдымаюцца, фінал і брава. Ім пляскаюць госці: сын з дзяўчынай, дачка з дзецьмі і некалькі турыстаў.

Гэта быў паказ для патэнцыйных кліентаў Anna Salsa School. Лекцыя каштуе 10 песа за гадзіну. Усё ў малым пакойчыку, які ўдзень з'яўляецца акадэміяй сальсы, а ўначы ператвараецца ў кватэру. Імбрык, тэлефон, старая лядоўня. На сценах і шафах традыцыйныя кубінскія лялькі, апранутыя, як дзяўчыны на карнавале.

— У мяне музыка ў генах, — кажа Анна. — Дзядуля да вайны быў вядомым джазмэнам і шоумэнам. Ягоным ключавым нумарам была ігра на бубнах. З гэтым ён праехаў усе Злучаныя Штаты і Еўропу.

— А бацькі?

— Бабка нарадзіла восем дзяцей. Матка — ужо толькі мяне. Яна рабіла кар'еру спявачкі. Fania All Stars, знакамітая студыя гуказапісу, падпісала з ёю кантракт на дзесяць кружэлак наперад. Каб яе не пераманілі канкурэнты. Мы жылі ў прыгожым доме ў прыгарадзе. Матка развялася з бацькам, была надта незалежнаю. Жыла поўным жыццём. А мне, чым старэйшая я рабілася, было ўсё цяжэй прымаць рэчаіснасць...

— А менавіта?

— Няроўнасць. Тое, што адныя маюць мільярды, а ў іншых няма нічога. Тое, што пасля заняткаў я магу ісці на марозіва, а тысячы дзяцей не ходзяць у школу. І тут прыйшла рэвалюцыя. Маці была ў роспачы. Гэта быў канец ейнага жыцця. Раўты, балі з багатымі прадпрымальнікамі — усё скончылася. Я — наадварот. Нават калі Фідэль забраў у нас наш дом і ўсю мэблю, я лічыла, што ён робіць слушна.

— Сапраўды так лічыш?

— Вядома. Мы адзіная краіна, дзе людзі сапраўды роўныя.

— Але бедныя.

— Беднасць ёсць паўсюль. Роўнасць — толькі ў нас. Рэвалюцыя — гэта мая самая вялікая любоў, другая пасля сальсы. Для Фідэля я танчу, для яго ўплятаю ў валасы прыгожыя кветкі і фарбую пазногці. Паглядзі, самы доўгі ў мяне колераў нашага сцягу.

— Ты ездзіла за мяжу?

— Толькі тады, калі мне споўнілася шэсцьдзесят, я паехала танчыць і рэкламаваць кружэлкі «Buena Vista Social Club». Гэта было вялікае перажыванне. Падарожжа на самалёце, элегантныя гатэлі, сустрэчы з музыкамі. Мы танчылі ў Лондане, Вене, Цюрыху. Хлопцы з Buena Vista — нашыя сябры. Яны арганізавалі гэтую паездку. Ібраім Фэрэр гадзінамі праседжваў у нашай кватэры. Калі ён сварыўся з жонкаю, прыходзіў да нас з бутэлькай рому, сам яе выпіваў і заставаўся на ноч. На жаль, потым ён зарабіў шмат грошай, купіў вялікі дом пад Гаванай і рабіў выгляд, што нас не ведае. Нядаўна ён памёр.

— Грошы змяняюць людзей, — дадае Асвальда. — Мы зарабляем у самы раз — хапае на жыццё. Шмат аддаем дзяржаве — адная толькі ліцэнзія на вядзенне бізнесу каштуе некалькі сотняў песа. У нас няма грошай, каб памяняць кватэру на большую. Гэты пакойчык 12 метраў. Яшчэ нядаўна мы тут жылі ўпяцярых. На шчасце, дзеці пераехалі. Добра, што мы не мусім ім дапамагаць.

— Я нарадзіла шэсць дзяцей. Гэты жарабец іх мне нарабіў, — смяецца яна і паказвае на мужа. — Кожнага разу праз два тыдні пасля родаў я зноў пачынала танчыць. Танец — гэта ўсё маё жыццё. Танец і рэвалюцыя.

Бізнесовец з Нямеччыны: Прадам ім усё

На дарозе пад Сьега-дэ-Авіла, напоўненай брычкамі каланіяльнай пярлінкі, стаіць раскірэчаны джып, таксама з чырвонымі — як наш пежо — нумарамі. Міхаэль, шасцідзесяцігадовы немец, змагаецца з прабітым колам. У пункце пракату ён не атрымаў запаснога кола. Мы забіраем яго ў свой аўтамабіль і дапамагаем знайсці вулканізатар.

Міхаэль прыкідваецца тым, кім ён не ёсць. Афіцыйна ён турыст, што прыехаў на курорт. Неафіцыйна — бізнесовец, які прыехаў па кантакты.

— Куба — гэта белая пляма, — тлумачыць ён. — Аналітыка сцвярджае, што пасля смерці Кастра тут можа адбыцца змена курсу на сацыялізм з элементамі свабоднага рынку. Чвэрцькапіталізм. Магчыма, на Рауля моцна ціснуць малодшыя міністры ды афіцэры. Яны не змагаліся за рэвалюцыю, ейны эпас ім чужы. Яны хочуць зарабляць больш грошай і мець лепшы ўзровень жыцця.

— Што гэта значыць?

— Калі Куба адкрыецца на ўвесь свет, ты прадасі ім усё. Не хапае адзення, аўтамабіляў, мэблі, ежы. Што б ты сюды ні прывёз, усё прадасі. Майткі? Прадасі. Кансервы? Прадасі. Фатэлі? Прадасі. Плюшавых мядзведзяў? Таксама прадасі. Яны адстаюць ад іншага свету на паўстагоддзя! Вось дзе нарэшце пачнецца бізнес!

— А ты што тут робіш?

— Шукаю каго-небудзь, хто мог бы стаць прадстаўніком маёй фірмы. Збіраю нумары мянялаў, гатэльных прайдзісветаў, прадаўцоў цыгар. Мае калегі гэткім чынам шукалі кантакты ў Польшчы. Я быў там з імі некалькі разоў.

— У Польшчы?!

— Ясна! Наогул Куба нагадвае мне познюю ПНР*. Тая самая ўзаемная залежнасць спецслужбаў і бізнесу. Чэргі пад пэвэксамі** і пад крамамі. Няпэўнасць, але з надзеяй на лепшае. Ну і вуліцы, поўныя фіятаў 126р***. Ці ведаеце, што яны больш хочуць мець гэтыя вашыя «малюхі», чым старыя амерыканскія седаны? Бо тыя мала спальваюць і да іх ёсць дэталі.

— Што тут для цябе самае складанае?

— Тое, што я не магу выйсці на спецслужбы. Калі на Кубу прыйдуць якія-небудзь перамены, службы будуць стаяць за імі. Тут не атрымаецца інвеставаць без іх. Я штодня тэлефаную жонцы і кажу, што шукаю тых залатых хлопцаў. Спадзяюся, яны праслухоўваюць мой пракляты тэлефон. І што аб'явяцца самі.

Мы ніяк не можам праверыць, ці кажа Міхаэль праўду. Верачы яму ці не верачы, пакуль што дапамагаем памя-

---

* Польская народная рэспубліка. — Заўв. пер.

** Pewex — валютная крама ў ПНР. — Заўв. пер.

*** Fiat 126p, які ў народзе атрымаў назву «maluch», «малеча», — невялічкі аўтамабіль, папулярны ў часы Польскай народнай рэспублікі. — Заўв. пер.

няць парамантаванае ў вулканізатара кола, развітваемся і вяртаемся ў Варадэра. Мы ездзілі па Кубе амаль два тыдні. Калі мы ўязджалі ў аэрапорт, «Granma», то-бок кубінская «Trybuna Ludu»*, размясціла здымак Фідэля ў шпітальнай піжаме з подпісам, што ён адчувае сябе ўсё лепш.

Год пасля смерці Фідэля

McDonald's з кубінскім урадам ужо падпісалі кантракт — праз год пасля смерці Фідэля яны адчыняць першую рэстарацыю ў Гаване. Яна размесціцца на катэдральным пляцы, у самым цэнтры старога горада. Хітом тут мае быць канапка McRevolution — з плямаю кетчупу ў форме чырвонай зоркі.

Такія плёткі распавядаюць адно аднаму людзі ў Гаване.

---

* Адна з самых шматтыражных газет ПНР. — Заўв. пер.

II. СВАБОДА

Свабода — гэта такі шок для мядзведзя, што яго нельга папросту выпусціць з клеткі ў лес. Трэба даць яму некалькі дзён, каб пераключыцца. Свабода — гэта новыя выпрабаванні. Новыя гукі. Новыя пахі. Новая ежа. Свабода — гэта для іх адна вялікая прыгода.

Лэдзі Перон

Вакзал Вікторыя, цэнтр Лондана. Поўнач, вакзал акупуюць тыя, каму няма куды ісці: бяздомныя, беспрацоўныя, дармаеды, выпівохі, вычварэнцы. На крэслах у зале чакання незвычайны трохкутнік: п'яны панк, элегантна апрануты мужчына і пажылая жанчына з такім вазком, з якім звычайна ходзяць бамжы. Кабета спакойна робіць сабе вячэру. Мужчыны абселі яе, як кураняты квактуху.

— Ты нашая вакзальная бабка! — крычыць ёй панк. — Ты нашая вакзальная бабка!

Кабета адрываецца ад наразання хлеба: — Гэй, малалетка, я ніякая не бабка! Мне ўсяго 55 гадоў! — крычыць яна па-польску. — Я Лэдзі Перон! Вывучы гэта ўрэшце!

Але хлопца не пераканаеш. Ён устае, хістаецца. Спрабуе пацалаваць бабку. Атрымлівае ў лоб, наводмаш, адкрытаю далонню.

— Добрая бабка, — радуецца ён. — Як мае быць. Трэба суцешыць — яна суцешыць. А як трэба, то і ў морду можа даць.

— Валі адсюль, малалетка, п'янтосіна! Сілаў ужо не маю на цябе! — крычыць кабета. — Заб'юць мяне тут, укакошаць! З моста саскочу! А вы мне цытрынаў набудзьце. І паўкілаграма цукру, — звяртаецца яна зусім спакойна да элегантнага мужчыны.

Каралеўства Лэдзі

Даўным-даўно Лэдзі жыла ў старой халупе пад Пабяніцамі, а пра вялікія чыгуначныя вакзалы ды сталіцы іншых краін ведала толькі з газет. Яна выразала з іх найбольш цікавыя артыкулы і фотаздымкі, пакідала сабе на памяць. Тады яе называлі Аліцыяй, гэтак жа, як у пашпарце.

Выразкі яна трымае да сёння. Напрыклад, пра сустрэчу Анджэя Лепера з Янам Паўлам II. Або пра лонданскі аўтобус, распораты бомбаю тэрарыста. Выразаючы яго, яна не магла нават дапусціць, што хутка такія аўтобусы будуць будзіць яе, калі яна спіць. І што яе саму абвінавацяць у тэрарызме.

Лепера яна выразала, яшчэ жывучы ў вёсцы. Яна ніколі не паспявала да аўталаўкі. Пакуль дашлёпвала, усё ўжо разбіралі.

Аўтобус яна выразала на чыгуначным вакзале ў Калюшках. Але нават тады яна не падазравала, як добра ўсё гэта разаўецца.

Сёння ейныя ўладанні — гэта прамавугольнік 200 метраў на 50. Два гектары. — Там Вікторыя, тут Коўч, а яшчэ Грынлэй, той, на які з Польшчы прыязджаецца, — паказвае яна рукой так, быццам паказвае, дзе расце які гатунак збожжа.

Вікторыя — вялікі чыгуначны вакзал. Коўч і Грынлэй — аўтобусныя. Пяць месяцаў тут запраўляе Лэдзі. У яе няма даху над галавою, таму прамавугольнік паміж вакзаламі — гэта ейны дом. У яе няма лядоўні, таму вакзальныя супермаркеты — гэта ейная лядоўня. Яна не мае грошай, але збірае падаткі.

Лэдзі на вакзале ў Калюшках

— Як вы тут апынуліся? — пытаюся я.

— Беднасць мяне выгнала з дому, — тлумачыць Лэдзі. — У Польшчы я ўжо халупы, лічы, не мела. Лачанне згніла, кроквы паламаў вецер, усё падлягала замене. Я звярнулася да гміны, і мне сказалі: — Ніяк не дапаможам. Гэта была апошняя кропля, бо ўсё, што я мела, — 500 злотых пенсіі. На жыццё хапала. Але я ўжо замярзала ва ўласнай халупе. Як адчула, што мне пагражае смерць, спакавала адну, другую торбу і пайшла на вакзал.

— Які вакзал?

— Чыгуначны.

— І на цягніку ў Лондан? — здзіўляюся я.

— Не так хутка, — смяецца Лэдзі. — Спачатку я спала на вакзале ў Пётркуве, потым у Калюшках. Там я таксама замярзала, бо не ацяплялі. Але ў Польшчы было нядрэнна, бо я спала ў залі чакання. Не так, як тут: на лаўцы ці

на тратуары. Мне толькі не падабалася ў Польшчы, што тыя вакзальныя мужыкі п'юць дэнатурат. І разносяць страшны смурод, бо сцуць, адліваюць, брудзяць, паляць цыгарэты. Гэта дэгенераты, дно. Калі ўжо п'еш, пі віно ці гарэлку. Так робяць культурныя людзі.

Лэдзі на тэме культуры крыху памяшаная. Нягледзячы на тое, што на Вікторыі старэйшыя і малодшыя звяртаюцца адны да адных на «ты», яна такога не дазваляе. Мусіць быць павага!

— І што — вы проста так прыехалі з вакзала ў Калюшках у Лондан? — усё яшчэ не разумею я.

— Не, спачатку быў той Страсбург. Які Страсбург? Хадзіце за мной, тут зачыняюць.

І сапраўды, ужо прабіла першая гадзіна ночы. Працаўнікі зачыняюць Коўч. Спадарыня Аліцыя паслухмяна збірае крошкі хлеба, а падляшскі паштэт — атрымала ад нейкага паляка — яна заварочвае ў фольгу. — З гэтымі ў жоўтых спяцоўках размова кароткая, — тлумачыць яна і павольна ўстае. — Колькі я праз іх нацярпелася, колькі слёз праліла! Двойчы праз іх трапляла ў шпіталь! Я хачу заявіць пра гэта на ўсю Англію. Яны мяне тузаюць, выганяюць. Я падаю, а яны па мне ідуць. А я калека, зусім не магу працаваць!

Я дапамагаю спадарыні Аліцыі пхаць вазок. Мы павольна выходзім на вуліцу.

— Хадзем туды, я зараз сплю ў тым пад'ездзе, — паказвае яна мне нейкую ўстанову за 50 метраў ад вакзала. — Раней я спала за аўтобусным прыпынкам. Але там дзьме вецер. Ужо мая крыжавіна баліць, нервы, бо я прастудзіла іх, калі спала на бетоне.

Справядлівасць ёсць у Страсбургу

— Шэсць гектараў і шэсць араў зямлі. Прыўкрасна, праўда? — спадзяецца на разуменне Лэдзі.

Столькі зямлі суседзі адабралі ў маткі спадарыні Аліцыі. — Тата нас пакінуў, — тлумачыць яна. — Калі б ён жыў з намі, яны б нічога не забралі. А так, паколькі не было мужыка, дык і не было каму бараніць. Матка была яшчэ горшаю калекаю за мяне. Ножку пакладзе на зэдлік і так сядзіць, не можа ўстаць. Я яе абслугоўвала. Пакуль я была маладзейшая, лепш працавала, а старэйшаю папсавалася. Матка памерла пару год таму.

Пасля смерці маткі, паводле спадарыні Аліцыі, ейныя суседзі паквапіліся на зямлю ды халупу. Спадарыню Аліцыю яны хацелі аддаць у прытулак. — Я сказала сабе: праз мой труп, — кажа Лэдзі эмацыйна. — У газеце я прачытала, што справядлівасць ёсць у Страсбургу. Што Страсбург дапамагае людзям, якіх ашукала польская дзяржава. Я набыла квіток і паехала ў Страсбург.

— Як гэта?

— Звычайна. Я села ў аўтобус і паехала. Я думала, што, можа, там мне дадуць кватэру. Я хацела там жыць, бо там цёплы край. Ну і я хацела сваю зямлю адсудзіць.

— Вы не баяліся?

— Страшэнна баялася! Раней я найдалей у Лодзь ездзіла. І на працу ў Пабяніцы. Я была вязальніцай, рабіла далонькі для пальчатак. Цяжка было, бо гэта праца стоячы. А пасля выйсця на пенсію я ўвогуле не пакідала ўласнае вёскі. А гэта такі глухі закутак! Але тады я баялася зрушваць

з месца, бо найбольшы страх, калі некуды ідзеш упершыню. І тады я гэтак разважала: ехаць ці не ехаць? Як не сустрэну там паляка, то мне ні з кім не дамовіцца. І так яно было. Я плакала, як немаўля. На вуліцы стаялі хлопец і дзяўчына. Дзяўчына ўзяла мяне пад руку і завяла ў той вялікі Трыбунал. А там такі чалавек, што стаіць на дзвярах, сказаў: «Навошта вы прыязджалі! Да нас не ездзяць! Нам пішуць!»

— А людзі з вёскі? Што яны казалі?

— Як я сказала, што еду ў Страсбург іх засудзіць, смяяліся, стукалі сябе па галаве. Сказалі, што і так нічога ў мяне не атрымаецца. І мелі рацыю, бо нічога не атрымалася.

— Дык ці варта было ехаць?

— Варта. Бо я ўбачыла, як усё гэта проста. Мне паўсюдна дапамагалі, вазілі, пыталіся, што трэба. І я падумала, што, відаць, калецы заўжды хтосьці дапаможа, куды б яна ні паехала. А калі я аднойчы стала пад вакзалам, адзін мужчына, што праходзіў міма, даў мне два еўра. Толькі працягнула руку, як мне пачалі людзі даваць нармальныя грошы! Я падумала, што варта туды яшчэ калі-небудзь вярнуцца.

Прайшла пара месяцаў. Замест Страсбургу Лэдзі паехала ў Лондан.

— Мне казалі, што тут рой палякаў. І сапраўды. Тут больш палякаў, чым ангельцаў. Сустракаюцца файныя, вельмі мне дапамагаюць. Адзін мне праспансараваў гатэль, дзве ночкі па 30 фунтаў заплаціў. У мяне нават паперка засталася на памяць. Другі даў мне пледзік і падушачку. А ёсць яшчэ такі доктарчык, які шторазу прыходзіць пагаварыць

і прыносіць мне чаго-небудзь паесці. Божа, як я цешуся, што іх сустрэла! Спачатку я баялася, што сустрэну адных валацугаў, п'яніц, люмпенаў. Бабулька, клічуць, дадай нам фунт ці два да «цайдру». Я вам буду дадаваць? А вы панабіраецеся, будзеце валяцца? О, не дачакаецеся!

Дэд азначае смерць

Шлях да ейнага пад'езда ў нас займае 15 хвілінаў. Цяжэй за ўсё пераадолець бардзюр. Ён завысокі. Лэдзі Перон робіць вельмі маленькія крокі; кожны з іх адгукаецца болем. Гэты боль яна ведае з дзяцінства. — Я нічога не магу: стаяць, насіць нешта, — падаю, — тлумачыць яна. — Цяпер мне ногі баляць. А калека я ад нараджэння, такой нарадзілася: адна нага на тры сантыметры карацейшая і таз у мяне крывы. Бацькі паказалі мяне лекару толькі ў другім класе. Нованароджаны адразу б паправіўся. А так — застарыя косці былі.

Даходзім. Лэдзі нервова ходзіць з кута ў кут. Яна мусіць знайсці такую нішу, дзе не будзе дзьмуць. І знаходзіць — адразу каля ўваходу. Аднак праз імгненне каля нас ужо стаіць маладая чорная дзяўчына з аховы. Выганяе нас з пад'езда. — Гэтая спадарыня бяздомная, — тлумачу я.

— Калі вы адсюль не сыдзеце, я буду вымушаная выклікаць паліцыю, — адказвае дзяўчына, хаця бачна, што адчувае сябе няёмка. Яна хоча прынесці бутэрброд або кубак гарбаты. Але спаць у пад'ездзе не дазваляе.

— Я ІН-ВА-ЛІД! — тлумачыць Лэдзі. Не дзейнічае. — Я заб'юся, скокну ў раку або кінуся пад аўтамабіль!

Нічога. Дзяўчына знікае. Лэдзі глядзіць на мяне з захапленнем.

— Добра вы па-ангельску шпрэхаеце. Хутка. Але мне лепш не разумець. Часам нехта махне рукой: і так гэтай бабе не растлумачу, хай ужо спіць, калі мусіць.

— Дык вы зусім нічога па-ангельску не ўмееце? — пытаюся я.

— Пару словаў умею, але няшмат. Кажу так: пліз, уотэр хот. Гэта значыць: прашу гарачай вады. Пліз, уотэр колд: прашу халоднай. Гуд морнінг, гуд нойт. Ну й гуд бай. А калі мяне праганяюць, кажу: дэд. Дэд значыць смерць. Памру тут, у Лондане, прыкончыце мяне. Калі не дазволіце мне збіраць грошыкаў, памру з голаду.

Калі б я была здаровай...

Лэдзі Перон сядае на валізку. Побач ставіць вазок, на зямлі — кавалак паперы. «Я бяздомная і калека. Прашу падтрымаць мяне. Дзякуй вялікі», — напісана палякамі з вакзала. Жабраваць яна не любіць. Зрэшты, ці гэта жабраванне? Гэта проста просьба пра дапамогу.

— Я не падыходжу, бо я саромеюся. Я сабе сяджу, як хтосьці хоча даць, то толькі добраахвотна. А паліцыя мяне тузае, забірае ў мяне таблічку, кажуць: гэта не legal!

Аднаго разу я раззлавалася. Бо на чыгуначным такія мужыкі ў спяцоўках сталі і збіралі грошы ў такое вядзерца, як з-пад селядца. У іх, здаецца, здарылася нейкае няшчасце. І я кажу паліцыянтам: як ім жабраваць, дык legal, а як мне, дык не?

Паліцыянты ўсё роўна мяне прагналі, але я падышла да таго з вядзерцам: спадару, кажу, дайце мне мані, калі ласка. Так бессаромна. А той нічога! Тады я зноў:

гів мі мані, я бедная. Гэта яго неяк закранула. Ён даў мне фунт.

Найлепш збіраць каля выйсця з метро. На жаль, там найбольш ганяюць. — Там мне добра людзі давалі, — Лэдзі занураецца ва ўспаміны. — За паўгадзіны я мела 20 фунтаў. Там ішлі і чорныя, і жоўтыя. Калі б я стаяла там некалькі гадзін, я б мела каля 100 фунтаў!

Ангельцы баяцца бомбаў

Мы пераходзім на на другі бок вуліцы. Там эвакуацыйнае выйсце з вакзала. Лэдзі яшчэ ніколі тут не спала, але чаму б не паспрабаваць. — Каб толькі не разбудзілі мяне рана. Бо я люблю паспаць так да дзявятай-дзясятай.

Файнае месца каля бараў, але там часам спіць нейкі чувак.

— Я каля яго баюся, бо мужыку ж могуць розныя сэксы ў галаву прыйсці, — тлумачыць Лэдзі.

Але выйсце з вакзала таксама нічога сабе — захіленае ад ветру. Я дапамагаю Лэдзі падняць вазок па лесвіцы, а яна адразу пачынае распакоўваць свой пажытак.

— Спадару, а вазок я сабе файны набыла, праўда? — узгадвае яна. — Раней я цягала валізку на такім вазку для багажу. Зняла на чыгуначным. Кідаеш фунт і цягнеш.

— Гэта тады вас абвінавацілі ў тэрарызме?

— Не, пасля. Тады, калі я ўзяла іншы вазок. Паліцыянты ўзялі мяне ў пастарунак, бо ўбачылі ножык. Я намазвала сабе хлеб. Мяне арыштавалі на шэсць гадзін. Думалі, што я тэрарыстка. Яны напалохаліся вазка. Думалі, што ў мяне ёсць бомба. Што я пакіну вазок, пайду, а бомба

выбухне. Яны баяцца бомбаў! — смяецца спадарыня Аліцыя. — Калі б не рыпітар, то-бок перакладчык, пасадзілі б мяне на некалькі гадоў.

Лэдзі Перон нацягвае коўдрачку ажно на нос.

А можа, Маёрка?

На наступны дзень мы дамовіліся сустрэцца на Коўчы. Лэдзі выграбае з вазка самыя каштоўныя скарбы. Квіток да Страсбурга, чэк за гатэль (30 фунтаў за ноч са сняданкам), здымак лекара, халупы пад Пабяніцамі і некалькі выразак з газет. Яна збірае іх з маленства.

— Я збіраю і пра паводкі, і пра тое, што нехта ажаніўся ці нарадзіў дзіця. На памяць, што такія падзеі мелі месца.

Сярод выразак самы важны — пра Страсбург. І яшчэ з «Жыцця Пабяніцаў» — пра спадарыню Аліцыю. Лэдзі яе не любіць — журналістка высмейвала ейнае падарожжа ў Страсбург.

— Але ж вы, спадару, пра мяне сур'ёзна напішаце, праўда? — пытаецца Лэдзі.

— Сур'ёзна, — пераконваю.

— Напішаце, што я не проста калека, а яшчэ й па свеце езджу?

— Напішу.

— І, можа, які-небудзь адрас падасце. Калі людзям захочацца, яны змогуць мне грошай выслаць. Добра?

Але адрас Лэдзі падаць складана. У Лондане яна жыве на вуліцы, а ў Польшчы будзе толькі пару дзён. — Атрымаю пенсію за чатыры месяцы. Вазьму адразу дзве тысячы, будзе за што паехаць у Італію. Або на Маёрку. Гэта адразу за

Іспаніяй. Калі я ўжо мушу быць бяздомнай і самотнай, дык хаця б там, дзе цёпла. Так я сабе нядаўна падумала.

Лэдзі надзяе чорныя акуляры. Не на нос, а на валасы. — Паненачкі так носяць, — тлумачыць яна мне. — Я не паненачка, але на здымку трэба выглядаць прыгожа.

Пстрыкаю пару фотак.

Потым Лэдзі просіць мяне зрабіць ёй паслугу. Яна хоча, каб я скокнуў на Вікторыю і набыў ёй вялікі пакунак бульбы фры і дзве пінакалады. — Гэта такі лёгенькі кактэйльчык, — усміхаецца яна.

Бульба фры павінна быць з канкрэтнай кропкі — там робяць мяккую, а ў Лэдзі ўжо амаль няма зубоў. Я вяртаюся праз паўгадзіны. Лэдзі выглядае так, быццам яна застыла на гэты час. Ані ейны твар, ані пазіцыя цела не змяніліся ні на міліметр. Бачна, што яна чэмпіёнка такіх застыванняў. Прачынаецца, калі я падыходжу.

— Ці можаце мне патлумачыць, чаму яны не хочуць даць мне кватэру? — пытаецца Лэдзі і сама сабе адказвае: — Бо дзяржава вельмі ненасытная. Калі ў яе шмат ёсць, яна хоча яшчэ больш. Што яны робяць з тымі грашамі? Ім усё мала. Калі ў іх ёсць Еўропа, ім хочацца ўвесь зямны шар. Багатыя не ведаюць, што такое беднасць, а я ад нараджэння не ведаю, што такое багацце.

Пасля гэтага Лэдзі моўкне, усміхаецца, бярэ мяне пад руку.

— Але, спадару, скажыце мне так шчыра. Многія здаровыя столькі свету не ўбачылі, колькі калека з-пад Пабяніцаў.

III. ГАНДЛЯВАННІ

Перадача мядзведзя мусіць быць падрыхтаваная значна раней. Такія рэчы абмяркоўваюцца месяцамі. Трэба сесці за стол, раз, другі, трэці. Пасябраваць, даверыцца адно аднаму. Без узаемнага даверу ніхто мядзведзя не аддасць. Хутчэй заб'е.

У кантрабандыстаў нічога не піпікае

Я сяджу на месцы пасажыра ў шасцігадовым пасаце, а душа ажно ў пяткі зайшла. Я падпальваю цыгарэту ад цыгарэты, нервова гляджу па баках, высылаю апошнія эсэмэскі.

Некалькі дзён таму я пазнаёміўся з Марэкам (імя зменене), хлопцам майго ўзросту, з памежнай польскай вёскі. Мы напіліся гарэлкі і Марэк прызнаўся, што ганяе аўто праз мяжу. Не зусім легальна. Ён карыстаецца тым, што ва Украіне мыта на ўжываныя аўтамабілі з Захаду часта большае за іх вартасць, а ён умее ўвезці аўто так, каб або не заплаціць мыта, або заплаціць яго мінімальна. Як ён гэта робіць? Распавядзе па дарозе, бо ён можа ўзяць мяне з сабою.

— Хочаш, рэдактар? — запытаўся Марэк.

— Хачу, — адказаў я.

І цяпер я за гэта плачу.

Марэк заязджае па мяне праз два дні, і цяпер мы ўдваіх стаім у пасаце, які ягоны калега набыў у Швейцарыі за некалькі тысяч еўра. Мытнік. Памежнік. Сцягі — польскі і еўразвязаўскі. Мост. Унізе рака Буг. Шлагбаум, за якім ужо не будзе шляху назад, усё бліжэй.

Прыбіральшчыца: Улады ведаюць, дзе ласы кавалак

У час, калі мы стаім на памежным мосце, брусельскія дыпламаты разважаюць, як перасунуць гэтую мяжу далей. Інакш кажучы: як заахвоціць Украіну да рэформаў, канчатковая мэта — убачыць яе чальцом Еўразвязу. Або прынамсі сталым ягоным партнёрам.

Мы яшчэ не ведаем, што крыху пазней прэзідэнт Віктар Януковіч пакажа Еўразвязу сярэдні палец, а ўкраінцы паўстануць са шматтыднёвымі праеўрапейскімі маніфестацыямі, якія скончацца смерцю некалькіх дзясяткаў дэманстрантаў, а па выніку — уцёкамі Віктара Януковіча з Украіны.

Яшчэ не ведаем, што праз імгненне пасля згаданых падзей Уладзімір Пуцін адарве ад Украіны Крымскі паўвостраў.

Але адно ўкраінцы, з якімі я размаўляю, ведаюць аж занадта добра: іх далучэнне да Еўразвязу не будзе шляхам, пасыпаным ружавымі пялёсткамі.

— Мы ніколі не ўвойдзем у Еўразвяз, — кажа Аляксандр, кіроўца, які пад'язджае да шлагбаума на маршрутцы,

набітай людзьмі. Ягоныя пасажыры вяртаюцца з сезонных працаў у Польшчы: яны збіралі трускалкі, потым маліны, памідоры, а апошнім часам яблыкі і слівы.

— Сезон сканчаецца, таму людзі вяртаюцца, — кажа Аляксандр. — Частка яшчэ засталася; носяць грыбы ў пункт скупу, але гэта ўжо драбяза. А Еўразвяз? Першае і самае істотнае: Пуцін нас ніколі не пусціць. Украіна — гэта для яго кавалак Расеі, не больш. Ён ніколі не пагодзіцца аддаць нас Захаду, — кажа кіроўца, а ўкраінцы, што вяртаюцца з саксаў*, яго падтрымліваюць. — Зрэшты, Данбас, то-бок усходняя Украіна, з задавальненнем злучыўся б з Расеяй. Размаўляюць там па-расейску і да сёння плачуць па СССР, што гэта была цудоўная краіна і кожны меў працу. Тое, што ў часы Савецкага Саюза, у 30-я гады, Сталін замарыў голадам дзесяць мільёнаў украінцаў, іх не цікавіць!

— Мая прабабка памерла падчас Галадамору, — ківае галавою пажылы мужчына ў каскетцы. — Мяне завуць Аляксандр Хадукін, раней я працаваў качагарам у Доме культуры, а сёння я ўжо на пенсіі. Мая матка распавядала, што ў 30-я гады людзі елі зямлю і адно аднаго, каб выжыць. Маткі душылі сваіх дзяцей, каб тыя не мучыліся. Страшэнныя часы. Расея ніколі за гэта не выбачылася, а цяпер яны пагражаюць, што, калі мы падпішам пагадненне з Еўразвязам, яны зноў нас замораць. Зачыняць мяжу — і мы нічога ані прадамо, ані набудзем, і яшчэ цану на газ нам у два ці тры разы падымуць.

---

* Саксы — сезонныя міграцыі палякаў.

Поп: Еўразвяз — гэта сатана

Бацюшка Алег Азаранкаў носіць бараду з сівізною, валасы, звязаныя ў хвосцік, і нямодны турэцкі швэдар. Ён ездзіць на старой ладзе і мае даўно сфармаванае меркаванне пра Еўразвяз. — Страшна туды ўваходзіць, — кажа ён.

Сямнаццаць гадоў бацюшка служыць у драўлянай царкве ў вёсцы Біла, недалёка ад мяжы з Расеяй. Палову гэтага часу ён патраціў на сваркі.

— Калі дзесяць гадоў таму да ўлады дайшоў аранжавы зброд, мне загадалі дзяліцца царквою з філарэтаўцамі, — жаліцца ён. — Божа мой, Божа, колькі ж я з-за іх панерваваўся!

Філарэтаўцы — гэта вернікі кіеўскага патрыярхату, які з патрыярхатам маскоўскім знаходзіцца ў стане вайны. Іхны правадыр — уладыка Філарэт.

Аранжавыя — гэта палітыкі, якія дайшлі да ўлады дзякуючы Аранжавай Рэвалюцыі. Але чаму бацюшка Алег з маскоўскага патрыярхату называе іх збродам?!

— Вітальд, што яны выраблялі! Сказалі, што раз я буду служыць у царкве, а раз — іхны бацюшка. Я сказаў, што гаворкі быць не можа, бо іхнага бацюшку я бацюшкам не лічу. Для мяне гэта звычайны чалавек. Тады яны прыйшлі, выламалі замкі, уставілі новы ланцуг, і некалькі гадоў я не меў ключа да ўласнай царквы! На шчасце, з моманту, як прэзідэнтам зрабіўся спадар Януковіч, крыху паспакайнела, і прынамсі ключы мне вярнулі. А Еўразвяз? Нічога добрага з ягонага боку да нас не прыйдзе.

— Але ж некалькі тыдняў таму ўсе рэлігійныя кіраўнікі Украіны напісалі ліст, які падтрымлівае ўваход Украіны ў Еўразвяз, — кажу я. — Яго падпісаў і Філарэт, і ваш начальнік, ойча.

— Вітальд, я вам нешта распавяду, — жмурыцца бацюшка Алег. — Патрыярх мусіць быць крыху палітыкам, таму ён кажа і падпісвае розныя рэчы. Але ў нас, звычайных святароў, год таму ў Кіеве адбылася сустрэча на тэму Еўразвязу. Прыязджала адна спадарыня з Францыі і нам прыгожа распавядала. Якія ўжо будуць грошыкі на аднаўленне царквы. Якія датацыі. І паказвала нам слайды: з Францыі, з Бельгіі, з Польшчы. Мы слухалі, ажно адзін з нашых найстарэйшых святароў устаў і кажа: «Можа, у вас бажніцы і прыгожа адноўленыя, можа, ёсць і медзь на даху, і мармур на падлозе. У нас часта царква фанераю абабітая, фундамент сыплецца. Але нашыя цэрквы поўныя. А вашыя пустыя». Мы ўсе яму запляскалі. Бо гэта праўда. Захад забываецца на Бога, па вас, паляках, гэта найлепш відаць. З моманту свайго ўваходжання ў Еўразвяз вы толькі багацееце. Адразу за мяжою пачынаецца тратуарная плітка. Вы ж ёю абклалі ўсю краіну. А той, хто багаты, забываецца пра Бога, толькі разважае, як памножыць уласнае багацце. А хто забывае пра Бога, адразу і пра іншых людзей забывае. На жаль, у вас гэта вельмі добра бачна. Два гады таму я ехаў з матушкаю праз Польшчу ў Нямеччыну...

— З кім?

—Ну, з маёю жонкай. Мы ехалі, і ў нас зламалася аўто. Мы махалі дзве гадзіны — і ніхто не спыніўся. Ніхто не хацеў нам дапамагчы, хаця я стаяў каля дарогі

ў сутане і з крыжам. Толькі паказвалі адно аднаму на нас пальцам, быццам гэта было нейкае вялікае дзіва. Толькі адна ўкраінская пара ўбачыла, што мы ў бядзе, спынілася і дапамагла нам.

— Гэта магло адбыцца дзе заўгодна...

— Вітальд, гэта яшчэ нічога. Найбольш я баюся, што Еўразвяз будзе нас сэксам атакаваць, прымусіць нас змяняць законы, каб абараняць вычварэнцаў! Вы зможаце хадзіць па Кіеве, як Адам і Ева па раі. І мужчына зможа цалаваць мужчыну. Пра такія рэчы ў святым пісанні кажацца, што яны прадвяшчаюць Апакаліпсіс. А ведаеце, Вітальд, Пачаеўскую лаўру, найсвяцейшае месца на захадзе Украіны? Ведаеце, што туды прыязджаюць людзі, апантаныя д'яблам? А ведаеце, што нядаўна ў аднаго мужчыну д'ябал усяліўся, калі ён чытаў брашурку пра гэты ваш Еўразвяз? Яго прывезлі ў Пачаеў, а ён пляваў на святароў. І казаў, што ён вось ужо збіраецца ва Украіну. Што ўжо сюды едзе. Што яму палітыкі рыхтуюць карэту. Усё зло, Вітальд, ідзе з Захаду.

Кантрабандыст: Нашы бяруць толькі вялікія сумы

Чарга павольна пасоўваецца; кожныя пару хвілінаў мы пад'язджаем на восем-дзесяць метраў. Гэта цягнецца ўжо гадзіну і працягнецца ў лепшым выпадку яшчэ столькі ж.

На Марэку скураная куртка, гольф і джынсы добрай маркі. Таксама кашуля Diesel і элегантны гадзіннік. Пахне па-замежнаму, адэкалонам Dior. Выглядае як скрыжаванне дробнага махляра і кагосьці, хто імкнецца ў крыху шырэйшы свет.

— На мяжы ўсё істотна, нават строй, — тлумачыць ён мне. — Кожны ўкраінскі мытнік — гэта малы псіхолаг. Будзе занадта дорага — загадаюць больш даць у лапу, бо ты занадта падняўся. Будзе затанна — не захочуць з табою гаварыць. Мы мусім дбаць, каб не перагнуць ні ў адзін бок. Тут усе ўсіх ведаюць. Калі адзін знаёмы шмат зарабіў і набыў сабе найноўшае аўдзі, то ўкраінцы перасталі прапускаць ягоныя аўтамабілі. І справа была не ў заробку, а ў прынцыпах.

— А менавіта?

— Яны ведаюць, што ў сваім маленькім пекле ніколі не заробяць столькі ж, колькі мы. Часам мы ездзім да іх дадому, на грыль, гарэлачку. Яны добра жывуць, нічога не скажу. Але кажуць, каб апынуцца ва ўкраінскай мытні, мусіш з парога даць 20 тысяч долараў. А потым штомесяц насіць долю свайму шэфу. Тры гады папрацаваў — і зноўку 20 тысяч, інакш выганяць. Таму яны з кожнай бабкі, што нясе два пачкі цыгарэт, бяруць па два злотыя. З кожнага дзеда, што вязе бензін, пятак. Бо мусяць адрабіць гэтыя 20 тысяч як мага хутчэй.

— Але ты гэта ведаеш дакладна?

— Ну, за руку я іх не лавіў, — моршчыцца Марэк. — Я толькі паўтараю тое, што мне распавядалі.

— А польскія мытнікі? Бяруць?

— У нас не. Для іх мы з'яўляемся раздробнікамі. Калі яны ўжо й возьмуць, то канкрэтныя грошы, за цэлую фуру цыгарэт. Акрамя таго, для іх не праблема выпусціць аўто з Польшчы, калі ўсе паперы ў парадку.

— А яны ў парадку?

— Ці ж я нейкі югаслаў, каб аўто красці? — абураецца Марэк. — Курс у нас такі добры, што можна вазіць легальныя. Гэтае аўто я набыў у Нямеччыне менш чым за пяць тысяч еўра. Я зараблю на ім наступныя дзве, але больш за палову раздам хлопцам. Зараз атрымаюць на мяжы, за мяжою атрымае паліцыя, а ў канцы месяца я паеду да іх на гарэлку і яшчэ нейкія бабкі ім пакіну. І гэтак у канцы месяца на ўласныя патрэбы ў мяне застанецца 20 тысяч злотых. Колькі ты, рэдактар, зарабляеш? Колькі?! Ну, ведаеш, у мяне кіроўца атрымлівае больш. Я магу табе час ад часу падкінуць якую замову, падзаробіш сабе. Хочаш?

Муж: Не хочацца мне працаваць

Яўгенія Чэрняк прыбірае пад польскімі ложкамі, мые польскія талеркі, прасуе польскія кашулі і гатуе абеды з польскага мяса і бульбы. Дадому ў вёску на Валыні яна прыязджае раз на некалькі месяцаў. Цяпер яе ўзяў з сабою знаёмы, які едзе да маткі ў бальніцу. І наш пасат, і іхны фіят дуката ўжо прайшлі польскі памежны кантроль. Мы разам чакаем уезду ва Украіну.

У Яўгеніі на галаве пафарбаваныя пасмачкі, на твары — зморшчкі. Але яна не выглядае на свае шэсцьдзесят гадоў. — Еўразвяз? Мне вельмі падабаецца, — паддаецца сваім мроям Яўгенія. — Найбольш падабаецца, што, атрымаўшы візу ў Польшчы, магу на гэтай візе наведаць дачку ў Берліне. Польшча — гэта ўжо краіна еўрапейская па поўнай праграме. Я ўсе гэтыя змены на ўласныя вочы бачу, езджу так ужо дваццаць гадоў. Возьмем хаця б шмоткі. Я памятаю, як палякі апраналіся, быццам

у Савецкім Саюзе. Абы хоць што на сябе накінуць ды з дому выйсці. А сёння? Кабеты як з моднага часопіса. Нават мужчыны пачынаюць за сабою сачыць. Калі я прыбіраю ў лазенках, усё часцей заўважаю адмысловую мужчынскую касметыку.

Калісьці ў дачкі ў Берліне я адразу пазнавала на вуліцы паляка. Што гэта чалавек з нашых краёў, з усходу. Цяпер жа, пакуль не пачую мовы, не пазнаю. Вы лепш выглядаеце. І ясцё лепш. У кожнай «Бядронцы»* можна набыць аліўкавы алей. І сыры італійскія. І пармскую вяндліну. Усе ездзяць па прадукты ў Польшчу, бо ў нас зямля хоць і найлепшая ў Еўропе, а ляжыць аблогай. І скажыце самі, Вітальд, дзе тут сэнс? Украіна магла б быць свірнам Еўропы. Наш чарназём можна лыжкаю есці, такой зямлі няма ва ўсім свеце. І што? Ляжыць аблогай. Людзі толькі глядзяць, як бы што-небудзь за мяжою зарабіць. Або атрымаць за так, так яшчэ з часоў камунізму прызвычаіліся. Мой суджаны не падлягае ніякім еўразвязаўскім стандартам. Крэму ён у жыцці на свае вочы не бачыў. Што толькі я яму дашлю — прапівае. Кажу: атрымалі мы пасля калгаса паўтара гектара. Ты б узяў хаця б малы кавалачак, засеяў морквай, агурком, памідорам. Пусціў бы курак. Было б хоць нешта сваё.

— І што ён адказвае?

— Што не! Бо яму не хочацца. На жаль, увесь наш народ такі, як наша сям'я. Або цяжка працуюць, але за мяжою,

---

* «Biedronka» — сетка супермаркетаў з недарагімі прадуктамі ў Польшчы. — Заўв. пер.

як я. Або сядзяць у сваёй вёсцы і лупяць кіем па дрэве, бо, можа, груша ўпадзе. Я малюся, каб і да нас прыйшоў Еўразвяз. Што сюды прыедуць галандцы, немцы, а няхай сабе і палякі, і зааруць нам гэтую зямлю. Зноў будзе калгас, але на гэты раз прыватны.

Начальнік змены: Можаце ехаць

Кола ў кола за нашым пасатам коціцца стары запарожац, які можна было б спакойна паставіць у музей матарызацыі. Выплёўвае з сябе чорныя аблачынкі выхлапных газаў. У запарожцы — дзядок і бабулька, ён у берэце з пімпачкай, яна ў хустцы. — Драбяза, — крывіцца Марэк. — Два колцы кілбасы вязуць і ўпакоўку ёгурту. Ну і, зразумела, бак бензіну, у яго яшчэ, пэўна, ёсць дадатковыя ёмістасці ў пырскавіках. Яны на гэтым заробяць трыццаць злотых, але дадатак да пенсіі ёсць.

Перад намі — больш чым дзесяцігадовы гольф, якім кіруе лысы малойчык. — О, гэта мой дружбак. Вова, што вязеш? — смяецца ў бок лысага Марэк.

— А якая табе розніца? — пытаецца з усходняй пявучасцю Вова.

— Тут таксама драбяза, — падміргвае мне Марэк. — Яны ўсе хітруны, што займаюцца кантрабандаю кілбасы ды сыру. У кожным другім аўтамабілі ёсць нейкая схованка — у дзвярах, у даху, у падлозе. У наш бок яны вязуць цыгаркі, а назад жрачку, бо ў іх усё даражэйшае і горшае, чым у нас.

Зноў пад'язджаем на дзесяць метраў. Удалечыні ўжо маячыць жоўта-блакітны ўкраінскі сцяг. Урэшце даязджаем да яго.

— Зараз пачнецца, рэдактар, назірай, — кажа Марэк, пасля чаго шырока ўсміхаецца, крычыць мытніку: — Доброго дня! — і ўціскае яму нешта ў руку.

— Гэта быў хабар? — пытаюся я.

— Нееее, толькі такі падаруначак.

Аказалася, што раздача падарункаў яшчэ толькі пачынаецца. Усіх памежнікаў і мытнікаў Марэк ужо называе па імені. Нават начальнік змены прыходзіць паціснуць яму руку.

— А гэта хто? — пытаецца, паказваючы на мяне пальцам.

— Калега. Вучыцца, — смяецца Марэк.

— Начальнікі самыя хітрыя, — кажа ён пазней. — Сам у руку не возьме, у яго для такіх мэтаў ёсць людзі. І калі б нешта пасыпалася, а здараецца, што з Кіева прыязджаюць кантралёры, вінаватым будзе хтосьці ніжэйшы па рангу.

Сапраўды, пасля таго як сыходзіць кіраўнік змены, мытнікі бяруць грошы зусім адкрыта. Іх не вельмі турбуе, што людзі ўсё бачаць. Марэк дае ім два вялікія стосы банкнотаў.

— Я б мог ім даць па пяцьдзясят еўра, але тут ізноў спрацоўвае псіхалогія, — кажа ён. — Калі мытнік атрымае некалькі банкнотаў, у яго будзе адчуванне, што ён атрымаў шмат. Калі б ён атрымаў адну, быў бы менш шчаслівы.

— А за што ты, уласна, плаціш, калі аўтамабіль у парадку?

— Тое, што я ўехаў, нічога не значыць. Яны мусяць убіць маё аўто ў сістэму — я ўехаў на аўтамабілі, на ім жа мушу

і выязджаць. Пры выездзе з Украіны, калі ў мяне няма аўтамабіля, у іх мусіць запіпікаць у камп'ютары. Паколькі я на ім не вяртаюся, я мушу падаць даведку пра продаж ці касацыю ва Украіне. Інакш яны мяне не могуць выпусціць.

— Выпусцяць?

— Будзем вяртацца — убачыш, ці запіпікае камп'ютар.

Кліент: Брусель нас у лапці абуе

Больш за дзесяць кіламетраў ад мяжы, у лясной кавярні над малым азярцом нас ужо чакае кліент. Яго завуць Алёша, на ім элегантная кашуля, гадзіннік дарагой фірмы і срэбны лексус. У наш пасат сядае кіроўца, які павязе яго далей.

— Ён паедзе ажно ў Адэсу, — кажа Лёша на ламанай польскай, выцягваючы грошы са скуранога гаманца. — Ну, хлопцы, прабачце, не пагавару з вамі. Праз гадзіну ў мяне прыязджае наступны аўтамабіль, на іншым пераходзе. Восемдзесят кіламетраў адсюль. Мушу ляцець.

— Ляці, Лёшка, ляці. У наступны раз, калі мы сустрэнемся, можа, вы ўжо будзеце ў Еўразвязе, — смяецца Марэк.

— Супакойся ты, курва, са сваім Еўразвязам, — крывіцца Лёша. — Калі ён, крый божа, аднойчы прыйдзе, мыта стане аднолькавае, а мы абодва ў лапці абуемся! — кажа і заводзіць рухавік лексуса.

— Можа, ён і пойдзе, але не я, — усміхаецца Марэк.

Мы даядаем абед і збіраемся ехаць у Польшчу з Анджэем, сябрам Марэка, які адмыслова па нас прыехаў. — Некалькі гадоў таму я набыў зямлю недалёка ад новага

памежнага пераходу ў Будомежы, — распавядае Марэк. — У мяне ёсць паўтара гектара недалёка ад дарогі. Можа, адчыню там краму, можа, кавярню, можа, маркет. Еўразвяз ці не Еўразвяз, каля мяжы чалавек заўжды пажывіцца.

Мяжу мы перасякаем перад самым змярканнем. Даем пашпарты на праверку. Я зноў з душою ў пятах, зноў цыгарэта ад цыгарэты.

Але маладая мытніца адпускае нас, вокам не павёўшы. Нічога не піпікае.

Пенсіянерка: Каб толькі да Еўразвязу памерці

Валянціна Каленнікава стаіць на малым кірмашыку каля выйсця з памежнага пераходу ў Мэдыцы, паміж будынкам піцэрыі і паркінгам, у адной руцэ трымае два пачкі цыгарэт «Paramount», адной з самых танных марак, у другой — бутэльку гарэлкі з апетытным коласам пшаніцы на этыкетцы, і палюе на кліента.

— У мяне добры нюх на людзей, — кажа Каленнікава. — Мне ўжо амаль 80 гадоў, таму я не падбягу да аўтамабіля гэтак жа хутка, як малодшыя. Але нейкім чынам я адчуваю, хто будзе купляць і дзе мне стаць. Апрача таго, малодшыя дзяўчыны саступаюць мне. Яны ведаюць, што бабульцы не так лёгка стаяць цэлы дзень. Я за гэта малюся за іх і стаўлю свечкі ў царкве.

Каленнікава легальна можа пранесці ў Польшчу два пачачкі цыгарэт і бутэльку гарэлкі. Цыгарэты прадае па чатыры злотыя, гарэлку — за дзесяць. Гэткім чынам яна заробіць першыя трыццаць грыўняў (10 грыўняў — 4 злотыя).

Наступныя трыццаць грыўняў яна заробіць, калі прывязе ва Украіну трохі кілбасы і сыру з памежнага маркету.

І яшчэ некалькі грыўняў яна атрымае за тое, што сядзе ў аўто, якое перавозіць пралкі ці нешта яшчэ з побытавай тэхнікі. Дазволена правозіць толькі адну штуку на чалавека, таму кіроўцы, што вязуць некалькі штук, мусяць некага браць з сабою. Колькі ўжо пралак ва Украіну ўвезла Каленнікава? Адзін Бог ведае.

З аднаго боку, Каленнікава чула, што Еўразвяз адкрые мяжу. Было б добра. Яна не мусіла б чакаць больш за гадзіну і ў мароз, і ў дождж, і ў свята, і ў будні ў чарзе. Не мусіла б праходзіць пад пільным вокам мытнікаў і набытых за мільёны еўра сканераў, якія павінныя вынесці вердыкт, ці не праносіць яна больш за два пачачкі і адну бутэльку.

З іншага боку — што калі цэны на цыгарэты пойдуць угару? У Польшчы ж пайшлі, і вельмі моцна. — Я сабе з гэткім жа поспехам магу магілу выкапаць, — кажа Валянціна. І пачынае плакаць.

— Не плачце, бабка, — кажуць ёй маладзейшыя дзяўчыны. — Нават калі і ўвойдзем у той Еўразвяз, вас ужо на свеце не будзе. Мы, маладыя, будзем перажываць.

І маюць рацыю, таму Валянціна Каленнікава папраўляе вузельчык на хустцы і бяжыць шукаць наступнага кліента, які набудзе пачак цыгарэт «Paramount».

IV. ГІСТОРЫЯ

Балгарскія цыганы кажуць, што самкі лягчэй паддаюцца дрэсуры, яны менш агрэсіўныя і не атакуюць людзей. Польскія ж цыганы лічылі трэнаванне самак не дастаткова ганаровым заняткам. Самкі, паводле іх, павінны нараджаць малых, каб мядзведнікам заўжды хапала мядзведзяў для працы.

Канец бетонных грыбкоў

Бункер спачатку абкладаюць старымі шынамі і падпальваюць. Або кладуць усярэдзіну пакет гною з вялікім утрыманнем калію. Атрымліваецца прымітыўная бомба, і бункер узрываецца.

— Калі бетон трэсне, б'ем па ім молатамі, каб дабрацца да сталі, — тлумачыць Д'ёні, будаўнік з Бэрату ў цэнтральнай Албаніі. — Бывае, што яе там ажно дзве тоны. Кілаграм у закупе каштуе 15 еўрацэнтаў. То-бок на адным бункеры можна зарабіць 300 еўра! А часам трэба і пяць дзён старацца, каб бетон трэснуў. Большасць жа грошай і так бярэ мой шэф. Я зарабляю па 20–30 еўра за штуку.

Але Д'ёні не скардзіцца. Апошнімі гадамі Албанія перажывае вялікі будаўнічы бум, які ўзвінціў цэны на сталь. Не спыніў яго крызіс у Італіі і Грэцыі, дзе працуюць сотні тысяч албанскіх эмігрантаў. Насамрэч эксперты асцерагаюць, што гэты бум — выдзьмутае яйка італійскай мафіі, якая, будуючы ў Албаніі нікому не патрэбныя хмарачосы — у некаторых нават палова кватэр стаяць пустыя, — адмывае брудныя грошы.

— У нас не адчуваецца крызісу, — кажа Д'ёні. — Прэм'ер хваліўся, што, апроч Албаніі, ва ўсёй Еўропе рэцэсіі няма толькі ў Польшчы.

Д'ёні таксама некалькі год працаваў у Грэцыі, у Пірэі, але яго перасталі забаўляць жмуркі з мясцовай памежнай службай, што рэгулярна вылоўлівае албанцаў, якія нелегальна працуюць. — Здароўе ўжо не тое, — кажа ён. — Тут я менш зарабляю, але й менш трачу. Баланс атрымліваецца падобны.

Удзень Д'ёні будуе новы раён, а вечарамі падпрацоўвае на бункерах. За гэта ён скончыў рамонт у кватэры і аддаў дзяцей у добрыя школы.

Сотні тысяч бункераў псуюць краявіды Албаніі ад Шкодра на мяжы з Чарнагорыяй да Каніспаля — рукою дастаць да Грэцыі.

— У камуністычныя часы я ў такіх бункерах праходзіў вайсковую падрыхтоўку, — узгадвае Д'ёні. — Мы вучыліся, як іх маскаваць на выпадак атакі. Гэта кавалак майго жыцця, але мне іх не шкада. Яны — сімвал кепскіх часоў, яны павінны знікнуць.

2

Бункер Г'ергія знізу даверху пафарбаваны ў зялёны колер, спераду — надпіс кіслотнага колеру «Bunker Bar». Нягледзячы на тое, што пляж у Шэнг'ін, на якім ён стаіць, не належыць да найпрыгажэйшых, Г'ергія гэта не палохае: — Можа, у нас і не вельмі шмат пяску. Затое ў нас ёсць бетонныя грыбкі; нашыя шампіньёны Дзядзькі Ходжы. Людзі з усяго свету прыязджаюць, каб на іх паглядзець!

Г'ергі запрашае ўсярэдзіну, дазваляе вызірнуць праз байніцу, накіраваную ў бок Італіі. Паказвае схаваны ў глыбіні металічны кій. — Я яго трымаў на выпадак п'яных кліентаў, якія часам не хочуць плаціць. А сёння ён у мяне супраць тых, хто прыходзіць бурыць бункеры. Я трымаю гэты бар і не дазволю дакрануцца да яго нават мезенцам.

Гэта факт, што албанскія бункеры — адметнасць сусветнага ўзроўню. У краіне, толькі крыху большай за Люблінскае ваяводства, дзе жывуць усяго 3 млн чалавек, камуністы пабудавалі іх каля 750 тысяч.

— У часы камунізму ўсё, што было звязана з бункерамі, захоўвалася ў вялікай таямніцы. А потым прыйшла дэмакратыя, згубілі дакументы — і сёння ніхто не ў стане іх добра палічыць, — кажа Іна Ізгара, палітолаг, якая, як і шмат хто з маладых, дзеліць сваё жыццё паміж Албаніяй і Італіяй. — Калі мы некалькі гадоў таму ўваходзілі ў НАТА, камандаванне Альянсу захацела атрымаць мапы іх размяшчэння. Гэта выклікала замяшанне, бо ніякіх мапаў

няма. Хтосьці калісьці сказаў, што іх 750 тыс., і гэта цяпер усе паўтараюць.

Бункеры стаяць у гарадах, на падворках, каля дамоў, на могілках і дзіцячых пляцоўках. Стаяць на горных вяршынях і напалову пагружаныя ў мора. Сельскія гаспадары, якія аруць зямлю, мусяць іх абгінаць. Праехаўшыся на цягніку з Тыраны да Дурэсу, налічыш некалькі дзясяткаў бункераў.

Элтан Каўшы, гід для турыстаў з Тыраны, распрацаваў трасу па самых цікавых. — Некалькі, да прыкладу, стаяць у горадзе Апаліна, паміж руінамі, якія засталіся ад старажытных грэкаў, — распавядае. — Турысты іх вельмі любяць.

Дзеля чаго іх збудавалі? Энвер Ходжа, які непадзельна кіраваў Албаніяй з 1944 г. да смерці ў 1985 г., баяўся атакі. — Гэта быў параноік, — кажа Іна Ізгара. — Лічыў, што ўсе хочуць на Албанію напасці. Адразу пасля вайны трымаўся Югаславіі. Неўзабаве пасварыўся з маршалам Ціта і больш чым на дзясятак гадоў звязаўся з СССР. Гэтая сувязь яму перастала падабацца, калі пачалася эпоха раскрыцця злачынстваў сталінізму. Заключыў саюз з Кітаем і — паўсюдна бачачы ворагаў — сур'ёзна ўзбройваў краіну і будаваў бункеры.

Яны ўпісваліся ў добра вядомыя албанцам страхі: цягам стагоддзяў на Албанію наязджалі і акупавалі старажытныя грэкі, рымляне, балгары, венецыянцы, туркі, італійцы, аўстрыйцы, немцы, сербы, урэшце — сучасныя грэкі.

Ізгара: — Гэтыя бункеры будаваліся для нас. Каб нас напалохаць, дысціплінаваць. Цяпер гучыць абсурдна, але

людзі ва ўзросце маіх бацькоў — сёння ім пад семдзесят — сапраўды верылі, што ўвесь свет хоча на нас напасці.

— Прапаганда дзейнічала, як у Паўночнай Карэі; нам казалі, што першая рэч, пра якую амерыканцы, расейцы ці грэкі думаюць пасля прачынання, гэта як бы Албанію захапіць, — дадае Каўшы. — Мы былі адрэзаныя ад інфармацыі, мой дзядзька на 20 гадоў трапіў у турму, бо паглядзеў фільм па югаслаўскім тэлебачанні і пераказаў яго сябру, а той на яго данёс. Большасць слухала радыё Тырана і не высоўвалася.

Людзі жылі па 12 чалавек на 50 квадратных метрах, бо ўсе інжынеры працавалі для войска, а ўвесь бетон ішоў на пабудову бункераў, якія ніколі не былі выкарыстаныя з мілітарнымі мэтамі.

— Найчасцей ужываем іх, каб страчваць цнатлівасць, — смяецца Іна Ізгара. — Нядаўна на вакацыях у Сарандзе мой прыяцель меў авантуру ў бункеры з дзяўчынай, з якой ён пазнаёміўся на дыскатэцы. І што? Пляваўся. Змерз як цуцык, а ў дадатак улез у кучу.

3

Ходжа памірае ў 1985 годзе. За месяц да ягонай смерці да ўлады ў Савецкім Саюзе прыходзіць Міхаіл Гарбачоў, і вецер пераменаў пачынае дзьмуць ува ўсіх камуністычных краінах. Але не ў Албаніі. Тут яшчэ ў 1990 г. пераемнік Ходжы Раміз Алія пераконвае албанцаў, што жыццё палякаў пасля змены сістэмы значна пагоршылася. Але албанцы ўжо ведаюць, што да чаго. Сістэма пачынае хістацца, урэшце ў 1992-м пераемнік Аліі аддае ўладу Салі

Бэрышы — былому кіраўніку партыйнай арганізацыі ў медычнай акадэміі ў Тыране, які лепш за іншых апаратчыкаў вынюхаў перамены. Бэрыша стаў прэзідэнтам. Сёння ён прэм'ер-міністр.

Гадамі бункераў Ходжы ніхто не чапаў. — Ажно ў 1999 годзе сербы пачалі бамбардаваць Косава, — адзначае Каўшы. — За кампанію дасталося і Албаніі, у тым ліку бункерам. І раптам аказалася, што канструкцыі, якія мусілі перастаяць атамную вайну, распадаюцца, быццам гліняныя! У мноства людзей быў шок.

Тады распачалося другое, цывільнае жыццё бункераў. Людзі страцілі да іх рэспект. У вёсках гаспадары трымаюць у бункерах кароў, коз і свінняў, у гарадах яшчэ нядаўна бункеры служылі лядоўнямі. Сёння Албанія ўзбагацілася, амаль кожны мае лядоўню ў хаце, таму ў бункеры людзі пачалі выкідаць смецце.

Інакш у сталіцы. Блокку — гэта раён Тыраны, падчас камунізму зачынены, пад аховаю; тут жылі саноўнікі — Энвер Ходжа, ягоныя міністры і таварышы. У падзямеллях кожнага будынка было бетоннае сховішча.

— Сёння Блокку — гэта самы клубны раён Тыраны, — смяецца Камэлія, студэнта юрыдычнага факультэта. — У былых сховішчах ёсць некалькі сапраўды файных бараў і дыскатэк.

Эліян Стэфа, які належыць да маладога пакалення албанскіх архітэктараў, з бункераў зрабіў свой дыпломны праект. Яму бункеры бачацца як міні-гатэлікі і нават... падвальчыкі для ахалоджвання віна. — Больш за ўсё мне б спадабалася, калі б нехта адчыніў у бункерах хостэл, —

кажа ён. — Мы зрабілі візуалізацыю. Усім падабаецца, але ніяк не знойдзецца адважны чалавек, які гэта запачаткуе.

Элтан Каўшы: — Мае турысты заплацілі б любыя грошы, каб пераначаваць у падобным месцы.

4

У цэнтры Тыраны стаіць іншы бункер — вялікая піраміда, пабудаваная адразу пасля смерці Ходжы ягонаю пляменніцай Пранвэрай. Гэта мусіла быць ягоная магіла і месца пілігрымак для школьнікаў, вайскоўцаў і працоўных. Сёння піраміда пустуе і палохае сваімі графіці. З ейных велічэзных сценаў з'язджаюць самыя смелыя мясцовыя скейтары. — Я праходжу міма яе па дарозе на працу, — кажа Г'ергій Ндрэцэн, якога рэжым Ходжы сем гадоў трымаў за кратамі за «варожую прапаганду». — Я ўсяго толькі раздаў некалькі антыўрадавых улётак, — распавядае Ндрэцэн, які сёння працуе ў фондзе, што дапамагае палітычным вязням у складанай матэрыяльнай сітуацыі. — Калі я праходжу паўз гэтую брыдоту, у мяне душа чарнее. Ніхто не адказаў за тое пекла, якое тут нам зладзілі.

Гэта факт. Камуністы, што ў Албаніі замардавалі некалькі дзясяткаў тысяч чалавек, а наступныя тысячы трымалі ў выпраўленчых лагерах, ніколі не былі пакараныя. Раміз Алія памёр у 2011 годзе ва ўзросце 86 гадоў. Некалькі з іх ён адседзеў у турме, але прысуды тычыліся надужывання ўлады і фінансавых махінацый, а не злачынстваў сістэмы. Пад канец жыцця былы дыктатар даў інтэрв'ю станцыі BBC, дзе прызнаўся, што не ўсе смяротныя прысуды камуністычных часоў былі справядлівыя. Сказаў, што шкадуе пра гэта.

Інакш з Нэджміе Ходжа. 93-гадовая жонка дыктатара нядаўна паказалася ў папулярным у Албаніі шоу Януша Бугайскага, амерыканскага палітолага з польскімі каранямі. Падчас паўтарагадзіннай размовы яна не вырашылася нават на самы дробны акт раскаяння. — Я ні пра што не шкадую, — сказала яна. — Наша краіна была вельмі бедная, у нас было мноства ворагаў. Усе тыя захады былі неабходныя.

— Што варта зрабіць з гэтаю пірамідай? — пытаюся ў Г'ергія Ндрэцэна.

— Тое ж, што робяць з бункерамі! Абкласці гноем, шынамі і спаліць. Разбурэнне бункераў — гэта пачатак выйсця з камунізму. Пакуль мы будзем жыць у прыдуманай камуністамі прасторы, да таго часу тут будзе кіраваць дух Ходжы.

Ці атрымаецца? — Відаць, так, калі ўтрымаюцца высокія цэны на сталь, — з горыччу заўважае Ндрэцэн. — Асабліва таму, што цяпер бурэннем заняліся яшчэ й вайскоўцы.

5

Пакуль Д'ёні, будаўнік з Бэрату, знішчае бункеры саматужным спосабам, албанскае войска робіць гэта планава. — У іх ёсць пнеўматычныя молаты, — Д'ёні ажно свісціць ад захаплення. — Яны страляюць з танкаў, мінамётаў. Яны могуць пакласці і дзесяць бункераў за дзень. Гэта тры тысячы еўра! Цікава, што яны робяць з гэтымі грашыма...

Я спрабаваў даведацца пра гэта ў албанскім міністэрстве абароны, але мае пытанні захраслі недзе паміж дэпартаментамі. Больш даведаліся албанскія журналісты,

якія знайшлі танкі, што разбураюць бункеры, у албанскім турыстычным раі недалёка ад гораду Семані.

— Мы мусім гэта зрабіць, бо ўтвараюцца віры і людзі тонуць, — кажа афіцэр ананімна. — Сёння для нашай краіны турысты вельмі важныя.

Войску дапамагаюць прыватныя будаўнічыя фірмы. Уладальнік адной з іх, Бэснік Ляску, у маладосці служыў у войску і будаваў бункеры.

— Слёзы мне заліваюць вочы, — прызнаецца ён. — Бункеры — гэта частка майго жыцця. Я не ўяўляў, што яны калі-небудзь знікнуць. І мне дзіўна, што мы бурым іх дзеля капіталістаў, якія на месцы бункераў пабудуюць дарагія гатэлі і рэстарацыі.

V. ІНСТЫНКТЫ

Мы сядзім у нашай абсерваторыі, глядзім, як яны сябе паводзяць, і разважаем. Колькі агрэсіі можам ім дазволіць. Ці яны ўжо перабралі меру, ці мы яшчэ можам даць ім хвілінку, каб астыць.

Гарбата з акупантам

«Здароў, дружа. Можа, ты б знайшоў крыху трацілу? У тваім горадзе шмат шахтаў. Узарвем як IRA — чыгуначны вакзал або аэрапорт. Пішы ў прыв. Грыгорый».

Гэтае паведамленне 16-гадовы Саша атрымаў у скайпе адразу пасля хваляванняў у Таліне. Спраўдзіў у Вікіпедыі, што азначае IRA. Прачытанае яму вельмі спадабалася. «Прівет, Грыша. Я паспрабую дапамагчы», — адказаў ён і пабег да сяброў-шахцёраў.

Бронзавы Салдат і цягнік да Масквы

Напрыканцы красавіка 2007-га Бронзавага Салдата з Таліна, сімвал перамогі Чырвонай Арміі над фашызмам, перанеслі з цэнтра на ўскрайкі горада.

Эстонскія расейцы ўспрынялі гэта як аплявуху. У Таліне зрабілася неспакойна. Разбіліся сотні шыбаў, пралілася кроў. Загінуў малады расеец, некалькі дзясяткаў чалавек былі параненыя. Тысячы хуліганаў, расейцаў ды эстонцаў, грамілі ды рабавалі крамы. Свет абляцелі здымкі 16-гадовага хлопца, што чысціць краму Hugo Boss.

Праз пару дзён я сустрэўся з маім прыяцелем Яанам.

— Чортавы рускія, — злаваўся ён. Паўжыцця жыве ў Польшчы, але жыва пераймаецца ўсім, што адбываецца ў Эстоніі. — Пятая клятая калона! Здраднікі! Акупанты!

— Акупанты? — здзівіўся я.

— Так! Палова з іх прыйшла з войскам. Каб нас пільнаваць. Каб Эстонія не бунтавалася.

— Здраднікі?

— Кожны з іх толькі і чакае, калі вернецца СССР.

— Пятая калона?

— Выдумляюць, як бы далучыцца да Расеі. Наш урад мусіць іх усіх выслаць у Маскву. Эстонія мусіць быць эстонскаю.

Я звярнуўся да статыстыкі. Кожны трэці жыхар Эстоніі рускамоўны. Кожны шосты не мае нават грамадзянства. Нягледзячы на гэта, Эстонія пачуваецца цалкам добра, яна ўвайшла ў Еўразвяз і ёсць эканамічным тыграм сярод былых рэспублік СССР.

— Што гэта за пятая калона, якая дазваляе гэтак развівацца? — запытаўся я ў Яана.

— Паедзь, напіся з імі гарбаткі з самавару. Сам убачыш, як яны нас ненавідзяць, — адрэзаў ён.

Акупант і капуста ў Кабуле

Калі Саша шукаў тратыл, Алена Ядомскіх атрымала ад сяброў-эстонцаў садовую кветку. На знак сімпатыі. «А мы баяліся, што яны перастануць адказваць», — сказала яна мужу. Алена тэрапеўтка. Віктар акупант. Яны жывуць у маленькай вёсцы пад Тарту, культурнай ды інтэлектуальнай сталіцай Эстоніі.

Суседзі Ядомскіх — выключна эстонцы. Але стасункі вельмі добрыя. Мы п'ем гарбатку і разважаем, ці можа Бронзавы Салдат тут нешта змяніць.

— Эстонцы выключныя, — кажа Алена са здзіўленнем. — Да 1918-га ў іх ніколі не было незалежнасці. Тут кіравалі немцы, расейцы, шведы, датчане ці палякі. Падобныя народы знікалі незаўважаныя. Тым больш што яны ніколі асабліва не змагаліся за незалежнасць. Ладзілі толькі фестывалі эстонскай песні. Гэта было іхнае змаганне.

Ад моманту, калі Эстонія здабыла незалежнасць, у Алены і Віктара суцэльныя праблемы. Спачатку яны не маглі атрымаць грамадзянства. Права на эстонскі пашпарт мелі толькі грамадзяне і дзеці грамадзян Першай Рэспублікі, якая існавала ў 1918–1940. Алена і Віктар жылі ў Эстоніі амаль усё жыццё. Нягледзячы на гэта, улады хацелі выслаць іх у Расею.

Віктар: — Я б, можа, і паехаў. Але ў мяне там нікога няма. Мае дочкі павыходзілі за эстонцаў. А я раптоўна даведваюся, што з'яўляюся акупантам.

Чаму? Бо Віктара ў Эстонію прыслаў генеральны штаб савецкай авіяцыі — ён быў пілотам.

— Я лётаў па ўсім свеце — у Кітай, за экватар. Я быў у Афганістане. Там я нагледзеўся такога свінства, што адразу пасля афганскай вайны паклаў білет КПСС. Кажуць, тры гадзіны абмяркоўвалі, ці можна ў такім выпадку даць мне медаль за мужнасць. Далі.

Гэты медаль Віктар носіць з правага боку на цёмна-сінім пінжаку афіцэра паветраных войскаў.

— Са мною служылі эстонцы. Мы размаўлялі па-расейску; яны кепска ведалі эстонскую. І раптам у 1991-м аказалася, што яны тут грамадзяне, а я акупант. Алена: — Я атрымала эстонскі пашпарт. Я балатавалася ў выбарах гарадской рады. Мне ўдалося дамагчыся хаця б таго, што такіх, як Віктар, не вывезлі.

Сёння ў Віктара расейскае грамадзянства з трохгадовым правам пражывання на тэрыторыі Эстоніі. Алена: — Мы баімся, што праз увесь гэты скандал палітыка супраць «акупантаў» зробіцца больш жорсткай. А мы ж ніякая не пятая калона! Тут нам нашмат лепш, чым у Расеі.

Віктар: — Калі мы з таварышамі хадзілі на кірмаш у Кабуле, адзін з гандляроў казаў па-расейску: добрая капуста, вельмі хуёвая! Нехта яго навучыў, і ён ляпаў без сэнсу. Гэтак жа і з расейскай моладдзю. Нехта ім сказаў, што трэба бараніць Бронзавага Салдата. Вось і бароняць.

Настаўніца і расейскія паліцыянты

Ехаць у Нарву нас адгаворвалі ўсе. Мафія, платныя кілеры, кепскае паветра і аўтамабілі, якія выбухаюць. У дадатак тлумы расейцаў — іх тут больш за 60 адсоткаў. Некаторыя яшчэ не астылі пасля падзей у Таліне.

Нават Алена і Віктар казалі, што лепш не ехаць.

Тое самае штодня чула эстонка Аэт Кіісла. Нягледзячы на гэта, яна прыняла пасаду настаўніцы ў каледжы ў Нарве, зусім каля мяжы з Расеяй.

Да вайны гэты горад быў пярлінай. Прыгожыя барочныя дамы спускаліся да самай ракі. Залатыя гады скончыліся пад канец Другой сусветнай вайны. Сёння Нарва — гэта шэрыя мікраараёны з бадзяжнымі сабакамі і чародамі чаек. Пасярод горада — занядбаны парк. У цэнтры — «мост сяброўства», забіты фурамі і тлумамі «мурашак». На другім баку ракі — расейскі горад Іванаград.

У Нарве гучыць толькі расейская мова. Расейцаў тут 97 адсоткаў. Паводле даследаванняў, з іх больш за 60 адсоткаў не ведаюць ні слова па-эстонску.

Аэт навучае ў каледжы, што рыхтуе настаўнікаў расейскамоўных школаў. — Мы навучаем пераважна па-расейску. Аднак паўтараем: калі хочаш працаваць у гэтай краіне, мусіш ведаць эстонскую. Хаця ў такіх месцах, як Нарва, нельга перагнуць.

— Як гэта?

— Дзяржаўнае тэлебачанне ёсць толькі па-эстонску. Гэта мусіла заахвоціць расейцаў да навукі. Але яны глядзяць выключна расейскія каналы. Масква гэта выкарыстоўвае і дражніць. Пераконвае іх у тым, што Эстонія да іх кепска ставіцца. А мы не ў стане прапанаваць ім нешта як супрацьвагу. Расейцы абурыліся Бронзавым Салдатам, а ў нас не было як растлумачыць ім сваю пазіцыю!

Некалькі гадоў таму ў Эстоніі паўстала моўная інспекцыя. Аэт:

— Выбралі больш за дзясятак прафесій, прадстаўнікі якіх абавязаныя ведаць эстонскую. Калі не ведаеш эстонскай, не можаш быць доктарам, таксоўшчыкам, прадаўцом — прынамсі, не ў дзяржаўнай краме. Не можаш працаваць ні ў дзяржаўнай установе, ні ў школе.

Калі інспекцыя зловіць кагосьці на няведанні эстонскай — вызначыць штраф і вынесе папярэджанне. У другі раз штраф вышэйшы. У трэці — парушальнік страчвае магчымасць займацца гэтаю справай.

Міхаіл Богрым з Кохтла-Ярвэ: — Мая жонка настаўніца. Чортаву процьму грошай мы аддалі на курсы эстонскай. Яны пазвальнялі лекараў, выбітных адмыслоўцаў, бо яны не ведалі эстонскай у дастатковай ступені. Гэта ж дыскрымінацыя!

Аднак дагэтуль ніхто не наважыўся пракантраляваць Нарву. Аэт Кіісла: — Я нават малака не магу набыць паэстонску. Мяне гэта часам бесіць. Чаму мы так змагаемся за мову? Бо нас толькі мільён. Хаця часам я і карыстаюся тым, што жыву ў Нарве.

— Як?

— Я грашу з хуткасцю. У Эстоніі высокія штрафы. Але, калі мяне ловіць паліцыянт, я вельмі хутка гавару паэстонску. У Нарве ніхто не ведае гэтай мовы бегла. Таму я тэатральна абражаюся. Штрафу я яшчэ тут не плаціла.

Мама, тата і экзамен на эстонца

Пакуль Саша шукаў тратыл, я піў гарбатку з Асяй Міхалічэнка. Мы сядзелі ў бары ў Йыхві, за 50 кіламетраў ад Нарвы.

Кліенты бара дзеляцца на дзве паловы. У паловы выразныя рысы твару эстонцаў. Палова мае невыразныя славянскія твары. Палова апранутая сціпла. У паловы — спартовыя строі дарагіх фірмаў, залатыя зубы і біжутэрыя.

Ася па-расейску размаўляе з мамай і сябрамі з Йыхві. Па-эстонску — са знаёмымі з універсітэта ў Тарту.

Больш за ўсё яе раздражняе, што многія эстонцы ацэньваюць яе толькі па прозвішчы. У яе расейскае, значыць, нельга з ёю прыязніцца. — Аднойчы да мяне падышоў нейкі хлопец. У жыцці яго не бачыла. Ён сказаў толькі, што ненавідзіць расейцаў, і пайшоў сабе.

На заняткі па найноўшай гісторыі Ася б увогуле лепш не хадзіла. Паводле студэнтаў і выкладчыкаў, ува ўсім зле свету вінаваты быў СССР, а сёння Расея. На Асю глядзяць так, быццам яна асабіста акупуе Эстонію. У такія моманты яна б з радасцю праваліласяпад зямлю. — Я нават не стоадсоткавая расейка, — жаліцца Ася.

Ейная мама татарка. Яна прыехала ў Эстонію адразу пасля ўніверсітэта, з Растова-на-Доне. Прыехала праз каханне — ейнага жаніха раней дэлегавалі сюды працаваць на шахце. Тады больш за палову жыхароў тут жылі за кошт здабывання гаручых сланцаў. Першы адвал пачынаецца менш чым за дваццаць метраў ад цэнтра горада.

Мама Асі была інспектарам. Яна правярала прадуктовыя крамы. Ім жылося вельмі добра. Эстонія была самаю багатай з усіх рэспублік СССР. Кожны, хто мог, хацеў тут жыць. Ян Левандоўскі ў кніжцы «Эстонія» прыводзіць такі анекдот: фехтавальнікі з Каракалпацкай АССР думалі,

што яны ўжо на Захадзе, і ў Таліне прасілі палітычнага прытулку.

У хаце Асі ўсяго хапала. Кіраўнікі крамаў засыпалі іх кошыкамі харчоў. Бацька быў шахцёрам — гэта была самая прэстыжная прафесія ў ваколіцы. Па-эстонску яны не ведалі ні слова. Але як яны маглі ведаць, калі ўсе суседзі былі расейцамі?

Калі Асі споўнілася пяць гадоў, ейны бацька стаў штэйгерам. Тады ў першы і апошні раз наведаць іх прыехалі бабуля з дзядулем — з Растова адсюль тры дні на цягніку.

Праз год абрынуўся Савецкі Саюз і ўсё пачало псавацца. Новы ўрад не даў бацькам грамадзянства. Яны мусілі здаць «экзамен на эстонца». Мама спрабавала зрабіць гэта шэсць разоў. Суседка эстонка ўбачыла прыкладны набор пытанняў. Не ведала паловы адказаў, хаця з дзяцінства гаворыць па-эстонску.

Таму мама пайшла на курсы. Заплаціла некалькі сотняў еўра, вучылася начамі — і зноў нічога. За той час змяніліся законы, і стала немагчыма без ведання эстонскай надалей праводзіць інспекцыі ў крамах. Яе звольнілі. Кіраўнікі крамаў рабілі выгляд, што яе не пазнаюць. Урэшце нехта з іх злітаваўся і ўзяў яе на працу як прыбіральшчыцу.

Бацькавы справы таксама ішлі няважна. Калісьці ўвесь продаж сланцаў ішоў у СССР. З 1991 года яго ніхто не купляў. У адзін дзень бацька застаўся без працы. Не знаходзіў сабе месца. Крыху піў, крыху глядзеў тэлевізар. Усё часцей бяздумна вытарэшчваўся ў акно.

Мінула больш за год, і ён паехаў у Расею. Казаў, што вернецца, як там уладкуецца. Не адказвае ўжо 12 гадоў.

Спадарыня дырэктарка і непаслухмяныя вязні

— Расейцы тут асацыююцца выключна з гучнаю музыкай, футрамі і кашмарным макіяжам. А мы, эстонскія расейцы, зусім інакшыя, чым тыя з Расеі, — кажа Уладзіслава Вашкіна, тэрапеўтка і дырэктарка Эстонскага Таварыства хворых на рассеяны склероз.

Інтэграцыя расейцаў ад самага пачатку была найвялікшай праблемай эстонцаў. У 2005 годзе група навукоўцаў з Таліна падвяла вынікі гэтай інтэграцыі. Яны шакавалі. Больш за палову эстонцаў не прымаюць расейскага стылю жыцця. Кожны трэці не хацеў бы працаваць з расейцамі. 85 адсоткаў эстонцаў не маюць расейцаў сярод сваіх найбліжэйшых знаёмых. Усе гэтыя паказчыкі растуць.

Іншыя даследаванні: з 1991 года колькасць самагубстваў сярод эстонскіх расейцаў вырасла на 40 адсоткаў.

У Кохтла-Ярвэ — больш чым на 50 адсоткаў.

Разам з Вашкінай мы п'ем гарбатку ў эстонкі Рут Тэры, кіраўніцы прытулку для былых вязняў і бяздомных. Прытулак знаходзіцца ў «сталінцы» — будынку 50-х гадоў. Яны больш трывалыя за «хрушчоўкі» з вялікіх панэляў. Нягледзячы на гэта, з будынка асыпаецца тынк. Ён можа асесці — праз 200 метраў пачынаюцца шахты.

— Кохтла-Ярвэ — гэта незвычайнае месца, — кажа Уладзіслава. — У 20-ці тысяч чалавек эстонскае грамадзянства, у 5-ці — расейскае. А ў 20-ці тысяч няма аніякага грамадзянства!

— Як такое магчыма?

— Не здалі або нават не здавалі экзамен на эстонца. Расейцамі стаць не пажадалі.

— Як яны жывуць?

— Нармальна. Яны толькі галасаваць не могуць. Ім трэба віза ўва ўсе краіны, нават у Расею. Найгоршае ж адбываецца ў галаве такога бездзяржаўніка. Некалькі год таму мы праводзілі даследаванні іх пачуцця самасвядомасці. Вынікі нас уразілі: яны не знаходзяць сябе. Эстонія, у якой яны нарадзіліся, іх не жадае. У Расеі яны таксама не ў сябе. Гэта шок!

— Чаму?

— Расейцы ў СССР тут былі прывілеяванымі. Раптоўна гэта скончылася. Яны страцілі прэстыж, працу, грамадзянства. Зашмат усяго за некалькі месяцаў. Шмат хто не вытрымаў.

Рут: — Да таго ж за кароткі час зачынілі пяць шахтаў: Кохтлу, Сомпу, Таміку, Ахтме і Ківіёлі. Людзі не былі да гэтага падрыхтаваныя. Ім трэба было дапамагчы.

Ейны прытулак меўся стаць месцам для вызваленых з турмаў людзей, якім няма куды ісці.

Рут: — У сярэдзіне дзевяностых на волю выйшла вялікая група тых людзей, якія трапілі за краты яшчэ пры СССР. Іхныя сем'і выехалі ў Расею, у іх тут нікога не засталося. Яны былі ў шоку: іншая краіна, іншыя грошы, крамы, тавары, законы. Расея не дала ім грамадзянства, бо яны злачынцы. Эстонія таксама не дала — бо не ведаюць мовы. А калі камусьці ўжо стукнула пяцьдзясят, вывучыць новую мову сапраўды цяжка. Эстонская належыць да угра-фінскай сям'і. У ёй 14 часоў.

На сярэдзіну 90-х прыйшоўся таксама апагей беспрацоўя.

Уладзіслава: — Цяпер, на шчасце, гэта змянілася. Ёсць курсы для былых шахцёраў. Вучацца на будаўнікоў, зваршчыкаў, кандытараў. Багата хто знайшоў працу.

Дарагая жырандоля і дзень нараджэння прафесара

— Калі расейцы думаюць, што ім тут дрэнна, хай едуць у Расею, — кажа Март Пэхтэр, стоадсоткавы эстонец.

Мы сядзім у бары «Moscow» — улюбёным месцы талінскай багемы. На сценах дарагія жырандолі, у зале афіцыянткі ў кароткіх спаднічках, на столі крыштальныя люстры. Шык і раскоша.

Март — студэнт палітычных навук. Як і ў 85 адсоткаў эстонцаў, у коле ягоных знаёмых няма расейцаў. І ён не хоча, каб яны былі, хаця ў ягоным горадзе палова жыхароў — расейцы.

— У мяне ёсць сусед. Аднойчы я кажу яму па-эстонску «добры дзень» — tere. А ён робіць выгляд, што не разумее. Халера ясная, мы жывем у незалежнай Эстоніі. Давайце размаўляць па-эстонску!

Бронзавы Салдат? Март праходзіў міма яго штодня па дарозе ва ўніверсітэт. Раз на год бачыў жменьку залатазубых дзядкоў, якія звіняць медалямі, і жанчын з бярэмем гваздзікоў. Сустракаліся 9 траўня. Марту нават у галаву не прыйшло забіраць у гэтых безабаронных экспанатаў даўніх часоў права адзначаць уласныя гадавіны. Ён ставіўся да іх як да фальклору.

Усё змянілася год таму. — Падпальвальнікі, прадстаўнікі правых сілаў, хацелі абрынуцца на ветэранаў. Паліцыя іх

разагнала. Нібы нічога важнага, але ў СМІ пайшла такая версія: эстонская паліцыя разганяе эстонскую моладзь, каб акупанты маглі ўскласці кветкі.

— І што?

— Я таксама лічу, што так не мусіць быць. Я сам амаль не памятаю СССР. Толькі першамайскае шэсце. Я яго вельмі любіў. Талін быў шэры і сумны. А шэсце — вясёлае, каляровае. Таксама памятаю балтыйскі ланцуг. Два мільёны чалавек з Літвы, Латвіі ды Эстоніі сталі плячо ў плячо і ўзяліся за рукі. Гэта была мірная дэманстрацыя даўжынёю 600 кіламетраў. Мы спявалі, было прыгожа. Вялікі кайф для дзіцяці. Нават расейцы былі з намі. Яны таксама ведалі, што СССР — гэта страшнае гаўно. Таксама я памятаю, як мой бацька мацюкаўся на начальніка расейца. Ён працаваў у навуковым інстытуце. Ад дацэнта і вышэй практычна ўсе былі расейцамі. У іх тут было райскае жыццё. Бацька неяк пайшоў да начальніка, прафесара Антонава, і пытае, якія ў яго шанцы на павышэнне. А прафесар: таварыш, я вас не бачу ў клубе. Вы не былі на маім дні народзінаў. Я вас амаль не ведаю! Адкуль я магу ведаць, ці вы заслугоўваеце павышэння? Мой сябар кажа, што гэта, магчыма, розніца тэмпераментаў. Што расейцы любяць застоллі, любяць братацца, ляпаць па плячы. Для іх гэта важна.

Эстонцы халодныя. Нават як вып'ем шмат гарэлкі, не адкрываемся. Мы не бачым магчымасці распавядаць некаму пра свае праблемы.

Але сёння мой бацька кажа, што ён бы пакінуў Бронзавага Салдата. Бо гэта салдат-ідэаліст, а не акупант. Акупанты і нуварышы ішлі за ім.

— А ты? Як лічыш?

— Што расейцаў трэба пстрыкнуць у нос. Кожны чацвёрты з іх не гаворыць па-эстонску. Ані слова. Так не можна! Некалькі сказаў кожны можа вывучыць. Яны так трымаюцца, быццам належаць да вялікай дзяржавы. Вывучэнне эстонскай ніжэй за іхны гонар. Трэба часам нагадаць ім, што тут ужо не Расея.

— Яны памятаюць, у паловы няма пашпарта.

— А з чаго б ім яго мець? Яны не вучылі мову, бо лічылі, што Расея сюды вернецца. Яны не верылі, што СССР сапраўды распаўся. Цяпер таксама ведаюць, што Расея іх заўжды падтрымае. Калі б не Вялікі Брат за мяжою, мы б даўно ўжо дамовіліся.

Двое шахцёраў і п'яныя браты

Моладзь у Кохтла-Ярвэ ўвечары мае на выбар бар «Alex» ці парк, акружаны «сталінаўкамі». Яны выбіраюць парк — тут не трэба ні за што плаціць. Ім падабаецца сядаць на лаўках за помнікам двум шахцёрам, якія з гонарам трымаюць вялікія кіркі. Мясцовыя называюць іх «непьющие», то-бок тыя, што не выпіваюць. Гэта яны, з вышыні ўласнай абстыненцыі, гадамі назіралі за першамайскім шэсцем. З 1991 года на ўсе святы каля іх лунае эстонскі сцяг. З гэтага сцяга пачынаю размову з ліцэістамі.

Юля: — Яны ў мяне асацыююцца з пераследам маіх бацькоў. Тата быў цудоўным хірургам, скончыў акадэмію ў Пецярбургу. Ён не вывучыў мову, і яны яго звольнілі. Не звярталі ўвагі на тое, што ягоныя пацыенты — суцэльныя расейцы. Сёння ён інструктар у аўташколе.

Саша: — Гэта сцяг маёй краіны. Тое, што гэтая краіна не заўсёды ставіцца да мяне справядліва, іншая справа.

Іван: — Эстонцы — гэта фашысты. Але гэта таксама й наша краіна. Мы мусім іх цывілізаваць.

— Фашысты? — спрабую зразумець я.

Іван: — Так, яны ніколі не змагаліся з фашызмам. Не падтрымлівалі Чырвоную Армію...

— Бо яны не хацелі далучацца да савецкай дзяр...

Іван: — Бо яны фашысты. Штогод арганізуюць тут злёт ветэранаў СС.

Іван найбольш радыкальны. Ён адзіны ўдзельнічаў у талінскіх беспарадках. У рэшты ёсць праблемы больш важныя, чым Бронзавы Салдат.

Міша: — Месяц таму я атрымаў эстонскі пашпарт. Апошнім часам экзамены лягчэйшыя. На вакацыі паеду да стрыечнага брата ў Лондан. Трохі зараблю.

Насця: — У мяне няма пашпарта. Я яшчэ не вырашыла, які хачу ўзяць. У Расеі ў мяне шмат сваякоў. Але Захад таксама мяне прыцягвае. Аднак, хутчэй за ўсё, вазьму расейскі. Я хачу стаць акторкай, а найлепшая акадэмія ў Маскве.

Вераніка: — У мяне таксама няма пашпарта. Я чакаю, калі атрымае мая мама. Я не хачу мець іншае грамадзянства, чым яна. Я нарадзілася ўжо ў незалежнай Эстоніі, я б магла адразу атрымаць пашпарт. Але я чакаю. Гэта як грамадзянскі пратэст.

Я пытаюся ў ліцэістаў, кім яны сябе больш адчуваюць — еўрапейцамі ці расейцамі. Толькі Саша адчувае сябе больш расейцам.

Саша: — Дзядзькі, цёткі, бабуля, дзядуля — усе расейцы. Тое, што мае бацькі тут, гэта, хутчэй, працоўнае здарэнне. На пенсіі яны хочуць вярнуцца ў Расею.

Гэтак, як Саша, адказваюць толькі 10 адсоткаў расейцаў. Паводле даследаванняў 2005 года, амаль 70 адсоткаў лічаць сябе часткаю незалежнай Эстоніі. Лічаць, хаця толькі ў паловы ёсць эстонскае грамадзянства.

Насця: — Нават калі я вазьму расейскі пашпарт, я буду адчуваць сябе еўрапейкай. Мы вельмі адрозніваемся ад нашых сваякоў з Расеі. Яны нас не любяць. Зайздросцяць, што ў нас эстонскі дабрабыт. Бабуля мяне называе «Мая малая эстоначка».

Міша: — Калі я наведаў сваіх стречных братоў пад Масквою, я зразумеў, што я зусім іншы. Для мяне інтэрнэт, чат, скайп — гэта нешта відавочнае. Яны майго ўзросту і нават не ведаюць, што гэта такое і з чым яго есці.

Юля: — Да майго бацькі прыехалі браты з-за Уралу. Яны панапіваліся, гарэлка скончылася, дык яны за ключыкі і да аўтамабілю. Бацька паклаўся ля дзвярэй. «Праз мой труп, яшчэ каго-небудзь заб'яце!» У Эстоніі язда пад чаркаю — гэта вельмі цяжкае злачынства. Браты паглядзелі на бацьку: «Ты ўжо не рускі. Ты ўжо нам не брат».

Тратыл і адзенне Hugo Boss

Мама Асі Міхалічэнка яшчэ раз запісалася на курсы эстонскай мовы. На сёмы раз ёй удалося здаць экзамен. Калі ўсё пойдзе добра, праз паўгода яна будзе эстонкай.

Урад у Таліне сур'ёзна разважае над тым, каб адчыніць тэлебачанне на расейскай мове.

На эстонскіх сайтах да сёння можна набыць адзенне Hugo Boss са зніжкай.

Мой сябар Яан ужо астыў. Ён лічыць, што такі выбух эмоцый быў карысны. Расейцам ён мусіў дапамагчы зразумець, што, нягледзячы ні на што, лепш жыць у Эстоніі, чым над Нявою. Эстонцам — што яны замала робяць, каб расейцы пачуваліся ў Эстоніі як дома. І што толькі расейцы, да якіх кепска ставяцца, могуць зрабіцца пятаю калонай.

Саша, яшчэ да таго як знайсці тратыл, патэлефанаваў Уладзіславе Вашкінай. Калісьці ён хадзіў да яе на тэрапію; яна для яго аўтарытэт. Ён запытаўся, што яму рабіць. «Трымайся ад гэтага падалей», — сказала Уладзіслава. Падзейнічала. Пакуль што і вакзал, і аэрапорт у Таліне стаяць на сваіх месцах.

VI. ЗІМОЎКА

Калі мядзведзі могуць запасці ў зімовы сон, гэта значыць, што яны на добрым шляху ў справе здабыцця свабоды. Што яны ўжо не жывуць толькі сённяшнім днём. Што навучыліся рыхтавацца да горшых часоў.

Хобіты ў пэгээрах

Беднасць і беспрацоўе выцягнулі нас з дому. Інакш ніхто б з сябе не рабіў дурня, — кажа Гендальф. Я сустрэў яго асабіста ў былым пэгээры пад Кашалінам.

Разам з солтысамі з Люблiншчыны я наведваю вёскі, што знайшлі сваё месца ў XXI стагоддзі. Мы ўжо былі ў вёсках Канца Свету, Лабірынтаў, Казак і Ровараў і ў Вёсцы Здаровага Жыцця. Солтысы правяраюць, ці падобныя маглі б з'явіцца ў іх.

Наступны прыпынак — Серакова Славеньске. То-бок Вёска Хобітаў. — Каб мяне толькі ніхто не зжэр, — смяецца адзін з солтысаў.

Мы паркуем аўтобус каля драўляных дамкоў персанажаў Толкіна. Галоўная забава — гульня-арыентаванне

ў лесе, дзе іх можна сустрэць асабіста. Толькі за чэрвень хобітаў наведалі 3 тыс. гасцей.

Мы набываем квіткі па 15 злотых (у цане суп і кілбаска). У мапу ўзіраецца сам Гендальф. Вырушаем у лес.

У Гендальфа няма часу на тэлебачанне

— Восем гадоў таму прыехаў Вацлаў Ідзяк, той навуковец з Кашаліна. Кажа: бачу, тут у вас Вёска Хобітаў. Скажыце, а хто такія хобіты?

Пачатак быў цяжкі. Старыя бабкі пад крамай казалі: нафарбуюць морды і лазяць па вёсцы. Сорам. Я ёй: да вас раз на месяц паштальён грукаецца, прыносіць пенсію. А мне ён толькі рахункі і прыносіць. Я мушу саромецца, што хачу зарабіць?

У Гендальфа бландзіністыя валасы, яшчэ няма сарака. Гэта яна кіруе на пляцоўцы, калі групы дзяцей ідуць у лес.

— Дзеці часам кажуць, што Гендальф не можа быць жанчынай. Адказваю коратка: адкуль ты ведаеш? Ты зазіраў яму кудысьці? Гэтага дастаткова. Вядома, так я кажу толькі старэйшым. Малодшым загадваю цягнуць за бараду. Або іх пужаю.

Часам цягнуць за бараду і запытваюць, чаму ў мяне ануча на твары. Або кажуць: вы пераапранутая. Я на гэта: а ты апрануты. Не дам мне дарогу заступаць. Я зашмат у жыцці перажыла.

Цяпер ужо лепш. І праца ўрэшце ёсць. Да пятнаццатай я Гендальф. Потым пераапранаюся — і я ўжо пані Малгажата. Хутка сядаю ў аўто, і мы з сяброўкамі едзем на працу.

Серакова? Муж-ляснік атрымаў сюды накіраванне. Калі я прыехала ў ліпені, 20 гадоў таму, паўсюдна квітнеў зяновец. Было жоўта, хораша. Я думала, што мы едзем жыць у рай. Але ў лістападзе, калі мы пераязджалі, было шэра, халодна, панура. Ад зяноўцу засталіся адныя куксы. Хацелася плакаць.

Больш за дзесяць год я праседзела ў хаце між чатырох сценаў. Я была такою Марысяй: праць, прыбіраць, гатаваць. І яшчэ завезці дзіця ў лякарню. У дачкі былі праблемы з селязёнкай ды вантробай. Тры разы на тыдзень я мусіла ездзіць з ёю на аўтобусе ў Кашалін.

Дзякуючы хобітам вёска змянілася. І я змянілася. Калісьці ўвесь вольны час я сядзела каля тэлевізара. Я ведала праграмы на памяць. А цяпер ужо не ведаю, калі апошні раз я глядзела тэлебачанне. Хіба ў траўні.

Калісьці ўсе пыталіся: дзе знаходзіцца Серакова? Я адказвала: гміна Сянуў; там, дзе робяць запалкі. Сёння я кажу: Серакова, а ўсе: хобіты!

Праз чатыры гады я сама ўпершыню пайшла ў трасу. Я ўбачыла троляў і пачала ўцякаць. І толькі тады, як ужо да асфальту дабегла, кажу сабе: дурная, чаго ты ўцякаеш? Тролі — гэта ж твае калегі!

Доктар Ідзяк з высокага фатэля

Прайшоўшы некалькі соцень метраў па асфальце, даходзіш да канца вёскі. Тут невялікі ўзгорак. Амаль усю вёску відаць, як на далоні: касцёльчык, некалькі дзясяткаў дамоў, пабудаваных яшчэ немцамі, школу, якая ў кожны момант перастане быць школай.

Вацлаў Ідзяк, пашыральнік ідэі тэматычных вёсак, патрапіў сюды, распрацоўваючы стратэгію гміны Сяноў.

— Мы разам з жыхарамі рабілі мапы іхніх ваколіц. Мы шукалі цікавыя месцы. Мапа Серакова была незвычайная: мегалітычныя пахаванні ў лесе; нейкія каменныя кругі. Мне ў галаву адразу прыйшоў Толкін.

Ідзяк скончыў польскую мову і літаратуру ў Познані, працаваў у Доме культуры, потым выкладаў сацыялогію і філасофію. У 1989 годзе хацеў быць як мага бліжэй да пераменаў — адмовіўся ад універсітэта і пачаў працаваць у пякарні.

— Я стварaў новыя віды хлеба. Потым я кіраваў аптовым складам з экалагічнымі прадуктамі. Урэшце я стаў дырэктарам Агенцтва рэгіянальнага развіцця ў Кашаліне. Ужо тады я спрабаваў прасоўваць тэматычныя вёскі. Але людзям тады было не да такіх рэчаў. А з высокага фатэля складана нешта зрабіць унізе. Я адмовіўся ад Агенцтва, і мы з жонкаю вырушылі ў поле.

Першыя спробы? У вёсцы Вяжбінэк. Вучым людзей, як шукаць культурныя асацыяцыі. Вярба? Д'яблы, Шапэн. Гётэ пісаў пра вербы.

Людзі часам думаюць, што мы гэта робім толькі дзеля грошай. Што мы проста хочам зарабляць на хобітах. Няпраўда. Грошы ў нас з еўразвязаўскіх грантаў. Мы карысталіся дапамогай многіх фондаў. Я быў стыпендыянтам «Ashoka» — арганізацыі, якая падтрымлівае грамадскіх прадпрымальнікаў. З хобітаў я не ўзяў ні капейкі.

Як усё пачыналася? Нас тут ведалі. У навакольных вёсках мы арганізоўвалі народныя гулянні, сустрэчы

жанглёраў, мастацкія майстар-класы. Людзі з Серакова пра гэта ведалі. Але калі я ўпершыню распавядаў пра хобітаў, усё чакаў, што нехта з іх устане і пакруціць пальцам каля скроні.

Чараўніца з інтэрнэту

— Некаторыя круцілі. Але як тут не круціць. Я, напрыклад, даю дзецям такі напой: жменя павукоў, жменя камароў і вада з балота, — кажа Чараўніца.

Шыльда на ўваходзе ў ейнае каралеўства сведчыць: «Вясковая святліца ў Серакове Славеньскім, пабудаваная на сродкі прэвентыўнага фонду PZU* пры ўдзеле грамадскасці». За дзвярыма — малая бібліятэка з інтэрнэтам. Тут Чараўніца ператвараецца ў пані Эдыту — бландзінку з кароткай стрыжкай і надзвычай сімпатычнай усмешкай.

— Хобіты? Аднойчы мая стрыечная сястра не змагла выйсці Чараўніцаю. Я сказала: пайду за цябе, толькі што я мушу казаць? І гэтак у мяшку, намазаная чорным, я пайшла пужаць дзяцей.

Сястра — гэта Энтыян. Мы сядзім разам за сталом у святліцы. — Я ў праекце ад самага пачатку. Бо ўсё гэта ўтварылася вакол школы. А я, пад імем Багуслава, тут працую. Дакладней, працавала. Бо нашу школу акурат зачыніла гміна.

Даўно было вядома, што зачыняць. Я яшчэ ў 2004-м мусіла прайсці атэстацыю. Але спалохалася, што буду

---

* Powszechny Zakład Ubezpieczeń — найбуйнейшая страхавая кампанія Польшчы. — Заўв. пер.

занадта дарагой настаўніцай і ніхто мяне не возьме. Атэставаны настаўнік мусіць зарабляць больш — паводле закону. Таму я вырашыла, што застануся таннейшай.

Толькі сёлета я махнула рукой. Я атрымала тры дадатковыя адукацыі. Езджу на курсы. Што будзе, тое будзе. Гэтак і выйшла. Цяпер я буду працаваць у святліцы ў Сянове.

Школы нам вельмі шкада. Нашы дзеці сёлета ў гміне выйгралі конкурс на лепшую батлейку. Камп'ютарная зала ў нас была з новаю тэхнікай. На дзень народзінаў Більба мы ладзілі лялечны тэатр. Багата дзе і паловы не адбываецца таго, што ў нас.

Але ў нас было толькі дванаццаць дзяцей. Гміна палічыла, што школа каштуе 300 тысяч на год. Аднаго голасу нам не хапіла.

Пані солтыс лушчыць гарох

Здаецца, пані солтыс аб'явіла хобітам вайну. Чаму? Не зусім ясна. Напачатку яна ангажавалася. Бурмістр набыў ёй страуса. Каб паказваць яго дзецям як цікавостку.

Але потым яна змянілася. Пачала замыкаць брамку, а страуса хаваць. Потым страус здох. Што здарылася? Невядома. Я іду запытацца.

Солтыса завуць пані Марыёла. Гэта жанчына сур'ёзная, энергічная, талковая і пагружаная ў працу. Якраз цяпер яна разам з сынамі сабрала гарох, трэба лушчыць. Пра хобітаў размаўляць не жадае. — Напішыце, што я да іх стаўлюся прыхільна, — кажа і збіраецца са мною развітвацца. Але я не магу дазволіць ёй сысці! Ніхто не ведае пра жыццё вёскі столькі, колькі солтыс. Таму мы дамаўля-

емся, што я дапамагу лушчыць — і мы зможам пагаварыць пра вёску і ейныя праблемы.

— Але пра хобітаў ні слова! — адзначае яна.

Мы сядаем. Я паслухмяна лушчу. — Людзі тут у асноўным з аперацыі «Вісла». Працавітыя. Праседжвання пад крамаю з віном тут не заўважалася.

Праблемы? Самая вялікая — гэта дарога. Дзірка на дзірцы. Нядаўна быў пажар у бараках — пажарнікам было вельмі цяжка дабрацца. Пра хуткую я ўжо маўчу. У нас збольшага пажылыя людзі. Яны баяцца, што, як нешта здарыцца, хуткая папросту не паспее.

Другая праблема: недахоп сувязі. Практычна ніводны мабільнік не працуе добра. У XXI стагоддзі, каля самай мяжы з Нямеччынай. Неверагодна.

Трэцяя: усё менш моладзі. З 200 жыхароў 50 нарадзіліся перад вайной або падчас яе. Маладыя ўцякаюць, куды хто можа.

Голум паліць «Мальбара»

Голум, ці пан Зенан, трымае вясковую краму. Мы сядзім на лавачцы, папіваем «Тыске», палім «Мальбара». Узгадваем часы, калі ў вёсках палілі цыгарэты без фільтра і пілі танныя віны, гэтак званыя мазгаёбы.

Гэта ўжо стала гісторыяй. Танных вінаў у Голума не набывае амаль ніхто. Сталыя наведнікі пры століку побач з крамаю частуюцца півам і размаўляюць пра тое, як у Польшчы знішчаецца дэмакратыя.

— Каб за язду на ровары забіраць правы... Такога нават у часы Гамулкі не было...

— Але ж ты, Ясю, выпіўшы ехаў на тым ровары, — заўважае больш цвярозы.

— Усё адно. Былі часы, нават на трактары можна было выпіўшы ездзіць. Заўжды можна было дамовіцца. Паліцэйскная дзяржава.

Вяртаемся да хобітаў. — Голум? Ён калісьці быў адным з іх, але звар'яцеў. З-за пярсцёнка. Праз той пярсцёнак ён забіў брата, — пачынае Пуш, але з'яўляюцца наступныя кліенты. Трэба вяртацца за прылавак.

— Была такая гісторыя ў суседняй вёсцы, — узгадвае аматар язды на ровары. — Толькі там сварка была не з-за пярсцёнка, а з-за дзяўчыны.

— Неее, там з-за зямлі ўсё было, — прыгадвае другі. — Брат забіў брата. Святая праўда.

Пан Зенан вяртаецца да падпаленай цыгарэты і перарванага аповеду. — Калі прыходзіць група, я кажу: «Вітаю вас, хобіты. Я таксама хобіт». Яны крычаць: ты зусім не хобіт! І пачынаюць шукаць пярсцёнак у сажалцы.

— Распавядзі, Зэнэк, як ты зрабіў сажалку!

— Выпадкова. Некалькі год таму я пасадзіў бульбу. Але там прарвалася крыніца і бульба пагніла. Я прайшоўся культыватарам і выкапаў невялікую яму. Там шукаюць пярсцёнак. Глыбіня па калена, але я кажу, што тры метры.

У мінулым годзе жанчына трымалася за канат рукамі і нагамі, хаця ейны азадак ужо датыкаўся да дна. Яна вельмі здзівілася.

— Зэнусь, можа, ты мяне ўладкуеш на якую-небудзь працу? — пачынае аматар роварнай язды.

— Ты хочаш быць тролем ці гномам? — пытаецца Голум, смеючыся. — Бачыце, нашыя бацькі жылі толькі з зямлі. А мы ўжо амаль не садзім. Я летась пасадзіў пяць гектараў лесу. Еўразвяз дае грошы. Калі гміна дазволіць, усё лесам абсадзім.

Каралева эльфаў любіць кіно

— Нешта дрэннае адбываецца з сучаснымі дзецьмі, — дзеліцца разважаннем каралева Галадыэль. — Яны не падумаюць нарваць кветак мне, каралеве эльфаў, яны шукаюць палкі, каб змагацца з тролямі. Мы былі больш спакойныя.

Каралева — у якасці пані Малгажаты — сёлета адважылася пайсці на працу ў рыбную кампанію «Espersen».

— Чаму «адважылася»? Бо калі доўга не працуеш, цяжка перамагчы сябе ў той першы раз. А для мяне гэта першая сур'ёзная праца.

На сайце чытаем: «Місія міжнароднай фірмы „Espersen“ — дастаўка на сталы еўрапейцаў рыбнай сыравіны Балтыйскага мора. Стандартныя прадукты — гэта замарожаныя брыкеты, паляндвіцы, кавалкі і рыбнае філе, а таксама вялікі асартымент рыбы ў паніроўцы».

Гэтыя стандартныя прадукты каралева спачатку аддзяляе ад касцей, а потым запакоўвае. Зараз у яе месяц адпачынку. Што будзе пасля — невядома.

— Можа, трэба будзе адмовіцца ад хобітаў. Шкада было б. Але ад хобітаў не будзе пенсіі, а «Espersen» пенсію дае.

Дзеткі? Я добры герой. Я даю дзецям артэфакт, які іх будзе ахоўваць.

— Што даеце?

— Ну я ж кажу — артэфакт. Але калі група не адкажа на пытанне — пакідаю закладніка. Пра што я пытаюся? Якія героі ёсць у Толкіна. Або загадваю загадкі: падаюць з дрэва жоўтыя, чырвоныя, вецер нясе іх у той самы бок. Што гэта такое?

Загадкі я бяру ў інтэрнэце. Без камп'ютара ўжо цяжка ўявіць сабе жыццё ў вёсцы.

Летась у нас было вельмі шмат турыстаў. Усе, здаецца, задаволеныя. Малая вёска — а столькі аўтобусаў.

Убачыўшы мяне, часам крычаць: Чырвоны Каптурок! Я на гэта: прабачце, даражэнькія, але гэта не тая казка.

Хаця часам знойдзецца дзіця, якое прачытала — і яму не падабаецца. З-за таго, што тут па-іншаму, чым у кніжцы. Я дык кніжку не чытала, мы хадзілі ў кіно. Чытаць трэба любіць. Я не люблю. Але кіно мне вельмі спадабалася.

Першы Троль чакае гміну

— Я не магу паварушыць пальцамі, калі падымаю запясце, — Першы Троль паказвае руку, амаль цалкам знявечаную падчас інцыдэнту ў саўгасе. — Маю руку ўцягнула між двух металічных валікаў. Дактары змаглі выратаваць толькі адно сухажылле.

Але ў мяне такі падыход да жыцця: мы жывем толькі раз — і няма сэнсу пераймацца. Калі сёння табе дрэнна, мо заўтра будзе лепш. Так, як цяпер. У красавіку згарэла мая халупа. Мы жылі ў старых бараках. Гміна кажа, што да лістапада адбудуюць, але яшчэ нават не пачыналі. Я з жонкаю і дзецьмі жыву ў школе. Дык што, плакаць нам?

Серакова? Я тут аказаўся праз дзяржаўную жывёлагадоўлю ў саўгасе «Sowno». Бацька патрапіў у аварыю, і я ў 14-гадовым узросце мусіў узяць гаспадарку на сябе. Але жонку я сабе ўзяў з саўгаса. Яна хацела туды вярнуцца, бо там усё даюць. Пасля развалу саўгаса мы пайшлі на куранюўкі*.

Хобіты? Больш за ўсё мне падабаецца, што ўсе грошы застаюцца ў вёсцы. Калі праходзіць гулянне, гатуюць нашыя кабеты, наш уладальнік крамы прадае піва, наш настаўнік музыкі грае. Свае зарабляюць, а не чужыя.

Кантакт з дзецьмі я ўсталёўваю вельмі хутка.

— Як ён можа не ўсталёўваць, калі зрабіў адзінаццаць уласных, — з-за газеты гаворыць каваль Міжзем'я пан Стэфан.

— У мяне толькі сямёра, — абураецца Першы Троль. Каваль не здаецца: — Эээ, тут кожны другі руды на экскурсіі — гэта твой.

Троль стомлена адмахваецца рукой — тою, здаровай.

— У нас таксама былі педагагічныя курсы. Нам казалі ставіцца да дзіцяці гэтак жа, як дзіця ставіцца да цябе. Дзіця ветлівае — ты таксама будзь ветлівы. Дзіця крычыць — і ты крычы.

Наогул я скончыў 30 або 40 розных курсаў. Я б у жыцці не падумаў, што пасля тэхнікума яшчэ столькім рэчам

---

* Kuroniówka — у народзе назва бясплатнай ежы, што раздавалі бедным у Варшаве ў часы міністра працы Яцэка Кураня. — заўв. пер.

буду вучыцца. І па свеце мы ездзім! Я быў у Аўстрыі, Чэхіі, Славакіі. І ў Англіі.

Але мы таксама навучаем дзяцей прыродзе. Гарадскія дзеці не ведаюць, як выглядае качка. А калі Чараўніца кажа ім налавіць камароў — ідуць і шукаюць. Яны не ведаюць, што камары не лятаюць удзень.

Другі Троль ставіць на хобітаў

— Горш за ўсё, калі не ведаеш, на што разлічваць. Калі гміна дасць нам школьны будынак, то ў нас ёсць вельмі шырокія планы развіцця.

Другі Троль — у якасці пана Юзэфа — кіраўнік Хобітану. — Сёння ўжо каля 30 чалавек зарабляюць на хобітах. Мы прымаем некалькі тысяч чалавек. Мы прафесійныя. Пачынаюцца таксама добрыя грошы. Колькі? Цяжка палічыць. Але за сезон назбіраецца па некалькі тысяч на чалавека.

Калі ж школу нам не дадуць, цяжка паверыць, што мы ўтрымаемся. А будзе шкада, калі ўсё змарнуецца. Людзі змяніліся. Некаторыя раней баяліся слова адно аднаму сказаць. Сёння яны гаваркія, смелыя.

Калісьці ён працаваў на заводзе суднавога абсталявання. Потым заняўся ўласнаю справай. — Спачатку ўсё спорылася. Мы з братам мелі пяць крамаў у наваколь-ных вёсках. Узялі аўто ў лізінг. Але насельніцтва пачало бяднець. А з кім найгорш мець справу? З прыяцелем! Хіба ты не дасі прыяцелю ў крэдыт? Вядома, дасі, а ў мяне, на жаль, навокал тут суцэльныя прыяцелі. І гэтак толькі на адной краме з крэдытамі мы страцілі 7 тысяч. Мы былі

самыя смелыя, а гэткія ў тыя часы больш за ўсіх па карку атрымлівалі. Цяпер мы таксама самыя смелыя. Людзі з усёй Польшчы прыязджаюць да нас вучыцца.

Бачыце тую паветку? Я будаваў яе больш за дзесяць год таму. Мы з сябрамі збіраліся рабіць дэталі для «малюха». Не атрымалася. Зараз тут будзе карчма «У троля». Мы зарэгістравалі ўласную фірму. Мы будзем спрабаваць жыць толькі з хобітаў.

— Атрымаецца?

— Атрымаецца — цудоўна. А не выйдзе — зробім штосьці іншае.

Доктар Ідзяк жанглюе мячыкамі

Канец экскурсіі. Вацлаў Ідзяк устае насупраць групы солтысаў з Любліншчыны. У руках ён трымае чатыры мячыкі. Праваю рукой падкідвае адзін з іх: спакойна, павольна. — Гадамі так было ў вёсцы. Дастаткова было навучыцца адной справе: сеяць, гадаваць жывёлу якую заўгодна. А цяпер часы змяніліся, — і Ідзяк пачынае жанглява ць. — Цяпер трэба спрабаваць так, — кажа і жанглюе трыма мячыкамі адначасова. — Або так, — і падкідае па чарзе два і адзін.

Солтысы з Любліншчыны круцяць галовамі. — У нас гэта не прыжывецца.

— Тут людзі таксама так казалі, — рэагуе Ідзяк.

Солтысы круцяць галовамі. — Тут беднасць. У нас аж такой беднасці няма, каб хобітаў з сябе рабіць.

VII. ЛЬВЫ Ў АФРЫКУ

Галоўнае правіла пры вызваленні льва: рабі выгляд, што ты дурнейшы, чым ёсць насамрэч. Найлепш — нашмат дурнейшы.

Поп-арт Радаван

Тут, спадарства, жыў спадар Караджыч. Тыя людзі — гэта ягоныя суседзі. Лепш не здымайце іх. Яны стаміліся ад журналістаў. Бачыце — крычаць. Калі ласка, не крычыце! Гэта толькі экскурсія. Два палякі, два расейцы і японец. А вы, спадарства, не пераймайцеся. Гэта проста непрыемная выпадковасць. Мы, сербы, звычайна вельмі ветлівыя. Вось, тая жанчына з сабачкам усміхаецца.

З жніўня 2008 года. Я ў Бялградзе на першай экскурсіі па слядах Радавана Караджыча, які тут хаваўся, прыкідваючыся лекарам натуральнай медыцыны Драганам Дабічам. Мы наведваем ягоны дом, ягоную краму і ягоны бар. Экскурсія называецца «Поп-арт Радаван».

Экскурсаводцы каля 20 гадоў. Калі Караджыч абложваў Сараева, яна яшчэ пешкі пад стол хадзіла. Што б ні

адбывалася — яна ўсміхаецца. — Вы заўважылі? Штосьці ёсць у ягонай паштовай скрынцы. Не, вам лепш туды не ісці. Ведаю, што ў Японіі вы заўжды робіце шмат фотаздымкаў. Але цяпер гэта дрэнная ідэя.

Мы глядзім на самы звычайны на свеце шматпавярховы дом. Звычайнае сонца смаліць, як халера. У гаршку квітнеюць самыя звычайныя пеларгоніі. Ён бачыў іх кожнага разу, калі выходзіў з дому.

Тут няма горных сховішчаў, пісталетаў, страляніны. Тут ёсць дзіцячыя драбінкі і сем лавак, пафарбаваных у зялёны колер. Тут ёсць шасціпавярховы дом, на якім цяпер нехта напісаў балончыкам «вуліца Радавана Караджыча».

22 ліпеня ён выйшаў адсюль, трымаючы некалькі торбаў. Да аўтобуса нумар 73 было некалькі сотняў метраў. Адныя кажуць: ён ехаў на вакацыі. Іншыя: ён ведаў, што новы ўрад зробіць усё, каб выслаць яго ў Гаагу. Ён сеў у аўтобус, праз хвілінаў дзесяць яго злавілі. Балканскі кат.

Тысяча гадоў турмы

Адкуль узялося гэтае прозвішча — Драган Дабіч? Здаецца, сапраўдны Дабіч да вайны быў інжынерам у Сараеве. Але ці дакладна? У гэтай гісторыі ні ў чым нельга быць упэўненым. Заходнія журналісты ў Бялградзе кажуць, што паліцыя свядома замыльвае нам вочы. І што ўлады хочуць, каб мы шукалі ўладальніка ягонага пашпарта, бегалі па супермаркетах, каб распытваць пра ягоны ўлюбёны сыр, і па паліклініках, каб распытваць, якімі метадамі ён лячыў. Яны робяць усё, каб мы разменьваліся на

неістотныя пытанні, якія датычаць падрабязнасцей жыцця доктара Дабіча.

Дзякуючы гэтаму мы мусім не запытваць пра самае істотнае: як магчыма, каб самы вялікі з часоў Другой сусветнай вайны міжнародны злачынца спакойна хадзіў па цэнтры Бялграда?

— Але гэтыя дробязі таксама важныя, — адзначае адзін з замежных журналістаў. — Каб зразумець сённяшнюю Сербію, мусіш зразумець тандэм добрага Доктара Дабіча і кепскага Містара Караджыча.

Таму давайце пашукаем уладальніка пашпарта. Самая праўдападобная версія гучыць так: сапраўдны Драган Дабіч жыў у Сараеве. Ён загінуў ад кулі сербскага снайпера ўвесну 1993 года. Ён бег па вуліцы на пляц, дзе мусілі раздаваць гуманітарную дапамогу.

Сараева ўжо цягам доўгіх месяцаў асаджанае войскамі Радавана Караджыча — прэзідэнта Сербскай Рэспублікі, якая сёння ўваходзіць у склад Босніі.

У горадзе жылося ўсё цяжэй. Не хапала вады, ежы, бінтоў.

Гісторыю першай смерці Драгана Дабіча па тэлебачанні Босніі і Герцагавіны распавёў ягоны брат Младлен, да сёння жыхар Сараева. — Куля прыляцела з раёна Врацэ. Там былі пазіцыі войскаў Караджыча. Майго брата серба забілі сербскія вайскоўцы. Калі я даведаўся, што потым Караджыч прыкідваўся ім, я жахнуўся. Як можна быць настолькі цынічным?

Амаль чатыры гады аблогі Сараева каштавалі больш за 12 тысяч чалавечых жыццяў. 1,5 тысячы з іх былі дзецьмі.

У Гаазе Караджычу пагражае нават тысяча гадоў зняволення. Самае цяжкае абвінавачанне — генацыд. У 1995 годзе ягоныя салдаты вынішчылі мірнае мусульманскае насельніцтва мястэчка Срабраніца.

«Жанчынам і дзецям загадалі ісці направа, мужчынам налева. Ці хлопец яшчэ дзіця, ці ўжо мужчына, вырашаў матузок, падвешаны на вышыні 150 сантыметраў. Калі хлопец быў вышэйшы — яго забіралі ў маткі, — піша пра Срабраніцу Войцех Тохман у кніжцы „Ты нібы камяні ела“. — Вясною наступнага года жанчыны даведаліся па радыё, што ў ваколіцах Срабраніцы працуюць групы Трыбуналу з Гаагі. Пад нядаўна ўскапанаю зямлёй знайшлі тры з паловаю тысячы целаў».

«Самаму малодшаму з тых, хто цудам пратрываў дзясяткі экзекуцый, было 17 гадоў. Калі яго выводзілі з грузавіка разам з групай мужчын з завязанымі вачамі і рукамі, усе яны прасілі толькі пра глыток вады». «„Я не хацеў паміраць засмяглы“, — сказаў ён праз шмат гадоў». Гэтак у кніжцы «Паштоўкі з магілы» напісаў баснійскі журналіст Эмір Сульягіч, адзін з нешматлікіх, хто перажыў атаку сербскага войска на Срабраніцу.

Дражэн Эрдэмавіч пад прымусам камандзіраў расстрэльваў мусульман у Срабраніцы. «У хлопца не былі завязаныя вочы, і Дражэн убачыў ягоны твар, хоць абяцаў сабе, што не будзе глядзець у твары вязняў, бо гэтак цяжэй страляць. Хлопцу магло быць пятнаццаць гадоў, можа, менш. Калі вязні ўкленчылі перад карным атрадам, за імгненне да загаду страляць, Дражэн пачуў голас хлопца. „Мама, — шаптаў ён. — Мама!“ Праз хвіліну ён

ужо быў мёртвы». Гэтак дзень з жыцця Дражэна ўзнаўляе Славенка Дракуліч у кніжцы «Яны не пакрыўдзілі б і мухі».

У Срабраніцы загінулі амаль 8 тысяч мужчын і хлопцаў. Наймалодшаму было 14 гадоў.

Другая смерць Дабіча

Другі раз Драган Дабіч памёр у будынку сербскай пракуратуры. На гэты раз дастаткова было ўсяго некалькіх рухаў нажніцамі, каб доўгавалосы, харызматычны доктар натуральнай медыцыны адышоў назаўжды.

Некаторыя, аднак, кажуць, што ў Караджыча былі дакументы іншага Дабіча — маламаёмнага халопа з вёскі Рума, 60 кіламетраў ад Бялграда. Падобна да таго, што пашпарт, якім карыстаўся Караджыч, быў копіяй пашпарта селяніна Дабіча, які — падкрэсліваюць заходнія журналісты — жыве без камп'ютара і мабільніка. — Такой славы я сабе не жадаў, — сказаў селянін Дабіч тэлебачанню BBC, пра існаванне якога раней не здагадваўся.

Адкуль у Караджыча былі дакументы Драгана Дабіча? Невядома. У ягонай кватэры знайшлі некалькі камплектаў дакументаў на розныя прозвішчы.

Я хацеў адчуваць гэты ток

Сёння складана знайсці пацыентаў Караджыча-Дабіча. Калі і знойдзеш, пра свае візіты яны распавядаюць з пэўнаю няёмкасцю. Па-першае, праз тое, што іхны лекар аказаўся кімсьці зусім іншым. Па-другое, саму нетрадыцыйную медыцыну апошнім часам высмейваюць як нейкі забабон.

Па-трэцяе, бо Драган Дабіч часта лячыў інтымныя захворванні: імпатэнцыю, бясплоднасць.

Елена С., 30 гадоў. Сяброўка маіх бялградскіх знаёмых. Худая, дагледжаная, сур'ёзная: — Лячэнне? Мяне ўгаварыла прыяцелька. Яна была на нейкай сустрэчы, дзе Дабіч распавядаў пра дыету. Яна казала, што ён прыехаў са Штатаў, але пажыў у Індыі і Кітаі. Мусіў браць 500 дынараў за візіт. Часцей за ўсё не браў нічога. Стварaў уражанне, быццам грошы не ўяўляюць для яго аніякай каштоўнасці.

У мяне тады былі праблемы з ныркамі, мне пагражалі дыялізы. Я паўсюдна шукала дапамогі.

Спачатку ён глыбока зазірнуў мне ў вочы. Потым памераў пульс, загадаў паказаць язык. Урэшце прыклаў мне рукі да спіны. Дакранаўся, але тут жа прымаў і патрасаў імі. Пасля гэтага я адчувала цяпло. На завяршэнне ён зрабіў мне нейкі амулет. Я яго ніколі не насіла і хацела выкінуць. Але зараз дык дакладна захаваю на памяць.

Я яму не давярала. Ён выглядаў як шарлатан. Доўгія валасы, звязаныя ў конскі хвост. Барада як у Святога Мікалая. Аднойчы ён сказаў мне, што праз бараду і валасы да яго прыходзіць касмічная энергія. Я падумала, што зараз з фатэля звалюся.

Але ныркі мае палепшалі. Не ведаю толькі, ці дзякуючы яму, бо я спрабавала шмат рэчаў, уключна з постам і малітваю.

Душан М., часты наведнік бара «Дом вар'ятаў», улюбёнага месца Дабіча. Лёгкая касавокасць, кароткія нагавічкі, гарачы патрыёт: — Аднойчы я паскардзіўся Караджычу...

То-бок Дабічу, што ў мяне будзе аперацыя на назе. Крыва зраслася. Патрапіў у аварыю на матацыкле.

Да яго мяне выслала матка, бо ў ейнай вёсцы ў Чарнагорыі таксама быў такі лакальны медык. Яна сказала: ці ён табе дапаможа, ці ніхто.

Я ведаў Дабіча: ён неаднойчы набываў мне піва. Ляпаў мяне па спіне, пытаўся пра здароўе.

На нашым раёне, здаецца, ніхто не нарадзіўся ў Бялградзе. Раён пачалі будаваць у канцы 70-х. Сялілі тут вайскоўцаў з сем'ямі. Майго бацьку паслалі сюды, бо ён быў афіцэрам югаслаўскага войска.

Многія сюды пераехалі падчас вайны — сербскія ўцекачы з Босніі і Харватыі. Вельмі добрыя сербы. Частка з іх змагалася ў час вайны. Можна сказаць, што для спадара Караджыча гэта было ідэальнае месца для жыцця.

Нага? Я пайшоў да яго. Спадар Драган, кажу, вы можаце дапамагчы мне з касцямі, якія дрэнна зрасліся? Мне іх будуць разламваць. Нічога не атрымаецца зрабіць?

Ён паглядзеў на мяне праз свае тоўстыя шкельцы. Сказаў, што ўжо выпіў віна, а пасля алкаголю не можа лячыць. Загадаў мне прыйсці да яго ў кватэру на наступны дзень.

У кватэры было вельмі чыста. Два пакоі. У адным ён спаў і працаваў за вялікім камп'ютарам. Я ўжо тады задаўся пытаннем, навошта яму такі камп'ютар. Пазней я прачытаў, што ён збіраў дакументы для абароны ў Гаазе.

Каля камп'ютара стаяў фотаздымак чатырох хлопцаў у строях амерыканскіх баскетбалістаў. Спадар Дабіч сказаў, што гэта ягоныя ўнукі, што жывуць у Штатах.

Лячэнне? Ён прыкладаў мне рукі да нагі. Пытаўся, ці адчуваю я ток. Я нічога не адчуваў. Але ў ягоным голасе было нешта такое, што мне хацелася адчуваць. І я казаў: так, адчуваю.

Усё адно пасля мне разламалі тыя косці ў шпіталі. Але, кажуць, зраслося добра. Я не ведаю, ці гэта праўда, бо ўвесь час кульгаю.

Гэта апалітычная экскурсія

— Тут, спадарства, доктар Дабіч рабіў пакупкі. Памідоры 39 дынараў, грушы 69. Кажуць, ён вельмі здорава харчаваўся. Толькі гародніна і садавіна. І сыр. Кажуць, яму вельмі залежала, каб усё, што ён еў, паходзіла з Сербіі. Прадавачка кажа, што таксама можа прапанаваць памідоры з Іспаніі. Прыгажэйшыя, большыя, цана не нашмат вышэй. Але ён заўжды выбіраў сербскія.

Цяпер, калі ласка, паглядзіце направа, у гэтым бары, «Дом вар'ятаў», ён сядаў пад сваім партрэтам. Піў віно «Мядзведжая кроў», размаўляў з людзьмі. Усе былі перакананыя, што ягонае імя — Драган Дабіч, што ён лекар нетрадыцыйнай медыцыны. Віно? Пакаштуйце, наша фірма прастаўляе. Нясмачна? Гэта таннае віно. Яго п'юць простыя людзі. Спадар Дабіч жыў вельмі проста.

У «Доме вар'ятаў» пануе вэрхал. Сталы выціраюць, калі хтосьці пра гэта ўзгадае. Тут дамінуе піва «Jelen», але таксама можна набыць чарнагорскае «Nikšićko». Усяго поўна: куфляў, вафляў, ануч, бутэлек. А на ганаровым месцы — партрэты. Мы пытаемся пра іх у экскурсаводкі.

— Гэты справа — генерал Младзіч. Яго яшчэ не злавілі. Хутчэй за ўсё, ён схаваўся недзе ў гарах, у колішнім бункеры маршала Ціты. Па слядах Ціты таксама праходзіць нашая экскурсія. І па слядах бамбардавання НАТА. Я пакажу вам у каталогу.

Гэты злева? Ну як гэта, вы не ведаеце? Хаця й праўда, вы ж з Японіі. Не мусіце ведаць. Гэта Слабадан Мілошавіч, былы прэзідэнт. Гэй, спадар з Польшчы, я не дачула вашае пытанне! Ці што легальнае? Вешанне гэтых партрэтаў? А чаму яно мела б быць нелегальным? У нас жа дэмакратыя. У Польшчы, хіба, вы таксама можаце вешаць усё, што захочаце. Але, але, вы мяне правакуеце, а гэта апалітычная экскурсія. Непрыгожа. Заходзьце ў аўтобус.

Мне не хапае спадара Дабіча

Сябры Драгана Дабіча сумуюць. Міна Мініч, тэрапеўт, гуру Дабіча, кажа мне па тэлефоне: — Толькі не падумайце, што я сумую па Караджычы. Я ведаў толькі Дабіча — прыемнага чалавека, чые думкі заблыталі астралогія і левітацыя.

Дабіч мусіў напісаць кніжку пра Мініча. Той з удзячнасці даў яму новае імя — Давід. У гонар біблейскага караля, бо ідэалогія Мініча і Дабіча была цесна звязаная з хрысціянствам.

Мініч: — Мы прадстаўляем атэісцкую версію праваслаўя. Мы ўзялі ад царквы найлепшае: містыку, медытацыю, лячэнне постам і малітву. Вы ведалі, што праваслаўныя манахі маглі левітаваць? Што ў раннія стагоддзі хрысціянства гэта было досыць распаўсюджаным уменнем? Што стала з манахамі? Што іх трымае за зямлю? Мы задавалі сабе

такія пытанні. І мы адкінулі інстытуцыйную царкву, ейную мішуру, помпу, ейны ўдзел у палітыцы.

Зараз я чытаю, што Караджыч як прэзідэнт быў вельмі звязаны з царквой. Значыць, ён увесь час мяне падманваў.

Караджыч... то-бок Дабіч... пасціўся два разы на тыдзень: у пятніцы і серады. Ён шукаў аналогіі паміж праваслаўем і рэчамі, якім ён навучыўся ў Індыі і Кітаі. Цяпер я ведаю, што ён увогуле там не бываў. Але распавядаў вельмі пераканаўча. Я думаў, што ён вялікі мудрэц. А ён быў папросту вялікім акторам, — сканчае Мініч.

Мішка Кавіяніч, уладальнік бара «Дом вар'ятаў»: — Ён пераважна слухаў. Гэта не тыповыя паводзіны ў Сербіі, дзе кожны пераважна гаворыць.

Тут жывуць бедныя людзі, а там, дзе беднасць, найбольш гавораць пра палітыку. Дабіч сядзеў пад партрэтам Караджыча і прыглядаўся да нас. Гэтак мы прагаварылі не адзін зімовы вечар. Часам, калі кагосьці ўжо несла, доктар Дабіч круціў галавой і казаў: «Усё не так проста, дзеці мае». Але ані разу не сказаў, якія сам мае погляды.

Шкада, што ён не сказаў нам праўду. Яго б ніхто не выдаў, мы б яшчэ лепш яго хавалі. Сюды прыходзяць толькі сапраўдныя сербы.

— То-бок якія? — пытаюся.

— Патрыёты. Былыя вайскоўцы. Праціўнікі гэтага праклятага Еўразвязу. Але я разумею, што ён не мог сказаць. Ён быў асцярожны, і ўсё роўна нехта яго выдаў. Я чытаў у газеце, што за ягоную галаву заплацілі 5 мільёнаў долараў.

Чаму «Дом вар'ятаў»? Восем гадоў таму, калі мы будавалі гэты бар, патэлефанавала мая жонка. Было страшэнна

гучна. «Я мушу выйсці, бо ў мяне тут дом вар'ятаў», — сказаў я. Працаўнікі падхапілі, гэтак і засталося.

Але сапраўдны дом вар'ятаў у нас тут пачаўся з тае пары, як злавілі спадара Дабіча. Журналісты, турысты, усе. А найгоршыя нацыяналісты. Я нічога не скажу, я серб і люблю Сербію. Але яны хацелі падпаліць мой бар, бо я прадаю кока-колу, то-бок амерыканскі напой. Ці гэта нармальна? Я вымушаны быў схаваць цэлую лядоўню. Цяпер яны прыцягваюцца сюды штодня.

Ведаеце, я мару, што прыйдзе дзень, адчыняцца дзверы і як нічога ніякага ўвойдзе спадар Дабіч. Я яму пастаўлю кілішак віна і скажу: доктар, у якую ж прыгоду вы ўляпаліся! А ён сядзе, паківае галавою і распавядзе, як у яго ў Гаазе прасілі прабачэння за памылку. Я не ведаў Караджыча асабіста, шаную яго выключна як правадыра. Ён хацеў, каб Сербія была толькі для сербаў, і так яно павінна быць.

Але мне не хапае Дабіча. І таго спакою, які быў некалькі тыдняў таму.

Я не была ягонай каханкай

Калі я прыехаў у Бялград, усе шукалі чалавека на імя Міла Дам'янаў. Доктар Дабіч быў у яе закаханы без памяці, — казалі знаёмыя пары.

Тацяна Ёванавіч з газеты «Здаровае жыццё»: — Мы разам ездзілі на канферэнцыі і сімпозіумы. Дабіч ні на хвіліну не выпускаў яе з вока. Яны сядзелі побач, а ў перапынках абдымаліся і гладзілі адно аднаго па руках.

Міліца Сэнэр, суседка доктара Дабіча: — Я часта бачыла іх разам, як яны трымаліся за ручкі. Прыстойная спадарыня, хаця я неаднойчы задумвалася: што такая маладая жанчына бачыць у стакім старым дзедзе. Але муж мне сказаў, што пасля вайны ў Сербіі замала мужчын. Лепш стары, чым ніякага.

Я таксама шукаў Мілу ў Бялградскім мікрараёне Земун. Безвынікова. Урэшце Міла знайшлася сама. Яна дала інтэрв'ю сербскаму таблоіду «Press»: — Я знікла, бо хацела найперш патлумачыць сям'і спадара Караджыча, што я ніколі не была ягонаю каханкай. Толькі пасля таго, як я ўпэўнілася, што спадарыня Караджыч атрымала гэтую інфармацыю, я вырашылася на інтэрв'ю.

Кім я была? Кабетай, зачараванаю духоўнасцю і глыбінёй гэтага чалавека. Спадар Дабіч ведаў вельмі шмат пра містыку, а таксама пра мастацтва, філасофію і гісторыю. Але паміж намі ніколі не было стасункаў, скажам так, інтымных.

Цяпер на бялградскіх вуліцах пра гісторыю Мілы разважаюць па-іншаму: ад пачатку яна была агенткай спецслужбаў і мусіла здаць Караджыча.

Блін «Караджыч»

— Зараз, паважанае спадарства, мы едзем у блінарню «Pinokio». Ён харчаваўся там некалькі разоў на тыдзень. Часцей за ўсё браў салодкія. На памяць пра яго зрабілі таксама блін: нутэла, арэхі, журавіны. Тут напісана, бачыце? «Радаван Караджыч — 150 дынараў». Што я пра гэта думаю? Цяпер кожны спрабуе неяк зарабіць. Што ў гэтым

дрэннага? У адным рэстаране паставілі пасярэдзіне крэсла: тут сядзеў прэзідэнт Караджыч. У іншым дадалі ў меню некалькі вегетарыянскіх страваў з прыпіскай «Раіць доктар Караджыч».

У вакне «Pinokio» экскурсаводка паказвае нам артыкул пра тое, што Караджыч тут харчаваўся. Побач вядомая сербская тэнісістка нахвальвае бліны з курыцай. Працаўнікі кажуць, што блін «Караджыч» разыходзіцца вельмі добра. Для экскурсаводкі гэта чарговы доказ таго, што тут напраўду залатая жыла.

— Мы таксама ўгаворвалі людзей у ягоным раёне, каб на час экскурсіі хтосьці з іх пераапранаўся ў доктара Дабіча. Каб надзяваў штучную бараду і чорны швэдар. Ён бы мог браць па 1 еўра за здымак. Але людзі не хочуць. Няма яшчэ бізнесовай свядомасці. У галовах яшчэ пануе камунізм.

У пакеце будзе танней

— Я спадзяюся, што вам спадабалася наша экскурсія. На жаль, яна не будзе даступнаю для індывідуальных кліентаў. Мы ўключаем яе толькі ў праграму «Belgrad sightseeing». Групы могуць выбіраць паміж Бялградам Ціты, Тэслы — нашага выбітнага вынаходніка — і Караджыча. Можна таксама ўзяць пакет, напрыклад Тэсла і Караджыч. У пакеце будзе танней.

На завяршэнне прапануем спадарству неспадзяванку. Мы пройдзем да будынка пракуратуры, куды спадар Караджыч трапіў адразу пасля арышту. Зможаце там пафатаграфавацца. Вядома, я з вамі сфатаграфуюся! Людзі з Японіі заўжды такія прыемныя.

Вось пракуратура. Тут спадара Дабіча пастрыглі, і ён зноў стаў спадаром Караджычам. Адсюль яго завезлі ў аэрапорт, а далей у Гаагу.

Дзе мне стаць? Тут? Цудоўна! І кажам: крызіс. Пстрык! Гатова.

Экскурсія? У большасці выклікае добрую рэакцыю. Людзі хочуць убачыць месцы, звязаныя са спадаром Караджычам. Мы задавальняем гэтую патрэбу.

Толькі адна жанчына напісала, што ёй не падабаецца назва «Поп-арт Радаван». Напісала, што людзі пачнуць успрымаць спадара Караджыча як сімпатычнага чалавека. Як дзядзечку з доўгаю барадой, у крыху завялікіх акулярах. Яна хацела, каб мы назвалі экскурсію «Ваенны злачынца Караджыч». Ну скажыце шчыра — вы б пайшлі на такую экскурсію?

Але тая жанчына папросту нічога не разумее ў працы турыстычнага агенцтва. Апроч таго, здаецца, у яе хтосьці блізкі загінуў на вайне. Такія перажыванні вельмі змяняюць чалавека.

Але вы мяне зноў адхіляеце ад тэмы. А мы папросту хочам рэкламаваць Сербію, ейную культуру і гасціннасць. Ёсць попыт на экскурсіі такога кшталту — мы іх арганізуем.

Куры для сербаў

Мы едзем на джыпе хонда ў бок Прыштыны. Кіруе Флорэнт, албанец. Побач сядзіць Душан, серб. Яны абодва з Мітровіцы, дзе албанска-сербскі канфлікт на самым піку. Я чакаю з непакоем, што адбудзецца па дарозе. Яны пасварацца? Паб'юцца? Пастраляюцца? Нічога з гэтага.

— Як магчыма, што вы сядзіце побач у адным аўтамабілі? — запытваю ўрэшце.

— Мы ненавідзім адно аднаго. Але паліва страшэнна дарагое, — кажа Флорэнт, і яны абодва з Душанам выбухаюць смехам. — Спакойна, бо зараз як стрэлю... — душыцца смехам Душан.

— Мы ведаем адно аднаго з дзяцінства, — урэшце тлумачыць Душан. — Мы гулялі ў футбол, калі яшчэ нічога не паказвала на тое, што Югаславія распадзецца. Мае бацькі жылі ў албанскай частцы горада. Да сёння ў іх там шмат сяброў.

— Сербы сябруюць з албанцамі? — удакладняю. Яны ківаюць галовамі. Ці можна было сустрэць яшчэ больш кур'ёзны дуэт у гэтай краіне?

Асцерагайся мэрсэдэсаў

Ездзіць аўтаспынам па Косаве ўсе адгаворваюць. Касавары ездзяць, як вар'яты, яны не ўраўнаважаныя, а з замежнікаў хочуць выдаіць усё да апошняга еўра, — сцвярджалі замежнікі, з якімі я піў каву адразу пасля прыезду ў Прыштыну.

— Іх ААН страшэнна распусціла, — кажа першы. — За ўсё дае ім касмічныя грошы. Я не веру, што цябе хтонебудзь нават на кіламетр падвязе бясплатна.

— У найлепшым выпадку табе трапіцца спрытнюга. У найгоршым — цябе высадзяць у адных шкарпэтках пасярод міннага поля, — хіхікае другі.

— Асцерагайся мэрсэдэсаў з прыцемненымі шыбамі, — дадаваў трэці. — Мафія. Могуць прадаць цябе на органы.

Я не верыў. Быў люты 2008-га, усяго некалькі дзён таму Косава абвесціла незалежнасць, а мне карцела ўбачыць касавараў у гэты важны для іх час. Прыгледзецца да іх праз пару дзён пасля таго, як іхная краіна стала наймалодшаю краінай Еўропы. Піць іхную каву, есці іхны хлеб, смяяцца з іхных жартаў і ездзіць на іхных аўтамабілях. Такім чынам, адным лютаўскім днём я стаў на ўзбочыне трасы Прыштына — Пэя.

Вельмі верагодна, што я — першы аўтаспыннік у незалежным Косаве.

Смецце, металалом і добрыя парады

Косава — гэта вельмі дзіўнае месца. Возьмем мабільны тэлефон. За паўгадзіны мяне паспяваюць прывітаць аператары трох краін. Спачатку — Манака, бо менавіта гэтая краіна тут аднойчы выйграла тэндар. А паколькі ў Косава няма ўласнага тэлефоннага кода — выбіраецца тэлефонны код княства.

Калі мы набліжаемся да мяжы з Македоніяй, мяне вітае мясцовы аператар. Па дарозе я праязджаю сербскі энклаў. Тут мяне вітае сербскі аператар.

Уся краіна заваленая смеццем. У мясцовых ёсць звычка кідаць яго проста ў раку. Здаецца, праз Прыштыну некалі працякала рака. Аднак яе так забрудзілі, што ўлады забетанавалі яе і на ейным месцы пабудавалі мікраараён.

У гэтага ёсць свае плюсы. На ўвесь час, праведзены ў Косаве, я забыўся пра алергію. Тут мала дрэваў, а трава нейкая слабенькая. Тыповы краявід — куча смецця, некалькі кіламетраў металалому і зноў куча смецця.

Менавіта ў такім месцы, паміж мыйняй, грудай металалому і запраўкай, я выходжу галасаваць. Махаю першы раз, крыху нясмела. Чарада аўтамабіляў на вялікай хуткасці — нават яе не збаўляе. Я махаю больш рашуча. Зноў нічога. Некаторыя кіроўцы, убачыўшы мяне, яшчэ больш разганяюцца. Відаць, гэта звычка з часоў вайны: адбываецца нешта дзіўнае — уцякай!

Іншыя глядзяць на мяне, як на рэдкі экзэмпляр жывёльнага свету. Дзядулі ў албанскіх шапках у форме паловы яйка мне добразычліва ўсміхаюцца. Хтосьці фатаграфуе на мабільны. Але ніхто не спыняецца.

Што ж, язда аўтаспынам тут не папулярная. Справа гонару кожнага мужчыны — сваё аўто. — У мяне можа не быць на ежу, але на бензін я знайду заўсёды, — кажа крыху пазней адзін з кіроўцаў.

Міма мяне праязджае калона вайсковых аўтамабіляў і дзве амфібіі. Падыходзіць хлопец з запраўкі і на ламанай нямецкай — здаецца, усе ў Косаве ведаюць гэтую мову, — тлумачыць, што да аўтавакзала тут менш за 500 метраў. — Чаму ты не здымеш аўтамабіль? — цікавіцца ён. — Бо я хачу пазнаёміцца з людзьмі, — адказваю яму. — Навошта? — ківае галавою з недаверам і вяртаецца да працы.

Праз хвіліну каля мяне спыняецца чорны мэрсэдэс з прыцемненымі шыбамі. Такі самы, на якім, відаць, ездзіць мафія. Душа мая пайшла ў пяты.

Экзекуцыя

— Свет і Еўропа нічога не ведаюць пра Косава, — казаў мне касавар, мой добры знаёмы. — Вы ведаеце толькі, дзе гэта і ў якім годзе была вайна. Усё астатняе можна вам навязаць. Вы думаеце, што тут кожны дзень узрываюцца бомбы, а жанчыны ходзяць апранутыя, як у Афганістане. Тым часам краіна наша нармальная, як у Еўропе, толькі крыху бяднейшая.

Потым мы крыху паразмаўлялі пра косаўскіх кіроўцаў. Насуперак аповедам, яны ездзяць у меру спакойна і бяспечна.

— Дарожных піратаў паліцыя карала публічнаю лупцоўкай. Некалькіх самых небяспечных расстралялі, — кажа з каменным тварам. Я быў уражаны. Мы хвіліну сядзелі ў цішыні, урэшце мой сябар не вытрымаў і пырснуў смехам.

— Бачыш, а ці я не казаў, што вы верыце ва ўсё?

Прыштына — Пэя: няма інспекцыі, але ёсць бізнес

Кіроўцу мэрсэдэса завуць Мэгрым. Мафія? Ён шырока ўсміхаецца і паказвае пальцам на аўтамыйню. — Вось тут сапраўдная мафія.

Не разумею. Я ўжо ведаю, што першы кіроўца не збіраецца прадаваць мае ныркі на чорным рынку. Я нават паспяваю зручна разваліцца на скураной абіўцы. Але ўсё яшчэ не ведаю, што агульнага ў працаўнікоў са шлангамі ў руках і мафіі, якая зарабляе мільёны на кантрабандзе.

Мэгрым, малады бізнесовец у шэрым спартовым строі, смяецца з мяне. — Бачыш тую мыйню справа? Я ведаю ейнага ўладальніка. Ён ездзіць на майбаху. У мяне свая мэблевая фабрыка. На ёй працуюць 200 чалавек. У яго — аўтамыйня. На ёй працуе толькі ягоны швагер.

— Не разумею...

— Гэта адмыванне брудных грошай! Чувак займаецца левым бізнесам, кладзе бабкі ў банк. Прыходзіць інспекцыя і пытаецца: адкуль вы ўзялі мільён долараў? А ён: у мяне мыйня, я цяжка працаваў, памыў паўмільёна аўто. Усе ведаюць, што гэта брахня. Але ў Косаве кантрольныя органы працуюць кепска. Ніхто яму нічога не зробіць.

— А твая фабрыка? Адкуль такая ідэя?

— Я ў жыцці не думаў, што адчыню сваю фабрыку. Я нават не ведаў, ці яшчэ калі-небудзь убачу Косава. Калі ў 1999-м я разам з бацькамі з'язджаў у Нямеччыну, тут было зусім цяжка. Бацька працаваў у Прыштыне перакладчыкам для адной з замежных газет. Ён аформіў нам від на жыхарства ў Боне. Там я скончыў вучобу і пачаў працаваць для аднаго немца. Гэта страшэнна багаты і абароцісты мужык. Мы пасябравалі. Аднойчы я ехаў наведаць сям'ю. Ён запытаўся ў мяне: Мэгрым, а можа, ты б прыгледзеў які-небудзь бізнес? Ці можна там нешта зарабіць?

Я паехаў і пачаў пытацца. Я думаў, што адчыню краму або бар. Аказалася, што мэблевая фабрыка ў Пэі стаіць зусім пустая. Яе можна было набыць амаль бясплатна, каб наняць людзей. Я пытаюся ў немца: бярэм? Ён на гэта: я ніколі не рабіў мэблю! Ну дык я кажу яму:

і я не рабіў. Але гэтыя людзі рабілі. Сёння мы прадаем прадукцыю ў Грэцыю, Македонію і Сербію. І, зразумела, у Нямеччыну.

— Гэта выгадна?

— Яшчэ як! Людзі з Косава працуюць за 200 еўра на месяц. Сёння тут краіна неверагодных магчымасцяў. Ведаеш, колькі грошай накачалі сюды за дзевяць гадоў? Адная толькі ААН амаль 30 мільярдаў еўра. А яшчэ ж Еўразвяз і дабрачынныя арганізацыі. Я калісьці гэта падлічыў. У кожны квадратны кіламетр увалілі 2 мільёны еўра. А інвестары так баяліся ўвайсці сюды. Зараз гэта скончыцца. Пасля абвяшчэння незалежнасці мне тэлефануе мноства людзей. Яны хочуць інвеставаць. Бачаць, што тут ёсць рынак. Пад Д'яковіцай стаяць некалькі фабрык. Пакуль яны яшчэ пустыя, але я ведаю, што палову ўжо набылі туркі.

Мы спыняемся ў цэнтры Пэі. Тут стаіць будынак, які нагадвае НЛА. У цэнтры горада каля ракі сустракаецца толькі моладзь. У гэтым нічога дзіўнага — большая палова касавараў яшчэ не дасягнула трыццаці год.

Гатэль «Begolli»: няма апартэіду, але ёсць джакузі

Касавары з-за мяжы, у якіх справы ідуць добра, імкнуцца як мага больш інвеставаць у сваёй краіне. Як прыклад, сямейны гатэль «Begolli», дзе я начаваў у Прыштыне. Практычнасць, прывезеная з Нямеччыны, тут пераплятаецца з албанскаю схільнасцю да раскошы. У албанскім доме мусіць быць як мага больш паверхаў. У кожным пакоі албанскага гатэля — джакузі і кічавая мэбля а-ля

Людовік XVI. Тое, што джакузі не працуе, а ў крэслаў адвальваюцца ножкі, ужо менш істотна.

Легенда Прыштыны — размешчаны ў цэнтры Hotel Grand, які лічыцца найгоршым пяцізоркавым гатэлем на свеце. 15 афіцыянтаў чакаюць гасцей у пустой зале. Але калі хтосьці з'яўляецца, ніхто з абслугі не жадае да яго падыходзіць.

— Што ж, гэта ўсё яшчэ дзяржаўны гатэль, — уздыхае Ардыта, з якою я тут сустракаюся. — І так ужо лепш, чым было. Калісьці тут быў сапраўдны апартэід — працавалі толькі сербы.

— Затое сёння там няма аніводнага серба, — дадаю я. Ардыта толькі паціскае плячамі.

Прызран — Штрпцы: няма электрычнасці, але ёсць снег

— Я сербка. Але я маю праблемы нашмат большыя, чым незалежнасць Косава. Якія? У мяне цячэ дах. Няма грошай на рамонт. І яшчэ электрычнасць...

— Электрычнасць?

Тацяна трымае абутковую краму ў сербскім энклаве Штрпцы. Яна падабрала мяне з дарогі на Прызран. З гонарам кажа, што ніводная албанка не адважылася б размаўляць з чужым мужчынам. Мне здаецца, яна крыху перабольшвае.

Мы едзем на ейным опелі праз горы Шар. Праязджаем пастарунак натаўскіх міратворцаў. Бяспеку сербаў сцерагуць украінцы разам з палякамі. Малая царква справа — гэта знак, што мы ўехалі на тэрыторыю энклава.

— Электрычнасць? — Тацяна вытрымлівае паўзу. — Паглядзі, людзі сядзяць пры свечках. Думаеш, гэта яны

такія рамантычныя? Святла няма часам тры гадзіны, часам пяць, бывае, што цэлы дзень. Ніколі не здагадаешся, калі яно будзе. Я не магу ні выпраць бялізну, ні памыцца, ні памыць посуд. Апроч таго, страшэнна нудна. Зімою раней цямнее. Выключаць табе электрычнасць — і сядзіш у цемры, як баран. Спаць не хочацца. Рабіць няма чаго.

— Што робіш?

— Гутарым з мужам. Часам хто-небудзь зойдзе. Але пераважна пануе такі летаргічны сон, здранцвеласць. Хоць некаторыя кажуць, што ў Косаве гэтак шмат дзяцей менавіта праз тое, што няма святла. Затое, калі раптоўна ўключаць, адразу ўстаеш на ногі. Няважна, колькі часу. Я заўсёды прачынаюся, калі ўначы ўключаюць электрычнасць. Будзіць мяне нейкі інстынкт. Я прымаю душ, уключаю пралку, гляджу тэлевізар. Людзі ў маім горадзе перакананыя, што албанцы выключаюць электрычнасць толькі сербам. Я ім кажу: я была ў Прызране. Там таксама няма святла. Але яны нікуды не ездзяць, сядзяць у Штрпцах і распавядаюць глупствы.

— Чаму яны не ездзяць?

— Баяцца. Два разы на тыдзень міратворцы канваюць аўтобусы: да мяжы з Сербіяй і да Грачаніцы. Там ёсць царква і аптовы склад. Албанцы кідаюць у гэтыя аўтобусы камяні, часам петарды. У мяне машына на косаўскіх нумарах, таму я не баюся. Я заплаціла за іх паўтары тысячы еўра. Але, калі б здарылася аварыя, я не ведаю, што рабіла б. Я не ведаю ні слова па-албанску.

— Ты баішся албанцаў?

— Ты здурэў? Я баюся толькі экстрэмістаў. Найлепшы сябар майго дзядулі — албанец. Яны разам працавалі ў гарах. Аднойчы яны парэзалі свае далоні, паклалі руку на руку і завязалі братэрства крыві. Не ведаю, як яны гэта прыдумалі, бо ў нас няма такой традыцыі. Відаць, бачылі такі вестэрн. Але з тае пары мы як сям'я. Мэмэд, сябар дзядулі, быў маршалкам на маім вяселлі. Калі сербскае войска лютавала ў Косаве, мы хавалі ягоных двух сыноў. Потым, калі албанскія партызаны ўзялі рэванш, мы жылі ў Мэмэда. Дзядуля ўжо памёр, але Мэмэд добра сябе адчувае. Ён трымае краму ў мястэчку, за некалькі кіламетраў адсюль. Я заўжды да яго заязджаю, калі еду па чаравікі. Люблю яго як уласную сям'ю. Хоць ёсць і невялікая праблема.

— Якая?

— Ён жахліва песціць маіх дзяцей. Дзень у Мэмэда — і не магу іх прымусіць слухацца.

— Што Мэмэд думае пра сербаў у Косаве?

— Ён у стане адрозніць злачынцаў ад звычайных людзей. Войны завязваюцца не паміж народамі. Ёсць злачынцы з аднаго і з другога боку. Ён гэта разумее. Пасля дэкларацыі незалежнасці ён бачыў, што я без настрою. І сказаў мне: Тацяна, мы толькі пешкі на шахматнай дошцы. Граюць амерыканцы з расейцамі. І выпадкова ты аказалася чорнаю, а я — белаю пешкай.

— А твае суседзі сербы? Як ставяцца да вашага сяброўства?

— Кажуць, нячысцік падкаснуўся. Штодня ў 12:44 яны пратэстуюць супраць незалежнасці Косава. На памяць

пра рэзалюцыю ААН. Яна мела нумар 1244 і выключала незалежнасць. Тады, калі я праходжу побач, яны глядзяць на мяне воўкам. Бо я набываю чаравікі ў албанцаў, а мусіла б байкатаваць іхныя тавары. Але калі ў пары баб разлезліся сербскія чаравікі, прыйшлі да мяне. З часам яны прызвычаяцца. Тут побач Брэзовіца, адзіны гарналыжны курорт Косава. Там таксама жывуць адныя сербы. Пасля абвяшчэння незалежнасці яны крычалі, палілі сцягі. Албанцы перапалохаліся і перасталі туды ездзіць. Умовы для катання там цудоўныя, а скаты стаяць зусім пустыя.

Сёння Брэзовіца ціха сядзіць і спадзяецца, што албанцы перадумаюць. А я спадзяюся, што албанскі ўрад урэшце выканае абяцанне і будзе электрычнасць. Калі будзе, то мне ўжо ўсё адно, прэм'ер серб, албанец ці папуас.

Пэя — Д'яковіца: няма плацяжоў, але ёсць генератар

У Косаве ёсць толькі адна электрастанцыя. Яна знаходзіцца пад Прыштынай і парушае ўсемагчымыя экалагічныя нормы. Падобна да таго, што ў ейную мадэрнізацыю ўжо ўвалена 500 мільёнаў еўра. Безвынікова.

Стрэфан, супрацоўнік адной з пазаўрадавых арганізацый, падвозіць мяне ў бок Д'яковіцы: — З электрастанцыі нічога не будзе, бо тут няма звычкі плаціць за электрычнасць. У часы Югаславіі не плацілі, і сёння навучыць гэтаму вельмі цяжка. Уладальнік кватэры, якую я здымаю, адвакат. Калі я паказваю яму рахункі за электрычнасць, ён толькі смяецца і кажа: мір, мір — добра, добра.

Адначасова ўсе набываюць малыя генератары электрычнасці. Такі ёсць у кожнай крамцы, цырульні ці кавярні. Калі выключаюць энергію, па ўсім горадзе разносіцца працяглае трррр. Гэта нашмат даражэй, чым рахункі за электрычнасць. Але людзей не пераканаеш.

Электрастанцыя не можа адсячыся ад тых, хто не плаціць — яна б мусіла адключыць увесь дом. Калі аказалася, што існуюць цэлыя дамы, якія не плацяць, прыехалі працаўнікі электрастанцыі. Іх добра пачаставалі кулакамі.

Электрастанцыя жыве толькі дзякуючы таму, што прадае электрычнасць Македоніі. На некалькі гадзін адключаюць усё Косава і высылаюць усё за мяжу.

Прызран — Драгаш: няма пятрушкі

Касавары пра сваіх братоў албанцаў гавораць з пэўнаю пагардай: эліта ў дзіравых ботах.

Албанцы гавораць пра касавараў, што гэта хітруны і нуварышы.

Касавары лічацца багацейшымі. Албанцы — разумнейшымі.

На пытанне, ці далучыцца Косава да Албаніі, і адныя, і іншыя наўпроставага адказу не даюць.

— Мы занадта доўга жылі паасобку. Мы занадта розныя, каб аб'ядноўвацца, — кажа кіроўца мікрааўтобуса пад Прызранам.

Але ў ягоным аўтамабілі вісіць маленькі сцяжок з чорным албанскім арлом. Сцяг Косава, сіні, з шасцю зоркамі, ён сваім не лічыць.

Ларс, датчанін, з якім я езджу па рэгіёне Гора, мае ўласную тэорыю на гэтую тэму. — Ім будзе цяжка аб'яднацца. Яны страшэнна розныя. Я нядаўна быў у Албаніі. Там калі ёсць возера — тут жа сто чалавек гандлююць рыбай. Калі крыніцы сцякаюць з гораў — сотня хлопцаў стаіць пры дарозе, каб памыць табе аўто. У Косаве ўсе сядзяць на срацы і чакаюць, калі дапамога прыедзе да іх сама. І яна прыязджае. Гэтыя людзі нічога не мусяць рабіць самі. Касавары жывуць з дапамогі гуманітарных арганізацый і стрыечных братоў з Нямеччыны. Сербаў утрымлівае ўрад у Бялградзе. Плаціць ім, каб яны толькі не выязджалі адсюль. Ты быў у Штрпцах? Там жыве некалькі тысяч сербаў. У бальніцы такога мястэчка мусяць працаваць максімум 30 чалавек. А там працуюць 300. Палова з іх нават не з'яўляецца на працы, а заробкі ў іх у тры разы вышэйшыя, чым у медыкаў у Бялградзе. Але ўсё адно найгоршая ААН.

— Чаму?

— Бо за ўсё пераплачвае. Мой сваяк, які працуе ў ААН, можа спакойна ўтрымліваць сям'ю з 10 чалавек. Калі так, то навошта ўрабляць зямлю? І глядзі — уся зямля зарастае травой. Нікому нічога не хочацца.

— Перагінаеш. У іх тут 70 адсоткаў беспрацоўя. Большасць людзей жыве за 1 еўра на дзень.

— Гэта статыстыка. А людзі нават пятрушкі не садзяць.

Д'яковіца — Бальяк: ёсць спакой, будуць куры

Джып хонда забірае мяне пад Д'яковіцай. Гэта там я знаёмлюся з Флорэнтам і Душанам — двума сябрамі з Мітровіцы.

— Як выглядае сербска-албанскае сяброўства? — дапытваюся я, бо мне цяжка верыцца. — Я думаў, што вы можаце толькі біцца.

— Няпраўда. У дзяцінстве мы хадзілі біцца дваром на двор, а не албанцамі на сербаў. Калі мае бацькі кудынебудзь ехалі, я спаў у сябра серба. Я цудоўна ведаю абедзве мовы, — кажа Флорэнт.

— Але па-албанску ты размаўляеш з вясковым акцэнтам, — кажа Душан — і абодва жартаўнікі зноў выбухаюць смехам.

— Толькі ў 80-х, калі Мілошавіч забраў у Косава аўтаномію, усё пачало кіпець. Потым сітуацыя ўжо толькі пагаршалася. Бацькі Душана памяняліся дамамі з албанцамі, якія жылі на сербскім баку. Усе акапаліся ў сваіх гета.

— Мы не бачыліся з 1996 да 2000. Абодва працавалі ў пазаўрадавых арганізацыях. Урэшце мы сустрэліся на нейкім мерапрыемстве ў Бялградзе. Флорэнт запытаўся, ці я б не хацеў з ім працаваць. З таго часу разам працуем у арганізацыі «Partners Kosova». Я тут адзіны серб.

— Мы разам ездзім на працу. Зрэшты, інакш і не атрымалася б. У Душана аўто на сербскіх нумарах.

— То-бок?

— У яго на нумарах літаркі КМ. Гэта азначае Косаўска-Мітравіца; гэта нумары, выдадзеныя ў Бялградзе.

— Там, дзе я жыву, ва ўсіх такія нумары.

— Але ў Прыштыне за такія нумары табе могуць шыбы выбіць ці пабіць самога. У мяне нумары КС — то-бок Косава. Мы на іх ездзім на працу. Але калі я іду ў госці да Душана, я пакідаю свае КС пры баснійскім месце ў Мітравіцы і перасядаю ў аўто Душана.

— У сербскай частцы горада можна атрымаць у лыч за нумары КС.

Хонда на нумарах КС зварочвае з трасы і спыняецца ў вёсцы Бальяк. Дзясятак недабудаваных дамоў з чырвонай цэглы. На ўскрайку малая мячэць і яшчэ меншая царква. Мясцовы стараста прасіў курэй для сербаў. Чаму? Няхай сам распавядзе. Забіраем з дому старасту і едзем да ведамства, якое для вёскі пабудавала ААН.

— Я як стараста вельмі радуюся здабытай незалежнасці. Кіраўніцтва нашай вёскі робіць усё, каб сужыцельст... — пачынае стараста.

— Асман, у нас няма часу. Сканчай гэты спіч, — кажа са смехам Флорэнт.

— Сапраўды, я прамаўляю, як палітык, — смяецца стараста.

— Дык навошта сербам тыя куры? — дапытваюся я.

— Да 2004 года ў нашай вёсцы не было ніводнага серба. Усе ўцяклі разам з войскам. Баяліся, што мы будзем ім помсціць. Але прайшло крыху часу. Не ў кожнага атрымалася наладзіць жыццё ў Сербіі. Бялград цяпер пратэстуе супраць нашай незалежнасці, але да сербаў з Косава там добра не ставяцца. І яны вяртаюцца. За чатыры гады вярнуліся 12 сем'яў. Амаль 50 чалавек. ААН

дае нам грошы. Мы будуем ім дамы. Памагаем уладкавацца. Але гэтага не дастаткова, бо ў іх няма працы. Таму мы прыдумалі, што дамо ім курэй. Яны адчыняць міні-фермы, будуць прадаваць яйкі, мяса. Будуць мець ежу. Аднаму мы купілі будку, ён там адчыніць краму з агароднінай. Заўтра мы едзем па першыя сто курэй. Можа, дзякуючы гэтаму ўдасца прывабіць троху больш сербаў.

— Навошта іх прываблiваеце?

— Каб урад у Бялградзе не нагаворваў, што мы тут іх крыўдзім. Апроч таго, на гэта ёсць грошы. Чаму ж з гэтага не скарыстацца?

— Албанцы не пратэстуюць?

— У мяне ёсць сусед. Вялікі албанскі патрыёт. Калі запытаць у яго пра сербаў, усіх бы перастраляў. Але, калі яны пачалі вяртацца, ён прыгадаў, што калісьці ў яго быў сябар Горан. І цяпер ён за мною бегае і пытаецца, ці не перавязу я яму сюды таго Горана. Бо ён хацеў бы яшчэ раз убачыць сябра перад смерцю.

VIII. КАСТРАЦЫЯ

У таго, хто большую частку жыцця быў нявольнікам, няма шанцаў, каб знайсці сябе на свабодзе. Таму мы вырашылі, што ўсіх нашых мядзведзяў трэба кастрыраваць.

Вясталкі Сталіна

Ён прыходзіць да мяне сярод ночы. Паглядзіць, папыхкае люлькай, закруціць вус. Усміхнецца — і адразу да дзвярэй. Я тады плачу і крычу, каб ён застаўся. Але які мужык будзе перажываць, што жанчына плача? Грузін — гэта так: напіцца гарэлкі, увайсці, хутка скончыць і заснуць. Я ненавіджу пітушчых. Але іншых тут, у Горы, няма. Іншыя бываюць толькі ў амерыканскіх фільмах.

Сталін — гэта зусім іншая гісторыя. Высокая культура. Ён ведаў, як пра кабету парупіцца, як сказаць камплімент, як добра пахнуць. Ён жыў сціпла, але насіў элегантнае адзенне. І не піў зашмат. А калі ўжо піў, то толькі добры, замежны алкаголь. Пра тое, што ён перамог фашызм і Гітлера, я ўжо нават не згадваю. Таму я сабе шмат гадоў таму сказала: Таня, якой халеры ты будзеш

з п'яніцамі сварыцца? Якой халеры, калі ты можаш жыць са Сталіным?

Анна Срэсэлі: Ён як сям'я

Мы стаім перад домам, у якім прыйшоў на свет Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Ягоныя бацькі жылі бедна. Матка прала бялізну мясцовым папам. Бацька быў шаўцом. Як вы бачыце, ягоны дом абнесены канструкцыяй у антычным стылі, а суседнія дамы зруйнаваныя. Так, увесь раён. Не, нічога дзіўнага ў гэтым не бачу. Калі б тут куры серлі, а дзеці гулялі ў футбол, вас бы гэта больш задаволіла?

У адным з тых разбураных дамоў жыла мая бабуля. Яна атрымала кватэру ў шматпавярховіку. Да канца жыцця паўтарала: «Унучачка, якое гэта шчасце, што я нарадзілася каля дома Сталіна. І што ўсё яшчэ магу глядзець на яго з вакон».

Бабуля памятае яшчэ матку Сталіна. Ён тут жыў больш за дзесяцігоддзе. Яна — амаль да канца жыцця. Для нас гэта вялікая нагода для гонару. Самая вялікая. Бо нічога іншага ў нашым мястэчку не адбываецца. Калі б не музей, горад бы даўно падох.

Некалькі гадоў таму ў нас была вайна. Недалёка ад мяжы з Асеціяй. Сто расейскіх танкаў уехалі ў Горы. Мы ўцякалі ў Тбілісі, а я не баялася, што яны разбураць мой дом і кватэру, я баялася, што разбураць музей. Але яны нічога не кранулі. Яны ўсё яшчэ баяцца Сталіна. Не датыкнуліся нават лапіку травы, толькі фатаграфаваліся пад ягоным помнікам. Такім чынам Сталін і пасля смерці нас выратаваў.

Калі я была ў школе, то адныя дзяўчынкі марылі працаваць у краме, іншыя хацелі лётаць у космас, а я хацела распавядаць людзям пра нашага вялікага суайчынніка. Усё ў сваім жыцці я арганізоўвала так, каб гэта збылося. Я пачала вывучаць гісторыю ва ўніверсітэце. А пасля навучання пабегла ў музей запытацца пра працу.

Але тады ўжо абрынуўся Савецкі Саюз. Музей быў зачынены і ледзьве пратрымаўся. Толькі нядаўна зноў пачалі браць на працу. Я была першым чалавекам, каго ўзялі ў новы набор. За той час я ўжо пачала выкладаць гісторыю ў гімназіі — таму ў музеі ў мяне палова стаўкі.

Ва ўніверсітэце мяне яшчэ вучылі, што Сталін быў выбітным дзяржаўным дзеячам. Але сістэма змянілася, змянілася таксама праграма, і цяпер я мушу вучыць, што ён быў тыранам і злачынцам. Я так не лічу. Перасяленні? Яны былі абавязковыя, каб людзі жылі мірна. Забойствы? Не ён за гэта адказвае, а Берыя. Голад ва Украіне? Гэта было прыроднае бедства. Катынь? Я ведала, што вы запытаеце. Усе палякі пытаюцца. Ведаеце, Катынь — гэта была вайна. На вайне такія рэчы — нармальная з'ява. І да таго, як вы пачнеце крычаць, дайце мне, калі ласка, скончыць. Вы ўжо астылі? Зараз я вам скажу, што я асабіста думаю.

Я лічу Сталіна вялікім чалавекам, але ні вучням, ні турыстам я гэтага сказаць не магу. Таму я кажу так: «Адныя лічаць яго дыктатарам, іншыя — тыранам, трэція — геніем. Хто ён насамрэч — на гэтае пытанне адкажыце сабе самі».

Тацяна Марджанішвілі: Божа, забяры мяне да Сталіна

Калі я бачу, што яны зрабілі з нашым любіменькім Сталінчыкам, у мяне душа крывёю залятае. Як так можна? Як можна з такога добрага чалавека рабіць пачвару, людаеда, нейкага монстра?

Калісьці ў наш музей прыязджаў аўтобус за аўтобусам. Выстройвалася чарга па некалькі сотняў метраў. Я глядзела ў твары тых людзей і бачыла, што з іх выпраменьвае дабрыня. А сёння? Адзін другога б загрыз. Вось, капіталізм.

Цяпер я ўжо туды не хаджу. Па-першае, бо сум. Па маладосці, працы, сябрах. А па-другое, бо ногі ўжо слабыя. Я нават па прыступках сама не спушчуся. У сакавіку мне споўніцца 82 гады, а цяжка быць здаровай усё жыццё. Раніцай устаю, парэжу хлебчык, завару гарбаткі, сяджу і кажу: «Навошта ты, Ісус Хрыстос, даў мне дажыць да такіх часоў? Навошта нашаму галубочку Сталіну косці перабіраюць?»

Але пазней я сабе думаю: «Узгадай, Таня, колькі Сталін нацярпеўся дзеля людзей. За цябе ён таксама не даядаў, не дасыпаў. Змагаўся з фашызмам, каб ты магла школу скончыць». І тады я бяру медаль з тварам Сталіна, я атрымала яго, калі сыходзіла з працы. Гладжу яго, галубочка, па вусах, і неяк мне лягчэе.

У музеі я працавала з 1975 года. «Наблюдацелем» — тым, хто адказвае за парадак і бяспеку экспазіцыі. Калі нехта спрабаваў дакрануцца да экспанатаў, мы мусілі хадзіць і крычаць.

Было няпроста. Старыя кабеты прыязджалі з вёсак і накідваліся на нашага Сталінчыка. Яны мусілі пацалаваць кожны здымак з экспазіцыі, як ікону ў царкве. А тых здымкаў больш за тысячу! Калі цэлы аўтобус баб прыязджаў і ўсе хацелі цалаваць, што я мусіла рабіць? Калі дырэктар бачыў — я хадзіла і крычала. А калі не бачыў, я казала: «Цалуйце сабе, бабы, дай вам, Божа, здароўя! Толькі не дакранайцеся да маскі, ні ў якім выпадку». Маска — гэта найсвяцейшая рэч у музеі, бо гэта пасмяротная маска.

Раней я працавала ў Нацыянальным музеі ў Тбілісі, але мой другі муж быў з Горы, і мне ўдалося перавесціся сюды. Было няпроста. Музей Сталіна — не тое месца, куды можна было зайсці з вуліцы і запытацца: «У вас ёсць праца?» Было істотнае меркаванне супольнасці. Я была разведзеная. Першы муж піў і біў мяне — няма сэнсу пра яго распавядаць. Тады я баялася, што мой развод станецца праблемай. На шчасце, мне далі вельмі добрую рэкамендацыю з музея ў Тбілісі.

Самыя элегантныя людзі ва ўсім свеце прыязджалі паглядзець дом Сталіна. З усёй Расеі, з Азіі, з Амерыкі. Журналісты, дыпламаты, артысты. А я стаяла між экспанатаў з карткаю, на якой было напісанае імя, і ганарылася, як невядома што. Гэтая праца была для мяне ўсім. Музей быў для мяне як дом.

Муж гэтага не разумеў. Мне не было з ім пра што гаварыць. Я, хоць мая праца палягала толькі ў пільнаванні экспазіцыі, чытала кнігі, знаёмілася з новымі людзьмі. А ён таксама піў. Спрабаваў біць, але я ўжо не давалася.

Пазней ён захварэў, пайшоў на пенсію. Цэлымі днямі сядзеў у кватэры або ў маткі. Каб зрабіць мне што-небудзь на злосць, казаў кепскія рэчы пра Сталіна.

Калі разваліўся СССР, ён паказаў мне язык. Гэтак быў задаволены. А потым памёр.

Шкада, што не дажыў да сённяшніх часоў. Цяпер бы я яму язык паказала. Навошта нам увесь гэты капіталізм, гэтыя амерыканскія сыры, сокі, шакалад? Нават малака ўжо нармальнага не набыць, усё мусіць быць у картоннай упакоўцы, бо так у Амерыцы. Я сабе думаю: «Ісус Хрыстос, забяры мяне з гэтага свету, бо даўжэй тут я не вытрымаю».

Нана Магаварыяні: Калі я яго бачу, мяне б'е токам

Мая пасада некалі называлася «кіраўнік асабістых справаў». Цяпер яна называецца «менеджар».

Агулам у музеі 63 працаўнікі, я адказваю за іх набор і працу. Дзесяць экскурсаводаў, адзінаццаць жанчын, якія пільнуюць экспазіцыю, дзве касіркі. З мінулага года ў нас з'явілася піянерка — дзяўчынка ў строі і чырвонай хустачцы, якая прадае паштоўкі і пазуе на фотаздымках. Гэта мая ідэя, за якую я атрымала асабістую пахвалу ад дырэктара. Турыст, разумееце, павінен мець з чым фатаграфавацца. Інакш ён не хваліць наш музей, і ў нас праз гэта кепскі PR. Я ведаю пра гэта, бо ў нас былі адмысловыя курсы пра турыстычны рух у час капіталізму.

Калісьці людзі прыязджалі пераважна з Савецкага Саюза. Нам было дастаткова расейскай мовы, але дзве кабеты ў нас размаўлялі па-ангельску і па-французску.

Сёння расеец — гэта вялікае свята. Палова калектыву выходзіць на яго паглядзець, калі такі прыязджае. І сустракаем мы іх найлепш. Хай бачаць, што палітыка палітыкай, а грузіны ім радыя.

Сёння большасць турыстаў — гэта Амерыка і Польшча. І ў нас праблема, бо не ўсе жанчыны ведаюць ангельскую, каб абслужыць гэтых турыстаў. Бо ў нас кожны турыст атрымлівае свайго гіда. Што рабіць? Кабет я незадоўга да пенсіі і не звольню, і не навучу ангельскай мове. Яны таксама бачаць, што ў новых часах яны не патрэбныя і ёсць пэўнаю абузай для музею. Але паміжсобку мы гэта не абмяркоўваем. Я ведаю, што значыць страціць працу з-за ўзросту.

Калісьці я працавала на фабрыцы адзення. Таксама ў аддзеле кадраў. Калі разваліўся Савецкі Саюз, фабрыка таксама развалілася. І ўсё параскрадалі. Нават шыбы з вокнаў. У часы Сталіна такія рэчы не былі б магчымыя. Вінаватых пакаралі б. Таму калі цяпер я чую, што пра яго распавядаюць, я кажу: «Людзі, стукніце сябе ў галаву. Узгадайце Савецкі Саюз. У кожнага была праца. У дзяцей была бясплатная школа. Ад Тбілісі да Уладзівастока». Я, напрыклад, калі б не камунізм, да гэтай пары жыла б у вёсцы. Пра кіроўчую пасаду нават не марыла б, бо раней усё было толькі для мужчын. Ніводзін дзяржаўны лад не даў столькі жанчынам.

Пасля ягонага падзення ўсё пагоршылася. Калісьці лекары не маглі адмовіць беднаму чалавеку. Сёння служба аховы здароўя прыватная, нават калі зломіш нагу, мусіш плаціць. Гэтаксама з навучаннем. Калісьці ў пенсіянера

быў бясплатны тэлефон і таннейшая электрычнасць. А сёння? 20 долараў пенсіі, а цэны, як на Захадзе.

І жанчынам усё горш. Бо ў СССР мужчынам шанцавала. Не было войнаў. А калі хто-небудзь з іх ударыць, можна было пайсці ў камітэт партыі і паскардзіцца. Партыя паведамляла ў партыйную ячэйку па месцы працы, і ў задзіры маглі быць вялікія праблемы.

Сёння ў мужчын няма працы, і яны ў дэпрэсіі. А калі хто з іх ударыць, дык нават няма каму абараніць.

Але ў нашым музеі большасць працаўнікоў — жанчыны. Нават між тэхнічнай абслугі, з чым я не сустракалася ў іншых установах гэтага тыпу. У нас найбольш месца адводзіцца Сталіну як сыну, мужу і бацьку. Менш — Сталіну як вайскоўцу ці стратэгу. Таму жанчыны тут нашмат больш дарэчы.

Мяркую, што таксама дзейнічае магія гэтага чалавека. Кабеты заўжды па ім сохлі. Жонкі дыпламатаў пісалі ў дзённіках, што ён быў вельмі імпазантны.

Штосьці ад гэтага засталося і да сёння. Часам, як стану каля той ягонай пасмяротнай масцы, як сабе пагляджу на яе, такім токам мяне ўдарыць, што мушу на хвіліну выскачыць на вуліцу.

Ларыса Газашвілі: Люблю ягоныя вершы

Мае бацькі — гэта Рамэа і Джульета часоў сталінізму.

Дзядуля па бацькавай лініі быў грузінскім князем. Ён ездзіў на белым кані, меў вялікі маёнтак, а ў доме — зачыненую на замок скрыню з золатам. Калі прыйшоў камунізм, яго сталі называць кулаком, зямлю і золата

адабралі, а пакінулі толькі скрыню. У мяне яна стаіць да сёння.

Дзядуля па лініі маткі быў з сялянскай сям'і. Дзякуючы Сталіну ён пайшоў у школу. Дзякуючы Сталіну ён стаў працаўніком калгаса, а пазней — таксама дзякуючы Сталіну — ягоным дырэктарам.

Чым горш былі справы ў першага дзеда, тым лепш было дзеду другому. Калі мае бацькі закахаліся адно ў аднаго, ніхто з дзядоў чуць не жадаў пра вяселле.

Дзядуля-дырэктар зачыняў маму ў хаце на замок. Пазней выслаў яе вучыцца ў Маскву. Шукаў ёй прыхільнікаў сярод сыноў сваіх знаёмых.

Дзядуля-князь шукаў для бацькі каго-небудзь з былой арыстакратыі. Пазней крычаў на яго. А яшчэ пазней — уставаў на калені.

Але вядома, што калі маладыя ўвапруцца, не дасі рады. Бацькі зладзілі вяселле, на якім не было ні адных, ні другіх дзеда і бабулі. Не наведвалі іх, рабілі выгляд, што іх не ведаюць. Так было да канца іхнага жыцця.

Таму, калі я атрымала працу ў музеі Сталіна, дзядуля-дырэктар абцалаваў мяне з усіх бакоў. А дзядуля-князь страшэнна абразіўся.

У музеі я адказвала за прапаганду. Гэта была вельмі адказная функцыя. Мы выдавалі газету, вершы Сталіна, літаратуру. Вершы ён пісаў прыгожыя. Рамантычныя, ажно дух займае. Калі б ён не стаў палітыкам, то, хто ведае, можа, атрымаў бы Нобеля?

Газета называлася «Бюлетэнь». То-бок калісьці яна называлася «Бюлетэнь музея Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна».

Але пасля развалу Савецкага Саюза застаўся толькі «Бюлетэнь». Каб нікога не пакрыўдзіць.

Праз той развал СССР у нас была страшная бязладзіца. Наш музей то зачынялі, то ізноў адчынялі. Змянялі экспазіцыю. Вярталіся да старой. Урэшце пагадзіліся на малыя папраўкі. Ні ў кога не было грошай, каб памяняць усю экспазіцыю. Ні ў кога таксама не хапала смеласці, каб увесь музей зачыніць. Занадта шмат грузінаў усё яшчэ любяць Сталіна.

Цяпер, на жаль, няма грошай на выданне «Бюлетэня». А я працую экскурсаводкай.

Я навучалася ў Калінінградзе. Мне там было добра. Я працавала ў школе, але мамачка сур'ёзна захварэла — і мне давялося вярнуцца ў Горы.

Знаёмыя сказалі мне, што нейкая жанчына з музея Сталіна пайшла ў дэкрэт. Таму я пайшла ў камітэт партыі, каб запытацца. Яны сказалі мне: спачатку трэба здаць іспыт.

Іспыт быў складаны. Трэба было цытаваць па памяці гісторыю Камуністычнай партыі, біяграфію Сталіна, гісторыю СССР. Але я вывучала гісторыю. Усё гэта было ў мяне ў галаве. Здала на выдатна.

Столькі дрэннага кажуць пра камунізм, але калісьці дырэктар разумеў, што ў нядзелю я мушу мець выходны, бо хаджу ў царкву. А цяпер мяне паставілі на нядзелю. Са злосці, я перакананая.

Тацяна Гургенідзэ: Я была б добраю да яго

Я нарадзілася ў кепскай сістэме. Бо ў мяне ментальнасць перадавіка працы. Калі трэба зрабіць нешта на грамадскіх асновах, я іду і раблю.

Я рабіла насценную газету для працаўнікоў. Заняткі для матак, якія самастойна выхоўваюць дзяцей. Калі была вайна, я памагала раздзяляць дапамогу.

У камунізме мяне ўсе шанавалі. Але прыйшоў капіталізм — і ўсе глядзяць на мяне, як на ідыётку.

Таму, калі я ўжо сапраўды больш не вытрымліваю, я прыходжу ў музей, каб супакоіцца. І кажу: «Спадар Сталін, я ведаю, што вы б гэта ацанілі». Мне гэта дапамагае. І калі мне сніцца Сталін — я вам ужо распавядала: ён глядзіць, закручвае вусы і выходзіць, — дык гэта звычайна праз некалькі дзён пасля такога супакаення.

З маім падыходам да мужчын таксама я не разлічыла з эпохай. Ведаеце, у Саюзе не было сэксу. Было палавое жыццё. Не было таго, што сёння моладзь глядзіць па тэлебачанні. Гэтых кліпаў і голых, прабачце, срак. Калі быў пацалунак, хтосьці кагосьці лёгка пагладзіў па спіне, — гэтага хапала. Кабета мусіла быць добраю работніцай, апранацца і паводзіць сябе сціпла. Таму, калі я пагляджу на гэтых сённяшніх дзяўчат, таксама іду ў музей. І кажу: «Спадар Сталін, вам бы гэта таксама не спадабалася». І зноў мне дапамагае.

П'яніц я не люблю. Наркаманаў таксама. Наш прэзідэнт мяне раздражняе, бо навошта ён задзіраецца з Расеяй? Вядома, што можна і з мядзведзем дамовіцца, калі

хацець. Але Саакашвілі ўпёрся, што ён — маючы Расею пад бокам — зробіць тут другую Амерыку. Была ў нас праз яго вайна, відаць, будзе і наступная. Калі была вайна, музей зачынілі, таму я прыходзіла ў парк, пад помнік, і казала: «Спадар Сталін, вы б узялі ўсё гэта ў свае рукі — і быў бы спакой».

А часам я іду і гэтак кажу: «Калі б вы жылі, дык, можа, мы былі б разам. Вам было б са мною добра. Я ўмею гатаваць, я вясёлая, прыгожа спяваю». І я мару, як было б добра быць жонкаю Сталіна. Але такія думкі я потым адкідаю. Бо паводжу сябе, як ідыётка. Сталін памёр. Камунізм скончыўся. Было, прайшло, да пабачэння.

Калі ён мне ў такі час прысніцца, я з ім вельмі халодная і афіцыйная.

Наця Ёлдбары: Сынок, будзь як Сталін

Мая мама казала: «Дачушка, не хадзі на гэтую працу. Сталін, вядома, быў вялікім чалавекам. Але такі рэчы сёння дрэнна выглядаюць у дакументах. Захочаш некалі іншую працу — не дадуць. Апроч таго, сорамна перад людзьмі там працаваць».

Але ў мяне малы сынок, і мне былі патрэбныя грошы. У Горы, калі ў цябе ёсць пэўныя амбіцыі, выбару не застаецца. Можаш навучаць у школе. Ісці ў гарадскую раду. Або ў Сталінлэнд — гэтак некаторыя гавораць на наш музей. Асабліва моладзь любіць пакпіць. На жанчын, якія тут працуюць, кажуць «сталінаўкі». Або «вясталкі» — бо яны нібыта пільнуюць, каб не згас агонь камунізму. Я па камунізме не сумую, хаця бачу, што для большасці людзей

у Горы свет скончыўся, калі абрынуўся СССР. У адной старэйшай калегі ў сталінскія часы забілі двух дзядуляў, а яна ўсё адно яго абараняе і любіць.

Я амаль не памятаю камунізму. Я нарадзілася тады, калі ён ужо сканчаўся. Я памятаю па тэлебачанні танкі ў Вільні. Калі мы здабылі незалежнасць, я пайшла з татам і грузінскім сцягам на галоўную плошчу горада. Гэта цудоўныя ўспаміны.

Тата хутка зразумеў новыя часы. Ён паслаў мяне на ангельскую, калі мне было сем гадоў. Дзякуючы ангельскай я атрымала працу ў музеі. Гэтую мову ведаю толькі я і яшчэ адна калега. Праз гэта ў нас найбольш групаў, а тыя спадарыні, што больш за ўсё на свеце закаханыя ў Сталіна, сядзяць і запарваюць каўку за каўкай. Заробак мы пазней атрымліваем аднолькавы, але я не скарджуся. Самае істотнае, што ў мяне ёсць праца.

Мой сынок не ведае па-расейску ні слова. Ён з дзіцячага садка вучыць ангельскую. Гэта будзе ўжо зусім іншае пакаленне. Сталін? Поўная абстракцыя.

Што я думаю пра Сталіна? Тут, у Горы, ёсць звычай, што бацькі ці дзядулі з бабулямі прыводзяць дзяцей у музей і пра яго распавядаюць. Я таксама прыводзіла свайго пупса. І распавяла яму ўсё так, як пішуць у амерыканскіх падручніках поспеху: «Яму было нашмат горш, чым табе. Бацька піў, халупа завальвалася, а сябры хуліганілі. Але ён быў працавіты. Дзякуючы гэтаму праз нейкі час ён кіраваў светам. Калі ты будзеш вучыцца, таксама зможаш шмат чаго дабіцца».

Анна Ткабладзэ: Мы байкатуем падзел Польшчы

Тут у нас ягоныя ўлюбёныя цыгарэты. Тут гадзіннік, які ён атрымаў ад маткі. Ён быў добрым сынам. Уважлівым мужам. Пяшчотным бацькам. Пра сваіх працаўнікоў ён дбаў, як пра дзяцей.

Сёння кажуць, што ён быў дрэнным чалавекам. А ў нашым архіве ёсць здымкі, як летам ён садзіць яблыні. Я лічу, што дрэнны чалавек з большаю ахвотай каго-небудзь пабіў бы ці забіў замест таго, каб садзіць яблыні. Зноў вы за сваё. Што забіў мільёны. Няма ніякіх доказаў гэтага. Усе дакументы падрабіў Берыя. Сталін зрабіў толькі адну памылку: ён быў задобры. Занадта моцна верыў людзям.

Гэтага ўсяго я не магу казаць турыстам. Дырэкцыя піша нам сцэнары экскурсій. Што ў гэтых сцэнарах? Тое, што я казала: што ён быў добрым сынам, уважлівым мужам. Можам яшчэ нагадаць, што ён перамог фашызм. Але пра розныя іншыя рэчы — не. Забойствы? Вы мне пачынаеце надакучаць. У нас тут ёсць няпісанае правіла: калі турыст нам вантробы пераядае, мы можам выйсці за межы музея і з ім пасварыцца. Але цяпер мы ў музеі, і я мушу прытрымлівацца сцэнара.

Нават стэнд пра пакт Молатава-Рыбентропа нам памянялі. Вядома, як ужо павесілі новы, дык непраўдзівы. Бо для Польшчы гэта сапраўды не быў добры пакт. Але ён даў СССР пару гадоў на даўзбраенне. І толькі дзякуючы яму фашызм быў пераможаны. А мы мусім казаць пра гэтак званы падзел Польшчы. Таму мы абыходзім бокам гэты стэнд. Такі наш ціхі байкот.

Скажу шчыра. Не ведаю, што думаць пра палякаў. З аднаго боку, калі тут была вайна з Расеяй, вы нам вельмі дапамаглі. Грузавікі з адзеннем і ежай прыязджалі сюды штодзень.

Але ніхто гэтак не чапляецца, як вы. Кожны чалавек прыедзе, паслухае з інтарэсам, а палякі крычаць на мяне, быццам я сама Сталін і сама вашу Польшчу падзяліла. А цяпер яшчэ кажуць, што Польшча дапаможа перабудаваць музей Сталіна ў музей Змагання з камунізмам. Калі гэта праўда, то ўвесь Горы прыйдзе ў заняпад. Бо мы тут нічога, апроч нашага Сталіна, не маем.

IX. МЯДЗВЕДЗІ-ТАНЦОРЫ

Часам, калі яны ўбачаць чалавека, — становяцца на заднія лапы і пачынаюць разгойдвацца злева направа. Быццам кленчаць — як раней — хлеб, цукерку, піва, пяшчоту, вызваленне ад болю. Болю, які ім даўно ніхто не чыніць.

Мы знішчым капіталізм

Бо ўрад абразае заробкі нам, а не сабе.

Бо немцы Грэцыю дзяруць як воўк кабылу. Яны зарабляюць тут мільярды і яшчэ крытыкуюць нас.

Бо не для таго мы прыдумалі дэмакратыю, каб хтосьці вырашаў за нашымі плячыма.

Бо капіталізм у сраку. Мы пусцілі лавіну, якая яго знішчыць.

Сакавік 2010, ужо некалькі тыдняў цэнтр Афінаў бесперапынна блакуюць дэманстрацыі. Настаўнікі, мядсёстры, працаўнікі порту, машыністы, анархісты. Уладальнікі крамаў рука ў руку з працаўнікамі заправак. Япі ў гальштуках плячо ў плячо з паголенымі налыса панкамі. — Замест таго, каб заціснуць паясы, усе радасна выйшлі на

вуліцу, — здзіўляецца Яцак, які ў Грэцыі мае фірму тыпу імпарт-экспарт. — Човен пад назвай «Грэцыя» тоне. Урад спрабуе яго ратаваць: падымае ПДВ, цану бензіну, урэзаў заробкі і прэміі бюджэтнікам. Але грэкі замест супрацы ладзяць грандыёзны страйк. І атрымліваюць наступныя мільёны еўра пазыкі.

— Чаму так адбываецца? — пытаюся я.

— Паўднёвы тэмперамент. У Ірландыі людзі паслухмяна пачалі эканоміць і выходзяць з крызісу. А грэкі? Упартыя людзі. Калі на адной фабрыцы адмянілі перапынак на каву, фабрыка збанкрутавала. Такі характар. Зрэшты, навошта вы гаворыце са мною. Запытайце ў грэкаў. У Афінах на кожным рагу нейкі пратэст.

Панядзелак, або Уладальнікі гатэляў галавой аб ходнік

Костас, уладальнік гатэліка пад Акропалем, апошнім часам амаль не спіць.

— Раней я ніколі не глядзеў інфармацыйнае тэлебачанне. Халера, як гэта ўцягвае, — кажа ён і размешвае цукар у чацвёртай на сёння каве. — Калі б хто-небудзь забараніў мне яе піць, я б таксама пратэставаў. Але мне не забараняюць. А вяртаючыся да тэлебачання, найбольш зацягвае гэты жоўты радок унізе. «Чыгуначнікі адмянілі». «Кантралёры падтрымалі». «Лекары абвесцілі». «Маракі часова прыпынілі». Што? Ну як гэта што?! Страйк! Госці пытаюцца толькі пра гэта. А кожны госць сёння на вагу скрадзенага немцамі золата.

Скрадзеным золатам немцаў дакараў Тэадорас Пангалас, віцэ-прэм'ер грэцкага ўраду. Таму што грэкаў

крытыкавалі за няўменне кіраваць фінансамі. — Кожны можа сарвацца, — з разуменнем ківае галавой Костас. Мы сядзім у садзе ягонага гатэліка. Якраз пачалі квітнець абрыкосы. — Сюды прыехала адна спадарыня з Нямеччыны і кажа: у вас крызіс, бо вы лянівыя і падманшчыкі. Я й сам ёй хацеў сказаць, што, калі б яны нас падчас Другой сусветнай не абрабавалі, мы б сёння жылі, як немцы. Але я прамаўчаў. Мы не можам абражаць немцаў. Зашмат іх сюды прыязджае, а ніхто не ведае, што будзе праз месяц. Кліенты таксама глядзяць інфармацыйнае тэлебачанне. І калі там няма нічога пра Грэцыю, то я атрымліваю 20 тэлефанаванняў і яшчэ столькі ж электронных лістоў на дзень на тэму адпачынку. Але дастаткова, каб паказалі, як нейкія саплякі паляць шыны — тэлефанаванняў будзе два, а электронных лістоў у лепшым выпадку штук восем. Што мне зрабіць? Як пратэставаць? Выйсці з гатэля і біцца галавою аб ходнік? Іншай ідэі ў мяне няма. Пацерпім мы ад гэтага крызісу страшэнна. Кожны пяты грэк жыве з турыстаў. Калі яны сёлета не прыедуць, восенню мы ўсе пойдзем з прыполам хадзіць.

Аўторак, або Блогеры супраць кіроўцаў

На пляцы Сынтагма вясёлыя бяздомныя сабакі бадзяюцца між аранжавымі дрэўцамі. Пасярэдзіне стаіць прыгожы фантан. На рагу — McDonald's. Насупраць вартавыя ў гетрах з пампонамі сцерагуць Магілу Невядомага Салдата. Над ім узвышаецца парламент.

— Вось тут нас абрабоўваюць, — Марыя, гідраперытная бландзінка гадоў сарака, працаўніца аднаго з замежных

банкаў, з пагардай надзімае ніжнюю вусну. — Таму мы блакуем гэты цырк.

Падчас усеагульнага страйку ў пачатку сакавіка сюды прыйшло больш за сто тысяч чалавек. Але ўрад прыстрашыў, што за страйкі будзе пазбаўляць заробкаў. Ніхто не хоча траціць дзённы заробак. Таму прафсаюзы вырашылі, што будуць арганізоўваць малыя пратэсты асобных галін. — Гэтак лепей, — кажа Марыя. — Я адпрацоўваю, прымаю душ і прыходжу сюды дакладна ў той момант, калі ў горадзе самы вялікі корак. Я працую ў прыватным банку і не магу нават падумаць пра пратэст. Калі б дырэктар убачыў мяне на Сынтагме, у мяне былі б вялікія праблемы. У іншых падобныя сітуацыі, таму мы абвесцілі, што пратэстуем як грэцкія блогеры.

— А чым ты займаешся ў банку?

— Кансультую кліентаў, у якіх больш за 100 тысяч еўра. — А калі б ты зараз мела 100 тысяч еўра, што б ты зрабіла? — Я б уцякла з Грэцыі. Тут яшчэ розныя цуды будуць адбывацца. Але пакуль што мы групуемся ў інтэрнэце і патрабуем ад ураду ўвесці падаткі для царквы і вытворцаў караблёў. Ведаеш, што найбольш зямлі ў Грэцыі належыць царкве? І што царква не плаціць за гэта ніводнага еўра? Гэтак жа, як уладальнікі караблёў, то-бок самыя багатыя грэкі. — І супраць гэтага вы пратэстуеце?

— Так. І супраць падаражання бензіну — з 1 еўра цана падскочыла да 1,5. Мы таксама пратэстуем супраць палітыкі ўраду, які скідае на грамадзян наступствы кепскіх палітычных рашэнняў. Мой заробак не панізяць. Але

даражэйшы бензін будзе ўплываць на цану кожнага кавалка хлеба і кілбасы.

На пратэст блогераў сабралося ўсяго некалькі дзясяткаў чалавек. Нягледзячы на гэта, Марыя ў захапленні. — Вельмі няблага для ініцыятывы з нізоў.

У меншым захапленні кіроўцы, якія праз Сынтагму вяртаюцца з працы. — Хадзіце да нас! Паліва занадта дарагое! — крычаць пратэстоўцы, але з-за стырнаў даносяцца толькі брыдкаслоўі.

— Марыя, Грэцыя папросту мусіць зацягнуць пояс! — я спрабую перакрычаць клаксоны.

— Тыповая прапаганда, — фыркае Марыя і зноўку надзімае ніжнюю вусну. — Паразмаўляй з Мэлінай. Яна зацягнула пояс ужо дзесяць гадоў таму.

Мэліне крыху больш за трыццаць. Яна навучае біялогіі. Не ў адной, а ў трох школах. — У мяне палова стаўкі ў адным ліцэі, чвэрць у іншым і адна восьмая ў трэцім. Чаму нідзе не навучаю на поўнай стаўцы? Бо, нягледзячы на тое, што я ўжо дзесяць гадоў працую настаўніцай, ніхто ніколі не прапанаваў мне стаўку!

— Чаму?

— Стаўка ў бюджэтнай сферы Грэцыі — як шчаслівы білет у латарэі. Атрымліваеш трынаццаты, чатырнаццаты заробак, цябе не могуць звольніць. Але ахвотных заўжды больш, чым месцаў. Таму трэба або кагосьці добра ведаць, або яшчэ лепш — заплаціць. Такім чынам, хоць я працую настаўніцай ужо дзесяць гадоў, на пенсію я не адклала амаль нічога. Але ў вачах Еўразвязу гэта выглядае вельмі добра: колькасць бюджэтнікаў не расце.

Недахоп мядсёстраў

Ёргас, медбрат з вялікага шпіталя на ўскрайку Афінаў, на пенсію пачаў адкладаць толькі два гады таму.

— Праз 12 гадоў працы, — адзначае ён. — Бо, нягледзячы на тое, што ў Грэцыі не хапае амаль трох тысяч медыцынскіх працаўнікоў, ніхто праз гэта не перажывае. А цяпер яшчэ ўрад абразае заробкі і нікога не хоча прымаць на працу. Калі нашая дэлегацыя пайшла да міністра здароўя, тая не захацела з намі размаўляць. Бо якраз прымала ў сябе дэлегацыю шпітальных садоўнікаў. — Але адмыслоўцы кажуць, што ў вашай бюджэтнай сферы працуе зашмат людзей.

— Няхай тыя адмыслоўцы прыйдуць да мяне на начное дзяжурства. У аддзяленні неадкладнай дапамогі два дактары і я. І цягам ночы нам трапляюцца: аварыя з двума параненымі, якіх трэба тэрмінова ратаваць; наркаман, у якога візія, што ён сатана, і якога я мушу ўціхамірыць; інфарктнік і дадаткова пара пераломаў, якім я на бягу даю нешта супраць болю, бо ведаю, што ім давядзецца некалькі гадзін пачакаць. Апроч гэтага, палова ложкаў у аддзяленні стаяць пустыя, мы не можам выкарыстаць усяго абсталявання. Чаму? Праз скарачэнні. І часта шпіталь накіроўвае на аналізы ў прыватныя шпіталі, бо тады бухгалтэрыя іх інакш апіша і ў табліцах для Еўразвязу гэта будзе лепш выглядаць. А тое, што гэта ў два разы дарагэй? Хто ж будзе гэтым пераймацца. Немцы задаволеныя, што мы эканомім. А гэта сёння самае важнае.

Серада, або Працаўнікі порту супраць немцаў

— Мы мусім немцаў у лапці абуць. Для гэтага мы тут! — кажа Яніс, які блакуе Амонію.

Амонія — гэта сэрца Афінаў. Тут перакрыжоўваюцца самыя важныя дарогі і лініі метро. Адсюль найбліжэй на Акропаль і на Сынтагму.

Але з тых часоў, калі ў раёне пачалі сяліцца нелегальныя эмігранты, тут усё менш карэнных грэкаў. Днём па ваколіцы сноўдаюць чарнаскурыя мужчыны, прадаюць падробкі торбаў і гадзіннікаў або шыхтуюцца ў доўгую чаргу па суп. Уначы прастытуткі з Нігерыі гучна заклікаюць кліентаў. Пратэст працаўнікоў порту з Пірэю тут выглядае як нешта з паралельнага свету.

Янісу 55 гадоў, ён працуе электрыкам у порце. Пра Валэнсу ён чуў, як інакш. — Ён узор для нас, для ўсіх грэкаў, што змагаюцца з дыктатурай. Толькі ён змагаўся з дыктатурай камуністычнай, а мы змагаемся з капіталістычнай.

Я хацеў сказаць, што гэтыя аналогіі зусім не такія ўжо відавочныя. Але цяжка было перабіць Яніса, які падсеў на антынямецкую хвалю: — Яны зрабілі сабе з Грэцыі калонію, як у Афрыцы. Увесь Еўразвяз — гэта каланізацыя. Год таму быў вялікі скандал, бо аказалася, што Siemens падкупляе грэцкіх чыноўнікаў, дзякуючы чаму выйграе тэндары. Немцы нас вучаць, як змяняць эканоміку, але самі больш за іншых карыстаюцца недахопамі сістэмы. Мы набылі ў іх падводныя лодкі за вялікія грошы.

— І што?

— Яны сапсаваныя! Яны косяць у левы бок. Мы іх называем п'янымі чаўнамі. Порт, у якім я працую, таксама набыў немец. Яны збіраліся разгарнуць прадукцыю, таму купілі танней. І што? Прадукцыю не разгарнулі, а зараз прадаюць нас арабам. З даходам. Што з намі зробяць арабы, нават думаць не жадаю. А наш прэм'ер едзе да Мэркель і словам нават не заікнецца пра порт.

— Дык гэта немцы вінаватыя ў вашых праблемах?

— А каб ты ведаў, так! Увялі нам еўра, каб прыязджаць сюды на танныя вакацыі.

— Вы атрымалі вялікую дапамогу ад Еўразвязу.

— Бо, калі немец прыязджае на адпачынак, усё мусіць быць, як у Нямеччыне. Набудавалі нам аўтастрадаў, паднаўлялі архітэктурныя помнікі. Хацелі тут другую Нямеччыну зрабіць. Але нічога ў іх не выйдзе. Ведаеш, хто такі немец?

Мне здаецца, я ведаю, але вырашаю не адказваць.

— Немец — гэта робат. Устае а шостай, едзе на працу, напіваецца згодна з календаром — раз на тыдзень. А ведаеш, хто такі грэк? Грэк — гэта добрае гулянне, сябры, сям'я. Я заўжды пасля працы сустракаюся з сябрамі. Мы сядзім, гутарым, ходзім адныя да іншых у госці. А немец, я пра гэта ў газеце прачытаў, нават у сваіх суседзяў не бывае дома. Калі б я хацеў быць немцам, я б перафарбаваўся ў бландзіна і пачаў уставаць а шостай. Але я не хачу. І няхай яны ўрэшце адчэпяцца ад нас і нашай эканомікі!

Чэк быць павінен

— У нас ужо скончыўся капіталізм у нямецкім стылі. Але ад яго пачаўся ўвесь крызіс, — кажа Лукас, журналіст з агенцтва. — Бывала, што па пяць разоў на дзень мне званілі з нейкага банку з прапановай: то крэдыцік, то пазычачка. Гэта ненармальна. А цяпер? Зусім не тэлефануюць. Ведаюць, што людзі бядою латаныя. Я працую ў дзяржаўным агенцтве, таму мой заробак скарацілі на 25 адсоткаў. Маёй жонцы — у прыватнай газеце — таксама скарацілі. Многія працадаўцы выкарыстоўваюць гэты момант, каб звольніць працаўнікоў або панізіць аплату. Пра адпачынак сёлета мы нават не гаворым. Шкада, бо дзеці акурат пачалі зарабляць самі, а мы хацелі ўбачыць Тайланд.

Урад хоча ўгаварыць нас, каб мы паўсюдна бралі чэкі і квітанцыі. Палічылі, што шэрая зона ў нас можа складаць да 50 адсоткаў бюджэту. Грэцыю называюць беднаю краінай багатых людзей.

З чэкамі ўсё добра, хоць таксоўшчыкі і лекары напачату крыху бунтаваліся. Я падтрымліваю ўсе гэтыя змены, не бачу іншага выйсця. Але на мінулым тыдні мой унутраны грэк выйшаў на паверхню. У нас сапсаваўся замок, і мы з жонкаю вырашылі заплаціць за новы, антыўзломвальны замок. Прыйшоў слесар і кажа: замок каштуе 100 еўра і вы мусіце ўзяць чэк, бо тады я даю гарантыю. Мая праца каштуе сотню — калі не хочаце браць чэк. А з чэкам будзе 120.

Натуральна, я папрасіў без чэка, гэтак жа, як на станцыі тэхабслугоўвання, у дантыста і нават на запраўцы.

Апошнім часам ва ўрадзе прыдумалі, што падатковая паліцыя магла б зазіраць людзям у торбы і, знаходзячы там пакупкі, патрабаваць да іх чэк. Калі б чэка не аказалася, штраф заплацілі б і пакупнікі, і прадаўцы.

Мяркую, яны ўжо крыху перабіраюць меру. Гэтаксама з паніжэннем заробкаў. Я разумею, што апошнімі гадамі мы пераважна праядалі грошы і цяпер трэба зацягнуць паясы. Але паніжэнні вельмі адчувальныя. Тое ж, што ва ўрадзе зараз прыдумваюць, мы даведаемся толькі ў ліпені. Тады тут будзе 40-градусная спёка і, што б яны ні зрабілі, ні ў каго не будзе сілаў пратэставаць.

Чацвер, або Уладальнікі крамаў супраць еўра

Як на гэта ўсё глядзяць прадаўцы? Я пытаюся ў Ёргаса Бурбуліса, якога называюць Юрэкам. Бурбуліс быў асістэнтам трэнера Казімежа Гурскага ў тыя часы, калі той разам з грэцкімі клубамі дабіваўся вялікага поспеху. Сёння ён уладальнік трох польскіх клубаў.

Піва «Łomża» ў Юрэка каштуе 1 еўра. Малінавы сіроп — 2,35. Вайсковы гуляш — 3,40, а кілаграм свойскага кумпяка — 7,20. — Але калі вы ўвойдзеце ў еўразону, я згарну бізнес. Бо Польшча толькі цяпер выгадная. Нават грэкі ў мяне набываюць польскую вяндліну, бо яна добрая і таннейшая за грэцкую. Чэкі, зразумела, атрымліваюць усе, без выключэнняў.

— Ну добра, але чаму ўвогуле грэк адчыніў польскія крамы?

— Падчас вайны ў Грэцыі, гэтак жа, як і ў Польшчы, з фашызмам змагалася Армія Краёва і Армія Людова.

У Польшчы выйграла А. Л., а ў Грэцыі — А. К. Тых, хто быў на баку камуністаў, як, напрыклад, мой бацька, пераследвалі. Тата ўцёк з Грэцыі і апынуўся ў Польшчы. Там пазнаёміўся з мамай. І там мы з братам нарадзіліся.

У Грэцыю сям'я Юрэка вярнулася адразу пасля таго, як абрынулася дыктатура палкоўнікаў. — Мы былі адною з першых сем'яў. Тата не хацеў жыць у іншых месцах. Любіў гэтую краіну. Я зразумеў гэта праз шмат гадоў, калі сам вярнуўся з эміграцыі — 20 год я жыў у Злучаных Штатах. Тут добрае паветра, добрая ежа, добрыя людзі. Рай! Зрэшты, паглядзі на маіх кліентаў. Яны прыехалі 15 гадоў таму і зусім не хочуць вяртацца.

Кліенты — гэта Робэрт, Гжэсек і Здзіх. Папіваюць піва «Łomża» і хваляць Грэцыю направа і налева.

— Тут калі бахнеш піўко і сядзеш за стырно, паліцыя толькі ўсміхнецца. У іх чалавечы падыход, — кажа Робэрт. — А ў Польшчы, я чуў, у турму можна патрапіць. Дык чаго туды вяртацца?

— Адно не пішы, што мы тут толькі піва п'ем. Калі б так было, ніхто б нам месца на працы не трымаў. А мы тут ужо больш за дзесяць гадоў і ўвесь час маем замовы. Як нам жывецца? Цяпер, калі мы ўжо ў Еўразвязе, вельмі добра. Можна легальна працаваць, ні на каго не азіраючыся. Бо да таго, як мы ўвайшлі ў звяз, паліцыя ладзіла налёты на будоўлі. Калі даведваліся, што хтосьці працуе крадком, трэба было адразу даваць у лапу. Інакш — дэпартацыя.

— А каб легальную працу атрымаць, таксама трэба было даць у лапу.

— І каб зрабіць іхны ідэнтыфікацыйны нумар.

— І каб да лекара патрапіць.

— Дык ты ўжо ведаеш, адкуль той крызіс у Грэцыі? — пытаецца Юрэк. — Кожны хацеў мець зашмат. Я яшчэ не адчуваю крызісу на ўласнай скуры. Але я ўжо бачу, што кліенты перасталі набываць шынку на вагу. Пачалі браць скрылікамі.

Пятніца, або Левыя супраць дзяржавы

Экзархія — гэта раён анархістаў, камуністаў, трацкістаў, альтэр-глабалістаў і эколагаў. Тут складана знайсці хаця б частку сцяны без графіці. У кавярнях палітызаваная моладзь дзень і ноч спрачаецца, як змяніць свет.

Паліцыя сюды не паказваецца. У бок паліцыянтаў тут адразу ляцяць камяні. У выходныя яны стаяць на падыходах да Экзархіі, прыкрываючыся пластыкавымі шчытамі. Здараецца, што каля кавярнага століка ўсе раптам пачынаюць чхаць. — Слезацечны газ. Пэўна, недзе нашыя ганяюцца з мянтамі, — тлумачыць тады афіцыянт і прыносіць вільготныя хустачкі.

Таму я іду ў Экзархію з неспакоем. Пачынаю ад утульнага пляца каля політэхнічнага ўніверсітэта.

— Экзархія? Тут пачнуцца перамены, якія зменяць усю Грэцыю і — калі ўсё пойдзе паводле плану — увесь свет, — з энтузіязмам кажа Марыя, студэнтка архітэктурнага. — Адзін урад тут ужо абрынуўся — Хунта палкоўнікаў. 17 лістапада 1973 года студэнты з майго ВНУ абвесцілі страйк. Да іх пачалі далучацца жыхары Афінаў, якім надакучыла дыктатура. Палкоўнікі напалохаліся. Наслалі на

ўніверсітэт танк. Загінулі 24 чалавекі. Але гэтак пачаліся змены, дзякуючы якім ужо праз год замест палкоўнікаў Грэцыяй кіраваў дэмакратычна абраны ўрад. Другі раз Экзархія паўстала ў 2009. — Нават самыя разумныя не маглі гэтага прадбачыць, — ківае галавой Марыя. — Пачалося з таго, што паліцыянты застрэлілі Аляксандраса, маладога хлопца, які крыху з імі задзіраўся. І Экзархія выбухнула. Праз хвіліну хвалявалася ўжо ўся Грэцыя. Людзі біліся з паліцыяй, штодзённыя беспарадкі, газ, дэманстрацыі. Спалілі некалькі камісарыятаў па ўсёй Грэцыі.

Гэта былі самыя вялікія грамадскія хваляванні з 1973-га.

Хрыстас, настаўнік у суседнім ліцэі: — Я тут 15 гадоў працую з моладдзю. Я быў перакананы, што нешта падобнае адбудзецца. Дзеці гадзінамі сядзяць над кніжкамі. Сканчаюць школу. Пазней вучацца ва ўніверсітэце. А калі я пытаюся ў сваіх былых навучэнцаў, пра што яны мараць, яны кажуць: працаваць у дзяржаўным сектары. Ці ж гэта нармальна, каб для 20-гадовага чалавека мэтаю была праца ў гарадской радзе?! За 1000 еўра ў месяц? Але гэтак у Грэцыі. Бо мы нічога не вырабляем. Можна працаваць або на дзяржаву, або ў турызме.

— Але пры чым тут хваляванні? — пытаюся я.

— Праца ёсць толькі для выбраных. Ты мусіш мець знаёмых і яшчэ даць хабар. Тады ў цябе будзе рай на зямлі: трынаццатка, чатырнаццатка, цябе не могуць звольніць. Але для большасці студэнтаў у Грэцыі няма будучыні.

Пытаюся ў Марыі, якая сітуацыя з маладымі архітэктарамі: — Існуюць дзве дзяржаўныя фірмы, якія адбіраюць на рынку самых здольных ці самых забяспечаных: тых,

у каго бацька ці маці працавалі ў гэтай галіне. Апроч таго, ёсць некалькі прыватных фірмаў. Але яны рэдка бяруць на працу. Выбар? Атрымліваеш дыплом і або едзеш за мяжу, або знаходзіш працу, ніжэйшую за свае магчымасці. На запраўцы, у офісе. Калі пашанцуе, то ў турызме. Я вучуся на трэцім курсе, а ўжо сёння бегаю стажыравацца ў адно агенцтва, што прывозіць турыстаў з Ізраіля.

Марыя вядзе мяне ў цэнтр Экзархіі. Калісьці ўтульны пляцык смярдзіць мачою. — Гаш? Кока? Нешта мацнейшае? — на ўваходзе запытвае імігрант з Афрыкі. Дзякуем. Тыя, хто не адмовіўся, сноўдаюць па пляцы. Нехта паліць джойнт. Нехта дапамагае сябру ўкалоцца ў вену. — На жаль, гэтае месца робіцца ўсё больш паскудным, — кажа Марыя. — Гарадскія ўлады наўмысна дазваляюць тут шырацца. Прыедзе журналіст з-за мяжы — і што бачыць? Наркаманаў, засіканы газон, графіці. Але Экзархія — гэта нешта зусім іншае. Гэта нязгода з капіталізмам. Нязгода з пацучынымі гонкамі. Мы тут будзем змагацца ажно да перамогі.

— Але з чым менавіта змагацца? З крызісам? — пытаюся. Марыя махае рукой. — Крызіс — гэта дробязь. Не адзін ужо быў. Мы будзем змагацца з капіталізмам. Паказваць людзям, што не абавязкова мець дом, удава баа і верталёт, каб быць шчаслівым.

— Дык што вы хочаце змяніць?

— Ну, знішчыць капіталізм. А потым убачым. Сам пераканаешся: адсюль пойдзе лавіна, што разліецца па ўсім свеце.

ЗМЕСТ

Частка 1

I. Любоў 7

II. Свабода 25

III. Гандляванні 38

IV. Гісторыя 54

V. Інстынкты 72

VI. Зімоўка 81

VII. Львы — у Афрыку 85

VIII. Кастрацыя 92

IX. Мядзведзі, што танчаць 102

X. Канец 107

Частка 2

I. Любоў 117

II. Свабода 133

III. Гандляванні 144

IV. Гісторыя 158

V. Інстынкты 167

VI. Зімоўка 183

VII. Львы ў Афрыку 196

VIII. Кастрацыя 225

IX. Мядзведзі-танцоры 240

ПЯРШАК.
MULTILABEL 34

Вітальд Шаблоўскі

ТАНЕЦ МЯДЗВЕДЗЯЎ

Пераклад з польскай мовы — Адэля Дубавец
Рэдактура, карэктура — Ліда Наліўка
Вёрстка — Іван Свешнікаў
Вокладка — Дар'я Сазановіч
Куратары выдання — Антон Кашлікаў, Саша Губская

Copyright © by Witold Szabłowski & Agora SA, 2014. All rights reserved.